Я. ГАШЭК

ПРЫГОДЫ ЎДАЛАГА ВАЯКІ ШВЭЙКА

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

З рускае мовы пераклаў М. Лужанін

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
ЛіМ
МЕНСК 1932

Тэхрэдактар *К. Пуроўскі*
Карэктар *А. Перская*
Здана ў друкарню 20-III—32 г.
Падпісана да друку 22-V—32 г.

Вокладка мастака І. Давідовіча

Заказ № 688. 5.000 экз. Уп. Галоўлітбелу № 2766.

Друкарня імя Сталіна.

ПРАЗ УСЮ ВЭНГРЫЮ.

Нарэшце надышоў момант, калі ўсіх пазапіхалі ў вагоны, з разьліку 40 чалавек ці васьмёра коняй. Праўда, коням было выгадней, як людзям, таму што яны ўмеюць спаць стоячы,—ну ды гэта ўсёроўна! Вайсковы цягнік зноў павёз на збойства ў Галіцыю партыю гарматнага мяса.

Наогул-жа гэта прынесла ўсім гэтым стварэньням толькі вядомую палёгку. Прынамсі, было штосьці пэўнае, калі цягнік адышоў ад станцыі: перад гэтым было толькі цяжкае няведаньне, ці паедуць сягоньня, ці заўтра, ці пасьлязаўтра. Некаторыя адчувалі сябе, як асуджаныя на сьмерць, што з жахам чакаюць, калі па іх зьявіцца кат. І вось зьяўляецца некаторае заспакаеньне, бо зараз ўсё павінна скончыцца.

З гэтай прычыны адзін салдат закрычаў з вагону, як дуркаваты.—Едзем! Едзем!

Каптэнармус Ванэк меў рацыю, калі казаў Швэйку, што сьпяшацца няма куды.

Шмат дзён прайшло да тэй хвіліны, калі пачалі грузіцца ў вагоны. За гэты час шмат гаварылі пра консэрвы, і Ванэк, што быў і на кані і пад канём, сьцьвярджаў, што гэта адна нікчэмная трызьня. Якія такія консэрвы?! Вось малебен перад дарогаю, гэта так, таму што малебен служылі і ў папярэдняй маршавой роце. А калі былі-б консэрвы, дык ня варта было-б правіць малебну. Ну, а цяпер давядзецца консэрвы замяніць малебнам...

І вось, заместа мясных консэрваў, зьявіўся старэйшы фэльдкурат Ібль, які адразу забіў тры зайцы. Ён адправіў малебен аднэчасова тром маршавым батальёнам, блаславіўшы два з іх на перамогі над сэрбамі і адзін—над расійцамі.

Пры гэтым ён зьвярнуўся да ваякаў з гарачаю прамоваю, і льга было заўважыць, што матэрыял для яе ён запазычыў з вайсковых календароў. Яна была настолькі расчуленая, што Швэйк, які знаходзіўся разам з Ванэкам у імпровізаванай у вагоне канцылярыяй, калі яны ехалі ў Візэльбург, успомніў гэтую прамову і сказаў каптэнармусу:

— Ах, як гэта будзе цудоўна, як гаварыў пан фэльдкурат, калі дзень будзе сыходзіць у надвячорак і залатыя праменьні сонца схаваюцца за гарамі, а на полі бойкі, як ён казаў, будуць чутны апошнія ўздыхі параненых, хрыпеньне коняй, што здыхаюць, і голас мясцовых жыхароў, калі над іхнымі галовамі яскрава будуць паладь саламяныя стрэхі халуп! Ах, я страшэнна люблю, калі людзі вярзуць такую лухту!

Ванэк сьцьвярджаючы матнуў галавою.

— М-так, гэтая прамова расчульвала да д'ябла,—сказаў ён.

— Яна была дужа добра і навучальна,—казаў далей Швэйк. Я яе добра запомніў і, калі вярнуся з вайны, канечне перадам яе ў «Поўнай чашы». Пан фэльдкурат, калі ён нам усё гэта растлумачваў, зрабіў такую прыгожую паставу, шот я спалохаўся, каб ён не пасьлізнуўся і ня ўпаў на складаны алтар і не пабіў мазгаўні аб дарахавальніцу. Ён расказаў нам такія прыгожыя прыклады з гісторыі нашае арміі, калі ў ёй служыў яшчэ Радэцкі, і пра тое, калі гарэлі хлявы на полі бойкі—як быццам-бы ён сам гэта бачыў.

А ў той-жа самы дзень фэльдкурат Ібль быў ужо ў Вене і падносіў другому маршаваму батальёну тую-ж самую чульлівую гісторыю, пра якую ўспамінаў Швэйк і якая так яму ўпадабалася.

— Дарагія ваякі,—казаў фэльдкурат Ібль,—ўявеце сабе, што бойка каля Кустоццы скончылася перамогаю, калі італьянскаму каралю Альбэрту пасьля дзесяцідзённага ўпартага змагацьня давялося перастуліць залітае крывёю поле бою нашаму айцу-камандзіру маршалу Радэцкаму, які яшчэ на восемдзесят чацьвертым годзе жыцьця меў такую бліскучую перамогу. Паглядзеце, дарагія ваякі! На ўзгорку перад узятаю штурмам Кустоццаю спыніўся ўшанаваны маршал. Вакол яго—ягоныя верныя ваеначальнікі. Сур'ёзнасьць моманту глыбока ўсьвядомлівалася ўсімі гэтымі людзьмі, бо, дарагія ваякі, недалёка ад фэльдмар-

шала льга было бачыць аднаго з яго салдатаў, які змагаўся са сьмерцю. Лежачы з патрушчанымі рукамі і нагамі на полі гонару, параненя ваяка адчуў, што маршал Радэцкі глядзіць на яго. Слаўны паранены унтэр-афіцэр сударгова заціскаў у здрантвелай руцэ свой залаты мэдаль «за адважнасьць». Пабачыўшы ўлюбёнага фэльдмаршала, у ім яшчэ раз успыхнула гатовае ўжо згаснуць жыцьцё, і паміраючы з нечалавецкімі натугамі папрабаваў падпаўзьці да фэльдмаршала. «Супакойся, ня муч сябе, мой адважны ваяка!»—выгукнуў маршал, саскочыў з каня і падаў яму руку. «Не магу вам падаць рукі, пане фэльдмаршал,—сказаў паміраючы,—таму што ў мяне абедзьве рукі адарваў знарад. Але я вас прашу пра адно, толькі пра адно. Скажэце мне ўсю праўду, ці мы перамаглі?»—«Так мы маем поўную перамогу, дарагі брат,—ласкава прамовіў фэльдмаршал.—Як шкада, што тваю радасьць засьціць гэтая цяжкая рана!»—«Сапраўды, пане фэльдмаршал, я ўжо, мабыць, не ачуняю»,—абазваўся гэрой глухім голасам, прыветліва ўсьміхаючыся.—«Табе, мусіць, хочацца піць?»—запытаў Радэцкі.—«О, так, пане фэльдмаршал, увесь дзень была сьпека, да трыццаці градусаў у цяню» Тады Радэцкі схапіў пляшку ў аднаго з сваіх ад'ютантаў і працягнуў яе паміраючаму.—«Памажы вам, божа!»—выгукнуў ён, мерачыся пацалаваць руку свайго ўлюбёнага начальніка.—«Колькі год ты праслужыў?»,—запытаў яго фэльдмаршал.—«Больш за сорак год, пане фэльдмаршал. Каля Аспэрну я атрымаў залаты мэдаль і пад Ляйпцыгам я быў і вайсковы мэдаль таксама ў мяне ёсьць... Пяць разоў быў я цяжка паранены, а вось цяпер надышоў мой канец! Але якая радасьць, якое шчасьце, што я яшчэ дажыў да гэтага дню! Я не баюся сьмерці, таму што на нашым баку бліскучая перамога і наш імпэратар атрымае ізноў свае землі». У гэты момант, дарагія ваякі, з лягеру дакаціліся велічныя гукі нашага народнага гімну: «Божа ахавай, божа абарані», магутна і горда луналі яны па-над полем бойкі. Ваяка, што разьвітваўся з жыцьцём, яшчэ раз папрабаваў узьняцца. «Няхай жыве Аўстрыя!—узьнята крыкнуў ён.—Няхай жыве Аўстрыя!—сьпявайце, сьпявайце наш цудоўны гімн! Няхай жыве наш улюбёны найвышэйшы правадыр, няхай жыве армія!» Паміраючы яшчэ раз прыпаў да рукі фэльдмаршала і пацалаваў яе, а пасьля схіліўся на

зямлю і апошні ціхі ўздых вырваўся з яго шляхетных грудзей. Найвышэйшы правадыр зьняў шапку перад трупам аднаго з сваіх адважнейшых салдатаў. «Гэтаму цудоўнаму канцу сапраўды можна пазайздросьціць»,—сказаў усхваляваны фэльдмаршал, апусьціўшы галаву на маліцьвена складзеныя рукі...

— Дарагія ваякі,—дакончыў сваю прамову Ібль,—жадаю вам, каб і ва ўсіх вас быў гэткі-ж слаўны, прыгожы канец!

Калі Швэйк успомніў гэтую прамову, ён з поўным правам, ні кропелькі не перабольшваючы, мог называць фэльдкурата Ібля ідыётам, якіх яшчэ сьвет ня бачыў.

Пасьля Швэйк пачаў гаварыць пра ўсім вядомыя загады, якія прачыталі ім перад пасадкаю ў вагоны. Адзін з іх быў падпісаны Францам-Іозэфам загад па арміі, другі—загад Эрцгэрцога Іозэфа-Фэрдынанда і абодва датычылі здарэньняў на Дуклінскім перавале ад 3 красавіка 1915 г., калі два батальёны 28-га пяхотнага палка разам са сваімі афіцэрамі і з музыкай на чале перайшлі на бок расійцаў.

Абодва загады чыталіся з дрыжыкамі ў голасе і спавяшчалі:

ЗАГАД ПА АРМІІ АД 17 красавіка 1915 г.

З пачуцьцём глыбокага смутку загадваем Мы выключыць са складу Нашае арміі 28-мы пяхотны полк за трусасьць і дзяржаўную здраду, адабраць у яго сьцяг і перадаць ў вайсковы музэй. Гісторыя палка, які накіраваўся на фронт в атручаным усьведамленьнем сваіх абавязкаў, лічыцца ад гэтага часу спыненай.

Франц-Іозэф (уласнаручны подпіс).

ЗАГАД ПА АРМІІ ЭРЦГЭРЦОГА ІОЗЭФА-ФЭРДЫНАНДА.

3 красавіка ў часе цяжкіх боёў на Дуклінскім перавале два батальёны 28-га пяхотнага палка, разам са сваімі афіцэрамі бяз ніводнага стрэлу здаліся аднаму батальёну расійцаў, і ачарнілі сябе, такім чынам, вечнаю ганьбаю.

73-му пяхотнаму палку разам з германскімі часьцямі ўдалося, не зважаючы на цяжкія страты забітымі і параненымі, утрымаць позыцыю пакуль прышлі падмацаваньні.

28-мы пяхотны полк назаўсёды выключаецца са сьпісаў аўстрыйскіх палкоў, а рэшта ніжэйшых чыноў, як і афіцэраў, будзе разьмеркавана па другіх часьцях арміі ды флёту, каб акупіць уласнаю крывёю гэту цяжкую віну.

Чэскія палкі на працягу ўсяе кампаніі, асабліва-ж у часе апошніх баёў, неаднакраць паказвалі ненадзейнасьць, у прыватнасьці пры абароне добра падрыхтаваных і даўно ўжо занятых намі позыцый. З прычыны акопнага характара вайны, ворагу звычайна вельмі хутка ўдаецца завязваць зносіны з няўартымі элемэнтамі, і ён пры судзеяньні гэтых здраднікаў накіроўвае свае атакі на вучасткі фронту, занятыя менш пэўнымі войскамі. Ворагу часта ўдаецца надзвычайна хутка і бяз жаднага супраціўленьня завалодваць гэткімі вучасткамі фронту і браць у палон вялікую колькасьць людзей. Ганьба і сорам і пагарда тым нясумленным нягоднікам бяз гонару, якія здраджваюць свайму гасудару і бацькаўшчыне і ганьбяць слаўныя штандары нашай адважнай арміі, а разам і гонар усяе нацыі. Рана ці позна іх напучыць куля ці вяроўка ката. Абавязак кожнага чэха, у якога захавалася пачуцьцё гонару, даносіць сваім бліжэйшым начальнікам пра ўсіх агідных провокатараў і здраднікаў, што знаходзяцца ў іхным асяродзішчы. А хто гэтага ня робіць, той такі-ж падлюка і здраднік!

Загад гэты прачытаць ва ўсіх ротах, экскадронах, батарэях ды экіпажах, а ў чэскіх палкох чытаць двойчы.

Эрцгэрцог Іозэф-Фэрдынанд.

— Крыху пазнавата яны нам гэта прачыталі,—сказаў Швэйк Ванэку.—Я толькі дзіўлюся, што яны прачыталі яго толькі цяпер, калі яго імпэратарская вялікасьць выдаў свой загад яшчэ 17 красавіка. Ды гэта-ж падобна на тое, быццам яны з якіх-небудзь меркаваньняў не хацелі абвясьціць нам гэты загад адразу. Калі-б я быў імпэратарам, я-б не дазволіў, кам мяне

гэтак папіхалі. Калі я 17 красавіка выдаў загад, дык трэба, каб яго 17 красавіка і прачыталі ўсюды, дзе трэба, нават калі-б пачаўся канец сьвету.

У другім канцы вагону, насупраць Ванэка, сядзеў кухар-окультыст з афіцэрскае кухні і штосьці пісаў. Ззаду яго сядзеў дзяншчык паручыка Лукаша, барадаты волат Балун, і прыкамандыраваны да 11 маршавае роты тэлефоніст Хадынскі. Балун чомрыў кавалак чэрствага салдацкага хлеба і спалохана тлумачыў Хадынскаму, што ён, бач, не вінаваты, што ў гэтай сумятні пры пасадцы не патрапіў у штабны вагон да свайго паручыка.

Хадынскі палохаў яго, што на вайне кепскія жарты і што за гэты ўчынак яму належыць куля.

— Ах, вось каб гэтыя пакуты хутчэй скончыліся!— скогліў Балун.

— Аднойчы мне ўжо давялося папрабаваць штосьці падобнае, гэта было ў час паходных манэўраў пад Ваціцамі. Там нам давялося рабіць пераходы ня піўшы, ня еўшы, і калі да нас зьявіўся батальённы ад'ютант, я крыкнуў: «Дайце нам хлеба і вады!» Ён адвярнуўся да мяне і сказаў, што, каб гэта было на пачатку вайны, мне-б давялося выйсьці наперад і ён-бы загадаў мяне расстраляць, але з прычыны таго, што цяпер не вайна, дык ён загадае пасадзіць мяне ў карцар. Але мне вельмі пашанцавала, таму што, калі ён паехаў конна з данясеньнем у штаб, ён скінуўся з каня і скруціў сабе шыю.

Балун глыбока ўздыхнуў і кавалак хлеба засеў у яго горле. Калі ён крышачку ачуняў, ён прагавіта глянуў на дзьве дарожныя торбы паручыка Лукаша, якія яму было загадана сьцерагчы.

— Эх, добрую пайку атрымалі паны афіцэры!—з зайздрасьцю прамовіў ён:—паштэт з пячонкі і вэнгерскую салямі. Вось каб паспытаць кавалачак!

Пры гэтым ён так ласкава паглядаў на дарожныя торбы свайго пана, быццам бяздомны сабачка, галодны, як воўк, што сядзіць перад дзьвярыма кілбаснае, адкуль смачна пахне сьвежаю кілбасою.

— Так, нядрэнна было-б,—згадзіўся Хадынскі,—каб нас дзе-небудзь пачаставалі добрым абедам. Вось, ведаеце, калі нас на пачатку вайны везьлі ў Сэрбію, мы на кожнай станцыі наяда-

ліся як трэба, да адказу. Ах, як нас тады частавалі! З гусіных палаткоў мы вырэзвалі кубікі лепшага мяса і гулялі імі на шокалядных плітках у ваўкі і авечкі.—У Эосэгу ў Кроацыі два члены саюзу вэтэранаў прынесьлі нам у вагон вялікую бляху з смажанымі зайцамі, ну, тут мы ўжо болей ня вытрымалі і вывалілі ім гэтых зайцоў на галовы. Усю дарогу мы нічога іншага не рабілі, як толькі жэрлі ды жэрлі, а пасьля блявалі з вакон. Капрал Мацейка, у нашым вагоне, гэтак набраўся, што мы мусілі палажыць яму на чэрава дошку і скакаць на ёй, і тады толькі яму палягчэла, зьверху і спадыспаду... Калі мы праяжджалі па Вэнгрыі, нам на кожнай станцыі ў вагон кідалі смажаных курэй, і мы з іх елі толькі адны мазгі. У Капошфальве мадзьяры накідалі нам амаль што цэлыя сьвіньня тушы, а аднаму майму таварышу так стукнула ў галаву смажанаю сьвіною мазгаўнёй, што ён пагнаўся за шчодрым ахвяравальнікам, каб адпісажыць яго сваёю папругаю. Затое ў Босьніі нам не давалі больш нават вады, а замест вады, хоць гэта і было забаронена, нас паілі, колькі ўлезе, рознастайнымі гарэлкамі, наліўкамі, ды віном. Помню, на аднэй станцыі, апраненыя ў белае дзяўчаты папрабавалі пачаставаць нас півам, дык мы іх гэтак шуганулі, што яны кінуліся ад нас хто куды.

— Такім чынам,—гаварыў ён далей,—мы ўсю дарогу былі сытыя і п'яныя, так што я нават масьці ў картах не разьбіраў, і не пасьпелі мы ачухацца і дакончыць пульку, як прышоў загад, і нас усіх высадзілі з вагону. Нейкі капрал, я ўжо ня помню, як яго звалі, пачаў крычаць на сваіх людзей, каб яны сьпявалі: «няхай усе сэрбы знаюць, што аўстрыйцы перамагаюць!» Але хтосьці ззаду даў яму нагою штурхаля, і ён бразнуўся на зямлю, пасьля ён пачаў крычаць, каб саставілі стрэльбы ў козлы, і цягнік зараз-жа завярнуў назад і пашоў пусты, але толькі, як бывае заўсёды, выкарыстаўшы сумятню, забраў з сабою ўсё наша харчаваньне на два дні. І вось на такой адлегласьці ад нас, як адсюль да тых дрэў, пачалі разрывацца шрапнэлі. Аднекуль зьявіўся на кані наш батальённы камандзір і склікаў усіх на вайсковы савет, а пасьля зьяўляецца Мачэк, чэх, хлапчына з сажань росту, і гаворыць па-нямецку, што далей ехаць нельга, што шлях папсаваны выбухам і што сэрбы

перайшлі раку і абышлі наш левы флянг, але што гэта яшчэ далёка ад нас. Да нас, як кажуць, паслана падмацаваньне, і мы гэтым сэрбам яшчэ накладзем у карак. І каб ніхто не здаваўся ў палон, калі-б да гэтага дайшло, таму што сэрбы адразаюць у палонных насы і вушы ды выколваюць ім вочы. І што хоць тут у нас па суседзтву і выбухаюць шрапнэлі, але што нам няма чаго непакоіцца, бо гэта проста прыстрэльваецца нашая артылерыя. Раптам дзесьці за гарамі пачулася: та-та-та-та-та-та. І гэта, бач, таксама глупства—гэта прыстрэльваюцца нашыя кулямёты! А пасьля мы пачулі зьлева каманду і залеглі, і над намі праляцелі гранаты і падпалілі станцыю, пачалі пасьвістваць кулькі, і здалёку пачуліся залпы і бразгатня стрэльбаў. Паручык Мачэк загадаў разабраць стрэльбы і заладаваць іх. Тады дзяжурны пашоў да яго і сказаў, што гэта немагчыма, таму што ў нас няма ладункаў, і што вядома, што нам павінны былі выдаць ладункі толькі на наступным этапным пункце, і што цягнік з баявымі прыпасамі ішоў наперад нашага і, мусібыць, трапіў у рукі да сэрбаў. Паручык Мачэк на некалькі хвілін зусім аслупянеў, а пасьля закамандаваў: «Прымкнуць штыкі!», сам ня ведаючы навошта,— проста з адчаю, каб што-небудзь рабіць. Мы яшчэ крыху пастаялі вось гэтак, падрыхтаваныя да бою, а пасьля папаўзьлі ўздоўж чыгункі, таму што вылецеў аэроплян і афіцэры закамандавалі: «За насыпы». Ну, пасьля ўжо, вядома, высьветлілася, што гэта быў наш, калі яго зьбіла нашая-ж артылерыя. Тады мы зноў узьняліся на ногі, хоць і ня было каманды: «Устаць!» З флянгу да нас ляцеў нейкі кавелерыст і яшчэ здалёк крычаў: «Дзе ў вас тут батальённы?» Батальённы выехаў яму насустрач, і той перадаў яму нейкую паперку ды паляцеў направа. Батальённы прачытаў яе яшчэ па дарозе і, як быццам зьехаў з глузду, выхапіў шаблю, кінуўся да нас і зароў на афіцэраў: «Назад назад! Кірунак на лагчыну, перабежка па адным!» І вось тут яно пашло і пашло. З усіх бакоў, быццам гэтага толькі і чакалі, па нас пачалі шпарыць. Па левую руку было кукурузнае поле і там было сапраўднае пекла! Мы на карачках спаўзьлі ў лагчыну, а ранцы так і пакідалі на гэтым праклятым чыгуначным насыпе. Паручыку Мачэку куля трапіла аднекуль з боку проста ў галаву, так што ён і войкнуць не пасьпеў. Перш

чым мы дайшлі да лагчыны, у нас так і валіліся забітыя і параненыя. Іх давялося пакінуць на волю лёсу ды бегчы да самага вечару. Увесь раён быў ужо абчышчан нашымі войскамі і мы засталі там толькі разрабаваны абоз. Нарэшце, мы дабраліся да нейкае станцыі, дзе былі атрыманы новыя загады: садзіцца на цягнік ды ехаць назад у штаб палка. Але мы не маглі гэтага зрабіць, таму што ўвесь штаб трапіў на дзень раней у палон, пра што мы даведаліся толькі на наступную раніцу. Ну, і засталіся мы тады, быццам сіроткі якія, і ніхто не хацеў нас знаць і нас прыкамандыравалі да 73 палка, каб мы накіраваліся з ім у тыл, што нас, самі разумееце, дужа ўзрадавала. Але спачатку нам давялося цэлыя суткі шлёпаць па гразі, пакуль мы знайшлі гэты 73-ці полк. А пасьля...

Ніхто яго ўжо больш ня слухаў, таму што Швэйк і Ванэк гулялі ў шэсьцьдзесяць шэсьць, кухар-акультыст з афіцэрскае кухні пісаў падрабязны ліст жонцы, якая пачала пад час ягонай адсутнасьці выдаваць тэасофскі часопіс, а Балун задрамаў на лаўцы, так што тэлефаністу Хадынскаму нічога не заставалася, як сьціхнуць.

Ён устаў і пачаў паглядаць у карты.

— Хоць-бы ты мне люльку падаў, ці што,—ласкава заўважыў яму Швэйк,—калі ты ўжо нічога ня робіш! Гульня ў шэсьцьдзесят шэсьць—справа пасур'ёзьней, як уся гэтая вайна і ваш няшчасны эпізод на сэрбскай мяжы... Эх, і дурань-жа я! Вось-жа спракудзіўся! Трэба было пачакаць яшчэ хадзіць з караля, і вось цяпер у мяне туз гіне. Эх, дурань я, дурань!

Тымчасам кухар-акультыст дакончыў ліста і яшчэ раз прачытаў яго, як відаць, здаволены, што, помнячы пра вайсковую цэнзуру, так ёмка зладжыў яго.

Дарагая мая жоначка!

Калі ты атрымаеш гэтыя радкі, я буду ўжо некалькі дзён знаходзіцца ў цягніку, таму што мы едзем на фронт. Гэта мяне не асабліва радуе, бо мне тут даводзіцца лынды біць. Афіцэрам зараз асобна не гатуюць, а яду яны атрымліваюць на этапах. Мне дужа хацелася згатаваць нашым паном афіцэрам у час пе-

расэду праз Вэнгрыю гуляш па-сэгедынску, але, нажаль, з гэтага нічога ня вышла. Можа, калі прыедзем у Галіцыю, мне пашэньціць сасмажыць сапраўдны галіцыйскі шолет, г. ё. варанага гуся з ядрыцаю ці рысам. Дай веры, мая дарагая, што я ча ўсю сілу прагну па магчымасьці зрабіць лягчэйшымі паном афіцэрам іхную працу ды клопат. Мяне перавялі в палкє ў маршавы батальён, таму што гэта было маё самае найбольшае жаданьне—абслугоўваць, хай сабе вельмі сьціпла, афіцэрскую кухню на фронце. Помніш, калі мяне ўзялі на прызыў ў дзеючую армію, ты пажадала мне, каб мне патрапіліся добрыя начальнікі? Ну, дык вось тваё жаданьне ажыцьцявілася, і мне ня тое каб на што-небудзь скардзіцца, а, наадварот, усе афіцэры мае сапраўдныя сябры і абаронцы, і асабліва да мяне ставяцца, як родныя бацькі. Пры першай магчымасьці я паведамлю табе нумар нашае палявое пошты»...

Гэты ліст зьявіўся ў выніку асобных абставін. Справа ў тым, што кухар-окультыст страціў зусім прыхільнасьць палкоўніка Шрэдэра, які спачатку рабіў яму даволі вялікую протэкцыю, але пасьля таго, як па ягоным недаглядзе палкоўніку не засталося смажанага мяса на разьвітальным абедзе, дадзеным афіцэрам маршавага батальёну, ён накіраваў бедака-кухара з маршаваю ротаю на фронт, даручыўшы афіцэрскую кухню палка якомусьці мізэрнаму настаўнічку з інстытуту сьляпых у Празе.

Кухар-окультыст яшчэ раз прабег вачыма, што ён напісаў, ліст здаўся яму даволі дыплёматычным, каб утрымаць аўтара падалей ад перадавое лініі, бо, што там ні кажы, і на фронце даводзіцца выкручвацца.

Праўда, калі ён быў яшчэ да прызыву рэдактарам і выдаўцам окультнае часопісы па вывучэньні патагобаковага сьвету, ён напісаў падрабязны артыкул пра беспадстаўнасьць страху сьмерці і артыкул пра перасяленьне душ. Але цяпер была зусім іншая справа!

Ён падышоў бліжэй, каб паглядзець у карты Швэйку і Ванэку. Між гульцоў не было зараз жаданае розьніцы ў чынох. Яны гулялі цяпер утраіх з Хадынскім у прэфэранс.

Ордынарац Швэйк з апошніх слоў лаяў каптэнармуса Ванэка.

— Дзіўлюся,—мармытаў ён,—як гэта вы маглі гэтак па-дурацку захадзіць! Вы-ж бачыце, што ён туляе на рэнонсах. У мяне хрысьцей няма, а вы пашлі не васьмёркаю, а як апошні ідыёт—званковым валетам. Вось, ён і пры сваіх!

— Варта падымаць гэтакі гвалт з-за нейкае паршывае біткі!—пачуўся ветлівы адказ каптэнармуса.—Самі вы гуляеце, як бот! Што-ж загадаеце мне высасаць хрысьценную васьмёрку з пальца ці што? Калі ў мяне зроду ня было хрысьцей, а толькі адны старэйшыя вікі і звонкі. Разумееце, боўдзіла цара нябеснага?

— Тады вам варта было гуляць бяз козыру, разумнік вы гэтакі,—з усьмешкаю абазваўся Швэйк.

— Якраз вось гэткі-ж выпадак быў у тракціры Вальша. Там вось таксама ў гэткага дзівака, як вы, была на руках гульня без казыроў, а ён усё толькі скідаў найбольш дробныя карты і ўсім даваў гуляць распасоўку і паглядзелі-б вы толькі, што ў яго былі за карты! Ад усіх масьцей—усе самыя вышэйшыя! І таксама як мне і зараз ня было рахубы, каб вы гулялі без казыроў, дык мне і тады ня было жаднае карысьці, дый наогул нікому, а кожны раз нам даводзілася плаціць ды плаціць. Нарэшце я яму кажу: «Пане Герольд, будзе ласкавенькі, гуляйце бяз козыру і не валяйце дурня!» А ён пачаў на мяне крычаць, як я наважваюся, ды тое, ды гэта, ды што ён унівэрсытэт скончыў, ды іншае да таго падобнае. Але гэта яму дорага каштавала. Гаспадар быў мой знаёмы, кельнэрша з намі таксама была блізка знаёма, дык вось мы заявілі паліцэйскаму патрулю, што ў нас усё ў парадку і што, па-першае, з яго боку подласьць выклікаць патруль і парушаць грамадзкую цішыню і спакой з тае прычыны, што ён дзесьці перад тракцірам пасьлізнуўся і набіў сабе нос. І, па-другое, што мы яго нават пальцам не кранулі, калі ён змахляваў у картах, і, па-трэцяе, што калі гэта высьветлілася, ён так хутка пакінуў нас, што праз нейкі выпадак лакаціўся на парозе. Гаспадар і кельнерша падцьвердзілі, што мы сапраўды абышліся з ім па-джэнтльмэнску і што лепшага абыходжаньня ён і не заслужыў, бо праседзеў ад сямі гадзін вечару да дванаццаці за адным кубкам піва і бутэлькай содавае вады, а ўдаваў сабе за няведама якога важнага пана, бо ён, бач,

професар унівэрсытэту, хоць у прэфэрансе разуменьне ня больш, як сьвіньня на апельсынах... Ну, каму-ж картаваць?

— Давайце, згуляем у свае казыры,—запрапанаваў кухар-окультыст: па пяць хэлераў вока.

— Расказалі-б нам лепей, — зьвярнуўся да яго каптэнармус,—пра перасяленьне душ. Помніце, вы расказвалі буфэтчыцы ў палкавым буфэце тады, калі разьбілі сабе ўвесь твар.

— Пра перасяленьне душ мне таксама даводзілася чуць,— заўважыў Швэйк.—Некалькі год перад гэтым я раптам надумаўся, як кажуць, падвысіць сваю адукацыю, каб не аставацца ад іншых, і накіраваўся ў чытальню Рамесьніцкае Управы ў Празе, але таму што я быў блага апранены і ў нагавіцах ззаду былі дужаватыя дзіркі, заняцца самаадукацыяй мне не давялося, бо мяне туды ня пусьцілі, а, наадварот, нават вывелі адтуль, таму што падумалі, што я прышоў красьці чыжыя футры. Тады я апрануў свой лепшы гарнітур і пашоў у бібліотэку музэю, дастаў з таварышам кнігу пра перасяленьне душ і прачытаў там, як адзін індыйскі цар пасьля сьмерці зрабіўся сьвіньнёю, а калі закалолі сьвіньню, перакінуўся ў малпу, а пасьля малпы—у сабаку, а з сабакі ў міністра. Пасьля, калі я трапіў на вайсковую службу, я пераканаўся, што ў гэтым павінна быць крыху праўды, таму што кожны, хто-б ён там ні быў, у каго была хоць адна зорачка, лаяў салдатаў або сьвіньнямі, або якою-небудзь іншаю жывёлаю, з чаго вынікае, што ніжэйшыя чыны, тысячу год перад гэтым былі, мусіць, славутнымі палкаводцамі. Але вось, калі пачынаецца вайна, гэткае перасяленьне душ робіцца дужа калаеною штукаю. Чорт яго ведае, колькі пératварэньняў давялося вытрымаць чалавеку, пакуль ён не зрабіўся тэлефаністам, кухарам ці радавым пяхотнага палка! І раптам яго разарве знарадам і яго душа пераселіцца ў артылерыйскую клячу! А ў батарэю, калі яна будзе ўзьяжджаць на якую-небудзь пазыцыю, бахне вялізны чамаданішча і заб'е каня, у якога толькі што перасялілася душа забітага салдата, і гэтай душы адразу-ж давядзецца зноў перасяляцца, скажам у якую-небудзь карову ў абозе, з якое на раніцу будуць варыць гуляш для нашае роты, так што душа ізноў ляціць вон і перасяляецца, прыкладам, у тэлефаніста, а тэлефаніста...

— Мяне дзівіць, што вы якраз мяне выбралі за мішэнь для сваіх няўдалых жартаў,—перапыніў яго, як відаць, пакрыўджаны тэлефоніст Хадынскі.

— Скажэце, ці не сваяк вам адзін Хадынскі ў Празе, уласьнік прыватнага дэтэктыўнага бюро?—нявінна запытаўся Швэйк.—Я вельмі люблю прыватных шпэгаў. За некалькі год перад гэтым я служыў у палку вось з гэткім шпэгам, з якімсьці Штэндлерам. У гэтага тыпа была такая завостраная дагары галава, што наш фэльдфэбель заўжды гаварыў, што яму даводзілася пабачыць за свой век шмат брыдкіх салдацкіх галоў, але гэткае дулі ён яшчэ ня бачыў. «Слухайце, Штэндлер,—казаў ён таму часамі:

— Каб у нас ня было манэўраў, вашая сыпічастая мазгаўня была-б ні да чога, ну, а так, дык хоць, артылерыя здолее прыстрэльвацца па ёй, калі здарыцца патрапіць у гэткую мясцовасьць, дзе не знойдзецца іншае «вытаркліваe» рэчы, апрача вашае дулі». Так, шмат бедаку давялося ад яго пацярпець. Часамі пры маршыроўцы, вышле ён яго, няшчасьніка, на пяцьсот мэтраў наперад, а пасьля закомандуе: «Кірунак—на вострую мазгаўню!» І наогул гэтаму пану Штэндлеру не шанцавала, хоцьбы і ў яго прыватным жыцьці. Часта-густа ён расказваў нам у буфэце, якія пакуты яму даводзілася часамі вытрымліваць. Напрыклад, яму даручылі дазнацца, ці ня трэплецца жонка якоганебудзь кліента з кім-небудзь іншым, і калі трэплецца, дык з кім, дзе і як. Ці, наадварот, рэўнівая жонка хоча канечне даведацца, за кім менавіта валочыцца яе муж, каб закаціць яму дома вялікі скандал. Сам-жа ён быў вельмі адукаваны чалавек, гаварыў пра парушэньне сямейнае вернасьці толькі ў самых вышуканых выразах і заўсёды ледзь ня плакаў, калі расказваў нам, што ўсё гэтыя людзі патрабавалі ад яго, каб ён канечне засьпеў «яго» ці «яе» на месцы злачынства. Іншы можа быць толькі-б радаваўся, калі-б засьпеў якую- небудзь парачку на месцы злачынства, і вочы-б усе свае прагледзеў, але пан Штэндлер на гэта страшэнна абураўся. Ён вельмі інтэлігентна тлумачыў нам, што яму нават проста прыкра глядзець на ўсю гэтую брыдоту. А ў нас сьлінкі цяклі, як у сабакі, калі патрымаць у яго перад носам кавалак варанае вэнгліны, калі ён апісваў нам розныя паставы,

у якіх ён засьцігаў тую ці іншую парачку. Калі нас пакідалі без пабыўкі, ён заўжды маляваў нам абразкі. «Вось у гэтакім выглядзе,—казаў ён—я захапіў паню такую-та з панам такім-та». І адрасы ён нам паведамляў. А сам усё такі сумны. «Вы не дасьцё веры,—панура казаў ён,—якія поўхі мне даводзілася атрымліваць ад абодвых удзельнікаў! І гэта мяне ня так прыгнечвае, як тое, што я браў хабары. На адзін гэтакі выпадак я ніколі не забудуся. Вы сабе толькі ўявеце: ён—у чым маці нарадзіла, яна—таксама, у нумары гасьцініцы і не замкнуліся на ключ. Ах, ідыёты! На ложку яны ня здолелі зьмясьціцца, таму што былі абодва таўстыя, дык яны валтузіліся на дыване, як кацяняты. А дыван той быў увесь атаптаны, пыльны, у недакурках. Калі я увайшоў, абодва ўскочылі і ён стаў перада мною, прыкрываючыся замест фігавага лісьціка рукою, а дама адвярнулася да мяне сьпіною, і на скуры яе быў значны адбітак рысунка дывану і недакурк, што прыліп да яе. «Выбачайце, пане Зэмак,—сказаў я,—я прыватны шпэг Штэндлер з бюро Хадынскага, і мне афіцыйна, па заяве вашае жонкі, даручана засьпець вас на месцы злачынства. А гэтая пані, з якою вы знаходзіцеся ў незаконай сувязі, ёсьць пані Грот». Ніколі ў жыцьці не страчаў я гэтага спакойнага грамадзяніна. «Дазвольце, сказаў ён, як быццам справа датычылася самае звычайнае рэчы,—я зараз апрануся. А віна ва ўсім толькі мая жонка, што сваёю беспадстаўнаю рэўнасьцю штурхнула мяне на гэтую незаконную сувязь і з неўгрунтаванага падазрэньня абражае мяне, свайго мужа, упікамі ды недавер'ем».—«На жаль, гэтая ганьба ня можа больш заставацца таемнаю...»—пачаў я. «Дзе мае споднікі?» спакойна перапыніў ён мяне. «На ложку». Нацягваючы споднікі, ён працягваў свае тлумачэньні. «Што-ж, калі гэтая ганьба ня можа больш заставацца таемнаю, дык давядзецца ўзяць разлуку з ёю».—«Майце на ўвазе, што ад гэтага ганьба ня зьменшыцца». «Што-ж, разлука—гэта наогул, ведаеце, даволі няпрыемная рэч,—гаварыў ён далей, апранаючыся,—і лепей за ўсё бывае, калі жонка ўзброіцца цярплівасьцю і не падае прычыны для грамадзкага скандалу. Нарэшце, рабеце, што вам хочацца, а я пакідаю вас з гэтаю дамаю ўдвох». Тымчасам пані Грот неяк умасьцілася на ложак, а пан Зэмак паціснуў мне руку і пашоў.

Я ўжо больш добра ня помню, што яшчэ расказваў нам пан Штэндлер, але толькі ён вельмі інтэлігентна размаўляў з дамаю, што ляжала на ложку. Напрыклад, ён гаварыў, што шлюб створаны не на тое, каб рабіць усіх шчасьлівымі, і што абавязак кожнага—заглушаць у сямейным жыцьці свае жаданьні ды ачысьціць, апрыстойніць грэшнае цела. «Пры гэтым,—расказваў нам Штэндлер,—я пакрысе пачаў распранацца, і калі ўжо амаль зусім распрануўся і разгарэўся, як алень у расходцы, у пакой раптам увайшоў мой добры знаёмы Стах, таксама прыватны шпэг з бюро Штэрна, якое конкуравала з намі, куды зьвярнуўся па дапамогу пан Грот, каб выкрыць жонку, якая, на яго думку, з кімсьці важдалася. Гэты Стах толькі сказаў: «Ага, пане Штэндлер in flagranti з паняю Грот! Вітаю!—ціхенька зачыніў дзьверы і вышаў. «Ну, цяпер ужо усёроўна,—прамовіла пані Грот,—цяпер вам ужо ня варта апранацца, а каля мяне месца яшчэ хапае! «Ды мне шмат месца і ня трэба, панечка»,—адказаў я, а пасьля у ўжо і сам ня помню, што казаў. Помню толькі, што я сьцьвярджаў, што калі паміж жанатых няма згоды, дык гэта дужа ўплывае на выхаваньне дзяцей. Пасьля ён яшчэ нам расказаў, што пасьля гэтага ён засьпяшаўся, каб як можна хутчэй далажыць пра здарэньне свайму шэфу, пану Хадынокаму, але што ён спачатку надумаўся крыху падмацавацца, а калі зьявіўся ў бюро, дык там ужо заварылася цэлая гісторыя. Справа ў тым, што гэты няшчасны Стах пасьпеў пабыць там па даручэньні свайго шэфа, пана Штэрна, каб паведаміць пана Хадынскага, якія ў яго служачыя ў ягоным дэтэктыўным бюро. Ну, а Хадынскі не надумаўся нічога лепшага, як паслаць па ягоную, Штэндлераву, жонку, каб яна сама разьлічылася за тое, што яго паслалі па службовых абавязках, а ён даў сябе злавіць на месцы злачынства агенту конкурэнта. «І вось, з гэтага часу,—заўсёды упэўняў пан Штэндлер, калі пра гэта пачыналіся размовы,—у мяне галава яшчэ больш завастрылася»... Ну, дык як-жа, гуляем мы па пяці ці па дзесяць хэлераў?

Яны селі за карты.

Цягнік спыніўся на станцыі Візэльбург. Ужо сьцямнела і нікога не выпускалі з вагону.

Калі цягнік рушыўся далей, з аднаго вагону пачуўся гучны

голас, што як быццам мерыўся заглушыць стук і прукат колаў. Нейкі салдат з Бэргрэйхенштэйку, расчуліўшыся, страшным голасам пачаў апяваць ноч, што насоўвалася на вэнгерскую даліну:

Добрай ночы! Добрай ночы!
Хто прыстаў, хай сплюшчыць вочы.
Скончан дзень наш бесклапотны,
Спачывай пасьля паходу...
Аж да раньня сплюшчце вочы.
Добрай ночы! Добрай ночы!

— Заткніся, нягчасны!—крыкнуў хтосьці на сантымэнтальнага сьпевака, які адразу-ж змоўк.

Яго адцягнулі ад вакна.

Але спрытныя рукі не адпачывалі аж да раніцы. Як амаль і ва ўсім цягніку пры сьвеце недагаркаў, так і тут, але толькі пад маленькаю газовачкою, ішла далей гульня ў свае казыры, і кожны раз, калі хто-небудзь прагульваў, Швэйк абвяшчаў, што гэтая самая справядлівая гульня, таму што кожны можа прыкупіць сабе столькі картаў, колькі яму ўздумаецца.

— У гэтай гульні,—сьцьвярджаў Швэйк,—трэба толькі купіць туза і сямёрку, а пасьля іх можна вылажыць. Астатніх картаў дакупляць ня варта. Гэта—рызыка.

— Давайце, вып'ем можа,—запрапанаваў пры ўсеагульнай згодзе Швэйк.

— Сямёрка чырвей,—абвясьціў Швэйк, здымаючы карты. Кожны плаціць пяць хэлераў, і прыкупка чатыры карты. Ану, жвавей, каб справа не стаяла.

На ўсіх тварах адлюстроўвалася такое здавальненьне, як быццам ня было ніякае вайны і людзі ехалі не ў цягніку, што вёз іх на фронт, на крывавую бойню, а сядзелі за столікамі ў якім-небудзь парыскім кафэ.

— Вось не чакаў,—сказаў Швэйк пасьля аднаго розыгрышу,— што атрымаю яшчэ аднаго раза, калі я пашоў з нічым і дакупіў яшчэ чатыры карты. Што-ж вы маглі зрабіць мне з вашым каралём? Я-ж бы яго пабіў ад першага ходу.

І ў той час, калі тут білі каралёў тузамі, дзесьці на фронце каралі білі адзін аднаго сваімі падданымі.

*

У штабным вагоне, дзе сядзелі афіцэры маршавага батальёну, панавала спачатку нязвычайная цішыня. Большасьць афіцэраў паглыбілася ў чытаньне маленькай, у картуновай апраўе, кніжачкі пад назваю «Грахі бацькоў», роман Людвіга Гантхофэра і ўважліва вывучала старонку 161-ю. Батальённы камандзір, капітан Загнэр, стаў каля вакна і трымаў у руках гэткую-ж кніжачку, таксама разгорнутую на 161-й старонцы.

Ён глядзеў на ляндшафт, што прабягаў паўз яго і абмяркоўваў, як-бы яму найлепш растлумачыць, што рабіць паном афіцэрам з гэтаю кнігаю. Уласна кажучы, уся гэтая справа мела сурова конфідэнцыйны характар.

Тымчасам афіцэры пачыналі меркаваць, ці не звар'яцеў канчаткова палкоўнік Шрэдэр. Праўда, ён даўно ўжо быў як быццам крыху крануўшыся, але ўсё-ж такі нельга было чакаць, што гэта здарыцца з ім гэтак раптоўна. Перад адыходам цягніка ён склікаў іх на надзвычайную нараду, абвясьціў ім, што для кожнага з іх падрыхтаваны паасобнік кнігі «Грахі бацькоў» Людвіга Гантхофэра і што ён загадаў адправіць гэтыя кнігі ў канцылярыю батальёна.

— Панове,—сказаў ён з таемным выглядам,—ніколі не забывайцеся старонкі 161-й.

Паглыбіўшыся ў гэтую старонку, афіцэры ўсё-ж не маглі нічога зразумець. На гэтай старонцы нейкая Марта падыходзіла да пісьмовага стала, даставала адтуль нейкую ролю і ў голас спакмячала, што публіка павінна будзе адчуваць спачуваньне да выканаўца гэта ролі. Пасьля, на гэтай-жа старонцы, зьяўляўся яшчэ нейкі Альбэрт, які канечне тужыўся кпіць, але ягоныя кпіны бяз сувязі з папярэднім тэкстам здаваліся гэткімі недарэчнымі, што паручык Лукаш ад злосьці пераграз свой янтарны папяросьнік.

«Стары дарэшты здрэйфіў,—думалі ўсё,—і з ім справа стаіць зусім блага. Цяпер ужо, напэўна, яго прызначаць у Вайсковае міністэрства». Капітан Загнэр адышоў да вакна, злажыўшы, нарэшце, плян свайго маленькага дакладу. У яго ня было асаблівага пэдагогічнага таленту, і таму так доўга і цягнулася, па-

куль ён управіўся з сваім заданьнем—растлумачыць значэньне 161-й старонкі.

— Ну і так, панове,—пачаў ён і паведаміў, што ўчора ўвечары атрымаў ад палкоўніка інструкцыю датычна 161-й старонкі романа Людвіга Гантхофэра «Грахі бацькоў».

— Дык, вось панове,—урачыстым тонам казаў ён далей,—я павінен пазнаёміць вас з сакрэтнаю інструкцыяй з прычыны новай сыстэмы шыфраваньня данясеньняў і загадаў у час баявых дзеяньняў.

Кадэт *) Біглер выцягнуў запісную кніжку і аловак і сказаў поўным службовае старannасьці тонам:

— Я гатоў, пане капітан.

Усе паглядзелі на гэтага дурня, стараннасьць якога, што выяўляў ён ва ўчэбнай камандзе, межавалася з крэтынізмам. Ён пайшоў на вайсковую службу добраахвотнікам і пры першым-жа выпадку заявіў начальніку вучэбнай каманды, калі той знаёміўся з сямейнымі абставінамі вучняў, што яго продкі, уласьне, пісаліся «Бюглер-фон-Лейтхольд» і на іхным гэрбу былі намаляваны буслава крыло і рыбіны хвост.

З таго часу яго называлі па фамільным гэрбе «бусел з рыбіным хвастом». Яго жорстка цьвялілі, і ён раптам зрабіўся ўсім дужа несымпатычны: бо ўсё гэта ніякім чынам нельга было пагадзіць з ганаровым гандлем заечымі ды трусовымі шкуркамі, якім займаўся яго бацька, хоць романтычна настроены захоплены сын шчыра імкнуўся засвоіць усе вайсковыя навукі і вылучаўся ня толькі старannасьцю і веданьнем усяго, што выкладалася на курсах, але і сам ад сабе ўсё больш паглыбляўся ў вывучэньне адмысловых твораў па вайсковым майстэрстве і вайсковай гісторыі, пра якую ён заўсёды пачынаў гаварыць, пакуль яго не перапынялі. Ён задаваўся, што паміж афіцэраў ён на роўнай назе з вышэйшымі чынамі.

---

*) Кадэтамі ў аўстрыйскай арміі называлі маладых асоб, якія мелі па сваёй адукацыі права на малодшы афіцэрскі чын, але афіцыйна яшчэ не прызначаных за афіцэраў. Яны карысталіся некаторымі правамі афіцэраў (насілі афіцэрскую кукарду, маглі наведваць афіцэрскае сабраньне і г. д.) ды выконвалі абавязкі малодшых афіцэраў у родзе. *(Заўв. пер.)*

— Пане кадэт,—адрэзаў капітан Загнэр,—пакуль я не дазволіў вам гаварыць, прашу вас маўчаць, бо вас ніхто ні пра вошта ня пытаўся. З рэшты, вы нязвычайна спрытны на розум чалавек. Я зьбіраюся паведаміць вам сакрэтныя весткі, а вы зьбіраецеся запісаць іх сабе ў кніжку. Вы ведаеце, што, калі вы згубіце гэтую кніжку, вас чакае палявы суд.

У кадэта Біглера была яшчэ адна благая звычка заўсёды тужыцца пераканаць іншых, што ў яго былі самыя найлепшыя намеры.

— Дазвольце далажыць, пане капітан,—адказаў ён,—што нават пры магчымай страце мае запісаное кніжачкі ніхто ня здолее разабраць, што я напісаў, таму што я стэнографую і ніхто ня ўздужае прачытаць мае скарачэньні. Справа ў тым, што я карыстаюся ангельскаю сыстэмаю стэнографаваньня.

Усе з пагардаю паглядзелі на яго, а капітан Загнэр толькі матнуў рукою і загаварыў ізноў:

— Я ўжо гаварыў вам пра новы спосаб шыфраваньня дэпеш падчас баявых дзеяньняў. Вам, можа быць, здавалася незразумелым, чаму я рэкомэндаваў зьвярнуць увагу менавіта на старонку 161-ю роману Людвіга Гантхофэра «Грахі бацькоў», але гэтая старонка, панове, зьяўляецца ключом новага мэтоду шыфраваньня, зацьверджанага загадам генэральнага штабу тэй арміі, у склад якое мы ўваходзім. Як вам вядома, існуе некалькі мэтодаў шыфраваньня важных данясеньняў. Навейшы, якім карыстаемся мы, грунтуецца на сыстэме дадатковых лічбаў. Такім чынам, касуюцца даныя вам на мінулым тыдні ў штабе палка шыфры ды мэтоды іхнага расшыфраваньня.

— Ага, сыстэма эрцгэрцога Альбэрта,—прамармытаў сабе пад нос старанны кадэт Біглер.—Ведаю, ведаю—запазычаная ў Гронфэльда, № 8922/р.

— Гэтая новая сыстэма надзвычай простая,—разьлягаўся па вагоне голас капітана Загнэра.—Я асабіста атрымаў ад пана палкоўніка другую частку романа разам з інструкцыяй. Калі мы, напрыклад, атрымалі-б гэткі загад: «пад вышынёю 228 накіраваць кулямётны агонь лявей», дык, панове, дэпеша чыталася-б гэтак: «Рэч, з, мы, якая, нас, на, бачаць, у, якое, абяцае, якіх, Марце, мы, гэтага, нам, дзякуй, вядома, рэжысэр, канец; мы,

абяцаньне сапраўды, думаю, думка, вельмі, пануе, голас, апошняе». Як бачыце, усё гэта вельмі проста і бяз усякіх лішніх комбінацый. Дэпеша перадаецца па тэлефону са штабу ў батальён. а адтуль па тэлефону-ж у роту. Атрымаўшы такую шыфраваную дэпешу ротны командзір расшыфроўвае яе наступным чынам. Ён бярэ «Грахі бацькоў» і пачынае шукаць зьверху на сумежнай старонцы слова «рэч». Вось, калі ласка, панове. Перш за ўсё слова «рэч» на старонцы 160-й знаходзіцца ў шэрагу слоў на 52-м месцы; значыць, трэба шукаць па наступнай 161-й старонцы 52-ую літару зьверху. Зьвярнеце ўвагу, што гэтая літара «П.» Наступнае слова ў дэпешы «з». На старонцы 160-й яно па ліку 7-е слова, якое адпавядае на старонцы 161-й 7-й літары, г. ё. літары «а». Пасьля ідзе слова «мы», а гэта,—прашу вашае ўвагі, панове!—зьяўляецца 88-м словам, якое адпавядае 88-й літары на наступнай старонцы 161-й, т. ё. літары «д». Такім чынам мы расшыфравалі слова «пад». Мы працягваем нашу працу, пакуль не атрымаецца ўвесь загад: «Пад вышынёю 228 накіраваць кулямётны агонь лявей». Ці-ж ня праўда, панове, дужа дасьціпна і проста, і да ўсяго гэтага не абыдзешся без патрэбнага ключа, г. ё. старонкі 161-й роману Людвіга Гантхофэра «Грахі бацькоў».

Усе моўчкі ўтаропіліся на апрыкрыя старонкі і цяжка ўздыхнулі. З хвіліну панавала поўная цішыня, пакуль кадэт Біглер з уздрытам у голасе ня выгукнуў:

— Езус-Мар'я, пане капітан, маю гонар далажыць тут штосьці ня тое.

І на самай рэчы, тут было штосьці ня тое.

Як ні тужыліся паны афіцэры, але ніхто апрача капітана Загнэра не знаходзіў на старонцы 160-й тых слоў, якім адпавядалі-б на старонцы 161-й літары, што складалі ключ дэпешы.

— Панове,—зьбянтэжана прамовіў капітан Загнэр, пераканаўшыся, што выгук адчаю, які вырваўся ў кадэта Біглера, быў зусім праўдзівы,—што тут здарылася? У маіх «Грахох бацькоў» Гантхофэра гэтыя словы ёсьць, а ў вашых няма?

— Дазвольце, пане капітан,—зноў узьняўся Біглер,—я дазволю сабе зьвярнуць вашую ўвагу, што роман Людвіга Гантхофэра складаецца з дзьвюх частак. Будзьце ласкавы самі ўпэ-

ўніцца—на вокладцы надрукавана: «Роман на дзьве часткі». Ну, дык вось, у нас 1-я частка, а ў вас 2-я частка, і з гэтай прычыны ясна, як дзень, што нашыя 160-я і 161-я старонкі не супадаюць з вашымі. Першае слова расшыфраванае дэпешы атрымліваецца ў вас «пад», а ў нас—«рак»!

Усім цяпер зрабілася зусім зразумела, што Біглер мусіць быў ня зусім такі дурань.

— Я атрымаў другую частку з штабу брыгады,—сказаў капітан Загнэр.—Тут, як відаць, здарылася якоесьці непаразуменьне. Пан палкоўнік выпісаў для вас 1-ю частку. Мусібыць,—гаварыў ён далей, як быццам-бы ўсё было зусім зразумела і ён ужо даўно ўсё ведаў, яшчэ да таго, як пачаў свой даклад пра самы просты мэтод шыфраваньня,—наблыталі яшчэ і ў штабе брыгады. Палку не паведамілі, што трэ' было выпісаць другую частку, вось і завязалася гэтая блытаніна.

Тымчасам Біглер пераможна пазіраў на прысутных і падпаручык Дуб шапянуў паручыку Лукашу, што «бусел з рыбіным хвастом» ёмка такі пад'ехаў на капітане Загнэры.

— Дзіўны выпадак, панове,—зноў пачаў капітан Загнэр, быццам зьбіраючыся пачаць размову, бо вакол яго былі гнімлівая цішыня.—Значыць, і ў канцылярыі брыгады сядзяць разявы.

— Дазвольце заўважыць,—ізноў падняўся няўцішны кадэт Біглер, які захацеў пахваліцца сваімі ведамі,—што паведамленьні на гэтулькі конфідэнцыйнага характару не павінны былі-б праходзіць праз канцылярыю брыгады. Загады, якія датычацца самых сакрэтных спраў арміі, павінны былі-б абвяшчацца сурова конфідэнцыйнымі цыркулярамі толькі дывізыйным ды брыгадным начальнікам. Я ведаю адзін шыфр, які ўжываўся ў часе войнаў за Сардынію і Савойю, у англа-францускай кампаніі пад Севастопалем, у час боксэрскага паўстаньня ў Кітаі і ў апошнюю расійска-японскую вайну. Згодна гэтай сыстэмы...

— Як жа-ж, дужа яна патрэбна нам, вашая сыстэма!—пагардліва і з нездавальненьнем абазваўся капітан Загнэр.—Ва ўсякім выпадку, бязумоўна, што сыстэма, пра якую ішла размова і якую я вам растлумачыў, зьяўляецца ня толькі аднэю з

лепшых, але і, можна сказаць, недасяжнаю. Ёй зусім ня страшны ніякія вымудры контрразьведкі ворага. Хоць разьдзярыся, вораг ня здолее прачытаць наш шыфр. Гэта штосьці зусім новае. Гэты шыфр ня мае прэцэдэнтаў.

Старанны кадэт Біглер многазначна кашлянуў.

— Я дазволю сабе,—сказаў ён,—зьвярнуць вашую ўвагу, пане капітан, на кнігу Кернхофа пра шыфры ў вайсковай справе. Гэтую кнігу кожны можа заказаць у вайскова-тэхнічным выдавецтве. У ёй дакладна апісаны мэтад, пра які я гаварыў вам, пане капітан. Вынаходцам яго зьяўляецца палкоўнік Кірхэр, які служыў пры Наполеоне І у саксонскай арміі. Кніга гэтая называецца «Шыфраваныя дэпэшы Кірхэра». Кожнае слова дэпэшы растлумачваецца ключом, надрукаваным на наступнай староньцы. Гэтая сыстэма была удасканалена паручыкам Флейснэрам у го «Падручніку вайсковае таемнапісі», якія кожны можа купіць у выдавецтве пры вайсковай акадэміі ў Вене. Вось, дазвольце, пане капітан.

Біглер пакапаўся ў сваім чамаданчыку, дастаў кнігу, пра якую гаварыў, і казаў далей.

— Флейснэр дзе нават гэтакі самы прыклад. Вось, проша ўсіх пераканацца. Той-жа самы прыклад, які мы толькі што чулі. Даняседньне: «Пад вышынёю 228 накіраваць кулямётны агонь лявей». Ключ: Людвіг Гантхофэр, «Грахі бацькоў». Частка 2. І вось, проша вас далей. Шыфр: «Рэч з, мы, якая, нас, на, бачыць, у, якое, абзацае, якіх, Марце» і г. д. Якраз тое, што мы когадзе чулі.

Супроць гэтага нельга было пярэчыць. Гэты сапляк, гэты «бусел з рыбіным хвастом» гаварыў праўду.

У штабе арміі хтосьці з паноў афіцэраў надумаўся спрасьціць сабе работу. Ён проста разгарнуў кнігу Флейснэра пра вайсковыя шыфры і—скончана справа.

На працягу ўсіх гэтых размоў можна было заўважыць, што паручнік Лукаш тужыўся перамагчы некае дзіўнае душэўнае хваляваньне. Ён кусаў сабе вусны, хацеў штосьці сказаць, але пасьля пачынаў гаварыць пра што-небудзь іншае.

Ах, ня варта праз гэта так хвалявацца,—прамовіў ён дужа зьбянтэжаны.—Вось калі мы знаходзіліся ў лягеры пад Брукам,

у нас хацелі прыстасаваць цэлы шэраг сыстэм шыфраваньня дэпеш і пакуль мы даедзем да фронту, прыдумаюць яшчэ і новыя. Але мне здаецца, што пад час бою зусім ня будзе часу расшыфроўваць гэткія таемнапісы. Раней, чымся хто-небудзь здолее разабрацца ў шыфраваным данясеньні, паляціць да ўсіх чарцей ня толькі рота ці батальён, але і ўся брыгада. Так што на практыцы гэтае справы не прыстасуеш.

— На практыцы,—неахвотна згадзіўся капітан Загнэр,— прынамсі што датычыць маіх нагляданьняў на сэрбскім тэатры вайны, ні ў кога ня было часу займацца расшыфроўкай. Я ня буду сьцьвярджаць, што шыфры ня маюць значэньня, нават і ў пазыцыйнай вайне, калі войскі стаяць па ўмацаваных пазыцыях і чакаюць моманту. А што шыфры ўвесь час зьмяняюцца, дык гэта таксама праўда.

Капітан Загнэр гатоў быў адступаць па усёй лініі.

— Значную частку вайны, што нашыя штабы на фронце ўсё менш і менш карыстаюцца шыфрамі, трэба шукаць у тым, што нашыя тэлефоны невыстарчальна ўдасканалены і асабліва падчас канонады нявыразна перадаюць асобныя склады. Папросту—у іх нічога нячутно, і такім чынам атрымліваецца непатрэбны хаос. Ну, а хаос ды бязладзьдзе—гэта саме горшае, што можа здарыцца пад час бою, панове,—праракаючы прамовіў ён і змоўк.

— Хутка,—зноў пачаў ён, глянуўшы ў акно,—мы будзем у Рабе. Людзям выдадуць па 150 грам вэнгерскай кілбасы. Мы пастаім там з паўгадзіны.—Ён глянуў на расклад. У 4 гадз. 12 хвілін цягнік адыходзіць. У 3 г. 58 хв. пасадка ў вагоны. Высадка—па-ротна. 11-ая рота выходзіць па разьдзелах да харчовага магазыну № 6. Контролёрам пры раздачы прызначаецца кадэт Біглер.

Усе паглядзелі на Біглера, як быццам хочучы сказаць: «чакай, ня салодка табе будзе, блазнота!».

Але старанны кадэт дастаў ужо з чамаданчыка аркуш паперы і лінейку, разьлінаваў паперу, расьпісаў на ёй маршавыя роты і апытаў начальнікаў часьцей пра колькасьць іхных людзей. Ніхто ня ведаў дакладных лічбаў і ўсе сказалі Біглеру патрэбныя яму весткі па прыблізных запісах у памятных кніжках.

Капітан Загнэр узяўся ад нуды чытаць «Грахі бацькоў» і, калі цягнік спыніўся ў Рабе, загарнуў кнігу і заўважыў:

— А гэты-ж Гантхофэр зусім няблага піша.

Падручнік Лукаш першы выскачыў са штабнага вагону і накіраваўся да таго, дзе знаходзіўся Швэйк.

*

Швэйк і яго таварышы ўжо даўно скончылі рэзацца ў карты, і Балун, дзяншчык паручыка Лукаша, пасыпеў так выгаладавацца, што нават пачаў дакараць сваё начальства і пачаў такую размову, што, ён, бач, цудоўна ведае, як напакоўваюць сабе чэрава афіцэры, і што гэта горай, як за прыгонам, і што раней гэткага бязладзьдзя на вайсковай службе ня было, і што, як расказваў яму дома ягоны дзед, афіцэры ў вайну 66-га году дзялілі ■ сваімі салдатамі і курэй і хлеб. Ён скогліў да таго часу, пакуль Швэйк не палічыў за патрэбнае ўзяць пад абарону вайсковую ўладу сучаснае вайны.

— Ну і малады-ж твой дзед,—ласкава сказаў Швэйк, калі яны ужо пад'яжджалі да Рабу,—калі ён помніць вайну 66-га году. Вось я ведаю аднаго Раноўскага, дык у яго быў дзед, што быў у Італіі яшчэ за Напалеонам 1-м, адслужыў там дванаццаць год і вярнуўся дамоў капралам. Ну і не знаходзіў ён ніякай работы, дык яго узялі да сябе за парабка ягоны сын. Вось паехалі яны аднойчы на працу, вазіць бярвеньні, і было там такое бервяно,—як расказваў той дзед, што парабкаваў у свайго сына,—на два абдымы, так што яго нельга было зрушыць з месца. Тады стары, сказаў: «хай застаецца тут, хто будзе з ім валэндацца!» А лясьнічы, як гэта пачуў, пачаў лаяцца і замахнуўся кіем, каб ён канечне ўзлажыў на воз і гэтае бервяно. Дзед нашага Раноўскага нічога іншага не сказаў, як толькі: «Ты—шчанюк, а я—стары, заслужаны ваяка!» А праз тыдзень прышла павестка, і яму давялося ізноў ісьці ў Італію і заставацца там яшчэ дзесяць год, а дамоў ён напісаў, што ён гэтага лясьнічага, калі вернецца, лузяне сякераю па мазгаўні. І ўжо гэта лясьнічаму пашанцавала так, што ён тымчасам памёр.

Тут у дзьвярах вагону зьявіўся паручык Лукаш.

— Швэйк, падыдзеце адно сюды,—сказаў ён.—Кіньце вашыя дурныя разважаньні ды растлумачце мне лепей адну рэч.

— Так точна, у момант, пане паручык.

Паручык Лукаш павёў Швэйка, кідаючы на яго дужа падазроныя погляды.

Паручык Лукаш пад час дакладу капітана Загнэра, што скончыўся гэткім фіяско, прышоў да некаторых вынікаў дэтэктыўнага парадку, на што не патрабавалася асабліва дасьціпных комбінацый, бо яшчэ да ад'езду Швэйк неяк далажыў яму:

— Пане паручык, у батальёне ёсьць нейкія кніжачкі панам афіцэрам. Я прынёс іх з палковае канцыляры.

З гэтай прычыны паручык Лукаш, калі яны перайшлі другую лінію чыгункі і спыніліся каля няпаленага паравіка, што ўжо цэлы тыдзень чакаў цягніка я баявымі прыпасамі, запытаўся на-прасьцяк:

— Ну, Швэйк, як была справа з тэтымі кнігамі?

— Дык вось дазвольце далажыць, пане паручык, гэта дужа даўгая гісторыя, а вы заўжды гэтак хвалюецеся, калі я вам яшчэ падрабязна расказваю. Вось, як тады, калі вы хацелі даць мне па мордзе, калі вы разарвалі адозву наконт падпіскі на вайсковую пазыку, а я вам пачаў расказваць, што я неяк чытаў у аднэй кнізе, што раней, калі была вайна, людзей прымушалі плаціць з кожнага вакна ну, прыкладам, з кожнага вакна па дваццаць манэт, ці з гусей стольки...

— Гэтак вы ніколі ня скончыце, Швэйк!—сказаў паручык Лукаш, працягваючы допыт і парашыўшы ня згадваць пра справу іх конфідэнцыйных размоў з капітанам Загнэрам, каб тэты абэлтух, гэты Швэйк ізноў не нарабіў якое-небудзь гісторыі.

— Вы ведаеце Гантхофэра?

— А што гэта за ён?—зацікавіўся Швэйк.

— Нямецкі пісьменьнік, дурань, вы гэтакі,—адказаў паручык Лукаш.

— Дальбог, пане паручык,—з пакутніцкім выглядам сказаў Швэйк,—я асабіста ня ведаю ніводнага нямецкага пісьменьніка. Асабіста я ведаў толькі аднаго чэскага пісьменьніка Ладыслава Хаека з Таўсу. Ён быў рэдактар «Сьвету жывёлін», і я неяк прадаў яму звычайнага сабачугу за завадзкога шчаца. Гэта быў

дужа вясёлы і сымпатычны пан. Ён заўсёды прыходзіў у рэсторан і чытаў там уголас свае апавяданьні, такія сумныя, што ўсе сьмяяліся, а сам ён пад час гэтага плакаў і плаціў за ўсіх, хто знаходзіўся ў рэстаране, а мы яму павінны былі сьпяваць:

Горад Таўс! Хто пазалотай
Маляваў твае вароты,
Хто ўвесь век-бы маляваў
Ды дзяўчатак цалаваў—
Дык яму канец няўзнак:
У зямлі ён сьпіць мярцьвяк!

— Вы-ж не ў тэатры, Швэйк! Чаго-ж вы галосіце, як опэрны сьпявак,—спалохана сказаў паручык Лукаш, калі Швэйк дасьпяваў апошнія строфы.

— Ды я-ж вас не пра гэта пытаўся. Я толькі хацеў ведаць, ці заўважылі вы, што кнігі, пра якія вы самі мне дакладвалі, былі творы Гантхофэра? Дык вось, што было з гэтымі кнігамі?—сярдзіта выпаліў ён.

— З тымі, якія я прынёс з палкавое канцылярыі ў батальён? запытаўся Швэйк:—Так точна, пане паручык, яны сапраўды былі напісаны тым панам, пра якога вы запыталі, ці ведаю я яго. Я атрымаў тэлефонограму проста з палкавое канцылярыі. Гэтыя кніжкі трэ' было паслаць у канцылярыю батальёну, але там ужо нікога ня было, нават дзяржурны пашоў, таму што ім хацелася пасядзець у буфэце, бо яны-ж зьбіраліся выяжджаць на фронт і ніхто ня ведае, ці давядзецца яму калі-небудзь пасядзець у буфэце. Дык вось, пане паручык, яны ўсе былі там і пілі, і нідзе ў ніводнай маршавай роце нельга было таксама нікога дазваніцца. Ну, а вы-ж мне загадалі, каб я як ордынарац увесь час быў пры тэлефоне, пакуль да нас не прыкамандыравалі тэлефоніста Хадынскага, дык я сядзеў і чакаў пакуль мяне адменяць. З палкавое канцылярыі лаяліся, што ім нікога нельга дазваніцца і што прышла тэлефанаграма, каб канцылярыя маршавага батальёну прыняла з палкавое канцылярыі нейкія кніжкі для паноў афіцэраў усяго маршавага батальёну. А як мне вядома, пане паручык, што на вайне трэба дзейнічаць хутка, дык я адказаў, што я сам зьяўлюся па гэтыя кнігі і занясу іх у батальённую канцылярыю. Мне навалілі такую гару кніжак, што я ледзьве дацягнуў іх да

нас. Калі я разглядзеў іх, дык адразу падумаў, каб гэта чаго ня здарылася! Справа ў тым, што палкавы фэльдфэбэль у палкавой канцылярыі сказаў мне, што мяркуючы па тэлефонограме з палка, у батальёне ўжо будуць ведаць, я к і я ім кнігі браць, менавіта—я к у ю ч а с т к у, таму што гэтыя кнігі былі ў д з ь в ю х ч а с т к а х і кожная частка сама па сабе: першая частка асобна, другая частка асобна. Ніколі ў жыцьці я яшчэ гэтак не сьмяяўся, таму што я ўжо шмат чытаў кніжак, але яшчэ ніколі не пачынаў адразу з другое часткі. А фэльдфэбэль мне яшчэ раз кажа: «Вось вам першая частка і вось вам другая. А я к у ю частку павінны чытаць паны афіцэры, гэта яны ўжо і самі ведаюць». Ну, я тады падумаў, што гэта ён, мусіць, сп'яну так гаворыць, таму што кнігу трэба чытаць спачатку, асабліва-ж гэтакі роман, які я прынёс, пра прахі бацькоў. Бо я таксама-ж разумею па-нямецку і ведаю, што трэба пачынаць з першае часткі, таму што мы не якія-небудзь кітайцы, каб чытаць ззаду наперад. Таму вось, пане паручык, калі вы вярнуліся з казіно я і далажыў вам па тэлефону, ці не пачалася ў вайсковай службе новая мода чытаць кнігі шыварат навыварат—спачатку другую, а пасьля першую частку. А вы мне яшчэ былі ласкавы адказаць, што я, мусібыць, п'яны, калі я нават ня ведаю, што ў маліцьве спачатку гаворыцца: «ойча наш», а пасьля ўжо «амін»!.. Што з вамі, пане паручык? Вам блага?

Зьбялелы, як палатно, паручык Лукаш схапіўся за падножку паравіка. На яго твары ня было аднак гневу. На ім адбіваліся адчай ды безнадзейнасьць.

— Кажэце, кажэце, Швэйк... усёадно... я ўжо як-небудзь...

— Вось я і кажу,—зноў пачуўся на закінутай лініі мяккі Швэйкаў голас, што я і сам трымаўся гэтага-ж пагляду.

Неяк аднойчы я купіў сабе такі страшны роман нейкага вэнгерскага пісьменьніка, і ў гэтым романе нехапала ўсяе першае часткі, дык мне давялося самому прыдумаць пачатак, бо нават і ў гэтакай гісторыі пра розных душагубаў не абыйсьціся бяз першае часткі. Мне было зразумела, што, уласна кажучы, зусім ні да чога, каб нашы афіцэры пачалі перш чытаць другую частку, а пасьля яе—першую, і якая дурната была-б, калі-б я перадаў у батальён тое, што мне сказалі ў палкавой канцылярыі, быццам

паны афіцэры самі ведаюць, я к у ю частку ім трэба чытаць. Наогул, пане паручык, уся гэтая гісторыя з кнігамі здалася мне страшэнна таемнаю і сьмешнаю. Я-ж ведаю, што паны афіцэры наогул мала чытаюць, а пад час бою...

— Пакіньце вярэьці нісянешніцу, Швэйк,—прастагнаў паручык Лукаш.

— Дык я-ж вас адразу запытаў па тэлефону, пане паручык, ці жадаеце вы атрымаць абедзьве часткі, і вы мне адказалі, як і зараз, каб я пакінуў вярэьці нісянешніцу, таму што каму-ж упадзе на думку цягнуць за сабою кнігі. Ну, я і падумаў, што калі такі ваш погляд, дык так мяркуюць і іншыя паны афіцэры. Я нават яшчэ і нашага Ванэка пытаўся, які сам ёсьць чалавек спрактыкаваны і пабыў на фронце. Ён мне растлумачыў, што спачатку ўсе паны афіцэры думалі, што гэтая вайна так сабе—глупства і вазілі з сабою ў паход цэлыя бібліотэкі, быццам на летніцу. Ім нават даравалі цэлыя зборы твораў розных пісьменьнікаў, каб ня нудзіліся ў паходзе, так што дзяншчыкі жываты падрывалі і клялі свой лёс. Ванэк кажа, што гэтыя кнігі зусім ня вартыя былі на раскурку, ні на вошта іншае, бо былі надрукаваны на раскошнай таўстой паперы. Чытаць іх ня было часу, таму што ўвесь час даводзілася хутка адступаць, ну іх і пакідалі к ліху. А пасьля гэта зрабілася звычкаю, каб дзяншчыкі, як толькі пачнецца канонада, зараз-жа выкідалі ўсю літаратуру. Пасьля ўсяго, што мне давялося пачуць, я захацеў яшчэ раз даведацца пра ваш погляд, пане паручык, і калі я вас запытаў, што зрабіць з гэтымі кнігамі, дык вы былі ласкавы адказаць, што калі ўжо што-небудзь узбрыдзе ў маю дурную галавешку, дык я ўжо не адчаплюся, пакуль не зраблю як належыць па мордзе. Дык вось, пане паручык, я прынёс ў батальён толькі п е р ш у ю частку, а другая частка засталася ў палкавым складзе. У мяне быў такі разьлік, каб пасьля таго, як паны афіцэры прачытаюць першую частку, ім выдалі і другую, зусім як ў бібліотэцы. Але раптам прышоў загад ехаць і тэлефонограма па батальёне, каб усё непатрэбнае здаць у палкавую канцылярыю. Дык я нават пытаўся пана Ванэка, ці лічыць ён гэтую другую частку чымсьці непатрэбным, ці не, а ён мне сказаў, што пасьля сумнае спробы ў Сэрбіі, Галіцыі ды Вэнгрыі ніякае літаратуры на фронт ня

возяць і што адзіна прыемная рэч—гэта вялікія скрынкі ў тарадох, куды кідаюць прачытаныя газэты для адсылкі ў армію, таму што ў газэты добра закручваць тытун ці сена, якое салдаты кураць у акопах. Першую частку гэтага роману мы ўжо разьмеркавалі на батальён, а другую, значыцца, занесьлі ў палкавы склад.

Швэйк змоўк, але зараз-жа зноў дадаў:

— А там, на складзе, пане паручык, дазвольце далажыць ёсьць розныя дужа добрыя рэчы, і нават цыліндр будвэйскага кантара, які зьявіўся ў ім на комісію і...

— Паслухайце, Швэйк, што я вам скажу,—глыбока ўздыхнуўшы, перапыніў яго паручык Лукаш.—Вы зусім не аддаеце сабе справаздачы пра вынікі вашага ўчынку. Мне ўжо самому да д'ябла апрыкрыла называць вас ідыётам. Вашай бязьмежнай дурасьці наогул няма імені, і калі, я вас заву ідыётам, дык гэта яшчэ ласкавае слоўца. Вы начвірылі чагосьці такога, што ўсё вашы жахлівыя злачынствы, у якіх вы былі вінаваты за той час, калі я знаёмы з вамі, здаюцца ў параўнаньні з гэтым музыкай анёлаў. Ах, Швэйк, калі-б вы ведалі, што вы нарабілі!.. Але вы ніколі не даведаецеся! Калі, можа быць, зойдзе гутарка пра гэтыя кнігі, дык сьцеражы вас божа боўтнуць, быццам-бы я загадаў вам па тэлефону ўзяць першую частку... А калі часам пачнецца размова пра першую і другую частку, дык вы проста не зварочвайце ўвагі. Вы, маўляў, нічога знаць ня знаеце і ведаць ня ведаеце і нічога ня помніце, а то вы мяне ўблытаеце ў якуюнебудзь гісторыю... Разумееце?..

Паручык Лукаш гаварыў такім голасам, быццам яго калаціла трасца. Швэйк выкарыстаў момант, калі той змоўк, і з нявінным выглядам сказаў:

— Вось, пане паручык, выбачайце, дазвольце запытаць, чаму я ніколі не даведаюся, чаго я такога страшнага нарабіў. Гэта я, пане паручык, толькі да таго дазволіў сабе запытаць, каб другога разу ўнікнуць гэткае гісторыі, бо-ж наогул гаворыцца, што чалавек вучыцца на сваіх памылках, ды гэта здарылася і з ліцейшчыкам Адамэкам на заводзе Данэка, калі ён памылкаю выпіў саляное кіслаты...

Ён не дагаварыў да канца, бо паручык Лукаш перарваў ягоны прыклад словамі:

— Вы—ідыёт! Разумееце? Тлумачыць я вам нічога ня буду. Лезьце назад у вагон і скажэце Балуну, каб ён мне прынёс у штабны вагон яшчэ да Будапешту францускую булку і ліверны паштэт, што ляжыць у мяне ў чамадане загорнуты ў станіёлевую паперу. А пасьля скажэце Ванэку, што ён асёл! Тры разы я ад яго патрабаваў, каб ён даў мне дакладныя лічбы пра колькасьць людзей у батальёне, а калі сёньня мне гэтыя лічбы былі патрэбны, дык вышла, што гэта старыя даныя з мінулага тыдню.

— Так точна, слухаю, пане паручык!—раўнуў Швэйк і павольна накіраваўся да свайго вагону.

Паручык Лукаш, пахаджваючы ўзад і ўперад па чыгунцы, падумаў:

— Вось трэ' было-ж надаваць гэтаму ёлупу, як сьлед, па мордзе, а я замест гэтага размаўляю з ім, як з таварышам!

Швэйк з сур'ёзным выглядам палез у вагон. Ён адчуваў павагу да самога сябе, таму што ня кожны дзень даводзіцца нарабіць такіх жахаў, што нават ніколі не даведаешся, у чым справа.

*

— Пане каптэнармус,—сказаў Швэйк, сядаючы на сваё месца.

— Пан паручык Лукаш сёньня як быццам у дужа добрым гуморы. Ён загадаў мне пераказаць вам, што вы асёл, таму што ён ужо тройчы загадваў вам даць дакладныя весткі пра склад людзей у батальёне.

— Ах, д'ябал!—узгарэў Ванэк.—Гэта я ўжо прытадаю камандзірам разьдзелу. Ці-ж вінен я, што кожны брадзяга камандзір разьдзелу робіць што яму ў галаву ўзбрыдзе і не дае мне ніякіх вестак пра свой разьдзел? Што-ж мне гэтыя «дакладныя весткі» з пальца высмоктваць, ці што? Ну і парадак у нашай роце! Другога такога, апрача як у нас у 11-й, і ня знойдзеш! Але-ж я так і ведаў, так і адчуваў! Я ні аднэй хвіліны не сумняваўся, што ў нас будзе хаос. То нехапае чатырох дзялянак, то выстаецца тры... Калі-б гэтыя абармоты зрабілі ласку хоць да-

кладваць, што вось столькі-та людзей адбыло ў шпіталь! Вось яшчэ і мінулым месяцы ў мяне ў сьпісах лічыцца нейкі Нікодэм, і толькі выдаючы пэнсію я даведаўся, што гэты Нікодэм памёр ад раптоўных сухотаў у Будвэйскім шпіталі. А за яго-ж увесь час хтосьці браў пайку! І абмундыраваньне за яго атрымалі, і бог яго ведае, дзе яно падзелася. А пан паручык мне яшчэ загадвае, пераказаць, што я—асёл, калі ён ня можа падтрымаць парадак у сваёй роце.

Каптэнармус Ванэк узбуджана захадзіў узад і ўперад па вагоне.

— Вось каб я быў ротны камандзір. Тады-б усё ішло, як па масьле. Кожны ніжэйшы чын у мяне быў-бы на воку. Унтэрафіцэры павінны былі-б падаваць мне рапорты двойчы на дзень. Ну, а што-ж зробіш, калі унтэр-афіцэрскі склад нікуды ня варт! Горш ад усіх у нас гэты камандзір разьдзелу Жыка. Заўжды тужыцца кпіць, заўжды расказвае анэкдоты, але калі я яму кажу, што Каварчык з яго разьдзелу пераведзены ў абоз, дык ён мне назаўтра падае рапорцічку на тую-ж колькасьць людзей, як, быццам, Каварчык усё яшчэ лічыцца ў роце і ломіць гультая ў ягоным разьдзеле. Дык вось, калі гэткія справы робяцца дзень у дзень, а пасьля мне яшчэ гавораць, што я асёл, дык пан паручык ня прыдбае сабе сяброў! Ротны каптэнармус—гэта вам не які-небудзь яфрэйтар, з якога кожны можа зьдзеквацца, як захоча!

Балун, які слухаў з разяўленым ротам, падмацаваў Ванэкаву думку моцным слоўцам, якога той сам не адважыўся сказаць.

— Эй, вы там, памаўчалі-б!—злосна крыкнуў каптэнармус.

— Слухай, Балун,—зьвярнуўся да яго Швэйк,—табе я павінен пераказаць, каб ты прынёс пану паручыку яшчэ да таго, як мы прыедзем у Будапешт, булку і ліверны паштэт, што ляжыць у пана паручыка ў чамадане загорнуты ў станіёленую паперу.

Болат Балун у адчаі зьвесіў даўгія, як у гарылы, рукі, увесь згорбіўся ды так і застыў ў гэтакім становішчы.

— Іх у мяне ўжо больш няма,—сказаў ён вялым голасам, утаропіўся на брудную падлогу вагона.

— Няма іх у мяне,—парыўна паўтарыў ён,—я... думаў... я іх толькі разгарнуў перад ад'ездам... толькі хацеў панюхаць ці

не сапсаваліся яны... Ну, а пасьля і паспытаў!—дакончыў ён з такім шчырым адчаем, што ўсё зрабілася зразумела.

— Ды вы іх проста зжэрлі разам са станіёлеваю папераю,— сказаў каптэнармус Ванэк і спыніўся перад Балунам, радуючыся, што яму больш ня трэ' будзе даводзіць, што не адзін ён асёл, як мусібыць, думаў паручык, і што прычына ўсіх гэтых непаладкаў хаваецца ў якойсьці іншай галіне. Размова перайшла на Балуна, які аб'еўся, і на ўсё трагічныя вынікі ягонага ўчынку.

Ванэку дужа хацелася прачытаць Балуну суровую і няпрыемную мораль, але яго папярэдзіў кухар-окультыст Юрайда, які адлажыў у бок сваю улюбёную кнігу, пераклад старажытных індыйскіх параміт, і зьвярнуўся да зьбянтэжанага Балуна, што яшчэ больш згорбіўся пад ударамі лёсу.

— Вам варта было-б, Балун, самому наглядаць за сабою, каб ня страціць пэўнасьці да самаго сябе, а таксама і да лёсу. Вам ня трэ' было-б прыпісваць сабе тое, што зьяўляецца заслугаю іншых. І кожны раз, калі вам давядзецца стаяць перад гэтакай праблемаю, калі вы нешта зжэрлі, заўсёды пытайцеся сябе: «У якіх суадносінах знаходзіцца ліверны паштэт са мною?»

Швэйку здалося мэтазгодным дапоўніць гэтае меркаваньне практычным прыкладам.

— Вось ты мне гэтымі днямі сам расказваў, Балун, што ў вас будуць калоць сьвіньню і адразу-ж, калі мы прыедзем на месца і ты паведаміш нумар палявое пошты, табе пашлюць вэнджаную шынку. А цяпер уяві сабе, што гэтую шынку пашлюць на адрас роты, і вось мы разам з панам каптэнармусам адрэжам сабе кожны па кавалачку, вэнгліна нам упадабаецца і мы адрэжам яшчэ па кавалачку, пакуль з шынкаю ня здарыцца тая-ж гісторыя, як з адным маім знаёмым лістаносцам, прозьвішча яго—Коцль. У яго быў костаед, дык яму сьпярша адрэзалі нагу па шчыкалатку, пасьля па калена, пасьля па сьцягно, і каб ён ў часе не памёр, дык яго-б увесь час і стругалі, як зломаны аловак.

Ну, дык вось, уяві сабе, Балун, што мы зжэрлі-б тваю вэнгліну такім-жа парадкам, як ты зжор у пана паручыка ягоны ліверны паштэт.

Волат Балун сумнымі вочыма глянуў на яго.

— Толькі дзякуючы маёй абароне,—сказаў Балуну каптэнармус,—вы засталіся за дзяншчыка ў пана паручыка, бо вас хацелі прызначыць у санітарны атрад і вам-бы давялося пад кулямі цягаць параненых. Пад Дуклаю нашыя санітары тройчы хадзілі па аднаго параненага прапаршчыка, які перад самымі загарожамі калючага дроту быў паранены куляю ў жывот, і ўсе яны засталіся з прастрэленымі галовамі. Толькі чацьвертай пары пашанцавала яго вынесьці але перш чым яны дайшлі да перавязачнага пункту, прапаршчык памёр.

Балун ня мог болей утрымацца і голасна хліпнуў.

— Як табе ня сорамна!—пагардліва прамовіў Швэйк,—а яшчэ хочаш быць салдатам.

— А што-ж я магу зрабіць,—заскаголіў Балун,—калі я ня створаны для вайны! Ну, па праўдзе-ж, я ніяк не магу пад'есьці як трэба, таму што мяне адарвалі ад майго рэгулярнага жыцьця. Гэта ўжо ў нас на раду напісана. Мой нябожчык бацька неяк у тракціры ў Працівіне пабіўся аб заклад, што ён за адзін раз зьесьць трыццаць кілбас і дзьве буханкі хлеба, і выйграў заклад. Я таксама зьеў аднойчы на заклад чатыры гусакі і дзьве міскі клёцак і капусты. Дома я, калісьці, успомню пасьля абеду, што трэба яшчэ чаго-небудзь зьесьці на вячэру, пайду ў кладоўку, адрэжу сабе кавалачак мяса, пашлю па кубачак піўка і няўзнак зьем два кілё кілбаскі ці вэнглінкі. Дома ў нас быў стары парабак Вамела, які заўсёды гаварыў, каб я не задаваўся і не напакоўваў сабе чэрава, і што ён помніць, як яму расказваў ягоны дзед пра гэткага-ж пражэру і хціўца, і як тады пасьля аднае вайны цэлых восем год быў неўраджай, так што хлеб пяклі з ільняное мякіны і што лічылі за сьвята, калі шанцавала здабыць хоць крышачку тварагу, бо хлеба зусім ня было, і што гэты селянін, калі пачаўся голад, за адзін тыдзень памёр, таму што ягоны жывот быў ня звучаны да гэткага галадаваньня... Але я мяркую, што наш бог карае людзей і ўсё-ж не пакідае іх,—закончыў Балун, падымаючы дагары свой засмучаны твар.

— Пан-бог стварыў пражэр і пан-бог пра іх паклапоціцца,— заўважыў Швэйк.

Аднойчы цябе ўжо прывязалі, а цяпер ты-б хацеў схадайнічаць сабе, каб цябе паслалі ў перадавыя акопы. Калі я быў за дзяншчыка ў пана паручыка, ён ва ўсім мог спадзявацца на мяне, і яму нават і ў думкі ня прыходзіла, каб я пачаў падглядаць ягоныя запасы. Калі ён атрымліваў што-небудзь асаблівае, ён заўжды гаварыў: «Пакіньце гэта сабе, Швэйк», ці: «Ну, што-ж, гэта мяне мала цікавіць. Дайце мне кавалачак паспытаць, а з рэшткаю рабеце, што хочаце!» А калі мы былі ў Празе і ён часамі пасылаў мяне на абед у рэсторан, дык я, каб ён не падумаў, што я яму прыношу маленькую дзялянку, таму што, я сам зьеў палавіну дарогаю,—дык я сам купляў на свае апошнія грошы яшчэ адну дзялянку, калі яна мне здавалася задужа маленькаю, каб пан паручык ня быў галодны і ня думаў пра мяне нічога благога. Нарэшце ён гэта заўважыў. Я заўсёды павінен быў прыносіць яму з рэсторану карту патраў і ён заказваў па ёй. Вось аднойчы ён заказаў фаршыраванага голуба. Калі мне далі палавіну голуба я надумаў, што пан паручык можа падумаць, што я зжэр другую палавіну, і купіў яму за свае грошы яшчэ адну дзялянку і прынёс гэткую раскошную страву, што пан паручык Шэба, які хацеў у той дзень навесьці экономію і якраз перад самым абедам прышоў у госьці да майго пана, таксама пад'еў як трэба. Але калі ён пад'еў, дык і кажа: «Не, ты ўжо мяне не упэўняй, што гэта адна дзялянка. Ва ўсім сьвеце ты не атрымаеш на адну дзялянку a la carte цэлага фаршыраванага голуба. Калі мне сёньня пашанцуе дастаць грошай, я пашлю ў твой рэсторан па абед Лепей ужо скажы проста, што гэта была дубальтовая дзялянка». Тады пан паручык загадаў мне ў ягонай прысутнасьці пацьвердзіць, што ён мне даваў грошы толькі на адну дзялянку, бо ён нават і ня ведаў, што ў яго будзе госьць. Я пацьвердзіў, што ён даваў мне грошы толькі на адну дзялянку. «Ну, вось бачыш!—сказаў мой паручык.— Але гэта яшчэ што! А вось гэтымі днямі Швэйк прынёс мне на абед цэлых два гусіных палаткі! Ты толькі ўяві сабе: крупнік з вэрмішэлем, бэф-булыі з пікантным сосам, два гусіных палаткі, цэлую гару клёцак і капусты і пончкі!»

— Тц-тц-тц... ліха на вас!—прыцмокунуў Балун.

— Вось тут і была лісіца закопана,—гаварыў далей

Швэйк.—Пан паручык Шэба сапраўды паслаў свайго дзяншчыка назаўтра па абед у наш рэсторан, і той яму прынёс на другую тэткую маленькую кучку пілаву з курыцы, быццам шасьцімесячны дзіцёнак нарабіў у пялюшкі—ну, так дзьве маленькіх лыжачкі. Ну, пан паручык Шэба на яго і наваліўся, быццам ён зьеў палавіну, а той прысягаецца, што не вінават, а пан паручык Шэба як дасьць яму ў морду ды выстаўляе мяне за прыклад. Вось, кажа, гэта дзяляңкі, дык дзяляңкі, што прыносіць паручыку Лукашу ягоны дзяншчык! Тады задарма набіты салдат назаўтра, калі яго паслалі па абед у рэсторан, пра ўсё распытаўся і далажыў пасьля свайму пану, а той у сваю чаргу паведаміў майго пана. Вось сяджу я ўвечары пры газэце і чытаю сабе ціхенька паведамленьні штабу галоўнакамандуючых варожых армій, як раптам уваходзіць мой паручык белы-белы, і проста да мяне, і каб я яму зараз-жа сказаў, колькі гэткіх дубальтовых дзяляңак я пераплаціў у рэсторане, і што ён даўно ўжо ведае, што я ідыёт, але што я вар'ят, гэта яму і думак ня трывожыла, і што я яму ўчыніў такую няпрыемнасьць, што яму хочацца застрэліць спачатку мяне, а пасьля і сябе. «Пане паручык,—сказаў я яму,—калі вы ўзялі мяне да сябе, вы адразу-ж з месца наўзавадкі заявілі, што на ваш погляд кожны дзяншчык злодзей і нягоднік. Калі-б я атрымліваў у рэсторане такія маленькія дзяляңкі на другую страву, вы, напэўна, падумалі-б, што я і на справе належу да гэткіх нягоднікаў, і што я аб'ядаю вас»...

— Ах, ты мой божа!—прашаптаў Балун, нагнуўся на чамадан паручыка Лукаша і адышоў з ім у бок.

— Тады паручык Лукаш пачаў шукаць у сябе па ўсіх кішэнях. З тэй прычыны, што гэта было дарэмна, палез у жылетны кішэнь і даў мне свой срэбраны гадзіньнік—гэтак ён расчуліўся! «Пакуль я атрымаю пэнсію, Швэйк,—сказаў ён,—вы мне ўсё напішаце і падлічаце, колькі я вам запазычыўся... А гадзіньнік вы пакіньце сабе на прыдачу... На другі раз сьцеражэцеся быць гэтакім вар'ятам!» А пасьля ў нас аднойчы надышоў гэткі крытычны момант, што мне давялося зацягнуць гадзіньнік у лёмбард...

— Што вы там робіце, Балун?—запытаўся ў тэтую хвіліну каптэнармус.

Замест адказу, няшчасны Балун закашляўся. Справа ў тым, што ён адчыніў чамадан паручыка Лукаша і даядаў яго апошнюю булку....

*

Праз станцыю прайшоў, ня спыняючыся, другі воінскі цягнік, да адказу напакаваны дэйчмэйстэрамі, якіх пасылалі на сэрбскі фронт. Яны знаходзіліся яшчэ пад уражаньнем узьнесьлых провадаў у Вене і ад самае Вены да гэтага часу не пакідалі гарлапаніць:

Наш шляхотны прынц Аўген
Імпэратару хацеў .
Цытадэль Белград вярнуць.
Загадаў мост збудаваць,
Каб у горад прапусьціць
Разам войска і гарматы.

Якісьці капрал з ёмка закручанымі дагары вусамі, усьпіраючыся локцем на салдатаў, якія сядзелі ў дзьверах вагонаў, зьвесіўшы ногі на двор, высоўваўся наперад, размахваў у такт рукамі і на ўсё горла роў:

Збудавалі мост цудоўны
Для абозу й для гарматаў—
Пераправу праз Дунай.
Каля гораду Зэмліну
Мы разьбілі моцны лягер,
Усіх сэрбаў выгнаць вон...

У гэты момант ён страціў роўнавагу, вылецеў з вагону і з усяго размаху напароўся жыватом на падважнік чыгуначнае стрэлкі, на якім і застаўся тырчэць, як жук на іголцы, у той час, як цягнік паімчаўся далей, а ў апошніх вагонах пачалі новую песьню:

Граф Радэцкі добра біўся,
Прагнаць ворагаў маніўся
Ён з Лёмбардыі вясной.
Мы ў Вэроне шмат чакалі...
Падмацоўку нам прыслалі,
Пачаў двейнічаць герой...

Пранізаны нейкім дурацкім падважнікам стрэлкі, ваяўнічы капрал быў ужо мёртвы. Неўзабаве каля я го на варце стаў нейкі маладзенькі салдацік, з станцыйнай аховы. З прымкнутым да стрэльбы штыхам, ён стаяў, выцягнуўшыся каля стрэлкі, з такім пераможным выглядам, як быццам трагічная сьмерць капрала на стрэлцы была справаю ягоных рук.

З тэй прычыны, што быў ён мадзьяр, ён пачаў крычаць на ўсё горла, калі людзі 91 палка з маршавага батальёну захацелі глянуць на мерцывяка.

— Не падыходзіць! Нельга! Начальства не дазволіла!

— Гэты, прынамсі, ужо ўсё адпакутваў,—заўважыў удалы ваяка Швэйк, які таксама, вядома, быў паміж цікаўных,—і гэта мае сваю выгаду, таму што калі чалавек атрымаў сваю дзялянку жалеза ў жывот, дык, прынамсі, усе ведаюць, дзе яго пахавалі. Добра, што гэта здарылася пры самай станцыі і што не давядзецца шукаць ягоную магілу на ўсіх тэатрах вайны.

— Ён дужа акуратна ўзьбіўся,—дадаў Швэйк з выглядам знаўцы, абглядзеўшы мёртвага капрала яшчэ і з другога боку.— У яго ўсё кішкі засталіся ў нагавіцах.

— Нельга, не падыходзь!—крыкнуў малады мадзьярскі салдацік.—Начальства не дазволіла.

Раптам за Швэйкам пачуўся суровы голас.

Швэйк узяў пад казырок. Перад ім стаяў кадэт Біглер.

— Так точна, пане кадэт, мы глядзім нябожчыка.

— Ды якую вы тут разводзіце агітацыю? Якая вам да ўсяго гэтага справа?

— Нікак нет, пане кадэт,—з адчуваньнем уласнай годнасьці адказаў Швэйк,—я нідзе не вяду ніякае агітацыі.

Ззаду-ж некалькі салдатаў засьмяяліся і наперад вышаў каптэнармус Ванэк.

— Пане кадэт, — сказаў ён, — пан паручык Лукаш паслаў сюды ордынарца Швэйка, каб той яго паведаміў, што тут здарылася. Я толькі што быў у штабным вагоне і чуў, што батальённы ордынарац Матушыч шукае вас згодна загаду батальённага камандзіра, каб вы зараз-жа зьявіліся да пана капітана.

Неўзабаве пасьля гэтага быў дан сыгнал на пасадку ў вагоны і ўсё вярнуліся на свае месцы.

— Калі дзе-небудзь зьбярэцца некалькі чалавек,—сказаў Ванэк, ідучы побач з Швэйкам—дык вы кіньце свае дурныя разважаньні, Швэйк, бо вам будуць адны толькі няпрыемнасьці. Капрал-жа ж з дэчмэйстараў, а з гэтай прычыны льга было вытлумачыць вашыя словы так, як быццам-бы вы радаваліся ягонай сьмерці. Гэты Біглер—страшэнны чэхаед.

— Ды я-ж нічога не казаў,—адказаў Швэйк тонам, што выключаў усякія падазрэньні,—апрача таго капрал гэтак акуратна ўзьбіўся, што нават кішкі засталіся ў нагавіцах. А ён-жа мог бы...

— А пакіньце вы, нарэшце гаварыць пра гэта, Швэйк! І капітэнармус Нанэк нават сплюнуў.

— Гэта-ж усё адно,—дадаў яшчэ Швэйк,—ці тут у яго будуць выпушчаны кішкі на славу яго імпэратарскае вялікасьці, ці там. Ці так ці гэтак ён выканаў свой абавязак. А ён-жа мог-бы...

— Паглядзеце адно, Швэйк,—перапыніў яго Ванэк,—як батальённы ордынарац Матушыч горда крочыць да штабнага вагону. Дзіўлюся, як гэта ён не спатыкнуўся аб рэйкі.

Незадоўга да гэтага паміж капітанам Загнэрам і старанным кадэтам Біглерам адбылася дужа няпрыемная размова.

— Дзіўна, пане кадэт Біглер,—гаварыў капітан Загнэр,—што вы не далажылі мне адразу-ж, што належыць 150 грам вэнгерскае кілбасы ня выдалі, так што мне самому давялося пайсьці і паглядзець, чаму людзі варочаюцца з харчовага магазыну з пішчымнымі рукамі і паны афіцэры таксама, як быццам загад ня ёсьць загад. Бо я-ж сказаў: «у магазын уваходзяць па разьдзелах, рота за ротаю». Гэта значыць, што і пасьля таго, як у магазыне нічога не атрымалі, трэ' было варочацца ў вагоны па разьдзелах, рота за ротаю. А вам, кадэт Біглер, я загадаў наглядаць за парадкам, але вы не зрабілі ласкі гэта выканаць. Вы былі здаволены, што вам ня трэба валэндацца з адлічваньнем кілбасных дзялянак, і вы, як я бачыў з вакна, спакойна пашлі наўзірацца на праколатага стрэлкаю капрала з дэйчмэйстэраў. І калі я потым загадаў вас паклікаць, вы ня

прыдумалі нічога лепшага, як гарадзіць лухту, быццам вы хадзілі ўпэўніцца, ці не вядзецца каля трупа гэтага капрала якаянебудзь агітацыя.

— Маю гонар далажыць, што ордынарац 11 роты Швэйк...

— Дайце мне спакой з гэтым Швэйкам!—крыкнуў капітан Затнэр.—Ня думайце, пане кадэт Біглер, што вы можаце бяскарна інтрыгаваць супроць паручыка Лукаша. Гэта мы туды паслалі Швэйка. Ну, чаго вы глядзіцё на мяне, як быццам думаеце, што я да вас чапляюся? Так, я да вас чаплюся, пане кадэт Біглер! Калі вы ня ўмееце ставіцца з належнаю павагаю да сваіх начальнікаў, калі вы будзеце імкнуцца іх скомпромэтаваць, дык я вас буду гэтак цукаць, што вы сваіх не пазнаеце. Можаце выхваляцца сваімі тэорэтычнымі ведамі, на гэтае вы майстар! Але пачакайце, калі мы прыбудзем на фронт, я прызначу вас у афіцэрскі патруль на выведку да самых драцяных загарожаў ворага... А дзе ваш рапорт? Нават рапорту я ня чуў калі вы вярнуліся! Гэта вам не тэорыя, пане кадэт!

— Маю гонар далажыць, пане капітан, што людзям было выдадзена замест 150 грам вэнгэрскае кілбасы па дзьве ілюстраваныя паштоўкі. Вось будзьце ласкавы, пане капітан?

Кадэт Біглер перадаў батальённаму камандзіру дзьве паштоўкі з сэрыі выданьняў вайсковага архіву ў Вене, начальнікам якога быў пяхотны генэрал Вайновіч. На аднэй паштоўцы была намалёвана карыкатура расійскага салдата, у выглядзе барадатага мужыка, якога абдымаў касьцяк. Пад карыкатураю быў зьмешчаны гэтакі тэкст: «Дзень, калі здохне ад голаду хцівая Расія, будзе дзень вызваленьня для ўсяе нашае монархіі».

Другая паштоўка была нямецкага паходжаньня і зьяўлялася падарункам Нямеччыны аўстро-вэнгерскім салдатам. Пад загалоўкам „Viribus unitis“ * быў намаляваны на шыбеніцы сэр Эдгард Грэй, а пад ім, весела ўзяўшы пад казырок, адзін аўстрыйскі, другі нямецкі салдат. Вершык на гэтай паштоўцы быў запазычан з кнігі «Броняваны кулак» Грэйнца, якая зьяўлялася зборнікам накіраваных супроць нашых ворагаў памфлетаў, пра якія нямецкія газэты пісалі: «Вершы Грэйнца дзейнічаюць,

*) Аб'яднанымі сіламі.

як удар гарапнікам, і насычаны невычарпальным гумарам ды бліскучым досьціпам». Тэкст вершыка пад шыбеніцаю казаў:

Грэй.

Вось шыбеніца паміж дрэў,
На ёй вісіць сэр Эдвард Грэй,
Калі-ж прыгледзімся—відно
Там толькі пудзіла адно.
Яго-б туды самога час,
Ды адшукаць спрабуй у нас
Такое дрэва ў хвойніку,
Што ціха дасьць сябе зваліць.
Каб гэткаму рабаўніку
Надзейнай шыбеніцай быць.

Капітан Загнэр яшчэ ня скончыў чытаць гэты вершык «насычаны невычарпальным гумарам ды бліскучым досьціпам», калі ў вагон куляю ўляцеў батальённы ордынарац Матушыч.

Капітан Загнэр паслаў яго на тэлеграф даведацца, ці ня прышлі якія-небудзь загады і ён прынёс тэлеграму з брыгады. Было зусім непатрэбна зварочвацца да шыфру, бо тэлеграма была нешыфравана і сплавяшчала: «Зараз-жа пакарміць людзей і рушыць у Сокаль». Капітан Загнэр зьбянтэжана паківаў галавою.

— Маю гонар далажыць,—сказаў Матушыч,—што комэндант станцыі просіць вас наведацца да яго на некалькі хвілін. Там прышла яшчэ адна тэлеграма.

І паміж камэндантам станцыі і капітанам Загнэрам адбылася размова строга конфідэнцыйнага парадку.

Тэлеграма павінна была быць перадана, хоць зьмест яе быў надзвычайна дзіўны, бо батальён яшчэ знаходзіўся на станцыі Раб. Што гэта магло значыць? Зараз-жа пакарміць людзей і рушыць у Сокаль»? Яна была адрасавана маршаваму батальёну 91 палка, копія маршаваму батальёну 75 палка, які ішоў пасьля першага. Подпіс быў сапраўдны: барон фон-Гэрбэрт начальнік брыгады.

— Дазвольце зьвярнуцца да вас, пане капітан, зусім конфідэнцыйна,—таемна сказаў вайсковы комэндант станцыі.— Прышла сэкрэтная тэлеграма, што камандзір вашае брыгады звар'яцеў. Яго накіравалі ў Вену, пасьля таго, як ён ужо раза-

слаў ва ўсе бакі тэлеграмы. У Будапэшце вы, напэўна, знойдзеце новую тэлеграму. Зразумела, што ўсё ягоныя тэлеграмы павінны быць анулаваны, але вы яшчэ не атрымалі адпаведнага загаду. У мяне, паўтараю, ёсьць толькі загад з дывізіі ня лічыцца з нешыфраванымі тэлеграмамі .Перадаць вам яе я абавязаны, таму што наконт гэтага я яшчэ не атрымаў адказу ад м а й г о начальства. Праз м а ё начальства я паслаў запытаньне ў вышэйшае вайсковае камандаваньне і справа атрымала законны кірунак...

— Пане капітан, дадаў ён пасьля невялікае маўчанкі,—я былы кадравы афіцэр піонэрнага палка, удзельнічаў у пабудове нашае стратэгічнае чыгункі ў Галіцыі і лічу, што на фронт трэба пасылаць менавіта гэтакіх старых, як я, якія валаклі цягло ад самага пачатку. А замест гэтага на чыгунках служаць грамадзянскія афіцэры, якія здалі экзамен на вольнапісанага! З рэшты праз чвэртку гадзіны вам давядзецца ехаць далей... А ведаеце, я як цяпер помню, што калі я быў яшчэ ў старэйшай клясе кадэцкага корпусу ў Празе, дык аднойчы падтрымліваў вас на роўналежных брусох па лекцыі гімнастыкі. Нас яшчэ абодвых пакінулі без пабыўкі. Вы тады здорава біліся з кадэтамі з немцаў. І Лукаш быў з вамі. Вы з ім былі вялікія сябры... Дык вось, калі я атрымаў тэлеграму са сьпісам афіцэраў маршавага батальёну, які павінен праяжджаць праз гэтую станцыю, я адразу-ж успомніў... Так, шмат вады перабегла ад таго часу... А кадэт Лукаш заўжды быў мне сымпатычны.

На капітана Загнэра ўся гэтая размова зрабіла дужа цяжкае ўражаньне. Ён адразу-ж пазнаў у комэнданце свайго былога таварыша па клясе, які ў кадэцкім корпусе быў душою антынямецкае опозыцыі, ад якое ён потым, зважаючы на кар'еру, адмовіўся. Больш за ўсё яго закранула згадка пра паручыка Лукаша, якога заўжды і так чамусьці абыходзілі пры павышэньні і пры ўзнагародах.

— Паручык Лукаш,—з націскам прамовіў ён,—дужа добры афіцэр. Калі адыходзіць цягнік?

Комендант глянуў на гадзіньнік.

— Праз шэсьць хвілін.

— Ну, дык я пайду,—сказаў Загнэр.

— А я меркаваў, што вы мне што-небудзь скажаце, Загнэр.

— Скажу? Ну, добра: «На здар!» *)—адказаў Загнэр і выйшаў з будынку комэндантуры.



Калі капітан Загнэр перад самым цягнікам вярнуўся ў штабны вагон, ён знайшоў усіх афіцэраў на сваіх мясцох. Яны разышліся на групкі ды гулялі ў карты, толькі кадэт Біглер ня гуляў. Ён капаўся ў кучы пачатых рукапісаў, што належалі да розных эпізодаў вайны, бо ён ня толькі марыў быць выдатным на полі бою, але яшчэ праславіцца ў якасьці літаратурнага вундэркінда апісаньнем розных выпадкаў з паходнага ды баявога жыцьця. Адным словам «бусел з рыбіным хвастом» марыў зрабіцца выдатным вайсковым пісьменьнікам.

Яго літаратурныя патугі пачыналіся крыклівымі загалоўкамі, якія, праўда, адлюстроўвалі мілітарызм эпохі, але заставаліся нераспрацаваныя, так што на аркушах паперы былі напісаны толькі назвы твораў, якія яшчэ павінны былі ўзьнікнуць, прыкладам:

«Біографіі ўдзельнікаў вялікае вайны.—Хто пачаў вайну? Палітыка Аўстра-Вэнгрыі і ўзьнікненьне сусьветнай вайны. Вайсковыя накіды.—Аўстра-Вэнгрыя і сусьветная вайна.—Пра карысьць вайны.—Некалькі слоў пра прычыны вайны.—Урачысты дзень для Аўстра-Вэнгрыі.—Славянскі імпэрыялізм і сусьветная вайна.—Дакумэнты сусьветнае вайны.—Матэрыялы для гісторыі сусьветнае вайны.—Дзеньнік сусьветнае вайны.—Першая сусьветная вайна.—Нашая дынастыя ў сусьветнай вайне.—Народнасьці аўстра-вэнгерскай монархіі і сусьветная вайна.—Хроніка мае кампаніі.—Як ваююць ворагі Аўстра-Вэнгрыі.—Чыя перамога?—Нашы афіцэры і салдаты.—Слаўныя ўчынкі маіх салдатаў.—З эпохі вялікае вайны.—Баявы прыпар.—Памяці аўстра-вэнгерскіх герояў.—Жалезная брыгада.—Лісты з фронту.—Героі нашага маршавага батальёну.—Падручнік для салдатаў пад час паходу.—Дні змаганьня і дні перамогі.—Што я бачыў і што вытрымаў у акопах.—На пера-

---

*) „На здар" (няхай жыве!)—чэскі нацыяналістычны лёзунг.

давых пазыцыях. — Апавяданьне афіцэра. — Наперад, сыны Аўстра-Вэнгрыі.—Варожыя аэропляны і нашая пяхота.—Пасьля бою.—Нашыя артылерысты—цьвёрдая ахова бацькаўшчыны.— І калі-б увесь сьвет узьняўся на нас...—Вайна абароны і вайна наступленьня.—Кроў і жалеза.—Сьмерць ці перамога!—Нашыя гэроі ў палоне».

Падышоўшы да Біглера і ўбачыўшы ўвесь гэты стос паперы, капітан Загнэр запытаўся, навошта ён гэта напісаў і чаго ён хоча гэтым дасягнуць.

Кадэт Біглер са шчырым энтузіязмам адказаў, што кожны з гэтых загалоўкаў вызначае кнігу, якую ён напіша. Колькі загалоўкаў, столькі і кніжак.

— Мне хацелася-б, каб пра мяне засталася памяць, калі мне суджана загінуць у баі, пане капітан. Сьветлым прыкладам для мяне зьяўляецца нямецкі прафэсар Удо Крафт. На сваім сорак пятым годзе жыцьця ён пашоў у армію добраахвотнікам на гэтую сусьветную вайну і быў забіты 22 жніўня на францускім фронце, выдаўшы яшчэ напярэдадні сваё сьмерці кніжку пад назвай: «Мы гатовы памерці за свайго кайзэра».

Капітан Загнэр адвёў кадэта Біглера да вакна і іранічна сказаў:

— Ану, вось пакажэце, пане кадэт, што ў вас яшчэ ёсьць? Мяне дужа цікавіць вашая праца.. Які гэта вы сшытачак схавалі сабе ў кішэнь.

— Ах, глупства, пане капітан,—адказаў па-дзіцячаму пачырванеўшы кадэт Біглер.—Зрэшты, калі ласка, паглядзіце самі.

На вокладцы сшытка было напісана:

«Схэма найбольш выдатных і вядомых баёў аўстра-вэнгерскае арміі, складвеная з афіцыйных крыніц афіцэрам Адольфам Біглерам, з заўвагамі ды тлумачэньнямі афіцэра Адольфа Біглера.

Схэма гэтая была надзвычайна простая.

Ад бою пры Нёрдлінгене 6 верасьня 1634 г. яна пераходзіла проста да бою пры Зэнце 11 верасьня 1697 г., пасьля вялізным пераскокам—да бою пры Кальдэьере 31 кастрычніка 1805 г., бою пры Асперне 22 мая 1809 году і бойцы народаў

пры Лейпцыгу ў 1813 годзе, а пасьля да баёў пры св. Лючыі ў маі 1848 г. і пры Траўтэнаў 27 чэрвеня 1866 г. і канчалася заваяваньнем Сараева 19 жніўня 1878 г. Разьвіцьцё і пляны гэтых боек былі ўсе на адзін капыл. Кадэт Біглер усюды намаляваў простатукнікі, якія з аднаго боку былі заштрыхаваны, што павінна было паказваць на сілы ворага. На тым і другім баку былі левае крыло, цэнтр і правае крыло. За лініямі войскаў быў паказаны стрэлкамі рух рэзэрваў. Бой пры Нёрдлінгене быў падобен, як дзьве кроплі вады на бой пры Сараеве, а абодва разам нагадвалі тое, як разьмяркоўваюцца гульцы на пачатку футбольнага матчу, і стрэлкі, здавалася, паказвалі, куды той ці іншы бок загоніць мячык.

Капітан Загнэр зараз-жа зьвярнуў увагу на гэтае падабенства і запытаў:

— Пане кадэт, вы, мусіць, гуляеце ў футбол?

Біглер яшчэ болей пачырванеў і нэрвова заміргаў вачыма, так што нават, здавалася, быццам ён ледзь стрымлівае сьлёзы.

Капітан Загнэр з усьмешкаю перагортаў сшытак і спыніўся на заўвазе да схэмы бою пры Траўтэнаў у часе пруска-аўстрыйскае вайны.

Кадэт Біглер напісаў: «Пачынаць бой пры Траўтэнаў ня варта было, таму што гарыстая мясцовасьць перашкаджала разгортваньню дывізій гэнэрала Мацукелі, якім пагражалі моцныя колёны прусакоў. Яны знаходзіліся на вышынях, якія абкружалі левае крыло аўстрыйскае арміі».

— Значыць, ваш погляд,—з усьмешкаю заўважыў капітан Загнэр, зварочваючы Біглеру сшытак,—бой пры Траўтэнаў варта было пачынаць толькі ў тым выпадку, калі-б Траўтэнаў знаходзілася на роўнай мясцовасьці? Ці ня гэтак, маленькі Напалеон з Будвэйсу? Што-ж, пане кадэт, дужа ёмка з вашага боку, што вы за такі кароткі тэрмін жыцьця ў арміі здолелі пасягнуць таямніцы стратэгіі. Шкада толькі, што гэта ў вас атрымалася так, як быццам хлапчукі гулялі ў салдаты ці назвалі сябе гэнэраламі. Вы падвысілі сябе гэтак хутка ў першы чын, што проста не нарадуешся! Маеце вось: афіцэр Адольф Біглер! Глядзі што, не пасьпеем мы даехаць да Будапэшту, як вы будзеце фэльдмаршалам, хоць-бы бяз году нядзелю перад

гэтым вы гатункавалі з вашым бацькам розныя скуркі. Як-жа падпаручык Адольф Біглер! Родненькі, зразумейце-ж, што вы яшчэ не афіцэр! Вы—кадэт! Вы вісіце ў паветры паміж прапаршчыкам і унтэр-афіцэрам. Вы так-жа далёка ад таго, каб быць афіцэрам, як калі-б дзе-небудзь у карчме які-небудзь ефрэйтар надумаўся клікаць сябе «пане фэльдфэбэль».

— Слухай вось, Лукаш,—зьвярнуўся ён да паручыка,—кадэт Біглер у цябе ў роце, дык ты пазважай на яго, калі ласка, ды падцягні яго. Ён падпісваецца «афіцэр», дык няхай ён заслужыць гэтую годнасьць у баёх! Калі нам давядзецца пад навальным агнём ісьці ў атаку, мы пашлем яго наперад з яго разьдзелам рэзаць драцяныя загарожы... Ах, дарэчы: вітае цябе Цыкан,—ён цяпер комэндант станцыі ў Рабе.

Кадэт Біглер зразумеў, што гаворка з ім скончана, узяў пад казырок і чырвоны, як рак, адышоў у самы далёкі кут вагону.

Быццам лунатык, адчыніў ён дзьверы прыбіральні і, чытаючы надпіс на нямецкай і вэнгерскай мовах: «забараняецца карыстацца прыбіральняю ў часе прыпынку цягніка на станцыі», ціха і бязгучна заплакаў. Пасьля папяўся... і, глытаючы сьлёзы, да рэшты выкарыстаў сшытачак з надпісам: «Схэма найбольш выдатных баёў і да т. п.». Спляміены ён пакрысе ўвесь зьнік у адтуліне і, падаючы на палатно, закружыўся пад хуткім вайсковым цягнікам.

Кадэт Біглер тут-жа ў прыбіральні памыў сабе чырвоныя ад сьлёз вочы і вышаў у калідор, даўшы сабе слова быць непарушным, па-д'ябальску непарушным. Ён накіраваўся ў суседняе купэ, дзе батальённы ордынарэц Матушыч гуляў з Бацэрам, дзяншчыком батальённага камандзіра, у дурня.

Паглядзеўшы ў адчыненыя дзьверы купэ, ён кашлянуў. Тыя былі азірнуліся, але зноў пачалі гуляць.

— Хіба вы ня ведаеце, што трэба?—запытаўся кадэт Біглер.

— Я ня мог,—адказаў Бацэр на сваім жахлівым тырольскім дыялекце,—у мяне ня было козыра. Я сам ведаю, што трэ' было гуляць з хрысьцей, а пасьля біць вінёвым каралём... Вось як трэ' было гуляць!

Кадэт Біглер не прамовіў больш ніводнага слова і зашыўся ў куток. Калі пасьля да яго падышоў прапаршчык Плешнер і запрапанаваў яму каўтнуць каньяку з бутэлькі, якую ён кагадзе выгуляў у карты, ён зьдзівіўся, з якою стараннасьцю кадэт Біглер выгвучаў кнігу Удо Крафта «Мы гатовы памерці за свайго кайзэра».

Яшчэ не даяжджаючы да Будапэшту, кадэт Біглер гэтак налізаўся, што ледзь ня выкінуўся з вакна і бесьперастанку, крычаў:

— Наперад, хлопцы, сьмялей! У імя бога і чорта наперад!

Тады батальённы ордынарэц Матушыч уцягнуў яго згодна загаду капітана Загнэра ў купэ і палажыў з дапамогаю Бацэра на лаўцы. І кадэту Біглеру прысьніўся наступны сон.

Сон кадэта Біглера перад Будапэштам

У яго ўжо была вышэйшая вайсковая ўзнагарода—жалезны крыж; ён меў ужо годнасьць маёра і паехаў інспэктаваць даручаную яму брыгаду. Праўда, ён яшчэ ня мог сабе растлумачыць, чаму ён усё яшчэ быў маёрам хоць камандаваў цэлаю брыгадаю і меркаваў, што ён даўно ўжо быў падвышан на генэрал-маёра, але што слова «генэрал» як-небудзь загубілася ў хаосе вайсковага тэлеграфу ды палявое пошты.

Таму ён у думках сьмяяўся, што ў цягніку, калі яны ехалі на фронт, капітан Загнэр пагражаў яму пасладзь яго рэзаць драцяныя загарожы. Зрэшты, капітан Загнэр не падставе ягонай, Біглеравай, атэстацыі ў штабе дывізіі ўжо быў з паручыкам Лукашом пераведзены ў другі полк, у другую дывізію, у другі армейскі корпус і хтосьці расказваў, быццам абодва гэтыя афіцэры бясслаўна згінулі пад час адступленьня ў якімсьці балоце.

І вось калі ён, Біглер, ехаў на аўтомобілі на фронт рабіць інспэктарскі агляд свае брыгады, яму ўсё зрабілася зусім зразумела. Яго, уласна кажучы, командыравалі ад генэральнага штабу арміі...

Паўз яго праходзілі салдаты і сьпявалі песьню, якую ён чытаў калісьці ў зборніку аўстрыйскіх салдацкіх песень:

Браты-салдаты, адважна за справу,
На ворага ўсе мы ўдарым сьмела!
Вышэй узьвівайся наш слаўны сьцяг.

Мясцовасьць мела той-жа характар, як і на малюнках «Велікае ілюстраванае газэты».

З правага боку, каля некага хлява, стаяла батарэя, якая трымала пад агнём варожыя акопы каля шосэ, на якім ён ехаў на аўтамобілі. зьлева быў дом, з якога паблісквалі агеньчыкі стрэлаў, у той час, як вораг тужыўся прыкладамі выбіць уваходныя дзьверы. Амаль каля самага шосэ дагараў падбіты аэроплян ворага. На даляглядзе відаць былі конныя разьезды і запаленая, уся ў полымі, вёска, а таксама акопы маршавага батальёну і невялікая вышыня, з якое вораг адстрэльваўся з кулямётаў. Крыху далей цягнуліся ўздоўж шосэ варожыя акопы. А шофэр вязе яго па шосе проста на іх!

Ён крычыць шофэру ў трубку,

— Хіба ты ня бачыш, куды мы едзем? Там-жа вораг.

Але шофэр спакойна адказвае:

— Ваша мосьць, гэта адна толькі добрая дарога. Шосэ добрае, а па прасёлкавых дарогах шыны ня вытрымалі-б.

Чым больш яны набліжаюцца да варожае пазыцыі, тым мацнейшы робіцца агонь. Па абодва бакі абсаджанага сьліванымі дрэвамі шосэ, каля самых акопаў выбухаюць знарады. Але шофэр спакойна заяўляе ў трубку:

— Гэта—цудоўнае шосэ, ваша мосьць, па ім едзеш, як па паркеце. А вось спрабуйма зьвярнуць на поле, у нас шыны адразу лопнуць.

— Гляньце, ваша мосьць,—зноў крычыць шофэр у трубку,—гэтае шосэ так добра збудована, што нават 30,5-сантымэтравыя мортыры нічога не могуць нам зрабіць. Шосэ гладкае, як ток, ну, а на камяністых дарогах і на палёх шыны ня вытрымалі-б. А варочацца нам назад ніяк нельга, ваша мосьць!

«Ба-бах»—чуе Бітлер і аўтомобіль робіць страшэнны падскок.

— Ну хіба-ж я вам не казаў, вашая мосьць,—крычыць у трубку шофэр,—што гэта чорт ведае якое добрае шосэ. Бачылі зараз перад намі выбухнуў 38-сантымэтравы знарад. І ніякай выбоіны—шосэ, як паркет! А калі-б зьвярнуць на поле, дык шыны-б ужо паляцелі-б да д'ябла. Цяпер нас абстрэльваюць з адлегласьці чатыры кілёмэтры.

— Куды-ж мы едзем?

— Там відаць будзе,—адказвае шофэр.—Пакуль ідзе гэткае шосэ, я за ўсё адказваю.

Аўтомібіль надзвычайна падкінула ўгору і ён спыніўся.

— Ваша мосьць,—крычыць шофэр,—ці няма ў вас карты генэральнага штабу?

Генэрал Бігляр запальвае электрычны ліхтарык і бачыць, што карта ляжыць у яго на каленях. Але выходзіць, што гэта карта Гэльголяндзкага ўзьбярэжжа ў 1864 годзе і часе аўстрапрускае вайны з Даніяю за Шлезьвіг.

— Тут скрыжаваньне,—кажа шофэр,—і абедзьве дарогі вядуць да варожых пазыцый. Для мяне галоўная справа—добрая дарога, каб шын не папсаваць, ваша мосьць... Я-ж адказваю за казённую машыну. І раптам—выбух, страшэнна гучны выбух, і сыплюцца зоры велічынёю з добрае кола. Млечны шлях густы, як сьмятана. Вось ужо Біглер імчыцца ў міжплянэтным прасторы, учарэпіўшыся за сядзеньне разам з шофэрам. Аўтомобіль за самым сядзеньнем разрэзала напал, быццам нажнамі, і ад яго засталася пярэдняя частка, што задзёрыста ірвецца наперад.

— Гэта яшчэ шчасьце,—кажа шофэр,—што вы мне паказалі карту ззаду. Вас перакінула да мяне, а задняя частка машыны ўзьляцела ў паветра. Гэты быў 42-сантымэтравы знарад. Я так і ведаў, што калі пад'едзеш да скрыжаваньня, дык дарога ўжо ні к д'яблу ня варта... Ды пасьля 30-сантымэтравага знараду толькі і мог быць 42-сантымэтравы. Больш буйных калібраў цяпер няма ў дзеяньні, ваша мосьць.

— Куды-ж мы цяпер едзем?

— Мы лецім на неба, ваша мосьць, і нам даводзіцца аб'яжджаць комэты. Яны, мусіць, будуць горай, як 42-сантымэтроўка...

— Вось глядзеце, пад намі плянэта Марс,—пасьля другое маўчанкі прамовіў шофэр.

Біглер зноў супакоіўся.

— А вы ведаеце гісторыю бойкі народаў пры Лейпцыгу?—запытаў ён.—Як фэльдмаршал, князь Шварцэнбэрг 14 кастрычніка рушыў на Лібэртковіцы і як 16 кастрычніка ўзгарэўся бой каля Ліндэнаў? Вы ведаеце, якія баі давялося весьці генэралу Мэрвельдту і як аўстрыйскія войскі прабіліся ў Вахаў і як 19 кастрычніка быў зможан Лейпцыг?

— Ваша мосьць,—урачыста гаворыць у гэты момант шофэр.—Мы якраз пад'ехалі да варот раю. Вылазьце, ваша мосьць! Мы ў гэтыя вароты ня ўедзем, бачыце, якая штурхатня—усё вайсковыя!

— Задушы каго-небудзь, каб пастрашыць,—крычыць ён шофэру,—тады ўжо іншыя рассунуцца.

І выхіліўшыся з аўтомобілю, ён крыкнуў:

— Зважай, сволачы! Гэткія падшывальцы! Бачаць, што едзе генэрал і ня могуць зрабіць «вочы направа».

— Гэта цяжкая задача, ваша мосьць,—прабуе супакоіць яго шофэр.—У большасьці-ж і галоў нямашака.

Генэрал Біглер толькі цяпер заўважыў, што стлумленыя перад варотамі раю былі спрэс інваліды: яны страцілі на вайне якую-небудзь частку цела і цягнулі ў торбах—хто галаву, хто рукі, хто ногі. Нейкі ўдалы артылерыст у разадраным шынэлі, які пёрся ўсё прасунуцца наперад, акуратна зложыў у свой ранец жывот з усімі ніжнімі канцавінамі. З ранцу аднаго заслужанага апалчэнца на генэрала Біглера глядзела палавіна задніцы, якую той страціў пад Львовам.

— Гэта ўсё робіцца для парадку,—заўважыў шофэр, спрытна прадзіраючыся між густога натоўпу інвалідаў.—Як відаць, яны павінны прайсьці праз нябесную комісію.

У вароты раю пускалі толькі па паролі: «За бога, цара і бацькаўшчыну!» На шчасьце, генэрал Біглер гэтага паролю не забыўся і аўтомобіль уехаў у рай.

— Ваша мосьць,—сказаў крылаты анёл-афіцэр, калі яны праяжджалі паўз казарму з анёламі-новабранцамі,—вам трэба зьявіцца да командзіра.

Яны паехалі далей каля пляц-параду, што кішма-кішэў анёламі-новабранцамі, якіх навучалі «алілуя».

Пасьля яны мінулі групу, дзе ў гэты момант рыжы анёл-капрал «падцягваў» разявяку анёла-новабранцу, лупіў яго кулакамі ў жывот і роў:

— Чаго ты вушамі лопаеш, сьвіньня віфліемская? Хіба-ж гэтак крычаць «алілуя»? Што ў цябе—клёцкі ў роце, ці што? Хацеў-бы я ведаць, які асёл пусьціў цябе, быдляціну шэрую, у рай... Папрабуй ты ў мяне яшчэ з раз крыкнуць «хахлілуя»! Што, нягоднік, ты і ў раі сапцы носам зьбіраешся? А ну паўтары ізноў, дубіна кедраліванская!

Аўтамобіль ад'ехаў ужо даволі далёка, але ўсё яшчэ чуваць было, як прастуджаны анёл-новабранец, хлюпаючы носам, пяўся на ўсю сілу: «хахлілуя», а анёл-капрал дзікім голасам крычаў на яго: «Ня гэтак, ня тэтак, карова іорданская, а а-лі-лу-я, а-лі-лу-я!» Разумееш!

Пасьля Біглер убачыў да болю бліскучае сьвятло вялізнага прожэктара над адным будынкам, такім вялікім, як Марыінская казарма ў Будвэйсе; над будынкам плавалі два аэропляны, адзін з правага боку, другі з левага, а пасярэдзіне між імі цягнулася вялізная палатняная шыльда з вялізарнымі літарамі

БОЖАЯ ГАЛОЎНАЯ КВАТЭРА

Два архангелы ў форме палявых жандараў выцягнулі генэрала Біглера з аўтомобілю, схапілі яго за каўнер і павялі на першы паверх.

— Трымайце сябе прыстойна перад госпадам-богам,—сказалі яны перад уваходам і ўпхнулі яго ў залю.

Пасярэдзіне залі, дзе на сьценах віселі фотографіі Франца-Іозэфа, Вільгэльма, эрцгэрцога Карла, забітага Франца-Фэрдынанда, эрцгэрцога Фрыдрыха, генэрала Віктара Данкля і начальніка генэральнага штабу Конрада фон-Гецэндорфа, стаяў сам пан-бог.

— Кадэт Біглер,—з націскам сказаў пан-бог,—вы мяне не пазнаеце? Я ваш былы капітан Загнэр з 11 роты.

Біглер скамянеў ад жаху.

— Кадэт Біглер,—зноў падвысіў голас пан-бог,—на якой падставе вы прысвоілі сабе годнасьць генэрала-маёра? На якой падставе, вы, кадэт Біглер, праехалі па шосэ на штабным аўтомобілі паміж позыцыяй ворага?

— Маю гонар далажыць...

— Замоўкніце, калі з вамі гаворыць пан-бог!

— Маю гонар далажыць,—яшчэ раз папрабаваў быў пачаць Біглер.

— Ах, дык вы ня хочаце маўчаць?—зароў пан-бог, адчыніў дзьверы і клікнуў:—Гэй, хто там? Давай сюды двох арханґелаў.

Увайшлі два арханґелы з вінтоўкамі цераз левае плячо і Біглер пазнаў у іх Матушыча і Бацэра.

А з вуснаў пана-бога разьлёгся голас:

— Занясеце яго ў клёзэт!

І кадэт Біглер праваліўся кудысьць у нявыказны смурод.

*

Каля соннага кадэта Біглера сядзелі Матушыч і дзяншчык капітана Загнэра Бацэр, якія ўсё яшчэ гулялі ў дурні.

— Ну і сьмярдзіць-жа ад яго, як ад падлы,—заўважыў Бацэр, з цікавасьцю назіраючы, як варочаўся праз сон юнкер.— ён мусібыць, гэтае...

— Што-ж, гэта з кожным можа здарыцца,—па-філёзофску абазваўся Матушыч.—Дай яму спакой, усёадно ты яго не пераробіш.

— Картуй вось лепей!

Пад Будапэштам відзён быў сьветлы воблак, і па Дунаі ва ўсе бакі сьлізгаўся прамень прожэктара.

Кадэту Біглеру сьнілася ўжо штосьці іншае, бо ён прамармытаў праз сон:

«Перадайце маёй слаўнай арміі, што яна стварыла сабе ў маім сэрцы нязрушны помнік замілаванасьці і ўдзячнасьці».

А з тае прычыны, што пасьля гэтых слоў ён ізноў пачаў варочацца, на Бацэра пахнула гэткім озонам, што ён нават плюнуў і заўважыў:

— Сьмярдзіць, як бочказоз, дальбог, як бочказоз.

А кадэт Бігляр варочаўся ўсё неспакайней і неспакайней, бо яго новы сон быў надзвычай фантастычны. Яму прыбачылася, быццам ён бараніў Лінц у зайне за аўстрыйскую спадчыну. Ён бачыў рэдуты, рэнтраншэмэнты ды палісады, якія цягнуліся вакол гораду. Яго штаб-кватэра зрабілася вялізным шпіталем. Усюды качаліся хворыя, трымаючыся за жывот. Пад палісадамі гораду Лінцу езьдзілі драгуны Напалеона I. А ён, начальнік, гарнізону, стаяў над усімі гэтымі людзьмі, таксама трымаючыся за жывот, ды крычаў францускаму парлямэнцёру:

— Перадайце вашаму імпэратару, што я ня здамся...

Пасьля яму здалося, быццам гэты боль у жываце крыху ацішэў; ён кінуўся са сваім батальёнам з цытадэлі, праз палісады насустрач славе ды перамозе, і ўбачыў, як паручык Лукаш засланіў яго сваймі грудзьмі ад удару шаблі францускага драгуна, прызначанага яму. Паручык Лукаш памірае каля яго ног з выгукам: «Такі чалавек, як вы, пане палкоўнік, патрэбней для арміі, чымся нікчэмны паручык!» Абаронца Лінцу, расчулены да сьлёз, адвярнуўся ад паручыка, як раптам паляцела картэч і трапіла яму ў мяккія часткі ніжэй сьпіны.

Бігляр машынальна схапіўся за нагавіцы. Адчуўшы штосьці цёплае і ліпкае ён крыкнуў: «Санітараў! Санітараў!» і скінуўся з каня. Бацэр і Матушыч паднялі кадэта Біглера з падлогі, куды ён скаціўся з лаўкі, ды палажылі на старае месца. Пасьля Матушыч пашоў да капітана Загнэра і далажыў яму, што з кадэтам Біглерам творыцца нешта нядобрае.

— Гэта ўжо, напэўна, не ад каньяку,—сказаў ён,—а хутчэй, мусіць, халера. Пан кадэт Бігляр на ўсіх станцыях піў непрагатаваную ваду. У Візэльбургу я сам бачыў, як ён...

— Ну, халера гэтак хутка ня бывае,—адазваўся капітан.— Зрэшты скажэце доктару, няхай ён яго агледзіць.

Пры батальёне быў «доктар вайсковага часу», стары мэдык і былі корпорант Вэльфэр. Ён умеў і любіў выпіць ды нарабіць гармідару і быў знаўца свае справы. Пабыўшы на мэдыцынскіх факультэтах амаль ва ўсіх унівэрсытэцкіх гарадох Аўстра-Вэнгрыі і прапрацаваўшы практыкантам у цэлым шэрагу больніц ён ўсё-ж не здаваў экзамэнаў на годнасьць док-

тара мэдыцыны, з тае простай прычыны, што згодна тэстамэнту, які пакінуў ягоны дзядзька, нашчадкі павінны былі выплачваць штогодную стыпэндыю студэнту мэдыцыны Фрыдрыху Вэльфэру, аж да таго моманту, калі ён атрымае доктарскі дыплём.

Між іншым гэтая стыпэндыя была ў чатыры разы большая за пэнсію доктара асыстэнта ў якой-небудзь больніцы, і з гэтай прычыны Фрыдрых Вэльфэр, які знаходзіўся адначасна амаль што ў дзесятку студэнцкіх корпарацый, мог нават займацца поэзіяй і выдаў некалькі зборнікаў ніштаваных вершаў у Вене, Лейпцыгу ды Бэрліне. Ён зьяўляўся супрацоўнікам «Сымпліцысімуса» і лічыўся, як ні ў чым ня бывала, студэнтам.

Але вось пачалася вайна і Фрыдрыху Вэльфэру давялося пагана.

Аўтара зборнікаў: «Кругавы кубак і навукі», «Казкі і байкі» і г. д. прызвалі на вайсковую службу як самага звычайнага сьмяротнага чалавека, а адзін са спадчыньнікаў дзівакадзядзькі выстараўся, каб наш добры Фрыдрых Вэльфэр здаў экзамэн на «доктара вайсковага часу». Экзамэн гэты быў пісьмовы. Вэльфэру давялося адказваць на цэлы шэраг пытаньняў, на якія ён стэрыотыпна адказаў адным і тым-жа сказам: «А ну вас усіх к...!» Праз тры дні палкоўнік, старшыня экзамэнацыйнай комісіі, абвясьціў, што ён варты годнасьці доктара па ўсіх галінах мэдыцынскіх ведаў, што старэйшы доктар прызначыў яго ў запасны шпіталь, што яго далейшая хуткая кар'ера залежыць ад ягонага трыманьня, і што хоць у яго і здараліся ў розных унівэрсытэцкіх гарадох дуэлі з афіцэрамі і усё гэта начальству вельмі добра вядома, але цяпер пад час вайны пра гэта можна ня згадваць.

Аўтар кнігі «Кругавы кубак і навукі», што нарабіла вялікага гармідару, прыкусіў губу ды ўзяўся служыць.

Пасьля некалькіх дыягнозаў ён выказаў сябе за надзвычай спагадлівага да пацыентаў з салдатаў і імкнуўся як ьга надалей працягнуць іхны тэрмін лячэньня ў шпіталі, хоць лёзунг па ўсёй лініі казаў: «Качацца салдатам у шпіталях ці здыхаць у акопах? Здыхаць ім у шпіталях ці ў стралковых лан-

цугох?» Доктара Вэльфэра накіравалі з 11 пяхотным маршавым батальёнам на фронт.

Кадравыя афіцэры батальёну ўважалі яго за істоту ніжэйшага парадку. Афіцэры запасу таксама не зважалі на яго і не таварышавалі з ім, каб прорва між імі і кадравымі афіцэрамі не зрабілася яшчэ глыбейшаю. Капітан Загнэр адчуваў сябе куды вышэй за былога студэнта, які пад час сваіх шматгадовых блуканьняў па ўнівэрсытэтах засёк некалькі афіцэраў. Калі доктар Вэльфэр, гэты «доктар вайсковага часу», праходзіў каля яго, ён нават не азірнуўся на яго, а пачаў ізноў з паручыкам Лукашам пляву звагаць рознае глупства. Ён сьцьвярджаў, што ў Будапэшце старанна выгадоўваюць тыкву, а паручык Лукаш расказваў з гэтага выпадку, як, будучы у трэцяй клясе кадэцкага корпусу, ён з некалькімі таварышамі езьдзіў у Славакію і трапіў на абед да аднаго эвангеліцкага пастара-славака. Той пачаставаў іх сьвінінаю са смажанаю тыкваю, а пасьля наліў ім віна, прымаўляючы:

Тыква ды сьвіньня
Дужа ждуць віна,

што яго, маленькага кадэціка Лукаша, дужа пакрыўдзыла.

— У Будапэшце нам ня шмат давядзецца пабачыць,—сказаў капітан Загнэр,—таму што мы будзем там толькі праездам. Згодна маршруту, цягнік пастаіць на вакзале дзьве гадзіны.

— Я мяркую, што будуць перачапляць вагоны,—абазваўся паручык Лукаш,—і нас усіх павязуць на разьмеркавальную станцыю.

Паўз іх прайшоў доктар Вэльфэр.

— Глупства!—сказаў ён, усьміхаючыся.—Маладых людзей, якія марыць з часам выбіцца на афіцэры і якія выхваляюцца сваімі гістарычнымі ды стратэгічнымі ведамі, варта было-б папераджаць, што небясьпечна адразу зьядаць цэлы пакунак салодкіх ласункаў, што маткі прысылаюць ім на фронт. Кадэт Біглер, як ён мне сам прызнаўся, зьеў пасьля ад'езду з Бруку трыццаць вялікіх шоколядных батонаў з крэмам і на ўсіх станцыях піў толькі гатаваную ваду. Гэта, пане капітан, нагадвае адзін радок у Шылера, дзе гаворыцца...

— Паслухайце, доктар,—перапыніў яго капітан Загнэр,— тут мова ідзе не пра Шылера. Што, уласна кажучы, здарылася з гэтым Біглерам?

Доктар Вэльфэр усьміхнуўся.

— Пан кандыдат на афіцэрскую годнасьць, в а ш кадэт Біглер апраівіўся, як бы вам сказаць, у нагавіцы! Гэта не халера і ня крываўка, а проста яго, так сказаць, правязло. Ён крышку перахапіў коньяку, і ўжо абрабіўся, як малое дзіцянё. Зрэшты, я мяркую, што гэта здарылася-б і без коньяку. Ён-жа зжор усе цукеркі, якія яму пасылалі з дому! Сапраўднае дзіцянё! У афіцэрскім сабраньні, як мне вядома, ён выпіваў кожны раз толькі шклянку лімонаду... Значыцца, цьверазун. А тутака ён накупіў сабе на станцыі бутэрбродаў...

— Значыць, нічога сур'ёзнага няма!— прамовіў капітан Загнэр.—Але тут-жа такая справа... Калі гэта зробіцца вядома...

Паручык Лукаш ўстаў і зьвярнуўся да Загнэра.

— Шчыра дзякую вам за гэткага начальніка разьдзелу.

— Я даў яму прыняць такую-сякую мікстуру,—сказаў, не пакідаючы ўсьміхацца Вэльфэр,—а наконт далейшага давядзецца ўжо загадваць вам, пане батальённы камандзір. Я здам кадэта Біглера тут у шпіталь і выдам яму пасьведчаньне, што ён захварэў на крываўку і нават на цяжкую форму крываўкі, што патрабуе суровае ізоляцыі, так што кадэт Біглер трапіць у дызэнфэкцыйны барак. Таму, што, я разумею, кадэту куды ганаровей захварэць на крываўку, чымся проста абрабіцца.

Тут капітан Загнэр службовым тонам зьвярнуўся да свайго прыяцеля Лукаша:

— Пане паручык, кадэт Біглер, які знаходзіцца ў вашай роце, захварэў на крываўку і застаецца на лячэньне ў Будапэшце.

Капітану Загнэру здалося, быццам Вэльфэр з выклікам усьміхнуўся, але, глянуўшы «на доктара вайсковага часу» уважлівей, ён убачыў, што той глядзіць зусім абыякава.

— Дык вось, усё ў парадку, пане капітан,—спакойна адказаў Вэльфэр, матнуўшы рукою.—Кандыдаты на афіцэрскую годнасьць такія-ж людзі, а пад час крываўкі ўсё пускаюць у нагавіцы.

Такім чынам здарылася, што адважны кадэт Біглер быў дастаўлен у вайсковы ізолятор у Альтофэне. Яго шматпакутныя нагавіцы загубіліся ў віры сусьветнае вайны.

Мары кадэта Біглера пра вялікія перамогі сталіся замкнутыя ў палату ізаляцыйнага бараку.

Калі кадэт Біглер даведаўся, што ў яго крываўка, ён прышоў у захапленьне. Ці-ж ня ўсё адно—быць параненым ці захварэць пры выкананьні свайго слаўнага абавязку на славу яго імпэратарскае вялікасьці!!

Тымчасам яго засьпела невялікая няўдача. З тэй прычыны, што ўсё месцы для дызэнтэтыкаў былі запоўнены, дык яго зьмясьцілі ў халерны барак.

Нейкі мадзьярскі штаб-лекар паматаў галавою, калі кадэта Біглера выкупалі і яму сунулі пад паху тэрмомэтр. 37°. Раптоўнае зьніжэньне тэмпэратуры гэта самы пэўны сымптом захворваньня на халеру! Хворы робіцца апатычны, вялы.

На справе-ж кадэт Біглер ня выказваў жаднага хваляваньня. Ён быў надзвычайна спакойны, у думках паўтараючы сабе, што ён-жа пакутуе за яго імпэратарскую вялікасьць, за свайго ўлюбёнага монарха.

Штаб-лекар загадаў паставіць кадэту Біглеру градусьнік у тоўстую кішку.

— Апошняя стадыя халеры,—думаў штаб-лекар.—Сымптомы агоніі, страшэнная слабасьць. Хворы не разумее, што адбываецца навокал, яго сьвядомасьць прытупляецца. Ён усьміхаецца у прадсьмяротных курчах...

Сапраўды, на працягу ўсяе гэтае процэдуры, калі яму сунулі градусьнік у тоўстую кішку, кадэт Біглер, разыгрываючы з сябе гэроя, усьміхаўся, як вялікамучанік. Але ён не зварухнуўся.

«Сымптомы,—працягваў свае назіраньні штаб-лекар,—якія вядуць пры халеры да сьмерці—пасыўнасьць»...

Ён запытаў старэйшага санітара па-мадзьярску, ці бляваў кадэт Біглер у ваньне і ці была ў яго бягунка.

Атрымаўшы адмоўны адказ, ён наўсторч утаропіўся на Біглера. Калі ў час халеры хворы пакідае бляваць і сьпыняецца бягунка, мы зноў-такі маем малюнак таго, што адбываецца пры халеры ў апошнія гадзіны жыцьця.

Кадэт Біглер, якога прынесьлі на койку з цёплае ванны зусім голага, страшэнна мёрз і ляскаў зубамі. Усё ягонае цела ўкрылася гусінаю скураю.

— Вось бачыце?—па-мадзьярску прамовіў штаб-лекар.— Яго дужа калоціць, халадзеюць рукі і ногі... Гэта канец.

Нахіліўся да кадэта Біглера, ён запытаў яго па-нямецку:

— Ну, як вы сябе адчуваеце?

— В-в-вельмі д-до-ббра-а, — стукаючы зубамі адказаў кадэт Біглер.—К-каб-б м-м-мне-е толькккі кккоўдрраду...

— Сьвядомасьць крыху парушана, крыху яшчэ дзейнічае,—канстатаваў мадзьярскі штаб-лекар.—Цела благога харчаваньня... Вусны ды пазногці павінны былі-б пачарнець. Гэта ўжо трэці выпадак сьмерці ад халеры, калі вусны і пазногці не пачарнелі.

— Вось к-к-каб-б к-к-коў-дру-у мн-мн-е-е-е!—праляскатаў зубамі кадэт Біглер.

— Тое, што ён гаворыць—яго апошнія словы,—сказаў па-мадзьярску штаб-лекар старэйшаму санітару.—Заўтра мы яго пахаваем разам з маёрам Кохам. Зараз ён страціць прытомнасьць... Ягоныя дакуманты ў канцылярыі?

— Яны будуць там,—спакойна адказаў старэйшы санітар.

— Каб-б к-коў-дру мне!—прашалясьцеў кадэт Біглер усьлед тым, што адыходзілі.

У палаце на шаснаццаць коек было ўсяго толькі пяць чалавек. Адзін з іх быў ужо мёртвы. Ён памёр за дзьве гадзіны перад гэтым ды быў пакрыты белым прасьцірадлам і прозьвішча яго было як таго вучонага, што знайшоў халерны вібрыён. Гэты быў маёр Кох, пра якога гаварыў штаб-лекар, што яго трэ'будзе пахаваць разам з кадэтам Біглерам.

Кадэт Біглер сеў на сваёй койцы і першы раз пабачыў, як людзі паміраюць ад халеры на славу яго імпэратарскае вялікасьці, бо яшчэ двое было пры сьмерці. Яны задыхаліся; іхныя твары пасінелі, а з вуснаў выляталі нейкія адрывістыя словы, прычым нельга было зразумець, якою моваю яны гаварылі. Гэта было хутчэй падобна да прыдушанага храпу.

Двое іншых надзвычайна бурнаю рэакцыяй ачуньваньня нагадвалі людзей, ахопленых тыфусовай гарачкаю. Яны крычалі

штосьці зусім няўцямнае ды шалёна дрыгалі пад коўдраю схудзелымі нагамі. Каля іх стаяў барадаты санітар, які тужыўся іх супакоіць, паўтараючы на сваім штырыйскім дыялекце:

— У мяне таксама была халера, залатыя вы мае, але я гэтак ня дрыгаў, як вы. Цяпер вам ужо будзе добра... Пойдзеце сабе на лабыўку... Ды ня брыкайся ты, чортава лялька!—навалiўся ён на аднаго хворага, калі той так напусьціў коўдраю, што яна абматалася наўкола ягонай галавы.—Гэтага ў нас нельга, не належыць. Будзь здаволен, што ў цябе гарачка, а то-б вышасажылі мы цябе з музыкаю. Няма чаго з вамі валэндацца.

Ён азірнуўся.

— Вось там тыя два памёрлі ўжо. Што-ж, мы гэтак і меркавалі,—ласкава дадаў ён.— А вы з гэтае бруднае гісторыі вылезеце. Ну, трэба ісьці па прасьціradлы.

Хутка ён вярнуўся з прасьціradламі. Ён прыкрыў імі нябожчыкаў, у якіх губы зусім пачарнелі, злажыў ім накрыж рукі з чорнымі пазногцямі і шмат пазавіхаўся, каб ўціскаць ім у раты далёка высунутыя языкі, а пасьля стаў каля коек на калены да забубнеў: «Прасьвятая дзева Марыя, прачыстая багародзіца...

І стары санітар са Штырыі сурова паглядаў пры гэтым на сваіх пацыентаў, у якіх буйная гарачка сьведчыла зварот да новага жыцьця.

— Прасьвятая дзева Марыя, прачыстая багародзіца,— паўтарыў ён, калі нейкі зусім голы чалавек ляпнуў яго па плячы.

Гэта быў кадэт Біглер.

— Слухайце,—сказаў Біглер,—я купаўся... Ці то мяне выкупалі. Мне... тр-тр-эба коўдра... Я... зь-зьз-мёрз...

— Гэта выключны выпадак,—казаў з паўгадзіны пасьля таго той-жа штаб-лекар кадэту Біглеру, які адпачываў пад коўдраю.

— Вы на шляху да адужаньня, пане кадэт. Заўтра мы пераводзем вас у запасны шпіталь у Тарноў. Вы—носьбіт халерных вібрыёнаў. Навука так далёка пашла наперад, што мы ўсё гэта можам добра пазнаваць... Вы з 91-га палка?

— 13-га маршавага батальёну,—адказаў за кадэта Біглера старэйшы санітар.—11-й роты.

— Пішэце,—сказаў штаб-лекар: «Кадэт Біглер, 13-га маршавага батальёну, 11-й роты, 91-га пяхотнага палка, накіроўваецца для назіраньняў у халерны барак у Тарноў, як падазроны па халеры».

І вось, такім чынам, удалы ваяка кадэт Біглер ператварыўся на «падазронага носьбіта халерных вібрыёнаў».

У БУДАПЭШЦЕ

На вакзале ў Будапэшце Матушыч падаў капітану Загнэру тэлеграму са штабу, якую паслаў няшчасны камандзір брыгады, накіраваны тымчасам у санаторыю. Тэлеграма была таго-ж самага зьместу, як і тая, што атрымалі на апошнім прыпынку: «Зараз-жа накарміць людзей, рушыць далей ў Сокаль». Аднак ў ёй быў яшчэ такі дадатак: «Абоз уключыць ва ўсходнюю групу. Выведачная служба касуецца. 13-ы маршавы батальён будуе мост праз Буг. Падрабязнасьці ў газэтах».

Капітан Загнэр зараз-жа накіраваўся да комэнданта станцыі. Яго сустрэў з ветлівую усьмешкаю маленькі тоўсьценькі афіцэр.

— Ну, і наварыў-жа ваш брыгадны кашы,—сказаў ён, шырака ўсьміхаючыся.—Аднак я мусіў перадаць вам гэтую лухту, бо з дывізіі яшчэ няма загаду не перадаваць ягоных тэлеграм адрэсатам. Вось, напрыклад, учора праходзіў тут 14-ы маршавы батальён 75-га палка, а на імя яго начальніка была атрымана тэлеграма, каб выдаць усім ніжэйшым чынам узнагароду за Перамышль па шэсьць крон, і разам з тым загад, каб з гэтых шасьці крон кожны ніжэйшы чын унёс у канцылярыю па дзьве кроны на вайсковую пазыку. З верагодных вестак, у вашага брыгаднага—прогрэсыўны паралюш!

— Пане маёр,—сказаў капітан Загнэр комэнданту станцыі,—згодна палкавога загаду, мы едзем маршрутам у Гэдэллэ. Людзі павінны тут атрымаць па 150 грам эмэнтальскага сыру. На апошняй станцыі людзі павінны былі атрымаць па 150 грам вэнгерскае кілбасы. Але яны нічога не атрымалі.

— Як відаць, і тутака з гэтае справы нічога ня будзе,— адказаў маёр, не пакідаючы ветліва ўсьміхацца.—Мне нічога

невядома пра адпаведны загад для чэскіх палкоў. Зрэшты гэта мяне і не датычыць. Вам трэ' будзе зьвярнуцца ў харчовую частку.

— А калі-ж мы накіроўваемся далей, пане маёр?

— Перад вамі стаіць цягнік з цяжкою артылерыяй для Галіцыі. Яго мы адпраўляем праз гадзіну, пане капітан. На трэцім пуці стаіць санітарны цягнік, які пойдзе праз дваццаць пяць хвілін пасьля артылерыйскага. На дванаццатым пуці у нас ёсьць цягнік з баявымі прыпасамі. Ён будзе адпраўлены праз дзесяць хвілін пасьля санітарнага, а праз дваццаць хвілін пойдзе ваш... Пры ўмове, што ня будзе ніякіх зьмен,—дадаў маёр, асабліва прыветна ўсьміхаючыся.

Цяпер ён здаўся капітану Загнэру зусім несымпатычным.

— Дазвольце, пане маёр,—сказаў Загнэр,—ці не растлумачылі-б вы мне, якім гэта чынам вам нічога невядома пра загад наконт выдачы па 150 грам эмэнтальскага сыру салдатам чэскіх палкоў?

— Гэта—сакрэтны загад.

«Значыць, я ўскочыў,—падумаў капітан Загнэр, выходзячы ад комэнданта.—І на якое ліха я загадаў Лукашу сабраць усіх аддзялённых начальнікаў дыісьці з імі атрымліваць з харчовае часткі гэты эмэнтальскі сыр!».

Але перш, чым камандзір 11-й роты, паручык Лукаш зрабіў заахды згодна загаду капітана Загнэра накіраваць людзей у харчовы склад, дзе трэба было атрымаць эмэнтальскі сыр з разьліку 150 грам на чалавека, перад паручыкам раптам вынырнуў Швэйк з гора-салдатам Балунам.

Балун дрыжэў усім целам.

— Дык вось, дазвольце пане паручык,—са сваёй звычайнаю трапнасьцю сказаў Швэйк,—справа, пра якую будзе зараз мова, надзвычай важная. Я хацеў-бы вас папрасіць, пане паручык, скончыць з гэтым дзе-небудзь па суседзтву, як выславіўся мой прыяцель Шпаціна з Зхоржу, калі яму выпадкам давялося быць дружкам на вясельлі, а ў царкве яму раптам захацелася...

— Дык у чым-жа справа, Швэйк?—перапытаў яго паручык Лукаш, а ён пасьпеў ужо занудзіцца бяз Швэйка, як і той без яго.—Пройдзем крыху наперад.

Балун ішоў, дрыжучы, усьлед за імі. Гэты волат зусім страціў душэўную раўнавагу і ў безнадзейным адчаі матаў рукамі.

— Ну, дык у чым-жа справа, Швэйк?—паўтарыў паручык Лукаш, калі яны адышлі далей.

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане паручык,—сказаў Швэйк,—што заўсёды лепей прызнацца раней, як тады, калі ўсё паляціць дагары нагамі. Вы, пане паручык, былі ласкавы сурова загадаць Балуну, каб ён да прыезду ў Будапэшт прынёс вам паштэт з гусінае пячонкі і булку Кажы, было табе загадана, ці не?—зьвярнуўся ён да Балуна.

Балун пачаў яшчэ толькі мацней матляць рукамі, быццам адбіваючыся ад нападу ворага.

— Гэты загад,—гаварыў ізноў Швэйк,—з боскае волі ня можа быць выкананы, пане паручык. Я ваш паштэт зжор! Так, гэта ■ яго зжор,—упэўненым голасам паўтарыў Швэйк, штурхануўшы ў бок перапалоханага Балуна,—таму што я меркаваў, што гэткі паштэт можа хутка сапсавацца. Мне не аднойчы даводзілася чытаць у газэтах, што нават цэлыя сем'і труціліся паштэтамі. Адзін такі выпадак быў і Пісэку, другі—У Бэраўне, трэці—у Табары, чацьверты—у Бунцлаў і пяты—у Пшыбраме. І ўсе гэтыя выпадкі скончыліся сьмерцю. Што-ж гэткі паштэт з гусінае пячонкі, гэта тая-ж трузна!..

Балун, што дрыжаў усім целам, адступіў некалькі крокаў убок, сунуў палец у рот ды пачаў блявазь.

— Што з вамі, Балун?

— Ой, мутарна, пане паручык, дужа мне,—выгукнуў Балун, выкарыстаўшы перадышку між двума прыступамі рвотаў.—Гэта-ж я яго ўмяў, гэты паштэт, зусім адзін.

З роту пакутніка Балуна вылецелі нават кавалачкі станіёлевай абгорткі паштэта.

— Як вы самы бачыце, пане паручык,—прамовіў Швэйк, аніколькі ня трацячы самаўладаньня,—кожны гэткі зьедзены паштэт выходзіць ізноў назад, як масла з вады. Я хацеў усё ўзяць на сябе, а гэты дурань сам сябе ўдаў. Ён наогул, дужа

прыстойны чалавек, але толькі ён абавязкова ўбярэ ўсё, што яму ні дай... Вось я таксама ведаў аднаго такога чалавека. Ён быў за кур'ера ў банку і яму льга было даручыць вялікія-вялікія грошы. Неяк аднойчы ён атрымліваў грошы з другога банку, і яму выдалі на тысячу крон болей, як належыла, дык ён зараз-жа занёс іх назад. Ну, а калі часамі загадаюць прынесьці на пятнаццаць крэйцараў паляндвіцы ці кілбасы да гарбаты, дык ён палавіну ўбярэ за дарогу. Страшэнна пражорлівы быў чалавек! Ці калі яго пасылалі па ліверную кілбасу, ён дарогаю надрэжа кілбасу сьцізорыкам, сярэдзіну выесьць, а пасьля залепіць дзіркі ангельскім пляйстырам, а гэта-ж на пяць штук кілбас каштавала яму даражэй, чым каштуе цэлая кілбаса.

Паручык Лукаш уздыхнуў і пашоў ад іх.

— Ці ня будзе ў вас якіх загадаў, пане паручык?—крыкнуў яму ўсьлед Швэйк, у той час, калі няшчасны Балун усё саваў палец у рот.

Паручык Лукаш матнуў рукою і накіраваўся да харчовага складу і ў яго мазгох прамільгнула дзіўная думка, што Аўстрыя ня здолее выйграць вайну, таму што салдаты зьядаюць паштэты сваіх афіцэраў.

Тымчасам Швэйк адвёў Балуна на другі бок вайсковае плятформы. Пры гэтым ён прабаваў суцешыць яго абяцаньнем схадзіць з ім разам у горад і купіць пану паручыку дэбрэцынскіх сасісак, а гэта быў той адмысловы гатунак кілбас, які ў Швэйка быў неяк шчыльна зьвязаны з уяўленьнем пра сталіцу вэнгерскае дзяржавы.

— А як раптам цягнік пойдзе без нас?—пачаў скогліць Балун, скупы да тае-ж ступені, як і пражэрлівы.

— Калі едзеш на фронт,—паважна заўважыў Швэйк,—ніколі ня спозьнішся на цягнік, бо ніводзін цягнік не захоча завесьці на месца прызначэньня толькі палавіну маршавага батальёну. Зрэшты, Балун, я цябе бачу наскрозь. Скнара ты, вось што, браток. .

Але ім нікуды не давялося пайсьці, бо ў тую-ж хвіліну пачуўся сыгнал на пасадку. Пасланыя па пайкі людзі вярнуліся са складу ў вагоны з пустымі рукамі. Замест эмэнтальскага сыру, які ім трэ' было атрымаць, ім выдалі на чалавека па ад-

ным пачку запалак і па адной паштоўцы выданьня «Камітэту па аздабленьні магіл згінуўшых ваякаў» і вось замест 150 грам эментальскага сыру, кожны абаронца бацькаўшчыны трымаў у руках малюнак Седліцкага (у Заходняй Галіцыі) салдацкага могільніка з помнікам няшчасным апалчэнцам, які быў зроблен згодна проекту скульптара, а на той час старэйшага унтэр-афіцэра з вольнапісаных Штольца.

Каля штабнага вагону таксама панавала нязвычайнае ўзбуджаньне. Афіцэры маршавага батальёну стоўпіліся вакол капітана Загнэра, які штосьці з запалам тлумачыў ім. Ён толькі што вярнуўся ад каменданта станцыі з вельмі сакрэтнаю ўжо тэлеграмаю са штабу брыгады, у гэтай даўжэзнай тэлеграме былі дадзены падрабязныя інструкцыі, як адносіцца да новага палажэньня, у якім апынулася краіна, пасьля 23 мая 1915 г.

Штаб брыгады паведамляў, што Італія абвясьціла Аўстра-Вэнгрыі вайну.

Яшчэ ў Бруку на Лейце ў афіцэрскім сабраньні пад час полудню ці то вячэры заўсёды абмяркоўвалася пытаньне пра дзіўныя паводзіны Італіі, але па сутнасьці ніхто не чакаў, спраўдзяцца словы гэтага ідыёта кадэта Біглера, які неяк пад час вячэры, адсунуўшы ў бок сваю дзялянку макаронаў, заявіў:

— Іх я наемся, як сьлед, пад сьценамі Вэроны.

Капітан Загнэр, азнаёміўшыся з толькі што атрыманымі са штабу брыгады інструкцыямі, загадаў трубіць трывогу.

Калі сабраліся ўсе людзі маршавага батальёну, іх выстраілі па ротах, і капітан Загнэр надзвычай усхваляваным голасам прачытаў ім атрыманы з брыгады загад:

> «Асьлеплены нячуваным здрадніцтвам і ненатольнаю прагавітасьцю, італьянскі кароль забыўся на братэрскія сувязі, якія рабілі яго саюзьнікам нашае монархіі. Ад самага пачатку вайны, калі яму належала стаць на бок нашых слаўных армій, здрадлівы італьянскі кароль граў ролю маскаванага бандыта, вядучы ўвесь гэты час таемныя перамовы з нашымі ворагамі і падрыхтоўваючы сваю здраду, якая закончылася ноччу з 22-га на 23-е мая абвяшчэньнем вайны нашай дзяржаве. Наш найвышэйшы

правадыр глыбока пераконаны, што наша слаўнае, непераможнае войска адкажа на брудную здраду падступлівага ворага такім зьнішчальным ударам, які прымусіць здрадніка прызнаць, што сваім ганебным і здрадніцкім уступленьнем у гэтую вайну ён сам падпісаў сабе сьмяротны прысуд. Мы маем цьвёрдую ўпэўненасьць, што з божаю дапамогаю хутка надыдзе дзень, калі італьянскія даліны зноў убачыць пераможцаў пры Санта-Лючыі, Вічэнцы, Навары і Кустоццы. Мы хочам перамагчы, мы павінны перамагчы, і мы пераможам!»

Пасьля было заўсягдышнае трохкратнае «ўра!», і салдаты, крыху зьбянтэжаныя, зноў паселі ў вагоны. Замест 150 грам эмэнтальскага сыру ім паднесьлі вайну з Італіяй.

*

У вагоне, дзе сядзелі Швэйк, каптэнармус Ванэк, тэлефоніст Хадынскі, Балун і кухар Юрайда, пачалася цікавая размова з прычыны ўступленьня Італіі ў вайну.

— У Табарскім завулку, у Празе быў вось гэткі выпадак,—пачаў Швэйк.—Жыў там адзін гандляр, прозьвішчам Гарчайшы. Крыху далей, амаль што насупраць яго, была крама гандляра Пажмурнага, а поруч, значыць—паміж абодвых, была крамка дробязяй гандляра Гаўлазы. Ну, вось Гарчайшы нейк і надумаўся, як нядрэнна было-б яму аб'яднацца з Гаўлазам супроць Пажмурнага, каб злучыць дзьве крамы пад фірмаю «Гарчайшы і Гаўлаза». А дробязьнік Гаўлаза зараз узяў ды пашоў да Пажмурнага ды кажа яму, што Гарчайшы дае яму тысячу дзьвесьце за ягоную, Гаўлазаву, крамку, каб толькі ўвайсьці да яго ў кампанію, але што калі ён, Пажмурны, дасьць яму тысячу восемсот, дык ён ахватней ўвайдзе з ім у кампанію супроць Гарчайшага. На гэтым яны і зладзілі, а Гаўлаза адзін час такі круціўся каля гэтага Гарчайшага, якога ён абдурыў, усё ўдаваў, быццам ён яму найлепшы дружак і прыяцель. А калі той яго пытаўся, калі-ж яны аформяць справу, ён усё казаў: «Цяпер ужо нядоўга. Я толькі чакаю, каб кватаранты вярнуліся з летніцы. І сапраўды, калі кватаранты вярнуліся, ён

справу аформіў, як і абяцаў Гарчайшаму. Дык вось, калі Гарчайшы пашоў аднойчы адчыняць краму, дык убачыў на краме свайго конкурэнта вялікую новую шыльду, а на шыльдзе выведзена новая фірма: «Пажмурны і Гаўлаза».

— У нас,—заўважыў дуркаваты Балун,—быў таксама такі выпадак: я хацеў купіць у суседняй вёсцы цялушку, і мне яе ўжо абяцалі, а мясьнік з Воціц перахапіў яе ў мяне з-пад самага носу.

— Цяпер, калі ў нас ёсьць яшчэ адна вайна,—гаварыў далей Швэйк,—калі ў нас ёсьць яшчэ адзін новы вораг і новы фронт, давядзецца ашчаджаць баявыя прыпасы. Чым больш дзяцей у сям'і, тым болей выдатку на розгі, як гаварыў стары Хаванэк у Матале, які за нейкую грашовую плату прыходзіў у сем'і сеч непаслухмяных дзяцей.

— Аднаго я баюся,—сказаў Балун, дрыжучы ўсім целам,— што праз гэтую Італію нам будуць даваць меншыя дзялянкі ежы.

Каптэнармус Ванэк глыбока задумаўся і сур'ёзна прамовіў:

— Усё можа быць, бо цяпер перамога наша крышку зацягнецца.

— Вось калі-б нам спатрэбіўся новы Радэцкі!—сказаў Швэйк.—Ён, прынамсі, быў-бы ўжо знаёмы з тэю мясцовасьцю і ведаў-бы слабыя бакі італьянцаў, і што атакаваць і з якога боку. Справа такая, што зусім ня гэтак проста куды-небудзь далезьці. Гэта дык усякі здолее, а вось выкараскацца адтуль— гэта ўжо сапраўднае вайсковае майстэрства. Калі куды-небудзь пнешся, трэба ведаць усё, што адбываецца наўкол, каб ня трапіць у такую кашу, што называецца катастрофаю. Вось у нашым доме, ведаеце, злавілі аднойчы на гары злодзея. Дык ён, калі лез туды, прыкмеціў, што штукатуры рамантавалі сьветлавы дворык; ён вырваўся, зьбіў з ног тоўстую дворнічыху і на штукатуравай люльцы спусьціўся на сьветлавы дворык, а адтуль яму ўжо наогул нельга было нікуды выбрацца.

Але нашаму бацьку Радэцкаму былі вядомы ўсе шляхі, дык яго ніяк немагчыма было злавіць. Я вось чытаў кніжку пра аднаго генэрала і там было напісана: як ён уцякаў ад Санта-Лючыі, і як італьянцы таксама ўцякалі, і як ён толькі назаўтра

здагадаўся, што выйграў бой. А з тэй прычыны, што італьянцаў ён не заўважыў нідзе, нават праз бінокль, дык ён вярнуўся і заняў пакінутую імі Санта-Лючыю. За гэтую справу яму далі годнасьць фэльдмаршала.

— А што Італія, па-мойму, дужа добрая краіна,—укруціў сваё слоўца кухар Юрайда.—Я за сваё жыцьцё быў аднойчы ў Вэнэцыі і ведаю, што італьянцы ўсіх абзываюць сьвіньня. Як толькі італьянец зазлуе, зараз-жа абзаве вас „porco maledetto“ *). У яго нават і папа рымскі сьвіньня, і мадонна—сьвіньня.

У сваю чаргу каптэнармус Ванэк таксама дужа прыхільна прыгадаў Італію. Да вайны ён вырабляў у сваёй лябораторыі ў Кралупе лімонны сок з гнілых лімонаў, і самыя танныя і самыя гнілыя лімоны ён атрымліваў з Італіі. Цяпер, мусіць, дастаўцы лімонаў з Італіі ў Кралуп—амэн.

Наогул вайна з Італіяй, як відаць, пацягне за сабою шэраг няпрыемных нечаканак, таму што Аўстрыя, напэўна, захоча адпомсьціць.

— Лёгка сказаць: адпомсьціць!—засьмяяўся Швэйк.—Іншы раз думаеш, што помсьціш, а ўрэшце пакутуе менавіта той, каго абіраеш, так сказаць, за зброю помсты. Калі я за некалькі год перад гэтым жыў яшчэ ў Вінаградах, у нас на першым паверсе жыў кіраўнік, а пакой у яго наймаў нейкі дробны чыноўнік. Гэты чыноўнік заўсёды хадзіў у адну карчомку на Крамэрожсавай вуліцы і палаяўся там з адным панам, у якога дзесьці ў Вінаградах была лябораторыя на дасьледваньне мачы. Пан гэты наогул ні пра што іншае не казаў і ня думаў, як толькі пра мачу, і заўсёды насіў з сабою бутэлечкі з мачою і ўсім тыкаў іх пад нос, каб і тыя далі яму зрабіць аналіз мачы, бо, бач, ад гэткага аналізу залежыць шчасьце самога чалавека і ягонае сям'і, і таму што каштуе гэта так танна, усяго толькі шэсьць крон. Усе, хто хадзіў у гэту карчомку, а таксама карчмар і ягоная жонка давалі рабіць аналіз мачы, і толькі наш чыноўнік не здаваўся, хоць той пан хадзіў за ім па пятах у прыбіральню і выходзячы, заўжды заклапочана гаварыў: «Ня ведаю, пане Скаткоўскі, але чамусьці мне вашая мача не падабаецца. Па-

*) Паршывая сьвіньня.

мачэцеся вы на ласку ў гэтую бутэлечку, пакуль яшчэ ня позна! Нарэшце ён упэўніў яго. Чыноўніку гэта каштавала шэсьць крон, а той пан крыху сфасэфікаваў яму аналіз, як гэта ён рабіў і з іншымі, не выключаючы карчмара і ягонае жонкі, якім ён, паміж іншым, нарабіў ці малых страт тым, што кожны аналіз суправаджаўся заўжды гэткімі сказамі, што гэта, бач, сур'ёзны выпадак, што, бач, піць нічога нельга акрамя вады, што, бач, курыць таксама нельга, жаніцца таксама нельга і есьці можна адну толькі гародніну. Ну, вось, наш чыноўнік страшэнна зазлаваў на таго пана, як і ўсе іншыя ды выбраў за зброю свае помсты нашага дворніка, бо ведаў яго за грубага і жорсткага чалавека. Неяк аднойчы ён і кажа таму пану, які займаўся аналізамі мачы, што наш дворнік сябе блага адчувае і просіць яго заўтра зайсьці раніцай гадзіне а сёмай па мачу, каб зрабіць аналіз. Ну, той і пашоў. Дворнік яшчэ спаў, калі той пан ветлівенька яго пабудзіў і сказаў: «Маю гонар вітаць вас, пане Малек! Добрае раніцы! Вось вам бутэлечка, памачэцеся, калі ласка, туды, а мне атрымаць з вас шэсьць крон. Ну, і пашла пацеха! Дворнік, як быў у адных споднiках, саскочыў з ложку, схапіў таго пана за горла ды бразнуў яго аб скрынку так, што той на ёй і лавіс. А пасьля сьцягнуў яго са скрынкі, дастаў раменны гарапнік, якім паганяюць валоў, ды пагнаў таго пана, як быў, у адных споднiках, па Галякоўскай вул., і той пан скуголіў, як сабака, якому наступілі на хвост, а на Гаўлічэнкавай вуліцы ўскочыў у вагон трамваю, а нашага дворніка затрымаў паліцэйскі. Ну, а з прычыны таго, што наш дворнік пачаў біцца і з паліцэйскім і акрамя таго быў у адных споднiках, дык яго за парушэньне цішыні і грамадзкага супакою і за спакусу пасадзілі ў каталажку, а ён, калі яго везьлі ў паліцэйскім фургоне, роў, як бык: «Сволачы, я вам пакажу, як маю мачу аналізаваць!» Так ён сабе й нахадайнічаў шэсьць месяцаў за буянства ў публічным месцы і за абразу дзеяньнем чыноў паліцыі пад час выканання службовых абавязкаў. А пасьля гэтага прысуду ён яшчэ дазволіў сабе абразіць дзекаго з членаў імпэратарскага дому, дык напэўна ён сядзіць яшчэ дагэтуль. Вось я і кажу, што калі іншы раз хочаш каму-небудзь адпомсьціць, дык заўжды пакутуе зусім невінаваты чалавек!

Тымчасам Балун пра штосьці моцна задумаўся і нарэшце са страхам запытаў:

— Дазвольце пацікавіцца пане каптэнармус, вы, значыцца, так мяркуеце, што з прычыны вайны з Італіяй нам будуць выдаваць меншыя дзялянкі?

— Дык гэта-ж ясна, як шоколяд,—адказаў Ванэк.

— Езус-Мар'я,—выгукнуў Балун, падпёр рукамі галаву ды тужліва сеў у куток.

Гэтым і закончыліся ў гэтым вагоне дэбаты з прычыны ўступленьня Італіі ў вайну.

*

У штабным вагоне, з прычыны адсутнасьці славутага вайсковага тэорэтыка, кадэта Біглера, гутарка пра ўступленьне Італіі ў вайну і стратэгічнае становішча, што стварылася ў сувязі з гэтым, была-б мусібыць, дужа нудная і вялая, калі-б падпаручык Дуб з 3-е роты не замяняў да вядомае ступені кадэта Біглера.

Падпаручык Дуб у грамадзянскім жыцьці быў настаўнікам аднае чэскае гімназіі і заўсёды няэвычайна старанна выяўляў сваю лёяльнасьць. Для пісьмовых прац ён заўсёды задаваў сваім вучням тэму з гісторыі габсбурскага дому. У малодшых клясах выабражэньне дзяцей палохалі імпэратар Максіміліян, які ўзьлез на нейкую скалу і ня здужаў адтуль зьлезьці, Іозэф II у ролі земляроба і Фэрдынанд добры. У старэйшых клясах тэмы былі куды складаней, як напрыклад тэма для 7-й клясы, «Імпэратар Франц-Іозэф, як прыхільнік навук і мастацтва». Праца на гэтую тэму выклікала звальненьне аднаго сяміклясьніка з гімназіі бяз права паступленьня ў якую-небудзь сярэднюю навучальную ўстанову ў аўстра-вэнгерскай монархіі за тое, што ён напісаў, што найлепшы ўчынак гэтага монарха была пабудова мосту імпэратара Франца-Іозэфа ў Празе.

Дуб заўжды меў няўхільнае нагляданьне, каб усе яго вучні з запалам сьпявалі народны гімн у дзень нараджэньня імпэратара ці ў іншыя да гэтага падобныя дужа ўрачыстыя сьвяткі. У компаніі яго ня любілі, бо вядома было, што ён даносіць, куды трэба на сваіх колег. У горадзе, дзе ён выкладаў, ён быў чле-

нам маленькага гуртка найвялікшых дурняў і боўдзілаў, куды ўваходзіў ён сам, начальнік акруговата кіраўніцтва і дырэктар гімназіі. У гэтым шчыльным гуртку ён навучыўся палітыканстваваць з пункту гледжаньня аўстра-вэнгерскае монархіі. Вось цяпер ён пачаў голасам і тонам заўзятага пэдагога выкладаць свае погляды.

— Урэшце, паводзіны Італіі мяне анікольі ня зьдзівілі,— гаварыў ён.—Я чакаў, што гэтак будзе, яшчэ тры месяцы перад гэтым. Ня трэба забывацца, што Італія за апошні час пасьля свае пераможнае вайны з Турцыяй за Трыполіс, дужа пачала задавацца. Апрача гэтага, яна вельмі разьлічвае на свой флёт і на настрой насельніцтва ў нашай берагавой вобласьці і ў паўднёвым Тыролі. Яшчэ да вайны мне давялося гаварыць начальніку нашага акруговага кіраўніцтва, што, на мой погляд, наш урад дарэмна аддае так мала ўвагі ірэндзіцкаму руху на поўдні. Ён цалкам згаджаўся са мною, бо кожны развэжлівы чалавек, які шануе захаваньне адзінства нашае монархіі, даўно павінен быў зразумець, да чаго мы можам давесьці справу, дзякуючы нашай надмернай спагадлівасьці да гэтых элемэнтаў. Я дужа добра помню, што два гады да гэтага я ў гутарцы з начальнікам акруговага кіраўніцтва выказаў і такі погляд, што Італія— гэта было пад час балканскае вайны, адразу-ж пасьля інцыдэнту з нашым консулам Прахаскаю—толькі чакае зручнага выпадку, каб па-здрадніцку напасьці на нас з тылу. А вось мы і дачакаліся!—крыкнуў ён такім голасам, быццам з ім усе спрачаліся, хоць усе прысутныя кадравыя афіцэры пад час яго прамовы паставіліся да прамовы гэтага балбатуна «з штацкіх» зусім абыякава.

— Праўда,—загаварыў ён ізноў больш спакойным тонам,— у большасьці выпадкаў, нават у школьных праграмах забываліся пра нашы ранейшыя дачыненьні з Італіяй ды на адважныя ўчынкі нашага слаўнага пераможнага войска, як у 1848 г., гэтак і ў 1861 г. пра што гаварыцца ў сёнешнім загадзе. Але я, заўсёды выконваючы свой абавязак, задаваў у канцы навучальнага году, а апошні раз перад самым пачаткам вайны, сваім вучням працу

на тэму: «Нашыя гэроі ў Італіі ад Вічэнцы да Кустоццы», ці— падпаручык Дуб урачыста падвысіў голас:

... ці: «Кроў і жыцьцё за Габсбургаў! За Аўстрыю, вялікую, адзіную ды непадзельную!»

Ён змоўк, чакаючы, як відаць, што і іншыя афіцэры, што ехалі ў штабным вагоне, выкажуць свой погляд, пасьля чаго ён яшчэ раз давёў-бы ім, што ён ужо за пяць гадоў перад гэтым прадбачыў паводзіны Італіі ў дачыненьні да саюзьнікаў. Але ён страшэнна памыліўся, бо капітан Загнэр, якому ордынарац Матушыч якраз падаў вячэрні выпуск «Пэштскага Льлёйду», сказаў, праглядаючы газэту:

— Вось як? Гэтая Вэйнэр, якую мы бачылі пад час яе гастроляй у Бруку, выступала ўчора тут, на сцэне Малога тэатру!

На гэтым закончыліся і ў штабным вагоне дэбаты пра Італію.

*

Батальённы ордынарэц Матушыч і дзяншчык капітана Загнэра Бацэр, якія сядзелі ў апошнім купэ, абмяркоўвалі вайну з Італіяй з чыста практычнага пункту гледжаньня, бо за многа год перад гэтым, яшчэ калі былі яны на прызыўной службе, абодва бралі ўдзел у якіхсьці манэўрах у паўднёвым Тыролі.

— Нішто сабе будзе справа лазіць па гарах,—сказаў Бацэр,—калі ў капітана ў самога цэлая гара чамаданаў! Я хоць і горны жыхар, але гэта ўжо зусім ня тое, як схаваць сабе пад крысо стрэльбачку ды пайсьці падстрэліць зайчыка ў Шварцэнбэрскім запаведніку.

— Гэта калі нас накіруюць туды ў Італію, мне таксама зусім не ў ахвоту цягацца з загадамі па гарох ды па глетчэрах. Ды яшчэ, якая там будзе паскудная ежа: толькі палента ды аліўкавае масла,—абазваўся Матушыч.

— А чаму пашлюць у горы менавіта нас?—узбуджана выгукнуў Бацэр.—Наш-жа полк быў ужо і ў Сэрбіі і на Карпатах, і я ўжо цягаўся з чамаданамі пана капітана і два разы губляў іх, адзін раз у Сэрбіі, другі раз на Карпатах, а пры гэтакім бязладзьдзі гэта можа здарыцца са мною і на італьянскім фронце... Ну, а што датычыць тамтэйшага ежыва...

Ён сплюнуў ды бліжэй падсунуўся да Матушыча.

— Ведаеш, у нас, у Бэргрэйтхэнштэйне робяць маленькія такія галачкі з сырое бульбы: вараць іх, пасьля пакачаюць у яйцы і ў сухарымах ды падсмажваюць на чыстым сьвіным сале.

Словы «сьвіно сале» ён вымавіў таемна-урачыстым тонам.

— І лепш ад усяго іх есьці з квашанаю капустаю,—мэлянхолічна дадаў ён.—Супроць такое справы ніякія макароны ня ўстояць!

На гэтым і тут скончылася гаворка пра Італію.



З тэй прычыны, што цягнік ужо дзьве гадзіны стаяў на станцыі, у астатніх вагонах узьнікла цьвёрдае аднадушнае перакананьне, што эшалён, як відаць, накіруюць па новым прызначэньні—у Італію.

За гэта сьведчыла і тое, што з эшалёнам рабіліся нейкія дзіўныя рэчы. Усіх людзей зноў пагналі з вагонаў; зьявіўся санітарны нагляд з дызэнфэкцыйным атрадам і апырскаў усе вагоны зьверху да нізу лізолем, што было сустрэнута дужа няпрыхільна, асабліва ў тых вагонах, дзе везьлі запасы хлебнае пайкі ды сухога харчаваньня.

Але загад ёсьць загад, а санітарная камісія загадала дэзынфікаваць усе вагоны эшалёну № 728, і таму кучы салдацкага хлеба ды мяхі з рысам былі спакойна абліты лізолем. З аднаго гэтага льга было зразумець, што адбываецца штосьці зусім асаблівае.

Пасьля ўсіх зноў пагналі ў вагоны, а праз паўгадзіны—зноў назад, таму што прыехаў рабіць агляд эшалёну такі старэнькі генэрал, што Швэйку здалося зусім натуральным назваць яго «дзядулька». Стоячы ззаду выстраенае шэрэнгі, ён ціхенька шапянуў каптэнармусу Ванэку:

— Ну і здыхляціна-ж!

А дзядулька-генэрал, абыходзячы ў суправаджэньні капітана Загнэра фронт, спыніўся перад нейкім маладзенькім салдацікам і, каб так сказаць, натхніць увесь атрад, запытаў, адкуль ён родам, колькі яму год і ці ёсьць у яго гадзіньнік.

Гадзіньнік у гэтага салдата быў, але ён надумаўшыся, што атрымае ад старога яшчэ адзін, адказаў, што ў яго няма гадзіньніка: на гэта дзядулька генэрал сказаў яму з гэткай-жа ідыёцкаю ўсьмешкай, якая бывала ў імпэратара Францы-Іозэфа, калі ён у якім небудзь горадзе адказваў на прывітаньне бургомістра:

— Вось гэта добра, вельмі добра!

А пасьля літасьціва зьвярнуўся да капрала, што стаяў поруч, ды запытаў, ці здарова яго жонка.

— Маю гонар далажыць,—гаркнуў капрал,—што я нежанаты.

І на гэта генэрал меў ласку гэтак-жа літасьціва ўсьміхнуцца ды заўважыць:

— Вось гэта добра, вельмі добра!

Нарэшце генэрал, што мусіць зьдзяцінеў ад старасьці, папрасіў капітана Загнэра паказаць яму, як салдаты самі разьлічваюцца на «першы-другі», і праз хвіліну пачулася ўжо:

— Першы!

— Другі!

— Першы!

— Другі!

— Першы!

Гэткіх генэралаў у Аўстрыі было хоць гаць гаці.

Калі агляд шчасьліва скончыўся, прычым капітану Загнэру давялося выслухаць ад генэрала ці мала прыемных слоў, людзям дазволілі пагуляць, ня выходзячы за межы вакзалу, бо бо атрыманы былі весткі, што цягнік кранецца не раней, як праз тры гадзіны. Людзі пачалі спацыраваць узад і ўперад па пэроне, з зайздрасьцю паглядаючы ці нельга чым-небудзь пажывіцца, а з тэй прычыны, што на вакзале панавала вялікае ажыўленьне, дык шмат каму пашанцавала выпрасіць папярос ці тытуну.

Рэзка кідалася ў вочы, што першапачатковы запал, які выяўляўся ва ўрачыстых прыёмах эскадронаў на вакзалах, моцна апаў, так што нават салдатам даводзілася жабрачыць.

Да капітана Загнэра зьявілася дэпутацыя «Саюзу для прывітаньня гэрояў»; яна складалася з дзьвёх страшэнна змучаных

пань, якія перадалі прызначаны маршаваму батальёну падарунак, а менавіта: дваццаць пушачак мятных ляпёшак, што зьяўляліся рэклямаю вырабаў аднае пэшцкае цукерні. Бляшаныя пушачкі, у якіх знаходзіліся гэтыя мятныя ляпёшкі, былі вельмі прыгожыя. На накрыўцы быў намаляваны вэнгерскі гонвэд, што паціскаў руку аўстрыйскаму апалчэнцу, над імі зьзяла карона сьв. Стэфана, а вакол ішоў надпіс на нямецкай ды мадзьярскай мовах: «За імпэратара, за бога і бацькаўшчыну!»

Гэтая пэшцкая цукерная фабрыка была так лёяльна, што ставіла імпэратара папярэдзе за бога.

У кожнай пушачцы было восемдзесят мятных ляпёшак, так што апулам прыпадала на кожныя тры чалавекі па пяць ляпёшак.

Апрача гэтага, бедныя змучаныя пані прывезьлі вялікі пакунак розных друкаваных малітваў, аўтарам якіх зьяўляўся будапэшцкі арцыбіскуп фон-Сатмар-Будафал. Яны былі надрукаваны на нямецкай і мадзьярскай мовах і зьмяшчалі ў сабе самыя жахлівыя праклёны на ўсіх ворагаў.

Згодна гэтага паважанага арцыбіскупа, бог павінен быў пасеч расійцаў, ангельцаў, сэрбаў, французаў і японцаў на катлету ды пашаткаваць іх на дробныя кавалачкі. Найласкавейшы бог павінен быў купацца ў крыві ворагаў і перабіць іх усіх да аднаго, як гэта зрабіў цар Ірад з дзецьмі.

У малітвах шаноўнага будапэшцкага ўладыкі сустракаліся, прыкладам, гэткія сказы: «Няхай блаславіць бог вашыя штыхі, каб яны глыбей праціналі чэрава вашых ворагаў. Хай накіруе ўсемагутны бог агонь вашых гарматаў проста на супаратавы штабы. Хай зробіць так усялітасны, найласкаўшы бог, каб усе ворагі вашыя захлынуліся ў крыві сваіх уласных ран, ад вашай рукі!»

Такім парадкам, трэба прызнацца, што ўсім гэтым малітвам не хапала ў канцы толькі аднаго добрага трохпавярховага слоўца. Калі абедзьве пані аддалі ўсё гэта капітану Загнэру, яны выказалі сваё гарачае жаданьне прысутнічаць пры раздачы падарункаў. У аднэй з іх хапіла нават адвагі заявіць, што яна

ахвотна зьвярнулася-б да салдатаў, якіх яна ўпарта называла «нашы слаўныя шэрыя шынэлі», з прачутым ударожным словам.

Абедзьве страшэнна пакрыўдзіліся, калі капітан Загнэр адмовіў здаволіць такую просьбу. Тымчасам падарункі былі адасланы ў вагон, дзе знаходзіўся склад.

Абедзьве паважаныя пані прайшлі праз шэрагі салдатаў, прычым адна ня мінула выпадку палапаць аднаго барадача па шчацэ. Гэта быў нейкі Шымэк з Будвэйсу, які ня меў нават уяўленьня пра высокую місію гэтых пань і, як толькі яны адвярнуліся, галасна сказаў сваім прыяцелям:

— Ну і нахабныя-ж тут бабы! Калі-б гэткая сьцерва была хоць да чалавека падобна, а то адны косьці ды скура, і ногі, як у чаплі, а морда,—як сем сьмяротных грахоў! А яшчэ гэтая старая клячa хоча прывабіць салдата!

На вакзале, як была ўжо сказана, панавала вялікае ажыўленьне. Выступленьне Італіі выклікала тут вядомую сумятню, таму што затрымалі два эшалёны артылерыі ды накіравалі іх у Штырыю. Тут-жа стаяў эшалён басьнякоў, ён тоўкся на вакзале ўжо двое сутак, і пра яго як быццам зусім забыліся Людзі двое сутак сядзелі без абеду і хадзілі ў Новы-Пэшт жабраваць. Наўкол толькі і чутна была мацярная лаянка забытых абураных басьнякоў: так цябе, ды растак, ды перагэтак!

Нарэшце маршавы батальён 91-га палка ізноў сагналі і пасадзілі ў вагоны. Але хутка пасьля гэтага батальённы ордынарац Матушыч вярнуўся ад комэнданта станцыі з паведамленьнем, што цягнік пойдзе толькі праз тры гадзіны. Людзей зноў выпусьцілі з вагонаў. Перад самым адыходам цягніка ў штабны вагон зьявіўся дужа ўзбуджаны падпаручык Дуб і патрабаваў, каб капітан Загнэр загадаў арыштаваць Швэйка. Падпаручык Дуб, вядомы абмоўца, яшчэ тады, калі быў настаўнікам у гімназіі, любіў пачынаць гутаркі з ніжэйшымі чынамі, каб выпытаць іхныя перакананьні і разам з тым навучыць ды адукаваць іх, чаму і за што яны ваююць.

Пад час свайго абходу ён заўважыў Швэйка, што стаяў каля ліхтара за будынкам вакзалу і з цікавасьцю разглядаў плякат

якойсьці вайсковай лётарэі. На гэтым плякаце быў намалёваны аўстрыйскі салдат, што пранізаў і прыціснуў барадатага салдата штыхом да сьцяны.

Падпаручык Дуб лоп нуў Швэйка па плячы і запытаў, як яму гэта падабаецца.

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане падпаручык,—адказаў Швэйк,—што гэта лухта! Мне давялося бачыць шмат бязглуздых плякатаў, але гэткага недарэчнага яшчэ не здаралася.

— Што-ж вам у ім не падабаецца?—запытаў падпаручык Дуб.

— Што мне ў ім не падабаецца, пане падпаручык? А вось што! Мне не падабаецца, як гэты салдат абыходзіцца з данай яму зброяй. Ён-жа можа зламаць штых аб гэтую сьцяну! А пасьля гэтага і наогул зусім ні да чаго, таму што яго яшчэ і пакараюць, бо расіец падняў рукі ўгару і здаецца. Значыцца—ён палонны, а з палонным трэба абыходзіцца як сьлед, таму што ўсёадно гэта такія-ж людзі.

— Значыцца,—ізноў дапытваўся падпаручык Дуб,—вам шкада гэтага расійца, ці што?

— Так точна, мне іх абодвух шкада, пане падпаручык. Расійца—таму што яго пранізалі штыхам, а нашага салдата—таму што яго за гэта арыштуюць. Ён-жа зламаў пры гэтым свой штых; нічога ня зробіш—сьцяна, куды ён яго прыпёр, відаць, каменная, а сталь, вядома, рэч крохкая. Вось у нас, дазвольце далажыць, пане падпаручык, яшчэ перад вайну, на прызыўнай службе быў адзін пан падпаручык у нашай роце, дык той гэтак лаяўся, што нават якая-небудзь старая шкура—і то гэтак ня ўмела. Але наогул ён быў дужа добры чалавек. Аднойчы на калядны ён раптам звар'яцеў—узяў ды купіў для ўсяе роты воз какосавых арэхаў. Ад таго часу я і ведаю, якая крохкая рэч—штых! Палавіна роты паламала штыхі аб гэтыя праклятыя арэхі. і наш ротны пасадзіў пад арышт усю роту, дык нават тры месяцы нікога ня пускалі на пабыўку, а пана падпаручыка патрымалі пад хатнім арыштам.

Падпаручык Дуб разьятрана глянуў на нявінную морду ўдалага ваякі Швэйка і злосна запытаў:

— Вы мяне ведаеце?

— Так точна, пане падпаручык, ведаю.

Падпаручык Дуб вырачыў вочы і затупаў нагамі.

— А я вам кажу, што вы мяне яшчэ ня ведаеце.

Швэйк са зьнешняй супакойнасьцю, быццам рапортуючы, паўтарыў:

— Ніяк нет, пане падпаручык, я вас нават дужа добра ведаю. Так што вы ёсьць пан афіцэр з нашага маршавага батальёну.

— Вы мяне яшчэ ня ведаеце!—зароў падпаручык Дуб.—Вы ведаеце мяне, можа быць, з добрага боку, але пачакайце—даznаецеся і з благога. Я вельмі суровы. Вы ў мяне яшчэ напла-чацеся, вось пабачыце. Значыць, як-жа гэта цяпер будзе: ведаеце вы мяне ці не!?

— Так точна, пане падпаручык, ведаю.

— А я вам кажу апошні раз, што вы мяне ня ведаеце, асёл вы чортаў. У вас браты ёсьць.

— Нікак нет, пане падпаручык, братоў у мяне няма.

Падпаручык Дуб, бачачы нявінную Швэйкаву морду, нявыказна разьюшыўся ды крыкнуў, ня маючы сілы болей стрымлівацца:

— У такім выпадку, ваш брат напэўна такая-ж быдлячына, як і вы. Кім ён быў?

— Профэсарам, пане падпаручык. Ён таксама адбываў вайсковую павіннасьць і вытрымаў экзамэн на прапаршчыка.

Падпаручык глянуў на Швэйка, быццам хацеў пранізаць яго вачыма. Швэйк з гонарам вытрымаў злосны падпаручыкаў зірк, і ўся гаворка паміж ім і падпаручыкам спынілася на гэты раз кароткаю камандаю.

— Кругом марш!

І так вось кожны пашоў у сваю дарогу і кожны думаў сваю думу.

Падпаручык Дуб думаў, што ён патрэбуе ад капітана Загнэра арыштаваць Швэйка, а Швэйк думаў, што ён бачыў ужо

шмат дурных афіцэраў, але што гэтакі экзэмпляр, як падпаручык Дуб,—рэдкасьць нават у палку.

Падпаручык Дуб, які якраз у гэты дзень надумаўся заняцца выхаваньнем салдатаў, знайшоў за вакзалам новыя ахвяры. Гэта былі два салдаты таго-ж самага палка, але іншага разьдзелу, якія ламанаю нямецкаю моваю таргаваліся ў цемнаце з двумя вулічнымі чараўніцамі, што дзесяткамі круціліся каля вакзалу.

Швэйк, адыходзячы, выразна чуў рэзкі голас падпаручыка Дуба:

— Вы мяне ведаеце?.. А я вам кажу, што вы мяне ня ведаеце... Але пачакайце, вы яшчэ пра мяне дазнаецеся... Можа быць, вы мяне ведаеце з добрага боку? Кажу вам, што вы дазнаецеся яшчэ і з благога... Вы ў мяне наплачацеся, калі вы гэтакія... У вас браты ёсьць? Яны, мусіць, гэткае-ж быдла, як і вы! Кім яны былі?.. У абозе?.. Ну, добра. Помніце, што вы салдаты... Вы—чэхі? А вы ведаеце, што Палацкі сказаў, што калі-б ня было аўстрыйскай монархіі, дык трэ' было-б яе стварыць?.. Кругом марш!..

Аднак абход падпаручыка Дуба ня даў агулам жадных дадатных вынікаў. Ён затрымаў тры групы салдатаў, але яго пэдагогічныя спробы «прымусіць наплакацца» мелі поўную няўдачу. Чалавецкі матэрыял, які везьлі на фронт, быў гэткае якасьці, што падпаручык Дуб у вачох кожнага салдата мог прачытаць, што той думае пра яго ня дужа што добра. Яго самалюбства было зачэплена, і нарэшце ён патрабаваў ад капітана Загнэра, у штабным вагоне, перад самым адыходам цягніка, арыштаваць Швэйка, матывуючы неабходнасьць ізоляцыі ўдалага ваякі Швэйка яго бязьмежна нахабнымі паводзінамі і назваўшы шчырыя Швэйкавы адказы «нахабным зьдзекваньнем». Ён з запалам даводзіў, што калі гэтак будзе працягвацца, дык афіцэрства страціць усякі аўторытэт у вачох ніжэйшых чыноў, у чым, вядома, не сумняваецца ніводзін з паноў афіцэраў. Сам ён яшчэ перад вайну казаў пану начальніку акруговага кіраўніцтва, што кожны начальнік павінен імкнуцца захаваць вядомы аўторытэт у вачох сваіх падначаленых, і пан начальнік акруговага кіраўніцтва з гэтым зусім згадзіўся. Асабліва-ж, цяпер у час

вайны, перад ворагам трэба трымаць салдатаў пад вядомым страхам. З гэтай прычыны ён, падпаручык Дуб, патрабуе для Швэйка суровага дысцыплінарнага пакараньня.

Капітан Загнэр, які, будучы кадравым афіцэрам, ня мог бачыць усіх гэтых афіцэраў запасу, гэтых «шпакоў», як ён іх называў, зьвярнуў увагу падпаручыка Дуба на тое, што гэткага парадку патрабаваньне ён можа заявіць толькі ў пісьмовым рапорце, а ніякім чынам вусна, як гэта робяць маклакі на рынку, таргуючыся аб цане бульбы. Што-ж датычыць самога Швэйка, дык першаю інстанцыяй зьяўляецца для яго пан паручык Лукаш. Наогул-жа такая справа вырашаецца пасьля рапорту. З роты такая справа пераходзіць у батальён, што, мусіць, пану падпаручыку вядома. Калі Швэйк чаго-небудзь начварыў, дык яго справа будзе разглядацца спачатку ў рапорце, а калі ён падасьць скаргу, дык у рапорце па батальёне. Калі пан паручык Лукаш згодзен лічыць апавяданьне падпаручыка Дуба за афіцыйнае паведамленьне, дык ён, капітан Загнэр, не супярэчыць супроць таго, каб зараз-жа прывесьці і дапытаць Швэйка.

Паручык Лукаш таксама ня меў нічога супроць такога вырашэньня пытаньня і толькі з свайго боку заўважыў, што ведае, што Швэйкаў брат сапраўды профэсар і афіцэр запасу.

Падпаручык Дуб зьбянтэжыўся і заявіў, што ён патрабаваў кары толькі ў шырокім сэнсе слова, бо вельмі магчыма, што згаданы Швэйк проста ня здолеў як трэба выказацца і таму ягоныя адказы і зрабілі ўражаньне настырлівасьці, нахабнасьці ды непавагі да свайго начальніка. Апрача гэтага, з ўсяго трыманьня згаданага Швэйка льга ўразумець, што ён прыдуркаваты.

Такім чынам, навальніца, што сабралася была над Швэйкавою галавою, шчасьліва разышлася, і бліскавіца яго не зачапіла...

*

У вагоне, дзе зьмяшчаліся канцылярыя і склад батальёну, батальённы каптэнармус Баўтанцле літасьціва адсыпаў двом батальённым пісарам па жмені мятных ляпёшак з пушачак, прызначаных на ўвесь батальён. Што-ж, гэта была штодзенная зьява.

што ўсё прызначанае на цэлы батальён праходзіла тэткую-ж маніпуляцыю, як і бяздольныя мятныя ляпёшкі!

На працягу ўсяе вайны гэта зрабілася такою звычайнаю зьяваю, што калі дзе-небудзь пад час рэвізіі вынікала, што салдатаў не абкрадалі, дык каптэнармус толькі зварочваў на сабе падазрэньне ў перавышэньні каштарысу ды ва ўчыненьні якіх колечы падробак з мэтаю хоць так-сяк упарадкаваць свае справы.

З гэтай прычыны, калі ўсе панапіхалі ў рот гэтых мятных ляпёшак, бо не знашлося нічога іншага, што-б льга было ўкрасьці ў салдатаў, Баўтанцль пачаў размову пра сумныя ўмовы, у якіх праходзіла гэтая паездка на фронт.

— Мне давялося ўжо ехаць з двума маршавымі батальёнамі,—сказаў ён,—але такой погані, як зараз, мне яшчэ не здаралася бачыць. Так, браткі вы мае, тыя разы мы яшчэ не пасьпелі даехаць да Эпэр'эсу, як мы ўжо атрымалі цэлыя горы ўсяго, што нам належала. Мне пашэньціла прыхаваць дзесяць тысяч штук папярос «Мэмфіс», два вялікія кругі эмэнтальскага сыру і трыста штук мясных консэрваў, а пасьля, як мы ўжо рушылі ў Бартфэльд займаць акопы, расійцы, з боку Эпэр'эсу адрэзалі нам сувязь з Музіным...

Вось калі справы зрабіліся! Я для адводу вачэй пакідаў ад усяго адну дзесятую частку на маршавы батальён, як быццам гэта я ашчадзіў, а ўсю рэшту продаў у абоз. Быў у нас там адзін маёр, Сойка—прозьвішча ягонае, дык гэта была, я вам далажу, гэткая сьвіньня, што... Ён быў ня надта што з адважных і ахвотней за ўсё аціраўся ў нас у абозе, таму што там наперадзе пасьвіствалі кулькі ды шрапнэлі. Вось ён усё нас і даведваўся, быццам яму трэба, бач, упэўніцца, ці добра гатуюць абед для людзей ягонага батальёну. Звычайна ён зьяўляўся да нас, калі рабілася вядома, што расійцы ізноў штосьці надумаліся. Дрыжучы ўсім целам, ён выпіваў дабраватую чарчыну рому, а пасьля прызначаў прагляд усіх палкавых кухняў, што засталіся пры абозе, таму што іх нельга было падвезьці да акопаў, і абед насілі туды ўночы. У той час у нас адбывалася тэткая катавасія, што пра афіцэрскую кухню ня было чаго і думаць. Адзіны, што заставаўся ў нас, шлях у тыл занялі немцы ды пачалі затрымлі-

ваць усё лепшае на сваю карысьць. Пасылалі з тылу нам, а яны, бывала, самі зжаруць, так што на нашую долю нічога не застанецца. Адным словам, сядзелі мы ў абозе без афіцэрскага забесьпячэньня. За ўвесь гэты час мне не пашанцавала ашчадзіць для нас у канцылярыі нічога, апрача няшчаснае сьвінячкі, якую мы зарэзалі ды вэндзілі для сябе. А каб не пранюхаў пра яе маёр Сойка, мы яе трымалі ў адлегласьці на гадзіну хады ад нас у артылерыйскім парку, дзе ў мяне быў знаёмы фэервэркер. Дык вось гэты маёр кожнага разу, як зьявіцца да нас, пачынае каштаваць сжыва з катла. Праўда, мяса шмат варыць не даводзілася, толькі тое, што знойдзеш у ваколічных сялян—худую кароўку ці сьвіньню. Гэта нам прусакі накепсьцілі, таму што яны за жывёлу пад час рэквізыцый плацілі ўдвая больш за нас. Такім чынам, за ўвесь час, калі мы стаялі пад Бартфэльдам, мы зэканомілі на мясе толькі якія-небудзь тысяча дзьвесьце крон, хоць мы і выдавалі пераважна замест грошай квітанцыі з батальённаю пячаткаю, асабліва пад канец, калі даведаліся, што расійцы на ўсход ад нас занялі Радваны, а на захад—Падол. І горш за ўсё мець справу з такім народам, як там, што ня ўмее ні чытаць, ні пісаць, а расьпісваецца толькі трыма крыжыкамі. Нашае інтэнданцтва гэта добра ведала, так што калі мы пасылалі па грошы, мы не маглі пасылаць яму падроблены квіток, быццам я выплаціў вось такую суму. Гэта льга рабіць толькі ў такіх мясцох, дзе народ асьвечаны і ўмее расьпісвацца. А пасьля, як я ўжо казаў, прусакі плацілі больш за нас і плацілі зараз-жа, дык калі мы куды-небудзь прыяжджалі, на нас глядзелі, як на рабаўнікоў, да таго-ж інтэнданцтва загадала, каб квіткі, падпісаныя трыма крыжыкамі, перадаваліся ў ваенна-палявы кантроль. Ну, а там, вядома, выведнікаў, як сабак нярэзаных! Адзін гэтакі тыпус хадзіў да нас, хадзіў, піў ды еў па горла, а пасьля нас-жа і абмовіў. І маёр Сойка заўсёды тыцкаў свой нос ва ўсе катлы. Дальбог, аднойчы ён выцягнуў з катла мяса, прызначанае на ўсю чацьвертую роту. Пачалося са сьвіное галавы; яму здалося, што яна дрэнна ўварана, вось і загадаў яшчэ крышку паварыць. Праўда, у той час, мяса шмат не варылі, на ўсю роту было прыкладам дванаццаць старых добрых дзялянак, але ён усё ўвабраў, а пасьля яшчэ пакаштаваў

крупнік і нарабіў гармідару, што ён рэдкі, як вада, і што гэта за парадкі, каб мясны крупнік быў бяз мяса. Пасьля ён загадаў дадаць туды мукі на затаўку ды засыпаць мае апошнія макароны, якія я ашчадзіў за ўвесь гэты час. Але гэта было яшчэ ня так крыўдна, як тое, што туды-ж пашло і два кілё сьметаннага масла, якія засталіся ў мяне яшчэ ад тэй пары, як была афіцэрская кухня. Яны ў мяне хаваліся на паліцы над маёю койкаю і маёр пачаў на мяне крычаць, адкуль у мяне гэтае масла. Я яму адказаў, што па раскладцы належыць на аднаго салдата па 15 грам масла ці па дваццаць адным граму тлушчу, і што гэтае масла, таму што яго нехапае, мы ашчаджаем да таго часу, пакуль салдатам можна будзе выдаць усё, што ім належыць. Маёр Сойка дужа расхваляваўся і накрычаў на мяне, што я, мусіць, чакаю, пакуль прыдуць расійцы і адбяруць у нас апошнія два кілё масла, і што гэтае масла зараз-жа павінна быць пакладзена ў крупнік, калі там яшчэ няма масла. Такім чынам, я страціў усе свае запасы, і вы можаце сабе паверыць, што гэты маёр, як толькі ён бывала зьявіцца ў нас, заўжды прыносіў мне якое-небудзь няшчасьце. У яго пакрысе выпрацаваўся гэткі нюх, што ён адразу знаходзіў усе мае запасы. Аднойчы, калі я прыхаваў для сябе кавалак пячонкі і толькі што зьбіраўся яе сьпячы, ён палез проста пад маю койку ды выцягнуў яе адтуль. Я яму сказаў, што гэтую пячонку трэ' было-б закапаць у зямлю, што гэткі факт устанавіў адзін каваль з артылерыйскага парку, які вучыўся на вэтэрынарных курсах. Тады маёр узяў аднаго ніжэйшага чына з абозу і разам з ім накіраваўся ў горы, і там пачаў смажыць гэтую пячонку, разлажыўшы вогнішча, і гэта яго згубіла. Таму што расійцы заўважылі агонь і—бац! па ім і па вогнішчы восемнаццацісантымэтроўкаю... Пасьля мы хадзілі глядзець, і нельга было адрозьніць, ці то на каменьні параскіданы кавалкі бычынае пячонкі, ці то—пячонкі самога пана маёра...

*

Пасьля атрымалі весткі, што цягнік пойдзе далей толькі праз чатыры гадзіны, таму што вучастак чыгункі на Гатван загружаны цягнікамі з паранеными. Апрача таго на вакзале пашырыліся

чуткі, што недалёка Ягру санітарны цягнік з хворымі і параненымі наскочыў на цягніка са знарадамі і што з Пэтру адпраўлены туды цягнікі, каб даць якую-колечы дапамогу.

Хутка фантазія салдатаў разышлася дарэшты. Называлі ўжо лічбу—дзьвесьці забітых і параненых і казалі, што аварыя была выклікана наўмысьне, каб захаваць розныга парадку злоўжываньні пры харчовым забесьпячэньні санітарнага цягніка.

Гэта зьявілася прычынаю для жорсткае крытыкі непарадкаў у харчовай частцы і гэтага маршавага батальёну з ласкі розных эладзюг у канцылярыях да складах.

Большасьць трымалася погляду, што батальённы капцёр Баўтанцль дзеліцца ўсім з афіцэрамі.

У штабным вагоне капітан Загнэр абвясьціў, што згодна маршруту ім, уласна кажучы, трэ' было быць ужо на галіцыйскай мяжы. У Ягры належала атрымаць консэрвы і хлеб для людзей на тры дні, а да Ягру яшчэ дзесяць гадзін язды і там стаіць столькі цягнікоў з параненымі пры наступленьні на Львоў, што, мяркуючы па тэлеграмах, у Ягры нельга атрымаць ніводнай буханкі хлеба, ніводнай бляшанкі консэрваў. Ён, капітан Загнэр, атрымаў загад выдаць замест хлеба і консэрваў па 6 крон і 72 хэлеры на чалавека, якія павінны быць выплачаны пры раздачы пэнсіі за дзевяць дзён, вядома, гэта ў тым выпадку, калі ён да таго часу атрымае грошы са штабу брыгады, таму што грошай зараз у яго ёсьць якіх-небудзь дванаццаць тысяч крон.

— Аднак, якое гэта сьвінства,—сказаў паручык Лукаш,—што нас паслалі на фронт зусім жабракамі.

Прапаршчык Вольф шапянуў на вуха паручыку Коларшу, што, згодна ягоных вестак, палкоўнік Шрэдэр за апошніх тры тыдні адаслаў на свой бягучы рахунак у адным венскім банку 16.000 крон.

Пасьля гэтага паручык Коларш расказаў, якім чынам дасягалася такая ашчаднасьць. Проста, у палка ўкрадуць, скажам, 6000 крон, паложаць іх ва ўласную кішэню, а пасьля пасьлядоўна і лёгічна загадаюць усім кухням штодзень выдаваць на кожнага чалавека па тры грамы сахару менш, як належыць.

На месяц гэта складае 90 гр мяса на чалавека, а на роту—прынамсі 16 кілё гароху на карысьць дасьціпнага начальства.

Паручык Коларш і прапаршчык Вольф расказвалі адзін аднаму ў агульных рысах тыя выпадкі, якія яны самі назіралі, але ня было жаднага сумненьня, што ва ўсім вайскова-гаспадарчым кіраўніцтве было вельмі многа гэткіх выпадкаў. Гэта сыстэма пачыналася ад каптэнармуса якой-небудзь роты і канчалася на злодзеі ў генэральскім мундзіры, што зьбіраў грошыкі на чорны дзень.

Вайна вымагала сьмеласьці і ў крадзежы.

Інтэнданты з любоўю пазіралі адзін на аднаго, быццам хочучы сказаць: «Мы—адна нацыя! Мы крадзем, таварыш, мы шальмуем, братка, але што-ж зробіш—на ражон не палезеш. Калі я не ўкраду, дык усёроўна ўкрадзе іншы, ды яшчэ будзе гаварыць, што я ня ўкраў толькі таму, што ўжо даволі накраўся».

У вагон увайшоў вайсковы з чырвонымі лампасамі. Гэты быў яшчэ адзін генэрал з тых, якія павінны былі інспэктаваць усе вучасткі чыгункі.

— Сядайце, панове,—ласкава кіўнуў ён, радуючыся, што засьлеў неспадзеўкі адзін эшалён, пра які і сам ня ведаў, што знойдзе яго тут.

Капітан Загнэр хацеў зьявіцца да яго з рапортам, але ён толькі матнуў рукою.

— У вашым эшалёне няма парадку,—адрывіста загаварыў ён. Ваш эшалён яшчэ ня сьпіць. Ваш эшалён павінен быў-бы ўжо спаць. У эшалёнах, калі яны стаяць на станцыі, людзі павінны класьціся спаць, як у казарме, а дзевятай гадзіне. За некалькі хвілін да дзевятае людзей выводзяць у прыбіральні за вакзалам, а пасьля людзі кладуцца спаць. Бо інакш людзі запаскудзяць уначы ўвесь вучастак чыгункі. Разумееце, пане капітан? Паўтарыце, калі ласка, тое, што я вам сказаў. Ці—пачакайце. Не паўтарайце мне гэтага, а зрабеце, як я хачу. Трубіць трывогу! Усіх пагнаць у прыбіральні! Трубіць адступленьне. Класьціся спаць! Праверыць, хто ня сьпіць. Для прыкладу пакараць! Так, так! Ну, усё, як быццам? Так. вячэру даваць а шостай гадзіне.

Пасьля ён загаварыў пра штосьці, што было ў мінулым, пра штосьці, чаго ня было ці што адбылося, так сказаць, пад некім іншым кутом. Ён здаваўся прывідам са сфэр чацьвертага вымеру.

— Вячэраць даваць а шостай гадзіне,—гаварыў ён і зірнуў на гадзіньнік, што паказваў ужо дзесяць хвілін на дванаццатую ночы.—А палове дзесятай—трывога, праходка ў прыбіральню, пасьля спаць. На вячэру а шостай гадзіне даецца гуляш з бульбаю замест 150 грамаў эмэнтальскага сыру.

Пасьля дадзен быў загад—падрыхтавацца. Капітан Загнэр зноў загадаў трубіць трывогу, і генэрал-інспэктар пачаў назіраць, як строіцца батальён, пахаджваючы з афіцэрамі ўзад і ўперад, бесьперастанку тлумачачы ім адно і тое-ж, быццам яны былі ідыёты і нічога не маглі ўцяміць, і тыцкаючы пальцам у цыфэрблят свайго гадзіньніка.

— Дык вось якая справа. А палове дзевятае—у прыбіральні, а праз паўгадзіны спаць. Гэтага зусім даволі. У гэты пераходны час салдата ўсёадно гоніць... А я асобнае значэньне надаю сну. Сон—гэта ёсьць падмацаваньне для далейшых пераходаў. Пакуль людзі сядзяць у вагонах, яны павінны адпачыць Калі ў вагонах няма месца, людзі сьпяць па чарзе. Адна зьмена ўладжваецца на начлег як мага выгодней і сьпіць ад дзевятай гадзіны вечару, да дванаццатай ночы, а іншыя стаяць і глядзяць. Пасьля першая зьмена, выспаўшыся, пераступае месца другой, якая сьпіць ад дванаццатай ночы да трэцяе гадзіны раніцы. Астатняя зьмена сьпіць ад трэцяй да шостай раніцы. А шостай гадзіне ранішні сыгнал, і людзі пачынаюць мыцца і, галоўнае, каб у час руху цягніка ня выскакваць з вагону. Паставіць перад эшалёнам патруль, каб людзі пад час руху не с а с к а к в а л і! Калі в о р а г зломіць нагу нашаму салдату (тут генэрал палопаў сабе паназе), дык гэта зьяўляецца чымсьці ганаровым, але калечыць сабе ногі, саскакваючы з цягніка—злачынства і гэта павінна бязьлітасна карацца».

— Значыць, гэта і ёсьць ваш батальён?—зьвярнуўся ён да капітана Загнэра, убачыўшы сонныя постаці людзей, з каторых шмат хто ня мог стрымацца і, трапіўшы са сну на сьвежае начное паветра, пазяхаў на ўвесь рот.—Гэта-ж батальён пазяхайлаў.

пане капітан! Вось бачыце, людзям трэба класьціся а дзевятай гадзіне.

Генэрал спыніўся перад адзінаццатаю ротаю, дзе на левым флянгу знаходзіўся Швэйк. Ён страшэнна пазяхаў, шырока разявіўшы рот і прыстойна прыкрываючы яго рукою. Але з-пад гэтае рукі разыходзіліся тэткія гукі, падобныя да зьвярынага рыку, што паручык Лукаш задрыжэў ад страху, каб генэрал не зьвярнуў увагі на гэтае паходжаньне. Да таго-ж яму здалося, што Швэйк сумысьля гэтак пазяхаў.

І сапраўды генэрал адвярнуўся і, падышоўшы да Швэйка, запытаў яго, быццам старога знаёмага.

— Чэх ці немец?

— Так точна, чэх, пане генэрал-маёр.

— Добра,—сказаў генэрал,—ён сам быў паляк і крыху разумеў па-чэску,—але чаго-ж ты рыкаеш, як карова? У прыбіральні ты ўжо быў ці не?

— Нікак нет, ня быў, пане генэрал-маёр.

— А чаму-ж ты з іншымі не хадзіў да ветру?

— Дык вось дазвольце, пане генэрал-маёр, на манэўрах у Пісэку пан палкоўнік Вахтль казаў нам, калі людзі на прывале залезьлі ў жыта, што салдат не павінен увесь час думаць пра тое, як-бы схадзіць да ветру, а салдат павінен думаць пра бой... А тымчасам, дазвольце далажыць, што нам рабіць у прыбіральні, калі, з дазволу сказаць, з сябе ўжо і выціснуць няма чаго. Згодна раскладу, нам ужо на некалькіх станцыях трэ было атрымаць вячэру, а атрымаць дык мы нічога не атрымалі. А з пішчымным чэравам я ў прыбіральню не палезу.

Расказаўшы генэралу ў гэтакіх простых выразах агульнае становішча, Швэйк так спагадліва глянуў на яго, што той зразумеў Швэйкаву просьбу дапамагчы ім усім у іхным горы. Як хочаце, калі ўжо даецца загад ісьці агульнаю колёнаю ў прыбіральню, дык гэтакі загад павінен, так сказаць, і ўнутраным чынам на нечым грунтавацца.

— Пасадзіць людзей ізноў у вагоны,—сказаў генэрал капітану Загнэру.—Якім гэта чынам людзі засталіся без вячэры? Усе эшалёны, што праходзяць гэтую станцыю, павінны атрымлі-

ваць вячэру, таму што тут харчовы пункт. Іначай і быць ня можа. На гэта-ж існуе пэўны расклад.

Усё гэта генэрал прамовіў з гэткаю рашучасьцю, якая адзначала, што зараз ужо дванаццатая гадзіна начы, што вячэра, як было зазначана, павінна была быць раздадзена а шостай гадзіне і што з гэтай прычыны не заставалася нічога іншага, як затрымаць цягнік тут яшчэ на адны суткі да шасьці гадзін заўтрашняга дню, каб людзі атрымалі належны ім гуляш з бульбаю.

— Няма нічога горш,—з нявымоўнаю сур'ёзнасьцю гаварыў ён далей,—як забываць у час вайны пад час перавозкі войскаў накарміць салдатаў. На маім абавязку ляжыць праконтроляваць, што, уласна кажучы, робіцца ў канцылярыі комэнданта станцыі. Бо, панове, часамі вінаваты самі начальнікі эшалёнаў... Пры рэвізаваньні станцыі Забатка на босьнінскай чыгунцы, я дапэўніўся, што шэсьць эшалёнаў не атрымалі вячэры. Шэсьць разоў на гэтай станцыі гатавалі гуляш з бульбаю, і яго ніхто не патрабаваў, так што даводзілася выкінуць на сьметнік цэлыя горы мяса і бульбы,—так, так панове!—а на тры станцыі далей салдаты тых самых эшалёнаў, якія праехалі ў Забатцы паўз горы гуляшу, выклянчвалі ў публікі на божае імя скарыначку хлеба. Тут ужо, як бачыце, вінна была не харчовая частка, а не на належнай вышыні былі начальнікі эшалёнаў. Пойдзем у канцылярыю!—закончыў ён, узбуджана размахваючы рукою.

Афіцэры пашлі за ім, пытаючыся самі ў сябе, чаму ўсе генэралы павар'яцелі.

У комэндатуры высьветлілася, што пра гуляш нічога невядома. Праўда, сягоньня меркавалі гатаваць гуляш на ўсе эшалёны, што праяжджалі гэты пункт, але пасьля прышоў загад— замест вячэры крэдытаваць кожнага ніжэйшага чына 75 хэлерамі, выдаўшы людзям гэтыя грошы на рукі ў час бліжэйшай выплаты пэнсіі праз палявыя казначэйствы. Што датычыць хлеба, дык людзі павінны былі атрымаць па паўбуханкі на станцыі Вацьян.

Начальнік харчовага пункту, як відаць, нічога не баяўся. Ён сказаў генэралу проста ў твар, што загады зьмяняюцца кожную гадзіну. Іншы раз, напрыклад, у яго падрыхтавана харчаваньне для такога-ж эшалёну і раптам прыходзіць санітарны цягнік, па-

казвае загад якога-небудзь вышэйшага начальства, і вось нічога ня зробіш, даводзіцца здавольвацца пустымі катламі!

Генэрал у знак згоды ківаў галавою, але ўсё-ж сказаў, што цяпер відаць зрух на лепшае, а на пачатку вайны справа была куды горай. Адразу-ж з усім ня ўправішся! Тут патрэбна вялікая практычная дасьведчанасьць. Тэорыя, па сутнасьці, толькі тармозіць практыку. А чым далей цягнецца вайна, тым больш усё належным чынам парадкуецца.

— Вось вам прыклад з мае ўласнае практыкі,—сказаў ён у захапленьні, што яму пашэнціла прыдумаць гэткі адменны прыклад:—за два дні перад гэтым эшалёны, што праходзілі праз станцыю Гатван, не атрымалі хлеба, дык яны атрымаюць яго там-жа заўтра... Ну, а цяпер пойдзем у буфэт.

У буфэце генэрал ізноў пачаў гутарку пра прыбіральні і дадаў, як неэстэтычна, калі па ўсім чыгуначным шляху раскіданы чалавецкія экскрэмэнты і ў час гэтага ён зусім спакойна еў заказаны ім біфштэкс.

Прыбіральням ён надаваў гэткае значэньне, як быццам ад іх залежала перамога двуадзінай монархіі.

З прычыны новага становішча ў сувязі з выступленьнем Італіі, ён заявіў, што менавіта з наладжэньня прыбіралень нашае арміі вынікае наша бязумоўная перамога ў італьянскай кампаніі.

Так вось перамога Аўстрыі выцякала з... прыбіралень. Для гэтага генэрала ўсё было згодна рэцэпту: «А шостай гадзіне салдатам даецца гуляш з бульбаю, а палове дзевятае непераможнае войска аслабаняе жываты ад непатрэбшчыны на раўчох, а ў дзевяць гадзін кладуцца спаць». Перад такою арміяй кожны вораг павінен уцякаць у панічным страху.

Генэрал задумаўся, запаліў сігару і доўга-доўга разглядаў столь. Ён думаў, што-б яшчэ такое сказаць, калі ён ужо тут, і чым-бы яшчэ пададукаваць афіцэраў маршавага батальёну.

— Ядро вашага батальёну—моцнае і здаровае,—раптам сказаў ён, калі ўсе чакалі, што ён так і будзе глядзець у столь ці маўчаць.—Людзі ў вас, як відаць, цалкам усьвядомліваюць свой абавязак. Радавы, з якім я размаўляў, абуджае сваёй шчырасьцю

ды вайсковай выпраўкай найлепшы погляд на свой батальён. Я ўпэўнен, што ён будзе біцца да апошняе кроплі крыві.

Ён змоўк і ўсьпершыся на бакавіцу крэсла зноў утаропіўся ў столь, а пасьля, не зьмяняючы становішча, прычым толькі паручык Дуб з уласьцівым яму падхалімствам таксама пачаў глядзець у столь, загаварыў ізноў:

— Але вашаму батальёну патрэбна, каб ягоныя дзеі ня былі забыты. Іншыя батальёны вашае брыгады ўжо стварылі сваю гісторыю, якую вашаму батальёну давядзецца працягваць. І вось, у вас якраз няма такога чалавека, які-б рабіў дакладныя запісы і на грунце іх пісаў гісторыю батальёну. У ім павінны сыходзіцца ўсе ніці гэтае гісторыі. Яму павінна быць вядома ўсё, што робіць кожная рота яго батальёну. Гэта павінен быць інтэлігентны чалавек, не якая-небудзь шэрая жывёліна, быдла... Адным словам, пане капітан, вы павінны прызначыць каго-небудзь за гісторыёграфа вашага батальёну.

Пасьля ён зірнуў на насьценны гадзіньнік, стрэлкі якога нагадвалі асавелай кампаніі, што час, нарэшце, разыходзіцца.

Інспэктарскі цягнік генэрала стаяў на самым вакзале, і генэрал запрасіў паноў афіцэраў да сябе ў салён-вагон. Комэндант станцыі ўздыхнуў. Генэрал і не падумаў заплаціць за біфштэкс і бутэльку віна і комэнданту зноў трэ' было плаціць за іх з свае кішэні. Такія візыты траплялісь па некалькі разоў на дзень. Каб аплаціць іх, комэндант затнаў ужо два вагоны прасаванага сена, якія ён загадаў перавесьці на запасную лінію і прадаў фірме «Левэнштэйн і К-о, вайсковыя пастаўшчыкі. Пасьля казна зноў купіла гэтыя два вагоны ад «Левэнштэйн і К-о», але комэндант пакінуў іх стаяць на тэй-жа запаснай лініі. Адкуль-жа вядома, можа быць, іх яшчэ раз трэ' будзе прадаць тэй-жа самай фірме.

Затое ўсе вайсковыя інспэктары, якія праяжджалі гэтую галоўную станцыю ў Пэшце, у адзін голас запэўнялі, што там у камэнданта... цудоўна кормяць.

*

Раніцай эшалён усё яшчэ стаяў на станцыі. Пратрубілі ранішні сыгнал і салдаты выйшлі са сваімі бачкамі мыцца пад помпай. Генэрал яшчэ не паехаў і асабіста аглядаў прыбіральні.

куды, згодна сутачнага загаду па батальёне, людзі вадзілі па аддзяленьнях, пад камандаю аддзялённых начальнікаў, каб зрабіць здавальненьне пану генэрал-маёру.

А каб зрабіць гэтую-ж прыемнасьць і падпаручыку Дубу, капітан Запнэр прызначыў яго на гэты дзень за дзяжурната.

Дык вось, падпаручык Дуб, трымай дзяжурства каля прыбіралень.

Нізенькая, але вялікая мужчынская прыбіральня, каля вайсковай пляцформы, з дзьвюма радамі раўкоў, магла зьмясьціць адначасна два аддзяленьні.

Салдаты садзіліся на кукішкі над выкапанымі раўкамі, адзін каля аднаго, быццам ластаўкі на тэлеграфных правадох перад асеньнім адлётам у цёплыя краіны.

Ва ўсіх выглядалі голыя ляшкі са спушчаных нагавіц і ва ўсіх матляліся на шыі паясы, быццам кожны зьбіраўся вось-вось павесіцца і чакаў толькі адпаведнае каманды. У гэтым, сапраўды, адчувалася жалезная вайсковая дысцыпліна і арганізаванасьць.

На левым флянгу сядзеў Швэйк, які трапіў сюды зусім выпадкова, і з цікавасьцю чытаў абрывак старонкі бог ведае якім ветрам занесенага сюды роману Ружэны Ясеньскай.

Адарваўшы вочы ад паперы, ён міжвольна глянуў у бок выхаду з прыбіральні і абамлеў ад зьдзіўленьня. Там стаяў у поўнай параднай форме ўчарайшы генэрал-маёр са сваім ад'ютантам, а поруч з ім падпаручык Дуб штосьці яму старанна тлумачыў.

Швэйк азірнуўся наўкол. Усе спакойна засталіся сядзець, і толькі аддзялённыя застылі, так сказаць, бяз руху.

Швэйк прасякнуўся сур'ёзнасьцю моманту.

Ён ускочыў, як быў са спушчанымі нагавіцамі і з поясам наўкол шыі, скарыстаўшы яшчэ ў апошнюю хвіліну свой кавалак паперы, і гаркнуў:

— Адставіць! Стройся! Зважай! Вочы на-пра-ва!

І ўзяў пад казырок.

Два аддзяленьні са спушчанымі нагавіцамі і з паясамі наўкол шыі падняліся над раўкамі.

Генэрал-маёр ветліва ўсьміхнуўся і закамандаваў:

— Вольна! Працяваць!

Унтэр-афіцэр Малек падаў свайму аддзяленьню добры прыклад і зараз-жа ўзяў старое становішча. Толькі Швэйк стаяў і ўсё трымаў пад казырок, бо з аднаго боку да яго падыходзіў грозны падпаручык Дуб, а з другога генэрал-маёр, які ветліва ўсьміхаўся.

— Я бачыў вас сягоньня ноччу,—вымавіў генэрал, заўважыўшы комічнае становішча Швэйка.

— Вінават, пане генэрал-маёр,—зьвярнуўся да генэрала ўсхваляваны падпаручык Дуб,—дазвольце далажыць, што гэта чалавек слабага розуму і вядомы, як ідыёт, як славутны дурань.

— Што вы за лухту гародзіце, пане падпаручык,—кінуўся раптам на яго генэрал і наўмысна голасна абвясьціў:—якраз наадварот было-б пэўней. Ніжэйшы чын, які ведае, што трэба рабіць, убачыўшы начальніка, і унтэр-афіцэр, які яго як быццам не заўважае і нават ігноруе. Зусім, як гэта бывае пад час бою—просты радавы прымае на сябе ў хвіліну небясьпекі камандваньне, а якраз-жа пану падпаручыку Дубу самому варта было-б закамандваць тое, што закамандваў гэты просты салдат—адставіць, стройся, зможай, вочы на-пра-ва!

— А ты ўжо?—спытаў Швэйка генэрал-маёр.

— Так точна, пане генэрал-маёр. Усё ў парадку.

— Значыць, ты гэтае... скончыў.

— Так точна, пане генэрал-маёр, скончыў.

— Ну, дык станавіся ізноў ва фронт.

З прычыны таго, што генэрал вымавіў словы «ва фронт» крыху галасьней, бліжэйшыя да іх людзі зноў пачалі ўздымацца над раўкамі.

Аднак генэрал ласкава матнуў рукой і сказаў ветлівым бацькаўскім тонам:

— Ды не-ж, вольна, вольна, хлопцы! Рабіце сваю справу.

Швэйк стаў цяпер у поўным парадзе перад генэралам-маёрам, і той зьвярнуўся да яго з кароткаю прамовай па-нямецку:

— Павага да чыну, веданьне статутаў і кемлівасьць, гэта ўсё, што патрабуецца на вайсковай службе. А калі да гэтага дадаць адважнасьць, дык няма такога ворага, якога-б нам давялося баяцца.

Пасьля, папхнуўшы Швэйка пальцам у жывот, ён зьвярнуўся да падпаручыка Дуба:

— Запішэце: гэтага чалавека пасьля прыходу на фронт зараз-жа падвысіць у наступную годнасьць і пры першым-жа выпадку прадставіць да бронзавага мэдалю за дакладнае выкананьне службы і веданьне... ну, вы самі ведаеце, што я хачу сказаць... можаце ісьці.

— Генэрал-маёр адыйшоў, а падпаручык Дуб гаркнуў так, каб той яго чуў:

— Першае аддзяленьне—канчай, стройся. Здубальтаваць шэрагі! Другое аддзяленьне...

Тымчасам Швэйк выйшаў вон і, праходзячы каля падпаручыка Дуба, аддаў яму чэсьць, як належыць, але падпаручык усё-ж крыкнуў:

— Адставіць! Яшчэ раз!

Швэйку давялося яшчэ раз узяць пад казырок, а пасьля на яго зноў пасыпаліся сказы: «Вы мяне ведаеце? А я вам кажу, што вы мяне яшчэ ня ведаеце!.. І вы ў мяне яшчэ наплачацеся»...

Нарэшце Швэйк дайшоў да свайго вагону, успамінаючы, што ў тыя часы, калі ён яшчэ служыў на прызыўнай службе у іх у Каролінэнталі быў адзін падпаручык, нейкі Худавы, які казаў ім, калі злаваў: «хлопцы, заўважце сабе, што стаўлюся да вас па-сьвінску і застануся такой сьвіньнёю, пакуль вы будзеце ў мяне ў роце».

Кухар-акультыст Юрайда і каптэнармус Ванэк ўпэўнялі яму пераказаць Балуну, каб той хутчэй прынёс яму кавы і не забыўся добра зачыніць бляшанку са згушчаным малаком, каб яно не сапсавалася. Балун варыў каву свайму паручыку на маленькай сьпіртусоўцы ў вагоне каптэнармуса Ванэка. Калі Швэйк пераказаў яму загад паручыка Лукаша, ён заўважыў, што ўвесь вагон падчас яго адсутнасьці пачаў ужо піць каву.

Бляшанкі згушчанае кавы і малака паручыка Лукаша былі ўжо напалову пустыя, а Балун, які піў каву са сподку, калупаў лыжкаю ў бляшанцы згушчанага малака, каб падбяліць яшчэ крыху сваю каву.

Кухар-акультыст Юрайда і каптэнармус Ванэк упэўнялі адзін аднаго, што бляшанка згушчанага малака паручыка Лу-

каша будзе яму зьвернута пры атрыманьні першай-жа партыі згушчанага малака.

Швэйку таксама прапанавалі паласавацца каваю, але ён адмовіўся і сказаў Балуну:

— Толькі што атрыманы загад па арміі, каб у 24 гадзіны павесіць усіх дзяншчыкоў, якія ўкралі ў свайго пана згушчанае малако ці каву. Пан паручык загадаў мне пераказаць гэта табе, а таксама, каб ты зараз-жа прынёс яму кавы.

Перапалоханы Балун выхапіў з рук тэлеграфістата Хадынскага порцыю кавы, якую ён сам толькі што наліў яму, падагрэў яе крыху на сьпіртусоўцы, падліў згушчанага малака і на ўсю сілу кінуўся ў штабны вагон.

Выкаціўшы ад старраннасьці вочы, ён падаў паручыку Лукашу каву, прычым яго неадступна мучыла думка, што паручык па яго вачох павінен здагадацца, што ён зрабіў са згушчанай кавай і малаком.

— Так што я крышку затрымаўся,—заікаючыся прамовіў Балун,—таму што я ня мог адразу іх адчыніць.

— Гавары ўжо проста—ты, мусіць, разьліў згушчанае малако,—сказаў паручык Лукаш, адпіўшы глыток кавы.—Ці чаго добрага, ты жор яго лыжкаю, як крупнік. А ты ведаеш, што табе за гэта будзе?

— Так што ў мяне трое дзяцей, пане паручык. Пашкадуйце,—зарумзаў Балун.

— Ну, сьцеражыся-ж, Балун! Я цябе апошні раз папераджаю, і раджу кінуць твае звычкі. Ці-ж табе Швэйк нічога не казаў?

— Казаў, што мяне павесяць у 24 гадзіны,—адказаў Балун, дрыжучы ўсім целам, як у трасцы.

— Ды пакінь ты калаціцца, дурыла,—з усьмешкаю сказаў паручык Лукаш,—і пастарайся лепей папраўіцца. Выкінь ты гэтыя думкі пра ежу з свае дурное мазгаўні і скажы Швэйку, каб ён пашукаў на вакзале ці поблізу што-колечы смачнага зьесьці. Дай яму вось гэтую дзесятку. Цябе я не пасылаю, а ты пойдзеш тады, калі нажарэшся досыту... А, тымчасам, ці ня зьеў ты маю бляшанку сардзін? Не, кажаш? А, ну, прынясі яе мне!

Балун пераказаў Швэйку, што пан паручык пасылае яму дзесятку, каб ён Швэйк адшукаў на вакзале чаго-набудзь смачнага пад'есьці. Пасьля ён, уздыхнуўшы, выцягнуў з чамадану паручыка Лукаша бляшанку сардзін і з цяжкім сэрцам панёс яе свайму пану.

Бядак так радаваўся, што паручык як быццам забыўся пра гэтыя сардзінкі, а вось цяпер усё згінула. Паручык пакіне іх, мусібыць у сябе ў вагоне, і Балун іх больш ня пабачыць. Балун пачуваў сябе абяздоленым.

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане паручык, вось яны вашыя сардзінкі,—горка прамовіў ён, перадаючы бляшанку яе ўласьніку.—Загадаеце адчыніць іх?

— Не, не, Балун! Ня трэба. Занясі яе зноў на месца. Я хацеў толькі ўпэўніцца, ці не запусьціў ты туды сваю лапу, бо мне здалося, калі ты прынёс мне каву, што ў цябе губы, як быццам у масьле... А што, Швэйк пайшоў ужо?

— Так точна, пане паручык, пайшоў,—лягчэй уздыхнуўшы адказаў Балун:—Ён сказаў, што пан паручык застанецца задаволены і што ўсё будуць пану паручыку зайздросьціць. Ён пайшоў кудысьці з вакзалу і сказаў, што ведае тут усе месцы да самага Ракош-Палота і што калі цягнік пойдзе без яго, дык ён накіруецца ў аўтомобільную роту і дагоніць нас на аўтомобілі на бліжэйшай станцыі. І яшчэ ён сказаў, што няхай у нас нятрывожацца, што ён ведае свой абавязак і дагоніць наш эшалён, калі-б яму нават давялося наняць за свой рахунак рамізьніка да самай Галіцыі і што грошы за рамізьніка ў яго можна ўтрымаць з пэнсіі. Дык вось вам ні ў якім выпадку ня трэба пра яго непакоіцца, пане паручык.

— Пайшоў вон!—панура прамовіў паручык Лукаш.

З канцылярыі комэнданта прышло паведамленьне, што цягнік кранецца толькі а другой гадзіне дню на Гедэллэ—Ошод і што афіцэрам будзе выдадзена па два літры чырвонага віна і па аднэй бутэльцы коньяку. Казалі, што гэтае віно—нейкае ахвяраваньне на карысьць Чырвонага крыжу, што не дайшло па прызначэньні. Як-бы там ня было, гэтае віно быццам з неба ўпала і ў штабным вагоне адразу зрабілася весела. Коньяк быў маркі «Тры зорачкі», а віно было—добры лафіт.

Толькі паручык быў увесь час чымсьці засмучаны. Прайшло ўжо больш за гадзіну, а Швэйк усё яшчэ не варочаўся. Прайшло яшчэ паўгадзіны, а тады да штабнага вагону пачала наблі-жацца дзіўная працэсія, якая выйшла з канцылярыі комэнданта станцыі.

Наперадзе крочыў Швэйк, сур'ёзна і дужа паважна, быццам мучальнік хрысьціянства, якога вядуць на арэну цырку.

Па абодвы бакі яго ішло па адным вэнгерскім гонвэдзе з прымкнутым да вінтоўкі штыхом. З левага боку командзір разьдзелу з каманды, што вартавала вакзал, а за імі відны былі постаці жанчыны ў чырвонай спадніцы са зборкамі і мужчыны ў вэнгерскіх ботах, круглым маленькім капялюшы і з падбітым вокам; у руках у жанчыны спалохана сакатала курыца.

Уся гэта компанія палезла ў штабны вагон, але командзір разьдзелу прыкрыкнуў на жанчыну з курыцай і на мужчыну, каб яны заставаліся на плятформе.

Калі Швэйк убачыў паручыка Лукаша, ён многазначна падміргнуў яму.

Командзір разьдзелу папрасіў дазволу пагаварыць з начальнікам 11-й маршавай роты і перадаў паручыку Лукашу протокол, складзены ў комэндантуры, дзе паручык з жахам прачытаў:

Начальніку 11-й маршавай роты 91-га пяхотнага палка на далейшае накіраваньне. Пры гэтым накіроўваецца радавы пяхотнага палка Швэйк Язэп, які знаходзіцца згодна яго ных слоў ордынарцам згаданае маршавай роты 91-га пяхотнага палка, па абвінавачваньні ў рабунку, учыненым у супругаў Іштван з Іштарсы ў раёне станцыйнай комэндантуры.

Падстава: Радавы пяхотнага палка Швэйк Язэп самавольна заўладаў, за домам супругаў Іштван у Іштарсе ў раёне станцыйнай комэндантуры, курыцаю, што бегала па двары і зьяўляецца ўласнасьцю згаданых супругаў Іштван, а таксама гэты Швэйк ударыў гаспадара курыцы, які прабаваў адабраць яе ў яго, пры супраціўленьні па левым воку, з прычыны чаго быў затрыманы патрулём

і накіраваны ў сваю вайсковую частку, а курыца зьвернута гаспадару.

Дзяжурны афіцэр (подпіс).

Калі паручык Лукаш расьпісваўся ў прыняцьці Швэйка, калены яго дрыжалі. Швэйк стаяў так блізка ад яго, што бачыў, як паручык забыў паставіць дзень месяца.

— Дык вось дазвольце далажыць, пане паручык,—сказаў ён,—што ў нас сягоньня 24-е. Учора было 23-е мая, калі Італія абвясьціла нам вайну. Калі я цяпер выходзіў за вароты, дык ніхто ні пра што іншае не гаварыў, як толькі пра гэта.

Гонведы і командзір разьдзелу адыйшлі, і засталіся толькі супругі Іштван, якія ўсё прабавалі пралезьці ў штабны вагон.

— Калі-б у вас была яшчэ пяцёрачка, пане паручык,—апісальным тонам пачаў Швэйк,—вы-б, здолелі гэтую курачку купіць. Справа ў тым, што гэты рабаўнік хоча за яе 15 гульдэнаў, але тут ён ужо лічыць і 10 гульдэнаў за сваё пабітае вока. Але мне здаецца, пане паручык, што 10 гульдэнаў за нейкае паршывае вока занадта дорага. Вось у нас у карчомцы «Бабуля» выбілі цэглінай усю сківіцу і шэсьць зубоў, і ўсе гэта каштавала ўсяго толькі 20 гульдэнаў, а тут-жа грошы маюць зусім іншую вартасьць... Каб павесіць чалавека, дык і то ў нас у Празе плацяць кату толькі чатыры гульдэны, а тут...

— Ідзі ты сюды,—паклікаў Швэйк чалавека з падбітым вокам і курыцай на руках, якую ён узяў з рук сваё жонкі,—а ты, старая, заставайся там.

Той увайшоў у вагон.

— Ён разумее крыху па-нямецку,—заўважыў Швэйк,—і ведае ўсю лаянку і сам таксама ўмее даволі добра лаяцца па-нямецку.

— Ну, дык вось, 10 гульдэнаў,—зьвярнуўся ён да яго.— 5 гульдэнаў за курыцу і 5 за пабітае вока. Зразумеў? Тут штабны вагон, валацуга, давай сюды курыцу!

Ён упхнуў у рукі ашаламоненаму чалавеку 10 гульдэнаў, узяў у яго курыцу, адкруціў ёй галаву і выпасажыў яго з вагону, а пры гэтым па-сяброўску схапіў яго за руку і ад душы патрос яе, прымаўляючы:

— Ну, бывай, бывай, дружа! Валі-валі, адгэтуль. Лезь да свае старое, а то я цябе ў момант калі пагаію!..

— Дык вось бачыце, пане паручык, што ўсё можна вельмі нават добра ўлагодзіць,—сказаў Швэйк паручыку Лукашу.— Лепш за ўсё, вядома, рабіць справу ціха, спакойна, бяз гвалту... А цяпер мы з Балуном зварым вам такі крупнік з курыцы, што ў Сяміградзьдзі пахнуць будзе.

Паручык Лукаш болей ня стрываў, ён выбіў няшчасную курыцу з швэйкавых рук і зароў:

— А вы ведаеце, Швэйк, чаго заслугоўвае салдат, які ў вайсковы час рабуе мірнае насельніцтва?

— Так точна, пане паручык, ведаю, ганаровую сьмерць праз расстрэляньне,—урачыста адказаў Швэйк.

— Ну, а вы-ж ва ўсякім выпадку заслужылі ня больш за вяроўку, Швэйк, бо вы першы пачалі рабаваць. Зладзюга вы паганы, нягоднік!.. Я проста ня ведаю, як мне вас яшчэ назваць. Няўжо, вы забыліся на сваю прысягу? Не, у мяне галава можа лопнуць!

Швэйк, пытаючыся, паглядзеў на паручыка Лукаша і хутка сказаў:

— Нікак нет, пане паручык, на прысягу, якую павінны прыняць усе нашы ваякі, я зусім не забыўся. Дык вось дазвольце далажыць, пане паручык, што я ўрачыста прысягаў майму дзяржаўнейшаму гасудару і ўладару Францу-Іозэфу I быць верным і бесьпярэчна слухацца таксама і генэралаў яго апостальскае вялікасьці і наогул бесьпярэчна выконваць загады ўсіх маіх начальнікаў і старэйшых, паважаць іх і абараняць, выконваць усе іх загады, на ўсіх службовых справах, ва ўсякі час і пры ўсякім выпадку. (Швэйк падняў курыцу з падлогі і гаварыў далей, выцягнуўшыся па-вайсковаму і гледзячы паручыку Лукашу проста ў вочы) адважна і сьмела біцца з кожным ворагам, хто-б ён ні быў і дзе-б згодна волі яго імпэратарскае і каралеўскае вялікасьці ад мяне ні патрабавалася, на вадзе, пад вадой, на сухазем'і, у паветры, удзень і ўночы, у баёх, наступленьнях, адступленьнях і ва ўсіх іншых вайсковых пачынаньнях, адным словам—у кожным месцы, ніколі не пакідаць мае вайсковае часьці, штандару і значкоў, ніколі не ўваходзіць ні ў якія

дачыненьні з ворагам, заўсёды трымаць сябе, як вайсковыя законы загадваюць і сумленнаму ваяку належыць і такім чынам, з гонарам пражыць і памерці, у чым няхай дапаможа мне бог! Амінь! А гэтае курыцы, дазвольце далажыць, пане паручык, я не рабаваў і наогул я трымаў сябе, памятаючы прысягу, як належыць быць.

— Кінь курыцу, зараз-жа кінь яе, ж-жывёліна!—гістэрычна крыкнуў паручык Лукаш, ударыўшы Швэйка скручаным протоколам па руцэ, у якой той трымаў мёртвую птушку.—Ты толькі зірні на гэты протокол, вось табе чорным па белым: Накіроўваецца радавы пяхотнага палка Швэйк Язэп, які знаходзіцца згодна ягоных слоў—ордынарцам... па абвінавачваньні ў рабунку... А цяпер скажы мне, марадэёр, нягоднік праклятый—не, я цябе яшчэ калі-небудзь заб'ю, абавязкова заб'ю, разумееш!—скажы мне, на ласку, бессаромныя вочы твае, як гэта ты мог так забыцца?!

— Ніяк нет,—мякка адказаў Швэйк,—тут проста здарылася сумнае непаразуменьне, і больш нічога. Калі я атрымаў ваш загад адшукаць вам чаго-небудзь добрага зьесьці, ці купіць, я пачаў меркаваць, што-б мне такое зрабіць. Тут каля вакзалу наогул нічога нельга было дастаць, апрача кілбасы з каніны ды вялянае асьляціны. Дазвольце далажыць, пане паручык, я усё вельмі падрабязна абмеркаваў. На паходзе канечна трэба штонебудзь спажыўнае, каб льга было лягчэй вытрымліваць усе вайсковыя цяжкасьці. Ну, мне і захацелася ўзрадаваць вас—зварыць вам, пане паручык, курыны бульён.

— Курыны бульён?—паўтарыў за ім паручык Лукаш, хапаючыся за галаву.

— Так точна, пане паручык, курыны бульён. Я купіў і цыбулі і 50 грамаў вэрмішэлі—вось, калі ласка. У гэтай кішэні ў мяне цыбуля, а ў гэтай—вярмішэль. Соль у нас ёсьць у канцылярыі і перац таксама. Так што нехапала толькі самое курыцы. Ну, і я вышаў з вакзалу ды пайшоў у Іштарсу. Уласна кажучы, гэта вёска, як быццам-бы і ня горад, хоць там на першай вуліцы напісана «Іштатараса Варош» *). Я праходжу адну

*) Варош—па мадзьярску значыць горад.

вуліцу з садкамі, другую, трэцюю, чацьвертую, пятую, шостую, сёмую, восьмую, дзевятую, дзесятую, адзінаццатую, дванаццатую, і толькі на трынаццатай вуліцы, зусім у канцы, дзе за апошнім домам пачыналіся ўжо палі, я ўбачыў курыны хлеўчык і курэй, якія гулялі каля яго. Я падышоў да іх і выбраў самую вялікую, тлустую—вось калі ласка, паглядзеце, пане паручнык, адно сала, так што яе і мацаць ня трэба, а адразу відаць, што яна ці мала паела ўсякай збажыны. Вось я яе значыць, зусім ня тоячыся, пры ўсёй публіцы, якая штосьці крычала на мяне па мадзьярску, узяў дый трымаю за ногі і пытаюся аднаго, другога, па-нямецку і па-чэску, чыя гэта курыца, каб я мог яе ў каго-небудзь купіць; а тут бягуць з апошняе халупкі мужчына і жанчына і давай мяне спачатку па-мадзьярску, а пасьля па-нямецку лаяць, што я ў іх сярод белага дня курыцу ўкраў. Я яму кажу, каб ён на мяне ня крычаў, таму што мяне паслалі ў яго купіць курыцу для вас, і расказаў яму, як была справа. А курыца, якую я трымаў за ногі, раптам залопала крыламі і папрабавала ляцець. Ну, а з тэй прычыны, што трымаў я яе ў руцэ лёгка, дык яна пацягнула маю руку за сабой і села свайму гаспадару проста на нос. Ну, а той пачаў чагосьці галасіць, быццам я ўдарыў яго курыцай па мордзе і жанчына таксама ўсё галасіла і прычытвала: «мая курыца, мая чубатачка, мая, мая». Тады нейкі вар'яты, не разабраўшы, у чым справа, нацкавалі на мяне патруль і я сам прапанаваў яму пайсьці са мною на вакзал у комэндатуру, каб мая непавіннасьць вышла наверх, як масла з вады. Але толькі з панам паручыкам, які там сяньня дзяжурыць, і пагаварыць ладам не пашанцавала, нават калі я яго папрасіў папытацца ў вас, ці праўда, што вы паслалі мяне купіць вам што-небудзь добрае, ён яшчэ на мяне нават накрычаў, каб я і пікнуць не адважыўся, таму што, бач, па маіх вачох відно, што па мне даўно ўжо тоўстая галіна ды моцная вяроўка плачуць. Ён, здаецца, быў у дужа благім гуморы і сказаў мне, што ў яго ёсьць яшчэ некалькі скаргаў і што якраз пазаўчора ў кагосьці поруч загінуў індык, а калі я яму адказаў, што мы ў той час былі яшчэ ў Рабе, ён сказаў, што такія адгаворкі ня маюць для яго жаднага значаньня. Вось ён і накіраваў мяне да вас, а нейкі яфрэйтар таксама на мяне яшчэ

накрычаў таму, што я яго не заўважыў і запытаўся, ці ведаю я, хто ён такі. Я яму сказаў, што ён—яфрэйтар, а калі-б служыў у егерскім палку, дык называўся-б колёнаважаты, а ў артылерыі—старэйшы канонір.

— Швэйк,—прамовіў пасьля хвіліннае маўчанкі, паручык Лукаш,—з вамі здарылася ўжо столькі нязвычайных выпадкаў і казусаў, столькі «памылак» і «непаразуменьняў», як вы маеце ласку казаць, што мусіць вам і сапраўды можа дапамагчы ў вашых учынках толькі моцная вяроўка на шыі з вайсковымі ўшанаваньнямі пасярод карэ.. Вы мяне разумееце?

— Так точна, пане паручык, карэ, ці гэтак званы замкнуты батальён складаецца з чатырох, а часамі ў выглядзе выключэньня з трох ці з пяці рот... А як вы загадаеце, пане паручык, ці не пакласьці ў крупнік з гэтай курыцы больш вэрмішэлі, каб ён быў гусьцейшы?

— Швэйк, я вам загадваю зараз-жа выбрацца вон ад гэтуль, разам з вашай курыцаю, бо я вам так заеду ёю па мазгаўні, ідыёт, вы няшчасны, што...

— Так точна, пане паручык, але толькі сэльдэрэю дазвольце далажыць, я нідзе не дастаў, і морквы таксама. Я пакладу туды бульб...

Швэйк не пасьпеў дагаварыць «бы», як куляю вылецеў з курыцаю са штабнага вагону. Паручык адным духам выпіў шклянку коньяку.

Швэйк аддаў чэсьць перад вокнамі вагону і засьпяшаўся адыйсьці.

*

Пасьля ўнутранага змаганьня, што шчасьліва скончылася, Балун якраз зьбіраўся адчыніць бляшанку сардзін свайго паручыка, калі раптам зьявіўся Швэйк з курыцай у руках, што, вядома, напалохала ўсіх, што сядзелі ў вагоне. Усе глядзелі на Швэйка, быццам пытаючыся: «дзе-ж ты гэта ўкраў?»

— Я яе купіў для пана паручыка,—адказаў Швэйк на іх нямое пытаньне, выцягваючы з кішэні цыбулю і вэрмішэль:—я зьбіраўся зварыць яму з яе крупнік, але ён болей ня хоча і падараваў яе мне.

— А што, яна ня была дохлая?—недаверліва запытаўся жаптэнармус Ванэк.

— Ды я-ж ёй сам галаву адкручваў,—адказаў Швэйк, выцягваючы з кішэні нож.

Балун удзячна і разам з тым лісьліва паглядзеў на Швэйка і моўчкі запаліў сьпірытусоўку свайго пана, а пасьля, захапіўшы некалькі бачкоў, пабег па ваду.

Да Швэйка падышоў тэлеграфіст Хадынскі і, запрапанаваўшы сваю дапамогу абскупсьці курыцу, ціхенька запытаў яго:

— А гэта далёка адсюль? Трэба лезьці ў двор, ці яны хозяць па вуліцы?

— Я яе купіў.

— Ды кінь-жа ты заліваць! А яшчэ таварыш называешся. Мы-ж бачылі, як цябе вялі.

Аднак ён усё-ж старанна дапамагаў аскубаць курыцу. Ва ўрачыстай падрыхтоўцы ўдзельнічаў і кухар-акультыст Юрайда, які рэзаў на кавалачкі бульбу і цыбулю.

Выкінутае з вагонаў пер'е абудзіла ўвагу падпаручыка Дуба, які хадзіў ўзад і ўперад ўздоўж усяго цягніка.

Ён крыкнуў, каб той, хто аскубае курыцу, паказаўся яму. І ў дзьверы высунулася здаволеная морда Швэйка.

— Гэта яшчэ што такое?—наскочыў на яго падпаручык Дуб, падымаючы з зямлі адрэзаную курыную галаву.

— Так точна, пане падпаручык,—адказаў Швэйк,—гэта курычая галава, курыцы байцовага заводу. Гэта завод добры і на яйкі, пане падпаручык, і дае пры добрым доглядзе па 260 яек на год. Вы вось будзьце ласкавы паглядзець, які ў яе быў багаты яечнік.

І Швэйк падсунуў падпаручыку курыныя вантробы.

Падпаручык Дуб сплюнуў і пайшоў быў далей, а пасьля вярнуўся

— Каму гатуецца гэта курыца?

— Так точна, пане падпаручык, нам. Вось, пагдядзеце, якая яна тлустая.

Падпаручык Дуб рашуча завярнуўся і пайшоў мармычучы сабе пад нос:

— Пачакай, я да цябе яшчэ дабяруся!

— Што ён табе сказаў?—зьвярнуўся да Швэйка Юрайда.

— Ды сказаў, што мы яшчэ дзе-небудзь стрэнемся. Вядома, гэтыя важныя паны—усё больш наконт аднародавага каханьня.

Кухар-окультыст Юрайда заявіў, што толькі эстэты бываюць гомосэксуалістамі, бо гэта выцякае з самай сутнасьці эстэтыкі.

Тады каптэнармус Ванэк расоказаў пра згвалтаваньне няпоўнагодніх іхнымі настаўнікамі ў гішпанскіх кляштарох.

І пакуль закіпала вада ў кацялку над сьпіртусоўкаю, Швэйк тым часам заўважыў, што аднаму такому выхавальніку даручылі ў Вене цэлую колёнію бяспрытульных дзяцей, а гэты пэдагог узяў ды ўсіх іх патвалціў.

— Гэта, вядома, брыдкі пал, але горш за ўсё бывае, калі ўспадзе на жанчыну. У Празе за некалькі год перад гэтым жылі дзьве жанчыны, абедзьве разводкі, таму што былі шлюхі, і аднае прозьвішча Маурэк, а другое—Шусэк. Дык яны ў прысадах Ростка, калі там цьвілі вішні, злавілі стагадовага імпотэнтнага дзядка-катрынічыка, павялі яго ў бліжэйшы лясок ды там і згвалцілі. Чаго толькі яны з ім не зрабілі! У Жыжкове жыў адзін профэсар—Аксаміт прозьвішча ягонае, які рабіў там раскопкі і ўсё шукаў магілы нейкіх карлаў. Ён раскапаў у тым ляску некалькі магіл, а гэтыя жанчыны вось зацягнулі дзядкакатрыншчыка ў такую раскапаную магілу ды там яго згвалцілі. Назаўтра прыходзіць профэсар Аксаміт і бачыць—у магіле нешта ляжыць. Ён быў узрадаваўся, а пасьля высьветлілася, што гэта змучаны дзьвюма жанчынамі дзядок-катрыншчык. На пяты дзень няшчасны пакутнік сканаў, а яны, сьцервы, мелі яшчэ нахабнасьць зьявіцца на яго пахаваньне. Гэта ўжо, на мой погляд, надзвычайная сапсаванасьць!

— А ты яе пасаліў!—зьвярнуўся Швэйк да Балуна, калі, выкарыстаўшы агульную цікавасьць да швэйкавай заўвагі, папрабаваў запхнуць штосьці ў сваю торбу для рэчаў.—А ну, пакажы, што ў цябе там? Балун,—сур'ёзна гаварыў Швэйк,—што ты хочаш рабіць з гэтаю курынаю ножкаю? Зьвярніце ўвагу, хлопцы, ён украў у нас курыную ножку, каб зварыць яе ціхенька сабе аднаму. А ты ведаеш, Балун, што ты зрабіў? Ты-ж

ведаеш, як гэта караецца згодна законаў вайсковага часу, калі на паходзе абкрадваюць сваіх таварышаў. Такіх нягоднікаў прывязваюць да гарматы і расстрэльваюць карцэччу. Што-ж, цяпер позна ўздыхаць! Як толькі мы стрэнем дзе-небудзь артылерыю, ты зьявішся да першага, які натрапіцца, феерверкера. А да гэтага часу ты ў пакараньне будзеш займацца ў мяне вучэньнем. Вылазь з вагону!

Няшчасны Балун вылез, і Швэйк стоячы ў дзьвярох вагону, пачаў камандваць:

— Зважай! Вольна! Зважай! Вочы напра-ва! Зважай! Проста! Вольна! А цяпер, Балун, ты будзеш рабіць вольныя рухі на месцы. Паварот напра-ва! Паслухаў, галубок, ды ты-ж і сапраўды карова, толькі што бяз рог. Вось ім там трэ' было-б і расьці, дзе ў цябе раней было правае плячо... Адставіць! Напра-ва! Нале-ва! Паўзварот напра-ва! Ну, бачыш, дубіна, цяпер ужо было лепш! Чысьцей, чысьцей! Паўзварот нале-ва! Налева, налева табе кажуць, курачы сын! Ва фронт! Ва фронт! Ух, дурань! Ня ведаеш, што ёсьць ва фронт? Проста! Кругом! На калена! Кладзіся! Садзіся! Устаць! Садзіся! Кладзіся! Устаць! Кладзіся! Устаць! Садзіся! Устаць! Вольна! Вось бачыш, Балун, гэта дужа карысна; так у цябе прынамсі жывот добра травіць будзе.

Вакол іх сабраліся кучкі гледачоў, якія весяліліся ад душы.

— А ну, адыдзеце,—крыкнуў Швэйк.—Ён у нас зараз будзе маршыраваць. А ты, Балун, пастарайся, каб мне ня трэ' было-б адстаўляць. Я ведаеш, ня люблю мурыжыць людзей дарэмна. Дык вось: кірунак на вакзал. Заўважаць, куды я паказваю... Шагам марш! Шарэнга—стой! Нарэшце-ж спыніўся, дурная твая галава! Шагам марш! Радзей, радзей! Ня ведаеш, што значыць радзей? Ну, дык я табе так пакажу, што табе сьвет ня міл будзе. Шырэй! У ногу! На месцы! Ах ты, боўдзіла, ты шэрае! Калі я камандую «на месцы»!—дык ты абавязан капытамі таптацца на месцы!

Наўкола сабраліся ўжо мабыць са дзьве роты.

Балун абліваўся потам і зусім ашаламоніўся, а Швэйк усё камандваў:

— Шагам марш! Шарэнга—кругом марш! Шарэнга—стой! Шарэнга, шагам марш! Бягом! Шагам! Шарэнга—стой! Вольна! Зважай! Кірунак: вакзал! Бягом—марш! Стой! Кругом! Кірунак: вагон! Бягом марш! Радзей! Шарэнга—стой! Напра-ва! Ну, цяпер хвілінку адпачні, а пасьля ізноў возьмемся. Цярплівасьць і праца ўсё перайначаць.

— Што тут такое адбываецца?—пачуўся голас падпаручыка Дуба, які ўсхвалёвана сьпяшаўся да месца зборышча.

— Дык вось дазвольце далажыць, пане паручык, абазваўся Швэйк,—што мы крыху практыкуемся, каб не забыць вучэньне і ня губляць дарэмна дарагі час.

— Вылазьце з вагону,—загадаў падпаручык Дуб,—мне ўжо дужа напрыкрала валэндацца з вамі, я далажу пра вас батальённаму камандзіру.

Як толькі Швэйк зьявіўся ў штабны вагон, паручык Лукаш вышаў з яго другімі дзьвярыма на пэрон.

Калі падпаручык Дуб далажыў капітану Загнэру пра вельмі дзіўнае, як ён сказаў, праводжаньне часу ўдалага ваякі Швэйка, капітан Загнэр быў якраз у дужа добрым настроі, таму што лафіт быў сапраўды цудоўны.

— Значыць, вы не жадаеце дарэмна марнаваць дарагі час?—многазначна засьмяяўся ён.—Добра! Матушыч, хадзеце сюды.

Батальённаму ордынарцу быў дадзены загад паваць пудзіла 12-й роты і ўсяго батальёну, фэльдфэбэля Насаклу, і прынесьці стрэльбу Швэйку.

— Гэты муж,—зьвярнуўся капітан Загнэр да фэльдфэбэля Насаклы,—не жадае дарам марнаваць дарагі час. Дык вы вазьмеце яго з сабой за вагон, ды прымусьце прарабіць з гадзіну прыёмы са стрэльбай. Ды круцей, без перадышкі. Галоўным чынам, каб без перапынку:

агонь, адставіць, агонь, адставіць, агонь... і г. д.

— Пабачыце, Швэйк, што сумаваць вам не давядзецца,—гэтак сказаў ён у дарогу Швэйку, калі той пайшоў з фэльдфэбэлем.

І хутка за сьценкаю вагону пачуліся гучныя словы каманды, якія ўрачыста разьляталіся на ўсю ныгунку. Фэльдфэбэль На-

сакла, які якраз перад гэтым гуляў дваццаць адно, і павінен быў трымаць банк, роў на ўсю сілу лёгкіх:

— Да нагі! На плячо! Да нагі! На плячо! Пасьля ён на хвілінку змоўк і тады можна было разабраць, як Швэйк задаволеным тонам спаважна гаварыў:

— Усё гэта я вучыў яшчэ многа год перад гэтым, на прызыўнай службе. Пасьля команды «да нагі» стрэльба абапіраецца аб правае сьцягно. Канец прыкладу знаходзіцца на адной простай лініі з наском нагі. Правая рука, зразумела, выцягнута і трымае стрэльбу так, што вялікі палец ляжыць на рулі, а другія пальцы павінны абхапіць прыклад у пярэдняй яго частцы; а па командзе «на плячо» стрэльбу лёгка ўскідаюць на правае плячо, руляю дагары і прыкладам назад.

— Ну, годзе табе языком мяньціць,—пачуўся голас фэльдфэбэля Насаклы, а пасьля команда:—Зважай! Вочы напра-ва! Ах, д'ябал! Як ты гэта робіш!..

— У мяне яна «на плячы», і па командзе «вочы напра-ва»! мая рука сыходзіць па рэмяні і я паварочваю галаву направа, а па командзе «зважай»!, мая галава глядзіць проста на вас.

Зноў пачуўся голас фэльдфэбэля:

— На рукі! Да нагі! На руку! На плячо! Штыхі—прымкнуць. Штыхі—адамкнуць! Стрэльбы на вагу! На малітву—шапкі далоў! Накрыйся! На малітву—па калені станавіся! Проста па мішэнях агонь—шарэнгай!—Шарэнга—плі! Паўзварот направа—шарэнга плі! Проста ў мэту—штабны вагон! Прыцэл 200! Рыхтуйся! Шарэнга—адстаў! Шарэнга—плі! Шарэнга—плі! Шарэнга плі! Адставіць! проста ў мэту, сталы, рэдка—пачынай. Стой!.. Да нагі!.. Вольна!..

Фэльдфэбэль пачаў скручваць сабе папяросу.

Тымчасам Швэйк з цікавасьцю разглядаў нумар сваёй вінтоўкі і, нарэшце, сказаў:

— Нумар 4268. Якраз гэткі нумар быў у аднаго цягніка ў Печку на 16-й лініі. Гэты цягнік трэ' было завесьці ў Лісу на рамонт, але гэта ня так проста было, пане фэльдфэбэль, таму што ў машыніста, які павінен быў весьці яго туды, была вельмі благая памяць на нумары. Тады начальнік дыстанцыі выклікаў яго да сябе ў канцылярыю і кажа яму: «на 16-й лініі стаіць

цягнік № 4268. Я ведаю, што ў вас благая памяць на нумары, а калі вам напісаць нумар на паперцы, дык вы паперку згубіце. Ну, але калі вы ўжо так слабы на нумары, дык пастарайцеся запомніць, што я вам зараз скажу, і вы ўбачыце, што можна лёгка запомніць, які захочаце нумар. Ну, дык вось. Цягнік, які вам трэба завесьці ў дэпо ў Лісу, значыцца за нумарам 4268. Вось вы і вазьмеце на ўвагу. Першы лік чацьвёрка, другі,— двойка. Запомніце значыцца 42. Гэта ёсьць двойчы два—чатыры, што дае нам першую лічбу, а калі падзяліць яе на два, дык атрымаецца ізноў два і такім чынам у нас атрымаецца поруч 4 і 2. Далей ужо проста. Колькі будзе двойчы чатыры? Восем. Ці-ж ня праўда? Вось вы і захавайце ў сваёй памяці, што васьмёрка ў нашым нумары зьяўляецца апошняй лічбай. Цяпер вы ўжо запомнілі, што першая лічба чацьвёрка. Другая—2, а апошняя—8, значыць вам застаецца толькі як-небудзь ямчэй запомніць лічбу 6, якая стаіць перад васьмёркай. Але і гэта зусім проста. Першая-ж лічба ў нас чатыры, другая—два, а разам яны якраз складаюць 6. Вось вам ужо і ня трэба сумнявацца, што другая з канца лічба ёсьць шасьцёрка, так што ўвесь парадак нашых лічбаў ужо ніяк ня выветрыцца ў вас з галавы і нумар 4268 моцна засеў у вашай галаве. Ці вы можаце прысьці да таго-ж вынiку больш простым шляхам, а менавіта...»

Фэльдфэбаль кінуў курыць, вырачыў вочы і толькі прашаптаў:

— Зьняць галаўны ўбёр!

— Вось ён і пачаў яму тлумачыць,—сур'ёзна гаварыў далей Швэйк,—той найбольш просты спосаб, якім можна было-б запомніць, нумар цягніка 4268. «Ад 8,—гаворыць начальнік дыстанцыі,—адняць два—атрымаецца шэсьць. Запомнім: шэсьць. Ад шасьці адняць два—атрымаецца чатыры. Значыцца, маем ужо чатыры і 68. Цяпер трэба толькі між гэтых двух лічбаў паставіць лічбу 2 і атрымаем 4 2 6 8. Можна зрабіць і яшчэ інакай, таксама вельмі проста, пры дапамозе множаньня і дзяленьня, тады атрымліваецца наступнае: запомніце, што двойчы 42 роўна 84. У годзе 12 месяцаў. Трэба адняць 12 ад 84; застанецца 72, і ад 72 яшчэ раз адняць 12 месяцаў. Атры-

мацца 60. Вось у нас ужо ёсьць шасьцёрка, таму што нуль мы можам проста адкінуць. Значыць, калі мы напішам 42—6—84 і адкінем, як перад гэтым нуль і апошнюю чацьвёрку, дык абавязкова атрымаем лік 4268, менавіта нумар цягніка, які трэба завесьці ў Лісу ў дэпо. Як я ўжо казаў, можна выкарыстаць і дзяленьне. Для гэтага трэба ўзяць коэфіцыент па таможаным тарыфе...» Што гэта, пане фэльдфэбэль, у вас галава закруцілася, ці што? Калі вы хочаце, я магу пачаць залпавы агонь. Рота—плі! Ліха яго бяры, пану капітану ня трэ' было пасылаць вас займацца на сонцы. Давядзецца, мабыць, схадзіць па насілкі.

Доктар прышоў і констатаваў, што фэльдфэбэль самлеў ці ад сонечнага ўдару, ці ад вострага запаленьня мазгавое абалонкі.

Калі фэльдфэбэль апрытомнеў, Швэйк стаяў каля яго і гаварыў:

— Дык вось, каб даказаць вам да канца... Як вы думаеце, пане фэльдфэбэль, запомніў машыніст гэты нумар? Не, ён усё пераблытаў і памножыў усё на тры, таму што ўспомніў сьвятую тройцу, ды так і не знайшоў цягніка, які і дагэтуль стаіць там на шаснаццатай лініі.

Фэльдфэбэль ізноў заплюшчыў вочы.

А калі Швэйк вярнуўся ў свой вагон, ён адказаў на пытаньне, дзе ён так доўга прападаў:

— Хто вучыць другога хуткаму кроку, той сам сто разоў робіць «на плячо».

У далёкім кутку вагона дрыжэў ад страху Балун. За час швэйкавай адсутнасьці, калі ягоная частка курыцы была ўжо зварана, Балун зжор палавіну яго дзялянкі.

*

Да адыходу эшалёну яго дагнаў мяшаны вайсковы цягнік з рознымі часткамі войска. Там былі і тыя, што паасталіся, і салдаты са шпіталяў, пасланыя ўсьлед часткам, што пайшлі ўперад і ўсякія падазроныя суб'екты, якія вярталіся з камандыровак ці з-пад арышту зноў на фронт.

З гэтага цягніка вышаў і вольнапісаны Марэк, якога ў свой час абвінавачвалі ў бунце, таму што ён адмаўляўся чысьціць прыбіральню, і якога дывізыйны суд апраўдаў. Справа яго была спынена, і таму вольнапісаны Марэк зьявіўся цяпер у штабны вагон да капітана Загнэра, як да начальніка маршавага батальёну. Справа ў тым, што Марэк зрабіўся, так сказаць, чалавекам, што вісіць у паветры, бо ўвесь час ён ня выходзіў з-пад арышту.

Калі капітан Загнэр убачыў вольнапісанага Марэка і прыняў ад яго накіравальную паперу з вельмі сакрэтнай заўвагай: «палітычна-неблаганадзейны! Рэкомэндуецца асьцярожнасьць!» ён ня надта ўзрадаваўся. На шчасьце, ён успомніў генэрала, які захапляўся прыбіральнямі, які так настойліва прапанаваў яму дапоўніць штат батальёну «батальённым гісторыёграфам».

— Вы дужа нестаранны, вольнапісаны,—мякка сказаў ён маладому чалавеку:—вы-ж сапраўдная пошасьць для тутэйшых месц. Замест таго, каб пастарацца выслужыцца і атрымаць годнасьць, якая належыць вам, згодна вашай асьвеце, вы траплялі з аднаго арышту ў другі. Палку даводзіцца чырванець праз вас, вольнапісаны. Але вы можаце выправіць свае памылкі, калі, дзякуючы сумленнаму выкананьню сваіх абавязкаў, вы зной уступіце ў шэрагі сумленных ваякоў. Ахвяруйце свае сілы батальёну. Я папрабую дапамагчы вам. Вы-ж адукаваны малады чалавек і напэўна маеце здольнасьць добра і стыльна выкладаць свае думкі на паперы. Вось што я вам скажу: кожнаму батальёну на фронце патрэбен чалавек, які-б вёў летапіс усяго, што датычыцца непасрэднага ўдзелу батальёну ў баявых справах. Неабходна мець апісаньне ўсіх слаўных паходаў ды ўсіх значных і слаўных здарэньняў, у якіх прымаў удзел і граў галоўную ці выдатную ролю наш батальён, і неабходна пакрысе падрыхтаваць матэрыялы для гісторыі нашай арміі. Вы мяне разумееце?

— Так точна, пане капітан, разумею. Мова ідзе пра эпізоды з жыцьця ўсіх частак арміі. У батальёна ёсьць свая гісторыя, на падставе гісторыі батальёнаў складаецца гісторыя палка. Гісторыя палкоў дае матэрыял для гісторыі брыгад,

гісторыя брыгад—для гісторыі дывізіі і г. д. Я, вядома, прыкладу ўсе свае сілы і веды, пане капітан.

І вольнапісаны Марэк нават прылажыў руку да сэрца.

— Я са шчырасю любоўю буду адзначаць слаўныя ўчынкі нашага батальёну, асабліва-ж цяпер, калі так пасьпешна разьвінаецца наша агульнае наступленьне, калі набліжаецца рашучы момант і калі наш батальён рыхтуецца засеяць поле бою целамі сваіх гэрояў-сыноў. Я добрасумленна буду адзначаць усе выпадкі, якія павінны адбыцца, каб старонкі гісторыі нашага батальёну былі ўквечаны лаўрамі.

— Добра, сказаў капітан Загнэр.—Вы будзеце прыкамандыраваны да штабу батальёну, будзеце назіраць, каму прызначаюцца ўзнагароды, будзеце адзначаць—праўда, згодна нашых паказаньняў—тыя пераходы, якія асабліва дазваляюць меркаваць пра ня звычайную баяздольнасьць і жалезную дысцыпліну нашага батальёну. Гэта ня так ўжо і лёгка, вольнапісаны, але я спадзяюся, што ў вас знойдзецца даволі наглядальнасьці, каб узвысіць наш батальён над іншымі часткамі палка, калі вы атрымаеце ад мяне адпаведныя дырэктывы. Я зараз дам тэлеграму ў полк, што я прызначыў вас за гісторыёграфа нашага батальёну. Зьявіцеся да каптэнармуса 11-е роты Ванэка, каб ён даў вам месца ў сваім вагоне. Там вам будзе вальней, як дзе, і скажыце яму, каб ён прышоў да мяне. Лічыцца вы будзеце, вядома, па штабу батальёна. Гэта будзе праведзена загадам па батальёне.

Кухар-акультыст ужо спаў. Балун так і не пакідаў дрыжаць, таму што ён адчыніў бляшанку сардзін свайго паручыка. Каптэнармус Ванэк пашоў да капітана Загнэра, а тэлеграфіст Хадынскі, як прыдабыў дзесьці на вакзале бутэлечку ядлаўцовае гарэлкі, падпаў пад уладу сантымэнтальнага настрою і з пачуцьцём сьпяваў:

У маладосьці палкі час
Я думаў: праўда ёсьць на сьвеце.
І супакой душы ня гас,
І неба промні слала ветла.
Ды убачыў я, што ўсё мана.
Каханьне й вера сталі згубай
Я мусіў гэта ўсё пабачыць
І зарыдаў таварыш любы.

Пасьля ён устаў, падышоў да століка каптэнармуса Ванэка і вялікімі літарамі напісаў на паперцы:

„Гэтым маю гонар пакорна прасіць прызначыць мяне батальённым горністам з падвышэньнем у наступную годнасьць.

Хадынскі, тэлеграфіст.

Гутарк капітана Зэнгэра з каптэнармусам Ванэкам цягнулася нядоўга. Капітан зьвярнуў каптэнармусаву ўвагу толькі на тое, што вольнапісаны Марэк будзе знаходзіцца ў адным вагоне са Швэйкам.

— Я магу вам сказаць толькі адно, што гэты Марэк, калі можна гэтак сказаць, палітычна неблаганадзейны... Божа мой! У наш час гэта не становіць нічога асаблівага. Пра каго гэта не гаворыцца! Ёсьць, ведаеце, столькі розных меркаваньняў... вы мяне разумееце? Ну, дык вось, я толькі зварочваю вашу ўвагу, што вы павінны, як толькі ён пачне што-небудзь такое гаварыць, зараз-жа прымусіць яго сьціхнуць, каб, чаго добрага, і мне не палучылася якая-небудзь няпрыемнасьць.. Вы яму проста скажэце, каб ён прыпыніў усякія такога парадку размовы і гэтага, можа, будзе досыць. Але я не хачу сказаць, што вы павінны ад кожнае дробязі зараз-жа бегчы да мяне. Скончыце з ім справу самі, па-добраму, таму што гэткая гаворка, па-добраму, заўжды лепш, чымся гэтыя бязглуздыя абмовы і даносы. Словам, я нічога не жадаю чуць, таму што... вы разумееце? Такая справа заўжды кладзецца плямаю на ўвесь батальён.

Дык вось, калі каптэнармус Ванэк вярнуўся ў свой вагон, ён адвёў вольнапісанага Марэка ўбок ды заявіў яму:

— Слухайце, галубок, вы ў нас лічыцеся за неблаганадзейнага, але гэта нішто. Толькі не кажэце тут нічога непатрэбнага ў прысутнасьці тэлеграфіста Хадынскага.

Ледзь толькі пасьпеў ён дагаварыць да канца, як Хадынскі, пахістваючыся, падышоў да іх, кінуўся ў абдымку каптэнармусу

і п'яным голасам штосьці прарыдаў, што павінна было, мусіць, быць якім-небудзь чулым романсам.

Калі здрада ўсё забрала,
Да цябе я зірк схілію.
І на сэрцы тваім любым
Я ад шчасьця сьлёзы ліў.
Ты ўсьміхнулася спакусна
І прышоў канец журбе,
Бо сказалі твае вусны:
— Не пакіну я цябе!

— Мы ніколі не разьвітаемся, сябры,—крычаў Хадынскі,— і што ўчую ў тэлефон, буду вам расказваць. Пляваць я хацеў на прысягу.

У кутку Балун пачаў з перапалоху хрысьціцца ды малціца ўголас:

— Прасьвятая багародзіца, прымі маё сьлёзнае маленьне і ўчуў мяне з вялікае літасьці свае. Дай мне ўтаймаваньне і памажы мне, найгоршаму рабу твайму, які ў гэтую пару смутку зварочваецца да цябе з вераю, цьвёрдаю надзеяю і гарачаю любоўю. Царыца нябесная, абарані мяне і зрабі, каб да астатку дзён маіх быў я пад абаронаю тваёю і пана бога нашага...

І літасьцівая дзева Марыя заступілася сапраўды за яго, бо вольнапісаны выцягнуў з свайго тонкага меха некалькі бляшанак сардзін і раздаў усім па бляшанцы.

Балун бязбоязна адчыніў чамадан свайго паручыка і палажыў туды пасланыя з неба сардзінкі.

Калі-ж потым усе адчынілі свае бляшанкі і з апэтытам ўзяліся за сардзінкі, Балуна апанавала такая спакуса, што ён ізноў адчыніў чамадан і сардзінкі і прагавіта зжор іх.

Але тады міласэрдная і найсалодшая дзева Марыя адвярнула свой твар ад яго і ў тую самую хвіліну, калі ён даядаў апошнія кропелькі масла з бляшанкі, перад вагонам зьявіўся батальённы ордынарац Матушыч і крыкнуў у адчыненыя дзьверы:

— Гэй, Балун, твой паручык загадаў табе прынесьці яму сардзінкі.

— Ну, тут ужо без аплявух справа не абыдзецца,—заўважыў каптэнармус Ванэк.

— Слухай, ня ідзі ты лепш з пустымі рукамі,—парадзіў Швэйк,—а вазьмі з сабою хоць пяць штук пустых бляшанак.

— Чаго гэта вы такога начварылі, што вас бог гэтак карае?—запытаў вольнапісаны.—Мусіць, у вашым мінулым ёсьць нейкі вялікі грэх. Можа вы абрабавалі царкву ці сьперлі ў ваншага папа з вэнглярні шынку? Ці, можа, вы выхлебталі ў яго ў падвале царкоўвае віно? Ці, можа, вы хлапчуком лазілі ў ягоны сад па ігрушы?

Балун са скрыўленым ад адчаю тварам, безнадзейна матнуў рукою. Увесь яго змучаны выгляд расчульваючы казаў: «Калі-ж скончыцца ўся гэтая пакута?»

— Усё гэта робіцца таму,—сказаў вольнапісаны, які чуў словы няшчаснага Балуна,—што вы страцілі сувязь з богам. Вы ня дужа старанна моліцеся, каб бог як мага хутчэй узяў вас да сябе з гэтае юдолі смутку.

А Швэйк дадаў:

— Балун да гэтага часу ня можа наважыцца сваё вайсковае жыцьцё, свой вайсковы парадак думак, свае словы і ўчынкі ды сваю вайсковую сьмерць даручыць добрасьці многалюбаснага сэрца ўсемагутнага, найдабрэйшага пана-бога, як любіў гаварыць мой фэльдкурат, калі ён пачынаў ужо хмялець і па памылцы чапляўся на вуліцы да якога-небудзь салдата.

Балун, стогнучы прызнаўся, што, страціў веру ў бога, таму што ўжо многа разоў маліўся, каб бог надаў яму сілы і прымусіў ягоны жывот як-небудзь сьціснуцца ды зьменшыцца ў аб'ёме.

— Гэтая пражэрлівасьць сказалася ва мне не цяпер, ня ў гэтую вайну,—румзаў Балун,—а яна мая даўнейшая хвароба. Праз яе і жонка мая разам з дзецьмі хадзіла ў Клёкоту на царкоўнае сьвята.

— Гэта месца мне знаёма,—заўважыў Швэйк.—Гэта будзе недалёка ад Табару. Там ёсьць багаты абраз дзевы Марыі з падробленымі дыямэнтамі і нейкі царкоўны служка з Славакіі прабаваў яе абрабаваць. Гэта быў дужа набожны чалавек. Вось ён туды прыехаў і падумаў, што справа яму ўдасца лягчэй, калі

ён спачатку ачысьціцца ад усіх сваіх старых грахоў, а таму ён пакаяўся і ў тым, што зьбіраецца назаўтра абрабаваць сьвятую дзеву. Але ён і азірнуцца не пасьпеў і далічыць да канца трыста разоў малітву «Ойча наш», прызначаную яму з эпітымію ягоным духоўным айцом, каб ён не пасьпеў схавацца, як яго, раба божага, падхапілі пад рукі і пацягнулі проста ў жандарскую ўправу.

Кухар-окультыст Юрайда пачаў з тэлеграфістам Хадынскім спрэчку, ці зьяўляецца гэта абураючым парушэньнем таемнасьці споведзі, ці пра гэта наогул ня варта гаварыць, таму што дыямэнты-ж падробленыя. Але Хадынскі нарэшце, давёў, што ўсё гэта ёсьць «Карма», гэта значыць загадзя накапованы лёс з далёкага невядомага мінулага, калі гэты няшчасны царкоўны прыслужнік з Славакіі быў, можа быць, антыподам на якой-небудзь іншай плянэце. І такім чынам лёс, мусіць, даўным даўно, калі гэты клёкоцкі духоўнік быў дзікаабразам ці якім-небудзь вымерлым сысуном наканаваў, што ён няміпуча павінен будзе парушыць тайну споведзі, хоць з юрыдычнага пункту гледжаньня па канонічным праве і тады даецца падараваньне грахоў; калі гэтая справа датычыць кляштаровае маемасьці.

З гэтай прычыны Швэйк зрабіў наступную маленькую заўвагу:

— Ну, вядома-ж, ніводзін чалавек ня ведае, што ён будзе рабіць праз некалькі мільёнаў год, а таму ні ад чаго не павінен адмаўляцца. Паручык Квасьнічка, калі яшчэ служыў у Карслінэнталі ў запасным батальёне, заўжды гаварыў па «слáвеснасьці»: «Вы, абармоты, гультаі, басурманы, не ўяўляйце, што гэтая вайна канчаецца для вас на гэтым сьвеце. Мы з вамі яшчэ стрэнемся і пасьля сьмерці і я вам наладжу ў пекле такую лазьню, што ў вас, у сволачаў, вочы на лоб павыскакваюць!»

Пасьля гэткага невялічкага адступленьня Балун зусім страціў розум і мяркуючы, што гавораць толькі пра яго і ўсё датычыць толькі яго, вёў далей сваё публічнае пакаяньне:

— Але нават і Клёкота не дапамагла ад мае пражэрлівасьці. Жонка варочваецца дамоў са сьвята і пачынае лічыць курэй. Зірк, дзьвюх ужо і нехапае! Але што-ж я мог зрабіць? Я і сам ведаю, што куры патрэбны ў гаспадарцы, каб несьлі яйкі, а як

выйду ды ўбачу іх, дык у мяне ў жываце быццам прорва нейкая адчыніцца... Ну, а праз гадзіну ў мяне на душы спакойна, бо курачка ўжо абскублена. Аднойчы, калі жонка з дзецьмі ізноў накіравалася ў Клёкоту памаліцца, каб гаспадар (гэта-ж я!) не аб'еў сям'і і не нарабіў шкоды, я пашоў панадворкам, і раптам трапляе мне на вочы наш індык... Тады гэтак справа траха мне не каштавала жыцьця. Адна ягоная костка засела ў мяне ў горле, і каб ня здарылася, паблізу майго парабка, маладога хлапчука, які выцягнуў яе адгэтуль, дык не давялося-б мне сядзець тут з вамі і нават не давялося-б прычакаць сусьветнае вайны. Вось як, браточкі... А парабок мой, хлапчыка вось гэты, быў у мяне спрытны. Такі таўсмач, пузаты, прысадзісты, тоўсты.

Да Балуна падышоў Швэйк:

— А ну, пакажы язык!

Балун высалапіў язык і Швэйк зьвярнуўся да ўсіх прысутных у вагоне:

— Я-ж так і ведаў, што ён зжор нават і свайго парабка. Прызнавайся: калі ты яго зжор? Калі твая сям'я ізноў уся выбралася ў Клёкоту?

Балун у адчаі зламаў рукі і выгукнуў:

— Пакіньце мяне, браточкі! Да ўсяго іншага яшчэ і пасьміханкі ад сваіх!

— Мы вас за тэта не асуджаем,—сказаў вольнапісаны.

— Наадварот, з усяго відаць, што вы будзеце добры салдат. Калі пад час напалеонаўскіх войнаў французы зрабілі аблогу Мадрыду, гішпанскі комэндант, каб ад голаду ня здаць цытадэлю, зжор свайго ад'ютанта, як ёсьць, нават бяз солі. А гэта сапраўды вялікі гэроізм, бо салены ад'ютант быў-бы ў кожным разе куды смачнейшы... Дарэчы, як зваць нашага батальённага ад'ютанта, пане каптэнармус? Цыглер? А гэта адзін з такіх худэчаў, з якіх нельга зрабіць дзяляянкі нават на адну роту...

Гляньце, у Балуна ружанцы ў руках,—заўважыў каптэнармус Ванэк.

Сапраўды, Балун у вялікім смутку сваім шукаў патолі ў маленькіх калодачак ружанцаў—выраб фірмы «Морыц Левэнштэйн і К° у Вене.

— Гэтыя ружанцы таксама з Клёкоты,—сумна прамовіў Балун. Калі мне прынесьлі іх, я якраз зарэзаў пару маладых гусей, але я вам скажу, гэты было ня мяса, проста—смаката!..

Хутка прышоў загад рыхтавацца да адыходу цягніка праз чвэртку гадзіны. А з тэй прычыны, што ніхто не хацеў верыць, здарылася, што дзе-хто, не зважаючы на ўсе зробленыя захады, кудысьці сышоў. Калі цягнік, нарэшце, рушыў, не далічваліся восемнаццаці чалавек. Паміж іх быў і фэльдфэбэль Носакла з 12-й роты, які пасьля таго як цягнік даўно ўжо схаваўся за Іштарсай, усё яшчэ таргаваўся ў маленькім садку за вакзалам з нейкаю прастытуткай, якая патрабавала за зробленую паслугу пяць крон, тады як ён прапанаваў усяго адну крону ці пару аплявух. Компромісная рашэньне ў выглядзе пары аплявух было выканана з такою сілаю і дакладнасьцю, што на адчайны скогат і піск жанчыны адусюль пачалі зьбягацца людзі.

З ГАТВАНУ НА ГАЛІЦЫЙСКУЮ МЯЖУ

На працягу ўсяго пераезду па чыгунцы да Лаборчу ва Ўсходняй Галіцыі, адкуль батальён павінен быў накіравацца паходным парадкам на фронт, каб здабыць там вайсковую славу, у вагоне, дзе ехалі вольнапісаны і Швэйк, пачаліся дужа дзіўныя гаворкі больш ці менш здрадніцкага характару. Зрэшты, мы можам сьмела сьцьвердзіць, што тое самае адбывалася і ў іншых вагонах і нават у штабным вагоне панавала моцнае нездавальненьне, таму што на нейкай станцыі была атрымана з палка копія загаду па арміі, згодна якога вінная порцыя афіцэраў зьменшылася на адну васьмушку літра. Праўда, пры гэтым не забыліся і пра ніжэйшых чыноў, якім скарацілі порцыю саго на 10 грам, што было яшчэ больш загадковым, бо ніхто за ўсю вайну не атрымаў і ня бачыў ніводнага грама саго.

У Фюзэш-Обоні заўважылі, што адна з рот згубіла сваю палявую кухню, таму што на гэтым прыпынку павінны былі, нарэшце, варыць гуляш з бульбаю, на які «прыбіральны» генэрал ускладаў гэткія вялікія надзеі. Пасьля таго як зрабілі даведкі, высьветлілася, што тую палявую кухню , наогул ня ўзялі з Бруку і, як відаць, яна яшчэ і цяпер стаіць закінутая і забытая, дзе-небудзь за баракам № 186.

Кашавары, што даглядалі гэтую кухню, перад самым ад'ездам з лягеру былі пасаджаны за буянства ў горадзе на гаўптвахту і злаўчыліся так уладзіцца, што яны ўсё яшчэ сядзелі на гаўптвахце ў той час, як іхная маршавая рота ўжо ехала па Вэнгрыі.

З гэтай прычыны рота, што засталася бяз кухні, была прыпісана на харчаваньне да другое раты, прычым не абышлося

.бяв сьціраньняў, таму што прызначаныя скрэбці бульбу людзі ад абедзьвюх рот палаяліся і ледзь не пабіліся міжсобку, бо і адны і другія ўпэўнялі, што яны ня гэткія дурні, каб працаваць на іншых. Нарэшце выявілася, што варка гуляшу была толькі спрытным манэўрам. Салдаты проста павінны былі прывыкаць, калі на пазыцыях будуць варыць гуляш і раптам прыдзе загад адступаць,—выліваць увесь гуляш на зямлю, не пасьпеўшы нават пакаштаваць яго.

Такім парадкам, гэта было так сказаць, ня надта пасьлядоўная, але ў кожным выпадку даволі навучальная падрыхтоўка. Калі гуляш ўжо зьбіраліся разьмяркоўваць, прышоў загад зараз-жа грузіцца ў вагоны і эшалён павезьлі ў Міскольч. Але і там гуляшу не давалі, таму што на лініі стаяў цягнік з расійскімі вагонамі. З гэтай прычыны людзей не выпускалі з вагонаў, даўшы поўную волю іхнай фантазіі. Людзі вырашылі, што гуляш будуць раздаваць на мяжы Галіцыі пры выгрузцы з цягніка, пасьля абвесьцяць, што гуляш тухлы і няварты на ўжываньне ды выкінуць вон.

Гэты самы гуляш павезьлі далей на Ціма-Лач і Самбор і калі ўжо ніхто болей не чакаў, што яго раздадуць, цягнік спыніўся ў Нэйштадце поблізу Шаторал-Жаўжгелі, дзе зноў наклалі пад катламі агню, разагрэлі гуляш і, нарэшце-такі яго раздалі.

Станцыя была поўная да адказу. Спачатку павінны былі адысьці два цягніка з баявымі прыпасамі, а пасьля два з артылерыяй і знарадамі і адзін з понтонным батальёнам. Наогул, можна сказаць, што тут сышліся вайсковыя цягнікі ўсіх частак арміі і ўсіх парадкаў зброі.

За станцыяй гонведзкія гусары набілі двох польскіх яўрэяў, адабралі ў іх клунак, знайшлі там бутэльку пэйсахоўкі і ўзяліся весела расьпіваць яе проста з рыльца, нават і ня думаючы плаціць за яе. Гэта, як відаць, было ў парадку рэчаў, таму што тут-жа недалёка стаяў іхны ротмістр і ветліва ўсьміхаўся ўсёй гэтай сцэне, у той час як за провіянцкім складам некалькі іншых гусараў прабавалі залезьці пад спадніцы чарнавокім дочкам набітых яўрэяў.

Тут-жа стаяў цягнік авіяцыйнай роты. На другой лініі стаялі таксама аэропляны на адкрытых пляцформах, але паламаныя,

папсаваныя. Тут былі і свае і варожыя аэропляны, зьбітыя артылерыйскім агнём, а пасьля, пераважна, палявыя гаўбіцы. Такім парадкам, з аднаго боку рушылася ўсё сьвежае і новае, а з другога, з фронту везьлі ўсе гэтыя рэшткі разьбітае славы ў тыл, у рамонт, у паправу.

Праўда, падпаручык Дуб растлумачыў салдатам, якія пазьбіраліся паўкол, што ўсе гэтыя падбітыя аэропляны ды гарматы зьяўляюцца вайсковай здабычаю; пры гэтым ён заўважыў, што крыху далей у групе салдатаў стаяў Швэйк і таксама штосьці тлумачыў. З гэтай прычыны ён ціхенька падышоў бліжэй і пачуў ласкавы швэйкаў голас.

— Ну, так, як ні круці, а гэта ўсё-ж такі вайсковая здабыча! Сапраўды, на першы погляд здаецца дзіўнавата, што вось тут на ляфэце, напрыклад, стаіць «Імпэратарска-каралеўская N -ая артылерыйская брыгада». Але справа, па-мойму, тлумачыцца так, што гэтая гармата трапіла ў палон да расійцаў, а пасьля мы ўжо адабралі яе назад, і гэткая вайсковая здабыча, у шмат разоў каштоўней, бо...

— Бо,—урачыста прамовіў ён, заўважыўшы падпаручыка Дуба,—бо нічога нельга пакідаць у варагавых руках. Ды вось вам прыклад—Перамышль, ці выпадак з салдатам, у якога пад час бою вораг выбіў з рук пляшку. Гэт абыло яшчэ ў час вайны з Напалеонам. Дык той салдат скрыўся ўначы ў варожы лягер і адшукаў сваю пляшку і прынёс яе назад і нават яшчэ зарабіў на гэтым, таму што ў ворага якраз выдавалі тае ночы віно.

— Слухайце, Швэйк, вымятайцеся вы куды-небудзь далей, каб я вас тут болей ня бачыў,—сказаў падпаручык Дуб.

— Слухаю, пане падпаручык,—адказаў той і накіраваўся да другога раду вагонаў. Але калі-б падпаручык чуў, што Швэйк яшчэ дадаў, ён зьнянрытомнеў-бы ад злосьці, хоць гэта былі зусім нявінныя словы з эвангельля:

«Через малое время и вы узрите меня, а еще через малое— и вы не узрите меня».

Пасьля таго як Швэйк пашоў, падпаручык быў настолькі дурны, што зьвярнуў увагу салдатаў на зьбіты аўстрыйскі аэроплян, на масянжовых частках якога можна было лёгка прачытаць: «Вінэр-Нэйштадт».

— Гэты аэроплян мы адбілі ў расійцаў пад Львовам,—сказаў падпаручык Дуб. Гэтыя словы пачуў паручык Лукаш, ён падышоў бліжэй і дадаў:

— Пры гэтым абодва расійскія лётнікі згарэлі жыўцом.

Пасьля ён моўчкі пашоў далей, думаючы да сябе, што падпаручык Дуб надзвычайны асёл.

За другім вагонам ён сустрэў Швэйка і пастараўся хутчэй мінуць яго, бо па швэйкавым абліччы лыга было здагадацца, што ў гэтага чалавека шмат сабралася на сэрцы, чым ён дужа хацеў-бы падзяліцца з сваім паручыкам.

Швэйк-жа проста падышоў да паручыка Лукаша і адрапортаваў:

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане паручык: ротны ордынарац Швэйк пакорна просіць, ці ня будзе якіх далейшых загадаў. Я ужо шукаў вас у штабным вагоне, пане паручык.

— Слухайце, Швэйк,—сказаў паручык Лукаш халодным няпрыязным голасам,—ці вы яшчэ помніце, як вас зваць? Ці вы ўжо забыліся, як я вас называў?

— Нікак нет, пане паручык, я на такую справу ніяк не магу забыцца, таму што я-ж ня вольнапісаны Жалезны. Справа гэтая была задоўга перад вайною, калі я служыў ў Каролінэнталі, і быў там у нас у палку нейкі палкоўнік Фідлер-фон-Бумэранг, ці нешта накшталт гэтага...

Паручык Лукаш міжвольна засьмяяўся з гэтага «штосьці накшталт гэтага», а Швэйк спакойна загаварыў далей:

— Дык вось дазвольце далажыць, пане паручык, наш палкоўнік быў да прыкладу ў два разы меншы за вас з росту і да таго-ж насіў бараду лапатаю, як князь Лабковіц, а калі злаваўся, дык падскакваў удвая вышэй свайго росту, аж празвалі мы яго гумовы дзядуля. Ну вось, тады было якраз першае мая, і дзяжурства трымала нашая частка. Напярэдадні ён зьвярнуўся да нас на пляцы з вялікаю прамоваю, што мы таму павінны ўсе заставацца ў казарме і ня выходзіць з яе, што згодна найвышэйшага загаду, калі-б патрабавалася, мы павінны перастраляць усіх гэтых соцыялістаў. Таму, калі які салдат пратэрмінуе сягоньня пабыўку і прашвэндаецца да заўтрашняга дню, той ёсьць здраднік свае бацькаўшчыны, таму што гэткая

п'яная зяпа нават ні ў кога ня здолее пацэліць, калі справа дойдзе да залпаў і будзе толькі пуляць у паветры. Вось гэты вольнапісаны Жалезны вярнуўся ў казарму дый кажа: «Дзякуй гумоваму дзядулю, што навучыў! І сапраўды: заўтра нікога з казармы ня выпусьцяць, дык лепей ужо сягоньня зусім не варочацца!» І гэтак ён дазвольце далажыць, пане паручык, сапраўды зрабіў, ды як чыста!

Але гэты палкоўнік Фідлер быў такі прайдзісьвет—упакой божа ягоную душу!—што ён назаўтра пашоў бадзяцца па Празе ды шукаць людзей з нашага палка, якія наважыліся пайсьці з казармы, і дзесьці каля Параховое вежы ён сапраўды напаткаў нашага Жалезнага і адразу-ж узьеўся на яго: «Я табе пакажу, я цябе навучу, ды я цябе падцягну!» нагаварыў таму нямаведама чаго і пацягнуў за сабою ў казармы і ўсю дарогу яму патражаў ды ўсё пытаўся, як яго прозьвішча. «Жалезны, Жалезны, ты ў мяне наседзішся! Вельмі рад, што ты мне натрапіўся, і я ўжо табе пакажу першае мая. Жалезны, Жалезны, ты цяпер у маіх руках, я цябе загадаю пасадзіць пад арышт, у карцар, душа мая!» Ну, Жалезны бачыць, што яму ўсёадно гінуць, і вось, калі ішлі яны цераз Пэршыч, каля самага рэсторану Розваржыла, ён раптам шмыгануў у пад'езд і праходным дваром на другую вуліцу і сапсаваў такім манерам гумоваму дзядулю, што зьбіраўся пасадзіць яго пад арышт, усё здавальненьне. А палкоўніка гэты выпадак так расхваляваў, што ён са злосьці забыў неслухава прозьвішча і ўсё пераблытаў. Прышоўшы ў казарму, ён пачаў падскакаць да столі (а столь была нізка), і дзяжурны па батальёне ўсё дзівіўся, чаму гэта стары раптам гаворыць ды выгуквае ламанаю чэскаю мовою: «Медніка пасадзіць пад арышт... «Не, ня Медніка, а як яго? Срэброўскага пад арышт... і зусім ня Срэброўскага, а Нікельмана пад арышт!» І так гэта стары блытаў, блытаў, дзень у дзень, і ўсё пытаўся, ці знайшлі, нарэшце, гэтага Медніка, не, Срэброўскага, не, Нікельмана, і нават загадаў усяму палку выстраіцца на пляцы, але таварышы, якія ведалі ў чым справа, здагадаліся прыстроіць Жалезнага пры акалодку, бо ён быў зубны тэхнік.

Так ўсё і цягнулася, пакуль аднаму з нашых ня здарылася заколоць аднаго драгуна ў гасьцініцы ў Бруку, за тое, што той

адбіў ад яго дзяўчыну. А тут ужо нас выстраілі ў шарэнгу ўсіх да аднаго, так што павінны былі ісьці з акалодку, а хто быў зусім хворы, таго дваіх вяло пад рукі. Нічога ня зробіш, давялося і Жалезнаму выйсьці на двор, а там нам прачыталі загад па палку такога прыблізна зьместу, што драгуны, бач, людзі і салдаты і што нельга іх калоць, таму што яны нашы баявыя таварышы. Адзін вольнапісаны перакладаў, а палкоўнік глядзеў зьвер-зьверам. Спачатку ён абышоў увесь фронт, пасьля зайшоў ззаду, пасьля яшчэ раз па фронце, і раптам пазнаў тэтага Жалезнага што быў росту з гару, так што было дужа сьмешна, пане паручык, як ён яго пацягнуў на сярэдзіну. Вольнапісаны, які перакладаў, прышыніўся, а наш палкоўнік пачаў наскакваць на Жалезнага, быццам шчанюк на каня і, раўці: «Вось бачыш, ты ад мяне не адкруціўся, ты нікуды ад мяне няўцёк, і цяпер ты ізноў будзеш упэўняць, што ты Жалезны, а я-ж усё гаварыў: «Меднік, Срэброўскі, Нікельман». Але ты ёсьць Жалезны, Жалезны, і я табе пакажу, як цябе? Срэброўскі, не, Меднік, не, Нікельман, сьвіньня, нягоднік, Жалезны!» А пасьля ўсырычыгў яму трыццаць сутак карцару... Але праз два тыдні разбаленіся яму зубы і ён успомніў, што Жалезны—зубны тэхнік. Вось ён загадаў прывесьці яго з карцару ў акалодак і загадвае вырваць яму зуб. Жалезны пачаў цягнуць. Цягнуў, цягнуў, з паўгадзіны ўсё цягнуў, так што старога разоў са тры вадою трэба было адліваць... Ну, а пасьля гэтага стары зрабіўся зусім шоўкавы і падараваў Жалезнаму астатнія два тыдні... Вось як здараецца пане паручык, калі начальнік забываецца прозьвішча свайго падначаленага, але падначалены ніколі ня можа забыць прозьвішча свайго начальніка, як і казаў нам заўсёды наш пан палкоўнік, што мы навек не забудземся, што ў нас быў такі палкоўнік Фідлер. А што маё апавяданьне, можа, вам ужо дадзела, пане паручык?

— Ведаеце што, Швэйк?—сказаў паручык Лукаш—чым больш я вас слухаю, тым больш пераконваюся, што вы наогул зьняк не паважаеце сваіх начальнікаў. Салдат павінен гаварыць пра сваіх начальнікаў выключна толькі добрае.

Паручык Лукаш, як відаць, зацікавіўся гэтаю гутаркаю.

— Дык вось дазвольце далажыць, пане паручык,— як-бы апраўдваючыся, перапыніў яго Швэйк,— пан палкоўнік Фідлер даўно памёр ужо, але, калі загадаеце, я буду гаварыць пра яго выключна добрае. Ён, пане паручык, быў проста, як бацька родны для салдатаў, сапраўдны анёлак, божы ўгоднік, які аддаваў апошняе бедным ды галодным. Ён дзяліўся сваім абедам з афіцэрскага сабраньня з першым салдатам, якога страчаў на дварэ. Калі мы аб'еліся клёцак, ён загадаў гатаваць нам сьвініну, а на манэўрах ён асабліва вызначаўся сваёю дабратою. Калі мы аднойчы трапілі ў Ніжня-Кралёвіцы, ён загадаў нам выпіць за яго рахунак усе запасы кралёвіцкага бровару, а ўжо ў дзень свайго нараджэньня ці імянін, ён заўжды частаваў увесь полк смажанымі ў сьмятане зайцамі і галушкамі з кменам. Ён быў такі добры да салдатаў, што аднойчы...

Паручык Лукаш лёгка лопнуў Швэйка па шыі і па-дружацку сказаў:

— Добра, добра, шэльма, не распаўсюджвайся! Ідзі!

— Слухаю пане, паручык!

Швэйк, накіраваўся да свайго вагону, у той час, як перад батальённым абозам, там дзе ў адзін вагон пагрузілі ўсе тэлефонныя апараты і правады, адыгралася наступная сцэна.

Там стаяла варта, таму што загадам капітана Загнэра ўсё павінна было рабіцца згодна статуту. Вартавых паставілі паабапал і паведамілі ім з палкавое канцылярыі пароль і лёзунг.

У той дзень пароль быў «каска», а лёзунг—«Гатван». Вартавы пры тэлефонных апаратах быў паляк з Каломыі, які патрапіў 21-ы полк зусім выпадкова.

Ён і ўяўленьня ня меў, што гэта «каска», але запомніў, што слова гэтае пачынаецца на літару «к», таму, калі дзяжурны па батальёне падпаручык Дуб запытаў у яго пароль, ён горда адказаў: «Кава»!

Гэта сапраўды было даволі праўдзіва, бо паляк з Каломыі ўсё яшчэ марыў пра ранішнюю і вячэрнюю каву ў брукскім лягеры. Калі-ж паляк яшчэ раз крыкнуў: «Кава»!, а падпаручык Дуб. усё бліжэй і бліжэй надыходзіў да яго, паляк, помнячы прысягу і тое, што ён стаіць на варце грозна гаркнуў:

— Стой!

Падпаручык Дуб зрабіў яшчэ два крокі і зноў патрабаваў ад яго пароль. Тады вартавы злажыўся, паўтараючы—бо ён блага ўладаў нямецкаю мовою—на якімсьці немагчымым жаргоне:

— Бэндзе шысэн, бэндзе стрэляць!

Падпаручык Дуб зразумеў і павольна адступіў назад і пасьля пачаў клікаць начальніка варты.

Зьявіўся унцер-афіцэр Елінэк з разводзячым, зьмяніў паляка і сам пачаў дапытвацца ў яго пароль. Не сунімаўся і падпаручы Дуб, і на іх настойлівыя пытаньні давeдзены да адчаю паляк з Каломыі не сваім толасам, а так што разьлеглася на ўсю станцыю, залемантаваў:

— Кава! Кава-а-а!

З усім, што стаялі там, вагонаў павыскаквалі салдаты са сваімі бачкамі, утварылася жахлівая сумятня, якая скончылася тым, што ад удалага паляка адабралі вінтоўку і, завялі яго ў арыштанцкі вагон.

Але ў падпаручыка Дуба ўзьнікала пэўнае падазрэньне супроць Швэйка, які—ён заўважыў—выскачыў з бачкам наперад ўсіх з вагону, і ён гатоў быў даць галаву пад сякеру, што гэта Швэйк крыкнуў: «выходзь з бачкамі, з бачкамі выходзь!»

Пасьля поўначы цягнік палоў далей на Ладовец і Трэбізаў дзе яму раным-рана была наладжана на станцыі ўрачыстая стрэча мясцовым саюзам вэтэранаў. Як потым высьветлілася, шаноўныя ветэраны зблыталі гэты эшалён з эшалёнам 14-га вэнгэрскага гонведнага *) палка, які прайшоў тут яшчэ ўначы. Ва ўсякім выпадку ветэраны ўсе былі п'яныя і сваімі крыкамі: «Няхай жыве кароль» пабудзілі ўвесь эшалён. Найбольш сьвядомыя салдаты высоўваліся з вокан вагонаў і злосна пасылалі да д'ябла і яшчэ далей.

На гэта вэтэраны так дружна і голасна каркнулі: «няхай жыве 14-ты гонведны полк!», што ў станцыйных будынках задрыжалі шыбы.

Праз пяць хвілін поезд накіравалі далей у Хумену. Тут ужо яскрава відаць былі сьляды нядаўніх баёў, калі расійцы прасу-

---

*) Гонведны полк—Запасны.

нуліся ў даліну ракі Цісы. На схілах цягнуліся прымітыўныя акопы, і ўсюдых былі параскіданы выпаленыя хутары, на месцы якіх хутка зьбітыя хацінкі сьведчылі, што гаспадары вярнуліся на сваё старое папялішча.

Пасьля, каля поўдня, калі эшалён прыбыў на станцыю і пачалі гатаваць абед, людзі мелі магчымасьць на свае вочы ўпэўніцца, як улада пасьля адыходу расійцаў абыходзіцца з мясцовым насельніцтвам, блізкім да расійскіх салдатаў па мове і веравызнаньні.

На пэроне абкружаная вэнгерскімі жандарамі стаяла група русінаў. Гэта былі папы, настаўнікі і сяляне з навакольных вёсак. Ва ўсіх рукі былі зьвязаны за сьпіною вяроўкамі і самі яны былі зьвязаны па пары. Амаль ва ўсіх твары былі ў крыві. а ўсе галовы на гузаках ды крывавых пісагох, бо пры арышце іх жорстка білі жандары.

Крыху далей мадзьярскі жандар прыдумаў вясёлую забаўку. Ён прывязаў папу да левай нагі вяроўку і, трымаючы яе ў руцэ, прымусіў яго, паграджаючы прыкладам, скакаць чардаш. Не пасьпеў той зрабіць некалькі па, як мадзьяр тузануў вяроўку. і поп шлёпнуўся носам аб зямлю, а з прычыны таго, што рукі ў яго былі зьвязаны, дык ён ня мог падняцца. Ён рабіў адчаяныя патугі перавярнуцца на сьпіну і такім парадкам ўстаць на ногі. Жандар рагатаў з яго да сьлёз, а калі поп, нарэшце, падняўся, зноў тузануў вяроўку так, што той зноў паляцеў дагары нагамі.

Нарэшце жандарскі афіцэр скончыў гэту забаўку, загадаўшы завесьці арыштаваных да прыходу цягніка ў пусты хлеў за станцыяй і біць іх там, каб ніхто ня бачыў.

Пра гэты эпізод зайшла гутарка нават у штабным вагоне і наогул, можна сказаць, што большасьць да яго паставілася адмоўна.

Прапаршчык Краўс заўважыў, што калі ўжо злавілі дзяржаўнага здрадніка, дык яго трэба павесіць на месцы бяз жаднага зьдзеку. Наадварот, паручык Дуб выказаў сваю поўную салідарнасьць з жандарамі; ён паставіў гэты інцыдэнт у сувязь з замахам у Сараеве і расТлумачыў учынак мадзярскіх жандараў на станцыі Хумена такім парадкам, што яны хацелі

адпомсьціць за сьмерць эрцгерцага Франца-Фэрдынанда і ягонай жонкі. Каб надаць большую вагу сваім словам, ён сказаў, што ў адным часопісе, на які ён быў абонаваны, яшчэ да вайны ў ліпнёвым нумары пісалі, што гэтае нячуванае злачынства надоўга пакіне ў сэрцах людзей незгаёную рану, тым больш хваравітую, што пры гэтым зладзейскім учынку было зьнішчана ня толькі жыцьцё прадстаўніка выканаўчай дзяржаўнай улады, але і жыцьцё яго каханае жонкі, і што сьмерць гэтых двух людзей разбурыла шчасьлівае ўзорнае сямейнае жыцьцё і зрабіла агульных улюбёнцаў-дзяцей сіратамі.

Паручык Лукаш мармытнуў штосьці накштальт таго, што, мусібыць, тутэйшыя жандары таксама былі абонэнтамі гэтага самага часопісу з яе чульлівымі артыкуламі. Яму раптам усё апрыкрала, і ён адчуваў толькі адно жаданьне—напіцца да чорцікаў, каб заглушыць свой сусьветны смутак. З гэтае прычыны ён вышаў з вагону і адшукаў Швэйка.

— Слухайце, Швэйк,—сказаў ён яму,—ці ня ведаеце вы дзе-б дастаць бутэльку коньяку? Мне штосьці не па сабе.

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане паручык, гэта ўсё ад зьмены паветра. Можа здарыцца, што вам будзе яшчэ горай перш, чым мы даедзем да тэатру вайны. Чым больш аддаляешся ад першапачатковай вайсковай базы, тым робіцца мутарней.

Адзін мой знаёмы, Язэп Календа, які быў за садоўніка ў Страшніцах, вось гэтак сама аддаліўся аднойчы ад свайго дому. Ён пайшоў са Страшніц у Вінаграды і крыху затрымаўся ў тракціры «Спатканьне сяброў», але тут з ім яшчэ нічога ня здарылася, але калі ён зайшоў у тых самых Вінаградах да Кароннае вуліцы ды да вадаправоднае станцыі, дык па ўсёй Каронной вуліцы, што за царквою сьв. Людмілы, пачаў накручваць з тракціру ў тракцір, дык ужо ён адчуў сябе быццам зусім разьбіты. Але толькі гэта яго не спалохала, бо ён напярэдадні вечарам паспрачаўся ў Страшніцах у тракціры «Стоп-сыгнал» з адным трамвайным кондуктарам, што за тры тыдні абыйдзе пехатою наўкол сьвету. Вось ён і пачаў усё больш і больш аддаляцца ад свае бацькаўшчыны, пакуль ня трапіў у «Чорную карчомку» на Каралёвым пляцы, а адтуль па Малы бок у піўніцу «сьв. Тамаш», адтуль у рэсторан «Панядзелкі», а адтуль праз тракцір «Кароль Брабакукі» ў «Бэль-Вю», а адтуль нарэшце ў піўніцу

Страхавага кляштара. Але тут ужо яму зьмена паветра не пашла на карысьць. Дайшоў ён, значыцца, да Лёрэтавага пляцу, і раптам ахапіла яго такая туга па бацькаўшчыне, што ён кінуўся з усяго маху ды пачаў качацца па тротуары ды крычаць: «Не пайду я далей, хлопцы! Чхаць я хацеў,—выбачайце за выраз. пане паручык,—на вашае падарожжа наўкол сьвету!»

Але калі выжадаеце, пане паручык, я вам коньяк дастану, толькі баюся я, каб цягнік як без мяне не пайшоў.

Паручык Лукаш пачаў упэўняць яго, што цягнік пойдзе не раней, як гадзіны праз дзьве і што тут-жа адразу за вакзалам з-пад крыса прадаюць коньяк цэлымі бутэлькамі і што капітан Загнэр пасылаў ужо Матушыча, і той прынёс яму даволі добры коньяк за 15 крон, а таму—вось 15 крон і гайда наперад. Але нікому толькі не тавары, што гэты коньяк паручыку Лукашу ці што яго, Швэйка, паслаў паручык Лукаш, таму што гэта забаронена.

— Будзьце благанадзейны, пане паручык,—прамовіў Швэйк,— усё абыйдзецца як трэба, таму што я дужа люблю забароненыя рэчы і нават я заўсёды рабіў што-небудзь забароненае, сам таго не заўважаючы. Аднойчы неяк у Каролінэнтальскай казарме нам забаранілі...

— Кругом—марш, марш!—перапыніў яго паручык Лукаш.

Дык вось, Швэйк пайшоў за вакзал, паўтараючы пра сябе ўсё ўмовы яго цяперашняй камандыроўкі: коньяк павінен быць добры, таму давядзецца яго пакаштаваць, і справа гэтая—забароненая, таму трэба быць асьцярожным, каб не засыпацца.

Якраз, калі ён скіроўваў ужо з пэрону, ён зноў сустрэўся з падпаручыкам Дубам.

— Ты чаго тут швэндаешся?—спытаў той Швэйка.—Ты мяне ведаеш?

— Так точна,—адказаў Швэйк, аддаючы яму чэсьць.— Дазвольце далажыць, што я не хацеў-бы ведаць вас з вашага благога боку.

Падпаручык укамянеў ад абурэньня, але Швэйк спакойна стаяў перад ім, трымаючы пад казырок і гаварыў далей:

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане падпаручык, я хацеў-бы ведаць вас толькі з добрага боку, каб мне не давялося ў вас наплакацца, як вы мелі ласку гаварыць анадове.

У падпаручыка Дуба закруцілася галава ад такой нахабнасьці, але ён толькі з абурэньнем засыкаў:

— Валі, падлюка, мы з табой яшчэ пагутарым.

Швэйк пайшоў на вакзал, а падпаручык Дуб, набраўшыся духу, пайшоў за ім. За вакзалам, тут-жа на вуліцы, стаяў шэраг перакінутых дагары дном клункаў, на якіх былі расстаўлены плеценыя з саломы кошычкі з рознымі ласункамі, якія выглядалі так нявінна, быццам яны былі прыгатаваны для дзяцей школьнікаў. Тут былі і цукровыя і шоколядныя батоны, і карамель, і вафлі, і монпасье; у некаторых кошычках было некалькі бутэрбродаў з чорнага хлеба з кілбасой, хутчэй за ўсё конскаю. Але ўсярэдзіне гэтыя клункі мелі самыя featured розныя гатункі сьпірытусовых трункаў: бутэлькі коньяку, рому, ядлаўцовай гарэлкі ды іншых налівак і гарэлак.

Крыху далей за рог вуліцы знаходзілася маленькая крамка, дзе канчаўся ўвесь гэты гандаль забароненым таварам. Салдаты таргавалі спачатку каля клункаў, а пасьля які-небудзь яўрэй з доўгімі пэйсамі выцягваў звычайную на выгляд бутэльку і нёс яе пад лапсардакам у крамку, дзе салдат няпрыкметна хаваў яе ў нагавіцы ці пад дзяжурку.

Сюды, значыцца, накіраваў свае шляхі і Швэйк, у той час, як падпаручык Дуб з уласьцівым яму шпэгаўскім талентам назіраў за ім з вакзалу.

Швэйк выбраў цукерак, заплаціў і ўкінуў іх у кішэню, прычым ягоны партнёр таемна шапянуў яму:

— Гарэлка ў мяне таксама ёсьць, пане салдат.

Яны хутка згаварыліся. Швэйк пайшоў у крамку і заплаціў толькі пасьля таго, як гандляр адкаркаваў бутэльку і Швэйк пакаштаваў коньяк. Ён застаўся здаволены коньяком і, схаваўшы бутэльку пад куртаю, вярнуўся на вакзал.

— Куды гэта ты хадзіў, нягоднік?—загарадзіў яму раптам дарогу падпаручык Дуб.

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане падпаручык, што я хадзіў купіць сабе цукерак.—Швэйк палез у кішэню і выцягнуў

жменьку брудных запыленых цукерак.—Калі пан падпаручык не пагрэбуе... я іх ужо каштаваў, яны неблагія. У іх такі прыемны дзіўны смак, накшталт павідла, пане паручык.

Пад яго дзяжуркаю выразна абмалёўваліся круглыя абрысы бутэлькі.

Падпаручык Дуб хлопнуў Швэйка па дзяжурцы.

— Што гэта ў цябе тут, нягоднік? Дай адно сюды!

Швэйк пакорліва дастаў бутэльку з жаўтаватаю жыжкаю і зусім выразнаю этыкеткаю «Коньяк».

— Дазвольце далажыць, пане падпаручык,—бязбоязна заявіў Швэйк,—гэта я ў пустую бутэльку ад коньяку набраў крыху вады піць, таму што ад учарайшага гуляшу мне страшна піць хочацца, толькі што вада з тэй помпы, як маеце бачыць, пане падпаручык, крышачку жаўтаватая. Мусіць, у ёй ёсьць жалеза. Такая вада дужа карысная на жывот.

— Калі табе так хочацца піць, Швэйк,—прамовіў з д'ябальскаю ўсьмешкаю падпаручык Дуб, жадаючы як можна болей працягнуць сцэну, у якой Швэйк павінен быў быць канчаткова пераможаны,—дык пі, ды як трэба. Выпі ўсё гэта адразу!

Падпаручык Дуб ужо маляваў сабе, як Швэйк некалькі разоў каўтне і пасьля ня здолее больш, а ён, падпаручык Дуб, будзе мець над ім слаўную перамогу і скажа: «дай мне таксама бутэльку, каб і я крыху сагнаў сваю смагу». І як гэты нягоднік, гэты Швэйк, будзе трымаць сябе ў гэты страшны для яго момант і які будзе пададзен рапорт і г. д.

Швэйк, адкаркаваў бутэльку, прытуліў яе да роту і так глыток за глытком жыжка зьнікла ў ягоным горле. Падпаручык Дуб акамянеў. Швэйк выпіў на яго вачох усю бутэльку, не змаргнуўшы, кінуў пустую бутэльку цераз плот у нейкую саджалку, сплюнуў і сказаў, быццам выпіў шкляначку мінэральнае вады:

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане падпаручык, што вада гэтая сапраўды з жалезістым смакам. Вось таксама ў Камыку на Малдаве адзін гаспадар рабіў для сваіх курортнікаў жалезістую ваду такім парадкам, што кідаў у студню старыя цьвікі ад падкоў.

— Я табе дам, старыя цьвікі ад падкоў. А ну, пакажы мне студню, дзе ты браў ваду.

— Гэта зусім недалёка адсюль, пане падпаручык. Зараз за крамкаю, на рагу.

— Ну, ідзі наперад, нягоднік, каб я бачыў, як ты крочыш.

«Дзіўна! Неверагодна!—думаў падпаручык Дуб.—Які падлюка, і выгляду не паказвае».

Пакорны свайму лёсу Швэйк пайшоў наперад; але штосьці падказвала яму, што там павінен быць калодзеж і яго аніяк ня зьдзівіла, што калодзеж там сапраўды быў. Пры калодзежы нават была помпа і калі яны падыйшлі і Швэйк пачаў качаць, палілася жаўтаватая вада, так што Швэйк мог урачыста заявіць:

— Вось вам жалезістая вада, пане падпаручык.

Да іх падыйшоў спалоханы гаспадар-яўрэй і Швэйк сказаў яму па-нямецку, каб ён прынёс шклянку, бо пану падпаручыку хочацца піць.

Падпаручык Дуб ад усяго гэтага так ачмурэў, што выпіў цэлую шклянку вады, пасьля чаго ў роце ў яго разышоўся смак конскае мачы і жыжкі з гнюю; нічога ня кемячы, ён даў яўрэю за шклянку вады 5 крон і сказаў, зварочваючыся да Швэйка:

— Ну, чаго вочы вылупіў? Марш дамоў!

Пяць хвілін пасьля гэтага Швэйк зьявіўся ў штабным вагоне, таемнаю грымасаю выклікаў паручыка Лукаша на пэрон і адрапартаваў:

— Дык вось дазвольце далажыць, пане паручык, што праз пяць самае большае дзесяць хвілін, я буду зусім п'яны, але я буду ляжаць у сябе ў вагоне і толькі хацеў прасіць вас, каб вы прынамсі гадзіны са тры не выклікалі мяне да сябе, пане паручык, і не давалі мне ніякіх даручэньняў, пакуль я не працплюся. Усё ў парадку, але мяне злавіў пан падпаручык Дуб і мне давялося схлусіць яму, што гэта вада, а ён прымусіў мяне выпіць усю бутэльку коньяку, каб давесьці яму, што гэта сапраўды вада. Усё ў парадку і я нічога ня выказаў, як вы загадвалі і асьцярожны я таксама быў... А толькі дазвольце далажыць, што я пачынаю ўжо адчуваць, пане паручык... ногі ня слухаюцца... хоць дазвольце далажыць, пане паручык, я прывык піць, таму што ў пана Фэльдкурата Каца...

— Пайшоў да д'ябла, нягоднік!—крыкнуў паручык, аднак без усялякае злосьці, але затое падпаручык Дуб зрабіўся яму

ішчэ на пяцьдзесят процантаў менш сымпатычны, як да гэтага часу.

Швэйк асьцярожна пралез у свой вагон і выцягнуўшыся на шынэлі і падклаўшы пад галаву свой мех, сказаў каптэнармусу ды іншым:

— Гады ў рады чалавек напіўся і просіць, каб яго ня будзілі...

З гэтымі словамі ён павярнуўся на бок і захроп.

Газы, якія ён выпускаў пры адрыжцы, хутка запоўнілі ўсё памяшканьне, так што кухар-окультыст Юрайда, які прагна ўдыхаў гэтую атмосфэру, заявіў:

— Ліха яго бяры, тут пахне коньяком!

Пры складаным століку сядзеў вольнапісаны Марэк, прызначаны, нарэшце, пасьля гэтулькіх няўдач і пакут за батальённага гісторыёграфа.

Якраз у гэты момант ён быў заняты складаньнем гэройскіх учынкаў батальёну ў запас і можна было заўважыць, што гэтае загляданьне ў будучыню давала яму вялікае здавальненьне.

Каптэнармус Ванэк з цікавасьцю наглядаў, як шчыра пісаў вольнапісаны, усьміхаючыся на ўвесь твар. З гэтае прычыны Ванэк устаў і схіліўся над вольнапісаным, які пачаў тлумачыць яму сваю работу.

— Ведаеце,—сказаў Марэк,—гэта-ж пякельна цяжкая задача, пісаць гісторыю батальёну наперад, у запас. Галоўная справа ў тым, каб сыстэматызаваць увесь матэрыял. Ва ўсім, ведаеце, павінна быць сыстэма.

— Значыцца, сыстэматычная сыстэма?—з больш ці менш пагардлівай усьмешкай запытаў каптэнармус Ванэк.

— Вось так, менавіта,—абыякава кінуў вольнапісаны,— сыстэматызаваная сыстэматычная сыстэма пры пісаньні гісторыі батальёну, бо нельга-ж ад самога пачатку выступіць з якою-небудзь буйнаю перамогай. Усё павінна разгортвацца памаленьку, згодна пэўнага пляну. Ня можа-ж, сапраўды, наш батальён адразу выйграць сусьветную вайну. Цярплівасьць, панове, цярплівасьць. Галоўная справа для гэткага добрасумленнага гісторыка, як я, гэта—перш за ўсё скласьці плян нашых перамог. Вось, напрыклад, тут я апісваю, як наш батальён—гэта адбудзецца,

мусіць, месяцы праз два—ледзь-ледзь не пераходзіць расійскае мяжы, якую вартуюць вельмі вялікія сілы, ну, скажам, данскія казакі, у той час, як некалькі варагавых дывізій трапляе ў тыл нашага становішча. На першы погляд, здаецца, што наш батальён няміnуча загінуў і мы будзем пасечаны на кавалкі. Але тут капітан Загнэр аддае па батальёну наступны загад: «Бог не жадае, каб мы згінулі. Значыцца, уцякайма!». Дык вось наш батальён пачынае ўцякаць, але варожая дывізія, якая абышла нас з тылу, бачачы, што ўласна кажучы мы бяжым за ёю без адзінага стрэлу, здаецца нашаму агульнаму рэзэрву арміі. Вось з гэтага і пачынаецца гісторыя нашага батальёну. З нязначнага інцыдэнту, гаворачы высокім стылем, пане Ванэк, разьвінаюцца потым справы, якія маюць найвялікшае значаньне. Наш батальён ідзе ад перамогі да перамогі. Цікава будзе прачытаць, як наш батальён зробіць начны напад на соннага ворага, для чаго, праўда, летапісец павінен мець стыль аўтара «Ілюстраваных корэспондэнцый з тэатру вайны», якія выйшлі ў час расійска-японскай вайны ў выдавецтве Вілінэка ў Празе. Дык вось, наш батальён нападае зьнячэўку на варожы лягер пад час сну. Кожны з нашых салдатаў выбірае сабе аднаго з ворагаў і з напружаньнем ўбівае свой штык ў ягоныя грудзі. Цудоўна навостраная сталь уваходзіць у людзей, як у масла; толькі часамі храбусьне рабрына. Сонныя ворагі ўздрыгваюць усім целам, вырачваюць на момант вочы, якія нічога ня бачаць, хрыпяць і выпростваюцца мёртвым. На іх вуснах застывае крывавая ропа... Гэтым справа канчаецца і перамога нашага слаўнага батальёну забясьпечана. Ці яшчэ лепш будзе справа, прыкладам, месяцы праз тры, калі наш батальён захопіць у палон расійскага цара, але пра гэта мы пагутарым з вамі другі раз, пане Ванэк, а тымчасам я прыгатую ў запас пару-другую невялікіх эпізодаў. Давядзецца прыдумаць зусім новыя вайсковыя выразы. Адзін я ўжо прыдумаў: я буду гаварыць пра «ахвярную рашучасьць нашых салдатаў, пранізаных асколкамі знарадаў». Пры выбуху ворагавай міны аднаму з нашых командзіраў дазьдзелу, скажам дванаццаці ці трынаццатай роты, начыста адрывае галаву.

— Дарэчы,—выгукнуў раптам вольнапісаны і лопнуў сябе па ілбе,—ледзь-ледзь не забыўся! Пане каптэнармус, ці кажучы

грамадзянскаю мовай, пане Ванэк, вы абавязкова павінны даць мне сьпіс усіх асоб, якія належаць да унтэр-афіцэрскага складу. Назавеце мне якога-небудзь унтэр-афіцэра і з дванаццатай роты... Як? Хуска? Ну, добра... Значыць, гэтаму самаму Хуску выбухам міны адрывае галаву, талава ляціць к чорту, а цела робіць яшчэ некалькі крокаў, нацэльваецца і зьбівае куляю ворагаў аэраплян... Зразумела, што гэтыя слаўныя перамогі сьвяткуюцца потым у Шэнбруне, у пчыльным сямейным коле. У аўстрыйскай арміі шмат батальёнаў, але адзіны батальён, які так вызначыўся, гэта—наш, так што ў гонар яго наладжваецца пры царскім двары маленькая сямейная ўрачыстасьць. Як відаць з маіх нататак, я ўяўляю сабе гэтую справу такім парадкам, што для такога здарэньня сям'я эрцгерцогіні Марыі-Валерыі пераяжджае з Вальязе ў Шэнбрун. Урачыстасьць мае зусім інтымны характар і адбываецца ў залі, каля спачывальні нашага ўлюбёнага монарха. Спачывальня асьветлена белымі сьвечкамі, бо, як вядома, пры двары ня любяць электрычнага асьвятленьня з прычыны магчымага кароткага замыканьня, супроць якога ў старога монарха ёсьць штосьці на воку. У 6 гадзін вечару пачынаецца ўшанаваньне нашага батальёну. У гэты момант у залю, якая, уласна кажучы, належыць да апартамантаў нябожчыцы імпэратрыцы, уводзяць унукаў яго імпэратарскае вялікасьці... У мяне ўзьнікае яшчэ такое пытаньне-хто будзе прысутнічаць апрача членаў імпэратарскай фаміліі. Генэрал-ад'ютант імпэратара граф Паар, вядома, павінен і будзе прысутнічаць. Пасьля, бо на гэтакіх сямейных і інтымных сьвятах звычайна каму-небудзь бывае блага (гэтым я зусім ня хочу сказаць, што графу Паару зноў будзе мутарна), дык неабходна прысутнасьць лейб-мэдыка, профэсара Кэрцля. Для парадку, каб прыдворныя лёкаі не дазвалялі сабе вольна трымацца з прысутнымі на парадным абедзе дамамі, будуць запрошаны обэргофмэйстэр барон Ледэрэр, камэргер граф Бэльград і статс-дама графіня Бомбэль, якая грае паміж прыдворных дам тую-ж ролю, што „мадам» у праскім, доме» Шухі. Калі ўсё гэтае шляхетнае таварыства зьбярэцца, пра гэта будзе далажана гасудару імпэратару. Імпэратар будзе ласкавы выйсьці да гасьцей у суправаджаньні сваіх унукаў, сядзе за стол і скажа тост у

тонар нашага батальёну. Пасьля імпэратара скажа слова эрцгэрцогіня Марыя-Валерыя. Слова, прысьвечанае галоўным чынам вам, пане каптэнармус... Праўда, згодна маіх натагак, наш батальён будзе мець цяжкія страты, бо батальён без забітых—не батальён. Давядзецца яшчэ напісаць асобны разьдзел пра нашых забітых... Але гісторыя батальёну не павінна складацца з адных сухіх голых фактаў, якіх у мяне сабрана наперад ужо штосьці каля 250 штук. Вось вы, напрыклад, пане Ванэк, будзеце забіты пры абароне пераходу праз маленькую рачулку, а Балун, які так пацешна паглядае на нас, памірае зусім іншаю сьмерцю—не ад кулі, шрапнэлі ці знараду. Ён будзе засілены арканам, кінутым з ворагавага аэроплян у якраз у тую самую хвіліну, калі бядак будзе есьці абед свайго паручыка Лукаша.

Балун адступіўся на некалькі крокаў, матнуў у адчаі рукою і панура прамовіў:

— Што-ж я магу зрабіць, калі ў мяне такі ўжо характар, калі яшчэ служыў на прызыўнай службе, я па тры разы на дзень бегаў на кухню па ежу, пакуль мяне нарэшце не пасадзілі. Аднойчы я злаўчыў сабе тры дзялянкі мяса на абед, за што мне і давялося адседзець цэлы месяц. Няхай будзе воля божая!

— Ды ня бойцеся, Балун,—пачаў суцяшаць яго вольнапісаны,—у гісторыі батальёну пра вас ня будзе гаварыцца, што вы згінулі пад час ежы, на шляху ад афіцэрскае кухні да акопу. Не. Вы будзеце прыгаданы: разам з астатнімі людзьмі нашага батальёну, якія зложылі свае галовы на славу нашай монархіі, напрыклад разам з каптэнармусам Ванэкам.

— А якую-ж сьмерць вы мне падрыхтавалі, Марэк!

— Чакайце, не сьпяшайце, пане каптэнармус. Так хутка справа ня робіцца,—задумліва сказаў вольнапісаны,—Вы-ж з Кралупу, праўда. Ну, дык напішэце дамоў у Кралуп, што вы згінулі бяз сьледу, але паведаміце пра гэта як можна асьцярожней, ці можа быць вам больш спадабаецца быць цяжка параненым і застацца ляжаць каля драцяных загарожаў? Вы ляжыце там з патрушчанаю нагою цэлы дзень. Уначы вораг асьвятляе нашы позыцыі прожэктарамі. Намацвае вас і, мяр-

куючы, што вы вышлі на выведку, пачынае асыпаць вас знарадамі і шрапнэльлю. Вы такім чынам робіце нашай арміі вялізарную паслугу, таму што варожая армія страціла на вас такую вялізарную колькасьць знарадаў і ладункаў, як на цэлы батальён, а часткі вашага цела, пасьля гэтых выбухаў, вольна лятаюць у паветры, разразаюць яго сваім рухам ды сьпяваюць гімн вялікай перамозе... Такім чынам чарга дойдзе да ўсіх і кожны з нашага батальёну як-небудзь вызначыцца, так што слаўныя старонкі нашай гісторыі будуць суздром запоўнены перамогамі, хоць мне дужа не хацелася-б перапаўняць іх. Але нічога ня зробіш. Усё павінна быць праведзена, як трэба, каб пра нас засталася памятка, перш чым ад нашага батальёну, скажам, у верасьні, зусім нічога не не застанецца, апрача гэтых слаўных старонак, якія раскажуць усёй Аўстрыі, што людзі, якія ніколі больш ня ўбачаць сваёй цудоўнай бацькаўшчыны, біліся гэтак-жа слаўна, як і бясстрашна...

Самы канец, пане Ванэк, ведаеце эпілёг—я ўжо зладжыў. Вечная слава памяці згінуўшых! Іх любоў да бацькаўшчыны ёсьць найсьвяцейшая любоў, бо яна венчаная сьмерцю. Няхай шануюцца іхныя імёны па век, як напрыклад вашае імя, пане Ванэк! І няхай тыя, каторых страта бацькі абяздоліла больш за ўсіх, асушаць сьлёзы свае з гордаю сьвядомасьцю, што іх дарагія нябожчыкі былі героямі нашага батальёну.

Тэлефоніст Хадынскі і кухар Юрайда з вялікаю цікавасьцю слухалі гэтае апісаньне падрыхтаванае гісторыі батальёну.

— Вось будзьце ласкавы паглядзець, панове,—сказаў вольнапісаны, перагортваючы свае нататкі.—Старонка 15: «Тэлефоніст Хадынскі забіты разам з батальённым кухарам Юрайдам». Далей: «Надзвычайнае гэройства. Тэлефоніст Хадынскі трое сутак, не пакідаючы свайго паста каля тэлефону ратуе з небясьпекаю для жыцьця тэлефонны дрот у сваім бліндажы. Кухар Юрайда, заўважыўшы, што вораг абышоў батальён з флянгу, кідаецца з катлом гарачае поліўкі на тых, што наступаюць, і сее між іх сумятню і ашпорвае іх страваю... Цудоўная сьмерць абодвых. Першы выбухае на фугасе. Другі гіне ад атрутных газаў, якія яму пускаюць у нос, калі ў няшчаснага ўжо больш нічога не засталося, чым-бы ён мог адбівацца.

Абодва паміраюць са словамі: «Няхай жыве наш батальёнпы камандзір!» Найвышэйшае камандваньне ня можа рабіць нічога іншага, як толькі прысылаць нам штодзень сваю падзяку ў выглядзе загадаў па арміі, каб і іншыя вайсковыя часьці даведаліся пра слаўныя ўчынкі нашага батальёну і насьледвалі наш прыклад. Вось чакайце, я вам прачытаю вынятку з аднаго такога загаду па арміі і флёце, які быў прачытаны ва ўсіх ротах, эскадронах, батарэях і экіпажах. Ён дужа падобен на загад эрцгэрцога Карла, які той выдаў у 1805 годзе, калі стаяў са сваёю арміяй пад Падуяю і на наступны дзень пасьля гэтага загаду атрымаў добрую пачостку... Дык вось проша паслухаць, што будзе прачытана ва ўсёй арміі пра наш батальён, як пра ўзорна-гэройскую вайсковую частыць: «...я ўпэўнен, што ўся армія возьме за прыклад вышэйзгаданы батальён, асабліва-ж засвоіць той дух упэўненасьці ва ўласныя сілы, тую непарушнасьць і стойкасьць у небясьпечных становішчах, тое нячуванае гэройства, тую любоў і давер'е да сваіх начальнікаў, адным словам усе тыя высокія якасьці, якімі вызначаецца гэты батальён і якія вядуць яго ад слаўнага ўчынку да ўчынку, ад перамогі да перамогі на славу нашае зброі. Яго прыкладу»...

З таго месца, дзе ляжаў Швэйк, пачулася моцнае пазяханьне і льга было чуць, як Швэйк гаварыў праз сон:

— Гэта вы зусім правільна заўважылі, фраў Мюльлер, што людзі бываюць надзвычайна падобны адзін на аднаго. У Кралупе жыў нейкі пан Ярош, які будаваў калодзежы і гэты пан быў як дзьве кроплі вады падобен да майстра гадзіньнікаў Лейханца з Пардубіц, а той—на пана Піскору, з Ічыну. А ўсе трое—на нейкага невядомага самагубцу, якога знайшлі павешанага і які загінуў у сажалцы, недалёка ад Нэйгаўзу, якраз каля чыгуначнага насыпу, дзе ён, мусібыць, кінуўся пад цягнік.

І зноў галоснае пазяханьне, а пасьля заключныя словы:

— І вось усіх астатніх прысудзілі да буйнага грашовага спагнаньня, а заўтра, пане Мюльлер, вы мне прыгатуйце, калі ласка, макароны.

Швэйк перавярнуўся на другі бок, дый зноў захроп, у той час, як паміж окультыстам Юрайдам і вольнапісаным пачалася спрэчка пра наступныя падзеі.

Кухар-окультыст Юрайда выказаў погляд, што на першы погляд яно як быццам-бы недарэчна, што чалавек на жарт піша пра тое, што яшчэ толькі здарыцца ў будучым; але з другога боку, гэтакі жарт часта мае сілу прароцтва, калі духоўны зірк чалавека, пад уплывам таемных сіл, прасякае праз шырыню невядомага будучага. Пасьля гэтых слоў прамова Юрайды была ўжо наскрозь містычная. У кожным другім яго сказе адчынялася якая-небудзь заслона будучага, пакуль ён не зьвярнуў на рэгенэрацыю. Гэта ёсьць, аднаўленьне чалавецкага цела, пасьля чаго загаварыў пра ўласьцівасьць інфузорый аднаўляць часткі свайго організму і закончыў сьцьвярджэньнем, што кожны чалавек можа адарваць у яшчаркі хвост, і ён у яе ізноў вырасьце.

На гэта тэлефоніст Хадынскі заўважыў, што людзі маглі-б усе пальчыкі сабе аблізаць, каб яны ўмелі рабіць гэткія штукі, як яшчарка. Напрыклад, на вайне, дзе ў людзей адрываюць галаву ці іншыя часткі цела, такая здольнасьць была-б дужа пажаданаю вайсковаму ведамству, таму што тады ня было-б болей інвалідаў. Кожны аўстрыйскі салдат, у якога-б заўжды выросталі то новыя рукі то ногі, то галава, быў-бы шмат каштоўней, чымся цэлая цяперашняя брыгада.

Вольнапісаны паведаміў, што ў сучасны момант, дзякуючы высокаму разьвіцьцю вайсковае тэхнікі, можна разрываць чалавечае цела ў выпадку патрэбы на тры часткі па дыяганалі. Існуе закон размнажэньня бічаносцаў з клясы інфузорый: кожная палавінка аднаўляецца, у яе зьяўляюцца новыя органы і яна вырастае ў цэлага бічаносца. Па аналёгіі, аўстрыйская армія пасьля кожнага бою, у якім яна брала ўдзел, патройвалася-б, падзесяцяралася-б, і з кожнай адарванай нагі вырастаў-бы новы, сьвежы пяхотны салдат.

— Шкада, што вас ня чуе Швэйк!—заўважыў каптэнармус Ванэк.—Ён абавязкова расказаў-бы нам які-небудзь прыклад.

Швэйк зараз-жа абазваўся на сваё прозьвішча, прамармытаў:—Ёсьць!—і выказаўшы гэтым адказам сваю вайсковую дысцыпліну, пачаў ізноў храпці.

Праз крыху адчыненыя дзьверы вагону прасунулася галава хадпаручыка Дуба.

— Дзе Швэйк!—запытаў ён.

— Маю гонар далажыць—сьпіць, пане падпаручык,—адказаў вольнапісаны.

— Калі, я пытаюся яго! Мяне дужа дзівіць, што вы самі зараз-жа ўскочыць і паклікаць яго.

— Ніяк немагчыма, пане падпаручык. Ён сьпіць.

— Дык пабудзеце яго! Мяне дужа дзівіць, што вы самі не здагадаліся, вольнапісаны! Вы павінны былі выказваць як мага больш стараннасьці перад вашым начальствам, вы мяне яшчэ ня ведаеце!... Але калі вы мяне будзеце ведаць...

Вольнапісаны пачаў будзіць Швэйка.

— Швэйк, гарым! Уставайце, жвава!

— Тады, калі гарэў млын у Адколеку,—прамармытаў Швэйк, пераварочваючыся на другі бок,—пажарнікі прыехалі нават з Высачан.

— Вось будзьце ласкавы самі пераканацца,—зьвярнуўся вольнапісаны да падпаручыка Дуба,—што я яго буджу, але што гэта ніяк немагчыма.

Падпаручык Дуб раззлаваўся.

— Як ваш апрозьвішча, вольнапісаны? Марэк? А-а-х, вось яно што! Вы значыць і ёсьць той самы вольнапісаны Марэк, які заўжды сядзеў па дарыштам. Так, ці што?

— Так точна, пане падпаручык. Я прайшоў курс павольнапісанага, та сказаць, па крымінальнай частцы і быў пазбаўлен годнасьці; гэта значыць, пасьля апраўданьня мне дывізыйным судом, які засьведчыў маю невінаватасьць, я быў прызначаны гісторыёграфам батальёну зноў з годнасьцю вольнапісанага.

— Ну, вы нядоўга ім будзеце!—раўнуў падпаручык Дуб, пачырванеўшы, як рак, што рабіла ўражаньне, быццам яго шчокі апухлі ад некалькіх добрых аплявух.—Ужо я пра гэта паклапачуся!

— Прашу скласьці на мяне рапорт па батальёну, пане падпаручык,—сур'ёзна заявіў вольнапісаны.

— Супакойцеся, вы ў мяне не адкруціцеся,—крыкнуў падпаручык Дуб.—Я вам пакажу рапорт! Мы яшчэ з вамі палічымся, але вам ад гэтага будзе мала здавальненьня. Вы мяне яшчэ будзеце ведаць, калі да гэтага часу мяне ня ведалі.

Раззлаваны падпаручнік Дуб адышоў зусім забыўшы, што з хвіліну таму назад у яго быў мілы намер паклікаць Швэйка і загадаць яму дыхнуць на яго, як апошні спосаб высьветліць, ці піў, не зважаючы на забарону, ўдалы ваяка Швэйк, ці не. Цяпер, вядома, было ўжо занадта позна, бо калі ён праз паўгадзіны зноў вярнуўся да таго вагону, людзям пасьпелі раздаць чорную каву і ром. Швэйк прачнуўся ўжо і на выгук падпаручыка Дуба выскачыў, як сэрна, з вагону.

— Ану, дыхні на мяне!—гаркнуў падпаручык Дуб.

Швэйк выдыхнуў ўвесь запас сваіх лёгкіх, як быццам-бы гарачы віхор панёс у поле ўсе пахі сьпіртаачышчальнага заводу,

— Чым гэта ад цябе тхне, нягоднік?

— Так точна, пане падпаручык, ад мяне тхне ромам.

— А-га! Злавіўся, братка!—сьвяткуючы перамогу, выгукнуў падпаручык Дуб.—Нарэшце я цябе злавіў!

— Так точна, пане падпаручык,—абазваўся Швэйк, ня выказваючы ніякае трывогі.—Нам толькі што раздалі кваў з ромам, а я выпіў увесь ром так, бяз кавы. Але калі ёсьць які-небудзь новы загад, што трэба спачатку выпіць каву, а пасьля ўжо брацца за ром, дык пакорна прашу прабачэньня—другі раз ня буду.

— А чаму-ж ты дрыхаў, калі я паўгадзіны перад гэтым прыходзіў сюды? Цябе нават дабудзіцца не маглі.

— Так што дазвольце далажыць, пане падпаручык, я ўсю ноч ня спаў, таму што ўсё ўспамінаў тыя часы, калі ў нас у Вэспрыме адбываліся манэўры. На той раз першы і другі армейскія карпусы, што гралі ролю варожае арміі, наступалі праз Штырыю і абкружылі наш чацьверты корпус, які быў разьмеркаваны ў Вене і яе ваколіцах, дзе ў нас усюдых былі цытадэлі; але яны нас абыйшлі і падыйшлі ўжо да самага мосту, які наш понтонны батальён перакінуў праз Дунай з правага яго берагу. Нам быў дадзены загад перайсьці ў контрнаступленьне, а войскі з поўначы, а таксама і з паўдня з Восека павінны былі нас падтрымаць. І вось нам прачыталі загад, што нам на дапамогу ідзе і трэці армейскі корпус, каб мы ня былі раздушаны між возерам Балатон і Прэсбургам раней чымся наладзім зносіны з другім корпусам. Але толькі ўсё гэта было ні да чаго, таму

што калі мы вось-вось павінны былі выйграць бой, затрубілі адбой і справу выйгралі «белыя павязкі».

Падпаручык Дуб не прамовіў ні слова і матаючы галавою пайшоў, але зараз-жа зноў вярнуўся і сказаў Швэйку:

— Заўважце сабе вы ўсе, што надыдзе час, калі вы ў мяне аж скавытацьмеце.

Больш ён нічога ня мог прыдумаць, а таму зноў пайшоў у штабны вагон, дзе капітан Загнэр якраз дапытваў нейкага няўдаліцу з дванаццатай роты, якога прывёў фэльдфэбэль Штрнат, таму што гэты адважны ваяка ўжо цяпер пачаў рабіць захады, каб зусім унікнуць небясьпекі ў акопах, украўшы на гэтую мэту абабітыя бляхай дзьверы з сьвінушніка. Ён стаяў перад камандзірам вырачыўшы ад страху вочы і апраўдваючыся тым, што хацеў узяць дзьверы з сабой, каб зрабіць ахову ад шрапнэляй, каб было «надзейней».

Гэты інцыдэнт падпаручык Дуб выкарыстаў на вялікую прамову пра тое, як павінен трымаць сябе салдат і з чаго складаюцца яго абавязкі ў дачыненьні да бацькаўшчыны і монарха, які ёсьць наш найвышэйшы вайсковы начальнік і найвышэйшы правадыр. А калі ў батальёне знаходзяцца такія элемэнты, дык неабходна іх зьнішчаць, караць і саджаць пад арышт. Гэты слоўны струмень быў такі недарэчны і недачасны, што капітан Загнэр палопаў вінаватага салдата па плячы і сказаў яму:

— Ну што-ж, калі вы сапраўды шчыра думалі тое, што гаворыце, дык зразумейце, што гэта—глупства, і больш гэтакіх рэчаў не рабіце. А цяпер занясеце дзьверы туды, адкуль вы іх узялі і вымятайцеся да ўсіх чарцей!

Падпаручык прыкусіў губу, будучы пераконаны, што ўласна кажучы, ратунак парушанае дысцыпліны ў батальёне залежыць выключна ад яго аднаго. З гэтае прычыны ён яшчэ раз абышоў увесь раён станцыі. Недалёка ад аднаго складу, на якім была вялікая дошка з абвесткаю на вэнгерскай і нямецкай мовах, што тут забараняецца курыць, ён пабачыў салдата, які сядзе ўна зямлі. Салдат чытаў газэту, якая яго так закрывала, што ня відаць было пагонаў. Падпаручык крыкнуў яму:

«Устаць»! Высьветлілася, што гэта быў салдат вэнгерскага палка, які стаяў у рэзэрве ў Хумэне.

Падпаручык Дуб страсянуў яго за плячо; тады мадзьяр ўстаў, запхнуў газэту ў кішэню і, ня лічачы нават патрэбным аддаць чэсьць, пайшоў у кірунку на вуліцу. Падпаручык Дуб быццам у тумане пайшоў за ім, але той наддаў кроку, а пасьля адвярнуўся і зьдзекваючыся падняў рукі дагары, каб падпаручык Дуб ні хвіліны не сумняваўся, што той адразу вызначыў прыналежнасьць яго, падпаручыка Дуба, да чэскага палка. Нарэшце мадзьяр прыпусьціўся бегчы і зьнік сярод бліжэйшых дамкоў.

Каб як-небудзь паказаць, што ён ня мае нічога агульнага з гэтаю сцэнай, падпаручык Дуб паважна зайшоў у адну з крамак на гэтай-жа вуліцы, зьбянтэжана паказаў на маток чорных нітак, паклаў іх у кішэню, заплаціў і вярнуўся ў штабны вагон. Пасьля ён загадаў батальённаму ордынарцу паклікаць яго дзяншчыка Кунэрта і сказаў, перадаючы яму ніткі:

— Мне пра ўсё даводзіцца клапаціцца самому, вы-ж, напэўна, забыліся ўзяць з сабой ніткі.

— Нікак нет, пане падпаручык, не забыўся. У мяне назапашана цэлы тузін.

— А ну, пакажэце мне, ды толькі зараз-жа. Ці вы думаеце, што я вам веру?

Калі Кунэрт вярнуўся з цэлаю скрынкаю чорных і белых штулек, падпаручык Дуб сказаў:

— Ну, паглядзі, якія ніткі ты купіў, і паглядзі, які маток купіў я. Паглядзі, якія яны ў цябе тонкія і як лёгка рвуцца і, наадварот, як трэба тужыцца, каб разарваць мае. На паходзе нам дрэні ня трэба. На паходзе ўсё павінна быць самага першага гатунку... Забірай свае шпулькі і чакай маіх далейшых загадаў, і запомні: другі раз нічога не рабі ад сябе, на свой розум, а прыдзі, запытай мяне, калі хочаш што-небудзь купіць. Я-б табе не пажадаў ведаць мяне, таму што ты з благога боку мяне яшчэ ня ведаеш...

Кунэрт пайшоў і падпаручык Дуб зьвярнуўся да паручыка Лукаша:

— Мой дзяншчык—дужа кемлівы чалавек. Часамі ён штонебудзь зробіць і ня так, але наогул ён цудоўна спакмячае. А лепш за ўсё ў ім яго абсолютная сумленнасьць. У Бруку я атрымаў ад свайго шваґра з вёскі пасылку, пару смажаных маладых гусей, дык ці паверыце—ён да іх нават не дакрануўся. А з тэй прычыны, што сам я іх ня мог гэтак хутка зьесьці, дык ён лепей даў ім прасьмердзнуць. Вось што значыць дысцыпліна. Праўда, кожны афіцэр павінен сам выхоўваць сваіх салдатаў.

Каб паказаць, што ён зусім ня цікавіцца балбатнёй гэтага ідыёціка, паручык Лукаш завярнуўся да важна і сказаў:

— Ах, так, сягоньня-ж серада.

Адчуваючы патрэбу выказацца, падпаручык Дуб падышоў да капітана Загнэра і пачаў конфідэнцыяльным таварыскім тонам:

— Паслухайце, капітан Загнэр. Якога вы погляду пра...

— Выбачайце, адну хвілiначку,—перапыніў яго капітан Загнэр і хутка вышаў з вагону.

*

Тымчасам Швэйк і Кунэрт размаўлялі пра сваіх паноў.

— Дзе гэта ты ўвесь час прападаў, што цябе зусім і ня відаць было?—запытаў Швэйк.

— Ды ты-ж ведаеш, што з маім наравістым заўжды якаянебудзь калатня. Кожную хвіліну ён кліча мяне ды пытаецца пра рэчы, да якіх мне няма жаднае справы. Між іншым, ён мяне запытаў, ці таварышую я з табою, а я яму адказаў, што мы амаль ня бачымся.

— А гэта дужа ласкава з ягонага боку, што ён пытаецца пра мяне. Я яго дужа люблю, гэта пана твайго. Ён такі добры і сярдэчны і да салдатаў ставіцца, як бацька,—сур'ёзна сказаў Швэйк.

— Ну, брат, у гэтым ты дужа памыляешся!—запярэчыў Кунэрт.—Сьвіньня ён, і дурны, як абух. Мне ён дадзеў ужо горш за горкую рэдзьку, так ён мяне дапякае.

— Ды што ты?—зьдзівіўся Швэйк.—А я-ж думаў, што ён сапраўды такі добры чалавек. Але, аднак, ты вельмі дзіўна гаворыш пра свайго падпаручыка, хоць, зрэшты, у дзяншчыкоў

гэта зроду гэтак вядзецца. Вось, напрыклад, дзяншчык маёра Вэнцля, ды кіначай ня скажа пра свайго пана, як: «Сволач ідыёт паганы!», а дзяншчык палкоўніка Шрэдэра, гаворачы пра свайго пана, абзываў яго толькі «сьцерва», «падла хадзячая!» А робіцца гэта таму, што кожны дзяншчык вучыцца ад свайго пана. Калі-б пан нас ня лаяў, дык і дзяншчык не паўтараў-бы за ім. У Будвэйсе пад час мае службы быў у нас адзін падпаручык, Прахаска—ягонае прозьвішча, дык той шмат ня лаяўся, а толькі называў свайго дзяншчыка «шляхетнаю каровою». Іншае лаянкі ягоны дзяншчык, некі Гібман, ад яго ня чуў. І так ён да гэтых слоўцаў прызвычаіўся, што калі пашоў у запас, дык пачаў называць і бацьку, і маці, і сясьцёр «шляхетныя каровы». А калі ён абазваў так і сваю нявесту, тая пакрыўдзілася і падала на яго ў суд за зьнявагу, таму што ён абазваў так яе, бацьку яе і маці яе на аднэй вечарынцы перад вочы ўсіх людзей. І ніяк не хацела яна яго прабачыць, а на судзе казала, што калі-б ён абазваў яе шляхетнай кароваю» сам-насам, дык яна можа-б і даравала, а так гэта скандал на ўсю Эўропу... А праміж нас кажучы, Кунэрт, гэтага ад твайго падпаручыка я ніяк не чакаў. На мяне ён зрабіў ужо тады, калі я яшчэ першы раз з ім гутарыў, такое сымпатычнае ўражаньне, быццам кілбаса, якую кагадзе прынесьлі з вэнглярні, а калі я паразмаўляў з ім другі ды трэці раз, ён здаўся мне такі начытаны і нейкі асабліва душэўны... Ты, уласна кажучы, адкуль? Проста з Будвэйсу? Вось гэта я люблю, калі хто-небудзь «проста» адтуль ці адтуль. А дзе ты там жывеш? Ага! Ну, што-ж, улетку там дужа добра... Сямейны? Жонка, кажаш, і трое дзяцей? Эх, шчасьлівы ты, таварыш! Прынамсі ёсьць каму па табе паплакаць, як любіў гаварыць у сваіх казанях мой фэльдкурат Кац, ды гэта-ж і сапраўды так, таму што я чуў такую прамову і ў Бруку. Яе гаварыў адзін палкоўнік запасным, што накіроўваліся на сэрбскі фронт, і казаў, што кожны салдат, які пакінуў дома сям'ю, парывае, праўда ўсе сямейныя ланцугі... ці то ён казаў так: «Калі ён стане трупам, трупам для сям'і, дык сямейныя ланцугі вядома парваны, але ўсё-ж ён гэрой, таму што аддаў жыцьцё за больш шырокую сям'ю, за бацькаўшчыну!» А жывеш ты, значыцца, на чацьвер-

тым паверсе? У мэзоніне?.. Так, так... Гэта ты праўду кажаш, я цяпер і сам ўспомніў, што там няма чатырохпавярховых дамоў... Табе пара ўжо? Ах, вось яно як: твой пан стаіць перад штабным вагонам ды глядзіць у наш бок. Ну, дык май на ўвазе, што калі ён запытае ці гаварылі мы з табою пра яго, дык ты скажы проста, што я пра яго сапраўды гаварыў, ды не забудзься пераказаць яму, як добра я пра яго гаварыў, што я рэдка страчаў афіцэра, які-б так ласкава і па-бацькаўску абыходзіўся з салдатамі. І яшчэ не забудзься пераказаць яму, што ён здаўся мне такі начытаны і скажы яму, што ён дужа разумны. І нарэшце скажы яму яшчэ, што я цябе ўгаворваў трымаць сябе як належыць ды выконваць усе яго нават дробязныя жаданьні. Ты ня пераблытаеш?

Швэйк палез да сябе ў вагон, а Кунэрт са сваімі ніткамі падаўся ў свой бярлог.

Праз чвэртку гадзіны цягнік рушыў далей у Нодзь-Чаба, паўз спаленыя вёскі Брэстава і Вялікіх Радван. Відаць было, што тут справа пачыналася не на жарт.

Узбочыны і спады Карпатаў былі парэзаны акопамі, якія цягнуліся ад даліны да даліны ўздоўж чыгуначнага палатна з новымі шпаламі. Паабапал чыгункі разьзяваліся вялікія яміны ад знарадаў. Над рэчкаю, што працякала да Лаборчу, за загібамі якое ішла чыгуначная лінія, відны былі часовыя масты і абвугленыя стаякі ранейшых пераправаў.

Уся даліна Мэзо-Лаборчу была ўзрыта і перакапана, быццам тут працавала цэлая армія вялізных кратоў. Шосэ па той бок рэчкі была пакаверкана, а каля яго відны былі ўтоптаныя плошчы—месцы прыпынкаў ворага.

Моцнымі дажджамі і ветрам прыбіла да краёў утвораных знарадамі ямін шкумацьцё аўстрыйскіх мундзіраў.

За Нодзь-Чабаю, на старой абпаленай сасьне, павіс у густым сплячэньні галін бот аўстрыйскага пяхотнага салдата, з якога тырчаў кавалак галёнкі.

Трапляліся лясы бяз ніводнага лістка, бяз ніводнай зялёнае голкі—такая праімчалася тут навала артылерыйскага агню. І наўкол стаялі дрэвы з паламанымі верхавінамі і прыдзіраўленыя, як рэшата, сьцены хутароў.

Цятнік марудна поўз па сьвежым насыпе. Такім, чынам, увесь баталён мог добра ўспрыняць і прадчуць усю асалоду вайны і, бачачы брацкія магілы з белымі крыжамі, што цьмяна паблісквалі на даліне і на спустошаных хспадах ,паволі, але пэўна падрыхтавацца да выступленьня на поле гонару, вянцом якога служыла замызганая ў дарожнай гразі шапка, што мат-лялася на бедным непафарбаваным крыжы.

Немцы з Бэргенхэнштэйну, што сядзелі ў апошніх вагонах ды сьпявалі яшчэ на папярэдняй станцыі свае ўлюбёныя песьні, цяпер крыху засмуціліся. Яны сэрцам адчувалі, што шмат хто з тых, чые шапкі аздаблялі брацкія магілы, сьпявалі тую-ж песьню пра тое-ж, як добра будзе, калі яны вярнуцца дамоў ды будуць сядзець у сябе ў хаце разам са сваёю любаю...

Мэзо-Лаборч—быў прыпынак на ператворанай у руціны ды ўшчэнт спаленай станцыі, з закураных сьцен якое недарэчна тырчэлі ва ўсе бакі патнутыя жалезныя папярэчыны.

Новы даўгі драўляны барак, насьпех збудаваны замест ранейшага будынку станцыі, быў укрыты плякатамі на ўсіх мовах: «Падпішыся на вайсковую пазыку».

У суседнім такім-жа даўгім бараку зьмяшчаўся шпіталь Чырвонага крыжу, з якога якраз вышлі дзьве сястры і таўсты вайсковы доктар. Сёстры клаліся з рогату ад таўстуна, які, каб расьмешыць іх, перакрыўляў галасы розных жывёл і даволі няўдала прабаваў рохкаць.

Недалёка ад чыгуначнага палатна, бліжэй да рэчкі стаяла разьбітая знарадам палявая кухня. Швэйк паказаў яе Балуну і сказаў:

— Глянь вось, Балун, што чакае нас у недалёкім будучым. Толькі зьбіраліся выдаваць абед, як у тую-ж самую хвіліну наляцела бомба і вось як гэтую кухню вырабіла.

— Жах, жах,—уздыхнуў Балун.—Я ніколі не ўяўляў сабе, што мяне чакае што-небудзь падобнае да гэтага, але вінавата ў гэтым мая гардыня. Бо які-ж я быў асёл! Мінулаю зімою я купіў сабе ў Будвэйсе скураныя рукавіцы. Мне, бачыце, было ўжо няёмка насіць на сваіх мужыцкіх лапах старыя вязаныя рукавіцы, якія насіў яшчэ мой нябожчык бацька і мяне ўсё так

падбівала купіць скураныя рукавіцы, якія носяць у горадзе... Бацька мой жор гарох, а я, бачыце, не магу тароху—давай мне курыцы ці гусака! І нават звычайная сьвініна была мне не да смаку, так што мая баба, каб мяне пярун засьвяціў, гатавала яе на піве...

І Балун, зусім расхваляваўшыся, пачаў каяцца ў сваіх грахох.

— Я бэсьціў у тракціры ў Малышы нядобрымі словамі ўсіх божых угоднікаў, а ў Ніжня-Цяхаі набіў пана каплана. У бога я яшчэ веру, гэта я адмаўляць ня буду, але наконт сьвятога Язэпа даўно ўжо пахіснуўся вох, даўно, у хаце ў сябе я цярпеў абразы ўсіх сьвятых, і толькі сьвятога Язэпа я выкінуў, і вось цяпер бог мяне і карае за ўсе мае грахі і маю бессаромнасьць. Колькі такіх грахоў я зрабіў у сваім млыне! Як часта лаяўся я з бацькам і не даваў яму спакойна дажыць свайго веку і як часта я дарма крыўдзіў жонку!

Швэйк задумаўся.

— Ты-ж млынар, праўда?—запытаў ён Балуна.—Тады табе трэба было ведаць, што божыя млыны мелюць ціха ды затое чыста, калі праз цябе пачалася сусьветная вайна.

Да гутаркі далучыўся вольнапісаны.

— Вашым баглайствам і няпрызнаньнем усіх сьвятых вы, Балун, рашуча сапсавалі ўсю справу, бо вам павінна было быць вядома, што нашая аўстрыйская армія ўжо шмат гадоў зьяўляецца каталіцкаю арміяй, за найбольш выразны прыклад якое служыць нам найвышэйшы правадыр. Як гэта вы наогул наважыліся ўступіць у армію, тоячы ў сабе атруту нянавісьці да некаторых сьвятых угоднікаў, калі само вайсковае міністэрства ўвяло праз гарнізонныя ўправы іезуіцкія экзэрцыцыі паном афіцэрам і мы зьяўляемся сьведкамі ўмацаваньня і росту клерыкалізму ў арміі? Вы мяне разумееце, Балун? Ці разумееце вы, што вы зрабілі злачынства супроць сьвятога духа нашае слаўнай арміі? А пасьля гэты сьвяты Язэп, пра якога вы нам расказвалі, што ягоны абраз быў выкінуты з вашага дому. А ён-жа, як вядома, зьяўляецца заступнікам ды абаронцам усіх, хто хоча так ці іначай ухіліцца ад вайсковай службы. Ён-жа быў цесьлем, а

вы ведаеце прымаўку: «А ну паглядзім, дзе цесьля пакінуў шчыліну?» Колькі людзей аддалося ўжо з гэтым дэвізам у палон... калі яны, абкружаныя з усіх бакоў і ня бачачы ніякага выйсьця, прабавалі, мусібыць, выратавацца ня толькі ад аднаго эгоізму, але і ад пачуцьця салідарнасьці з арміяй, каб потым, вярнуўшыся з палону, мець магчымасьць сказаць яго апостальскай вялікасьці: «вось ізноў перад вамі і чакаем вашых далейшых загадаў». Вы мяне разумееце, Балун?

— Не, не разумею,—уздыхнуў Балун.—У мяне наогул цяжкая мазгаўня. Мне ўсё трэба паўтарыць разоў дзесяць.

— Няўжо?—запытаўся Швэйк.—Ну дык слухай, я табе яшчэ раз растлумачу. Ты толькі што чуў, які дух пануе ў арміі і ты чуў, што табе давядзецца паверыць у сьвятога Язэпа, і што, калі ты будзеш абкружаны ворагам, ты павінен будзеш здагадацца, дзе цесьля пакінуў шчыліну, каб ты мог захаваць сябе для свайго імпэратара і для новых войнаў. Вось цяпер ты, можа, зразумеў і табе было-б зусім ня так блага, калі-б ты нам падрабязьней пакаяўся, што за распуствы ты чварыў у сваім млыне. Але толькі не надумайся расказваць, як тая дзяўчына ў анэкдоце, што пайшла каяцца да папа, а пасьля, калі пакаялася ўжо ў розных грахох, раптам засаромелася і сказала, што кожную ноч распусьнічала. Зразумела, калі поп гэта пачуў, у яго пацякла сьліна і ён сказаў: «Не саромся, дачка мая, я-ж божы намесьнік, дык ты раскажы падрабязьней, як ты грашыла». Ну, а яна яшчэ горай заплакала, што ёй сорамна, бо гэта такі страшэнны грэх, а ён, ёй ізноў чаўпе, што ён яе духоўны бацька. Нарэшце, пасьля ўпартага адмаўленьня, яна расказала, што яна заўжды распраналася голая і клалася на ложак. І зноў ён ня мог з яе слова выціснуць і толькі яна яшчэ больш раўла. Ён ёй зноў паўтарае, што яна не павінна саромецца, што чалавек ад нараджэньня ёсьць пасудак грэху, а што літасьць божая нявымерна. Тады яна нарэшце наважылася і пакаялася: «Калі я, значыцца, распраналася, ды клалася ў ложак, я пачынала калупаць паміж пальцаў на нагах ды нюхаць». Вось вам і ўся распуста! Але я спадзяюся, Балун, што ня гэткімі справамі займаўся ў сябе ў млыне і раскажаш нам што-небудзь цікавае, сапраўды распуснае.

Высьветлілася, што Балун, па яго словах, дазваляў сабе грашыць з сялянкамі; грэх яго зьмяшчаўся ў тым, што ён падменьваў іхную муку і з прастаты душэўнае называў гэта распустаю ці непатрэбствам. Больш за ўсіх расчараваны быў тэлеграфіст Хадынскі, які проста запытаў былога млынара, няўжо-ж ён сапраўды ня балаваўся з сялянкамі на мяхох мукою, на што Балун, ламаючы рукі, адказаў:

— На гэта я быў занадта дурны.

*

Людзям абвясьцілі, што за Палотаю ў горным праходзе Любка яны атрымаюць абед, і батальённы каптэнармус, ротныя кашавары і падпаручык Кайтхамль, які загадваў харчоваю часткаю батальёну, сапраўды накіраваліся з патрулем, у якім было чатыры ніжэйшыя чыны, у сяльцо Мэзо-Лаборч.

Праз паўгадзіны яны вярнуліся ў суправаджэньні трох зьвязаных за заднія ногі, сьвіней, сям'і русіна, у якой гэтыя сьвіньні былі зрэквізаваны і якая галасіла з гэтай прычыны, ды тоўстага вайсковага доктара са шпіталю Чырвонага крыжу. Вайсковы доктар штосьці горача даводзіў падпаручыку Кайтхамлю.

Перад штабным вагонам сьпіраньні дасягнулі свайго вышэйшага пункту, калі вайсковы доктар абвясьціў капітану Загнэру, што гэтыя сьвіньні прызначаны на патрэбы Чырвонага крыжу, пра што русін таксама нічога не хацеў чуць, патрабуючы, каб сьвіньні былі зьвернуты яму, таму што яны—яго апошняя маемасьць і ён нізавошта, і ўжо ва ўсякім выпадку, не за гэткую цану, якую яму за іх заплацілі, ня згодзен іх аддаць.

Пры гэтым ён пхаў атрыманыя за сьвіней грошы ў руку капітану Загнэру ў той чакс,, як яго жонка моцна трымала другую руку і цалавала яе з тэю пакорлівасьцю, якая заўжды была характарна для гэтых месц.

Капітан Загнэр зусім зьбянтэжыўся і прайшло некалькі хвілін, пакуль яму пашанцавала вызваліцца ад старое. Аднак гэта яму ані не дапамагло, бо замест старое за яго руку ўчапіліся больш маладыя члены русінскае сям'і і ў сваю чаргу пачалі абсыпаць яе пацалункамі.

Але падпаручнік Кайтхемль адрапартаваў:

— У гэтага чалавека засталося яшчэ дванаццаць штук сьвіней і заплачана яму за рэквізаваных сьвіней поўнасьцю, згодна апошняга загаду па харчовай частцы дывізіі за № 12420. Згодна § 16 гэтага загаду за сьвіней належыць плаціць у мясцовасьцях, што не пацярпелі ад вайсковых дзеяньняў, не даражэй за 2 кроны 16 хэлераў, кілё жывое вагі; у мясцовасьцях-жа, што пацярпелі ад вайсковых дзеяньняў, робіцца надбаўка 36 хэлераў на кілё жывое вагі; значыцца, за кілё належыць плаціць 2 кроны 52 хэлеры. Увага: калі будзе высьветлена, што ў раёне вайсковых дзеяньняў сьвінагадоўля не пацярпела і ў насельніцтва ёсьць спакладаныя сьвіньні, якія могуць быць выкарыстаны на харчаваньне эшалёнаў, за сьвініну належыць плаціць, як у мясцовасьцях, якія не пацярпелі ад вайсковых дзеяньняў, з асобнаю надбаўкаю ў памеры 12 хэлераў за кілё жывое вагі. У выпадку нявыразнасьці становішча, на месцы зараз-жа складаецца комісія, куды ўваходзяць: зацікаўленая асоба, начальнік адпаведнага эшалёну і той штаб-афіцэр ці каптэнармус (калі справа датычыцца невялікіх атрадаў), якому даручана загадваньне харчоваю часткай.

Усё гэта падпаручнік Кайтхамль прачытаў уголас па копіі загаду па дывізіі, які ён заўсёды насіў пры сабе, дзякуючы чаму ён ведаў на зубок такія падрабязнасьці, як тое, што ў раёне вайсковых дзеяньняў цана на моркву пастаўлена ад 15 да 30 хэлераў за кілё, а цана на цьвятную капусту, якая адпускаецца ў раёне вайсковых дзеяньняў толькі на афіцэрскі стол, падвышана да 1 кроны 75 хэлераў за кілё.

Тыя, хто выпрацаваў у Вэне гэтыя стаўкі, як відаць меркавалі, што ў спустошаных вайной мясцовасьцях—морквы і цьвятной капусты хоць гаць гаці.

Падпаручнык Кайтхамль прачытаў гэта ўсхвалёванаму русіну па-нямецку і запытаў яго пасьля, ці разумее ён прачытанае, а калі той адмаўляючы заківаў галавой, паручнык зароў на яго:

— Значыцца, ты хочаш, каб была комісія?

Русін зразумеў слова «комісія» і матнуў галавой у знак згоды. Сьвіней ўжо даўно павялі да палявых кухняў, а наўкол іх гаспадара стаялі прызначаныя ў рэквізыцыйны атрад салдаты

з прымкнёнымі да стральбы штыкамі; нарэшце комісія рушыла ў дарогу, каб высьветліць на месцы, г. зн. на хутары, ці трэ было русіну атрымаць 2 кроны 52 хэлеры ці 2 кроны 28 хэлераў за кілё.

Але яны не пасьпелі яшчэ нават дайсьці да дарогі, якая вяла на хутар, як з боку палявых кухняў пачуўся трыкратны прадсьмяротны піск няшчасных сьвінак.

Русін эразумеў, што ўсё скончана і ў адчаі выгукнуў:

— Надбайце мне за кожную сьвіньню хоць па два добрых гульдэны.

Чацьвёра салдатаў яшчэ шчыльней абкружылі яго, а ўся ягоная сям'я загарадзіла капітану Загнэру і падпаручыку Кайтхамлю дарогу, кінуўшыся пасярод яе ў самы пыл на калені.

Старая і дзьве яе дачкі абхапілі калені абодвых афіцэраў, называючы іх сваімі дабрадзеямі, але русін прымусіў іх змоўчаць і на русінскай мове загадаў ім устаць: няхай салдаты жаруць сьвіней і падохнуць ад іх!

Такім чынам, комісія не адбылася, а з тэй прычыны, што русін раптам чагосьці ўзьеўся і пачаў пагражаць кулакамі, адзін з салдатам лузянуў яго прыкладам, які гулка ўдарыўся аб заскарузлы мужыцкі кажушок. Пасьля чаго ўся сям'я перахрысьцілася і са сваім гаспадаром на чале кінулася наўцёкі.

На дзесяць хвілін пазьней батальённы фэльдфэбэль ласаваўся ў сваім вагоне з батальённым ордынарцам Матушычам сьвінымі мазгамі і фэльдфэбэль, напакоўваючы сабе вантробу, зласьліва сказаў пісаром:

— Што? Вам таксама хочацца? Не, браткі, гэта толькі для паноў унтэр-афіцэраў. Кашаварам застануцца почкі і пячонкі, мазгі і лепшае мяса—паном каптэнармусам, а пісаром толькі дубальтовая дзялянка таго-ж мяса, што і ніжэйшым чыном.

Капітан Загнэр у сваю чаргу ўжо загадваў адабраць на афіцэрскі стол лепшае мяса, ня надта тлустае, і згатаваць яго з кменам.

Вось чаму ніжэйшыя чыны, калі быў раздадзены абед, знайшлі ў сваіх бачкох у порцыі крупніку толькі па два маленькія кавалачкі сьвініны, а такія, якім яшчэ больш не пашанцавала,—нават усяго толькі па адным кавалачку сьвіное скуры.

На кухні панавалі звычайнае кумаўство і падхалімства, якімі карысталіся ўсе, што стаялі бліжэй да ўлады. Дзяншчыкі зьявіліся на Любкінскім паравале з тварамі, якія бліпчэлі ад тлушчу. Ва ўсіх ордынарцаў жываты былі, быццам, барабаны Рабілася штосьці неверагоднае!

Вольнапісаны Марэк выклікаў каля катлоў цэлы скандал, таму, што захацеў быць справядлівым. Калі кашавар са словамі: «гэта нашаму гісторыёграфу!» паклаў яму ў бачок дужаваты кавалак варанае грудзінкі, ён заявіў, што на вайне ўсе роўныя. Гэта выклікала агульнае здавальненьне і было сыгналам, каб усе пачалі лаяць кашавараў.

Вольнапісаны шыпрнуў свой кавалак мяса назад, пацьвердзіўшы гэтым, што ён не жадае карыстацца протэкцыяй. Але кашавар гэтага не зразумеў, і падумаў, што батальённы гісторыёграф застаўся нездаволены, а таму кашавар шапянуў яму, каб ён прышоў пазьней, калі раздача скончыцца, і тады ён атрымае кавалак шынкі.

У пісароў морды так і зьзялі, санітары цяжка аддзымуваліся ад сытасьці, а навакол гэтай вакханаліі ўсюдых яшчэ відны былі нязрыбраныя сьляды апошніх баёў. Усюдых ляжалі параскіданыя пустыя ладункі, пустыя бляшанкі ад консэрваў, зрыўкі расійскіх, аўстрыйскіх і нямецкіх мундзіраў, разьбітыя фурманкі і двуколкі і даўгія палосы акрываўленых бінтоў і ваты.

У старой сасьне, каля былога касьцёлу, ад якога засталася толькі куча сьмяцьця, тырчала неразарваная граната. Усюдых былі расьсеяны аскабалкі знарадаў. Дзесьці недалёка былі, як відаць, абы як закопаны трупы забітых, таму што наўкол панаваў цяжкі пах мерцьвячыны.

І ўсюдых, дзе праходзілі і спыняліся на адпачынак войскі, відны былі кучы чалавецкіх экскрэмэнтаў міжнароднага паходжаньня ад усіх народнасьцяй Аўстрыі, Нямеччыны і Расіі. Экскрэмэнты салдатаў усіх нацыянальнасьцяй ляжалі тут поруч ці намнажваліся ў кучы і гэтыя кучы спакойна жылі адна з адною.

Напалавіну разьбітая цыстэрна, будка чыгуначнага вартаўніка і наогул усё, што зьяўлялася якой-небудзь аховаю, было наскрозь прабіта кулямі.

Каб дапоўніць малюнак наступнае баявое ўцехі, за недалёкаю гарою ўздымаўся густы дым, быццам там гарэла вялікая вёска, якая зьяўлялася цэнтрам буйной вайсковай опэрацыі. Там палілі халерныя і дызэнтэрыйныя баракі на вялікую радасьць тых паноў, якім была даручана іхная пабудова пад аховаю эрцгэрцогіні Марыі і якія пры гэтым кралі, як хацелі, ды напакоўвалі сабе кішэні, складаючы сьцьвярджальныя дакуманты на халерныя і дызэнтэрыйныя баракі, якія не існавалі.

А вось цяпер адна група такіх баракаў была аддадзена ў ахвяру за ўсе астатнія, і ў сьмярдзючым дыме падпаленых саламяных сяньнікоў адлятালі на неба ўсе сьляды вялізарных крадзяжоў пад протэктаратам эрцэрцогіні.

На скале за вакзалам немцы пасьпелі паставіць ўжо згінуўшым брандэнбурцам помнік з надпісам «Гэроям Любкінскага перавалу» і з вялікім масянжовым імпэрскім арлом, прычым на цокалі было асабліва адзначана, што гэты помнік зроблен з расійскіх гармат, адбітых нямецкімі палкамі пад час вызваленьня Карпатаў.

У гэтых нязвычайных і нязвычных да гэтага часу абставінах батальён адпачываў пасьля абеду ў сваіх вагонах, у той час, як капітан Загнэр усё яшчэ ня мог дамовіцца са сваім ад'ютантам з прычыны атрыманьня шыфраванае тэлеграмы са штабу брыгады пра далейшы рух батальёну. Дыспозыцыя была такая нявыразная, што, здавалася, быццам батальён зусім дарэмна быў накіраваны да Любкінскага перавалу, а павінен быў ехаць ад Нэйштадту у зусім іншым кірунку, таму што ў тэлеграме гаварылася пра такія пункты, як Кап-Унгвард, Кіш, Бярэзна і Ужок.

Праз дзесяць хвілін высьветлілася, што штаб-афіцэр, які сядзеў у штабе брыгады, усё пераблытаў, бо прышла шыфраваная тэлеграма з запытаньнем, ці зьяўляецца атрымальнікам 8-мы маршавы батальён 75-га палка (вайсковы шыфр Г-3). Разьзява штаб-афіцэр у штабе брыгады быў надзвычай зьдзіўлены адказам, што атрымальнік—11-ты маршавы батальён 91-га палка, і зараз-жа паслаў запытаньне, хто загадаў ім ехаць у Мункач, калі іх маршрут гаворыць Любкінскі перавал—Санок

у Галіцыі. Разьзява быў надзвычай зьдзіўлены, што тэлеграфуюць з Любкінскага перавалу і паслаў шыфроўку: «Маршрут бяз зьмен: Любкінскі перавал—Санок, дзе чакаць далейшых загадаў».

Пасьля звароту капітана Загнэра, у штабным вагоне ўзьняліся дэбаты з прычыны некаторай бязладнасьці начальства, прычым рабіліся нагадкі, што ўсходняя армія зусім страціла-б галаву, каб там ня было немцаў.

Падпаручык Дуб прабаваў бараніць разгубленасьць аўстрыйскага генэральнага штабу і пачаў вярзьці нейкую нісянетніцу пра тое, што мясцовасьць дужа спустошана баямі, якія былі там нядаўна, і шлях яшчэ не пасьпелі спарадкаваць.

Усе афіцэры глядзелі на яго спачуваючы, быццам жадаючы сказаць: гэты чалавек нявінен у тым, што ён такі дурны. Не знаходзячы падтрыманьня, падпаручык Дуб гаварыў далей пра цудоўнае ўражаньне, якое робіць на яго гэтая змучаная мясцовасьць, бо яна даводзіць, якая жалезная моц хаваецца ў нашай арміі. Яму ізноў ніхто нічога не адказаў. Тады ён яшчэ раз паўтарыў:

— Вядома, напэўна гэта так! Бо расійцы адступілі адсюль у поўнай паніцы.

Капітан Загнэр цьвёрда пастанаўляе паслаць падпаручыка Дуба пры першым выпадку, калі становішча ў акопах будзе небясьпечнае, у афіцэрскую выведку варожых пазыцый за драцяныя загарожы і шэпча паручыку Лукашу ў вакно вагону:

— Гэтых шпакоў нам чорт насыпаў! І чым такі чалавек інтэлігентней, тым ён больш асёл.

Здаецца, быццам падпаручык Дуб зусім не пакіне гаварыць, ён ізноў расказвае усім афіцэрам, што ён чытаў у газэтах пра баі ў Карпатах і пра змаганьне за Карпацкія перавалы ў пэрыяд аўстра-нямецкага наступленьня на Сане.

Ён расказвае так, як быццам ён ня толькі сам удзельнічаў у гэтых баёх, але і сам кіраваў гэткімі опэрацыямі.

Асабліва прыкра гучэлі такія сказы, як:

— Пасьля мы прасунуліся на Букоўско, каб замацаваць за сабой лінію Букоўско-Дынаў, ня губляючы сувязі з бардыжоў-

скім корпусам, каля Старое Паланкі, дзе мы разьбілі самарскую дывізію ворага.

Паручык Лукаш ня здолеў утрываць, і ён заўважыў падпаручыку Дубу:

— Пра што ты яшчэ да вайны, мусіць, гаварыў з тваім начальнікам акруговае ўправы.

Падпаручык Дуб няпрызнана зірнуў на паручыка Лукаша і вышаў з вагону.

Вайсковы цягнік стаяў на насыпе, а ўнізе ў некалькіх мэтрах ад ягонай падставы ляжалі параскіданыя розныя рэчы, кінутыя расійскімі салдатамі, якія беглі адступаючы за канаву, што цягнулася ўздоўж насыпу. Тут былі іржавыя імбрычкі, кацялкі, падсумкі і да гэтага падобнае. Апрача таго, тут-жа, поруч з бунтамі калючага дроту, відны былі палосы акрываўленых бінтоў, закарэлыя ад крыві павязкі і вата. У адным месцы, над канавай, стаяла група салдатаў і падпаручык заразжа скмеціў, што сярод іх быў і Швэйк і штосьці ім расказваў.

Таму падпаручык Дуб таксама накіраваўся туды.

— Што тут такое адбываецца?—суровым голасам запытаў ён, спыніўшыся проста перад Швэйкам.

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане падпаручык,—адказаў за ўсіх Швэйк:—мы глядзімо.

— А што вы глядзіце!—крыкнуў падпаручык.

— Так точна, пане падпаручык, глядзім уніз, у канаву.

— А хто вам гэта дазволіў?

— Гэта, дазвольце далажыць, пане падпаручык, ёсьць жаданьне нашага пана палкоўніка Шрэдэра, які застаўся ў Бруку. Калі мы ад'яжджалі на фронт, ён, разьвітваючыся з намі, сказаў у сваёй прамове, што калі нам здарыцца праяжджаць па мясцовасьці, дзе адбываліся баі, дык мы павінны добра ўсё разгледзець, як, значыцца, біліся і наогул, значыцца, усё, што можа быць нам карысным. І вось, каля гэтае канавы, мы бачым, пане падпаручык, што салдат павінен выкінуць, калі ён уцякае. Дык вось дазвольце далажыць, пане падпаручык, мы бачым тут, як недарэчна, што салдат цягне з сабой розныя не-

непатрэбныя рэчы. Ён імі зусім дарэмна натружаны. Ён ад іх толькі дарэмна томіцца і калі яму даводзіцца цягнуць на сабе такі цяжар, дык ён ня можа як трэба ваяваць.

У падпаручыка раптам мільгнула думка, што ён мог-бы нарэшце аддаць Швэйка пад ваенна-палявы суд за здрадніцкую прапаганду, а таму ён хутка запытаў:

— Значыцца, вы мяркуеце, што салдат павінен пакінуць і ладункі, як вы бачыце, вось у гэтай ямінцы, ці штыхі, як вы бачыце, вось там?

— Нікак нет, пане падпаручык,—адказаў Швэйк, ветліва ўсьміхаючыся,—а вось будзьце ласкавы глянуць на кінуты тут-жа мэталёвы начны гаршчок.

І сапраўды, каля самага насыпу, сярод чарапкоў, выклікаючы тырчаў пераедзены іржою начны гаршчок з абабітаю палівою. Мусіць гэтыя рэчы, якія адслужылі ў гаспадарцы, былі выкінуты сюды загадам начальніка станцыі, як матэрыял для вучоных спрэчак паміж архэолёгаў наступных вякоў, якія будуць ці мала зьдзіўлены знаходкаю старажытнага становішча... А пасьля ў школе дзецям будуць гаварыць пра эпоху паліваных начных гаршкоў, што існавала калісьці!».

Падпаручык Дуб ня спускаў з вока гэтай пасудзіны, але ня мог зрабіць нічога іншага, як проста ўпэўніцца, што гэта сапраўды адзін з тых інвалідаў, якія правялі сваю маладосьць пад ложкам.

Гэта зрабіла на ўсіх вялікае ўражаньне і, з прычыны таго, што падпаручык Дуб маўчаў, Швэйк ізноў загаварыў.

— Дык вось дазвольце далажыць, пане падпаручык, з гэтакім начным гаршком здарылася ў курорце Падзібрадзе пацешная гісторыя, якую расказвалі ў нас у рэсторане ў Вінаградах. У той час у Падзібрадзе пачалі выдаваць газэту «Незалежнае слова» і галоўнаю пэрсонай у гэтай справе быў падзібрадзкі аптэкар, а за рэдактара прызначылі нейкага Ладыслава-Хаека Домажліцкага. Ну, а гэты аптэкар быў вялікі дзівак; ён зьбіраў, напрыклад, старыя гаршкі і да таго падобныя дробязі, так што ў яго зложыўся цэлы музэй. Дык вось, Хаек Дамажліцкі неяк запрасіў да сябе ў Падзібрад аднаго дружака, які

таксама пісаў у газэтах і яны з гэтай прычыны здорава выпілі, бо ўжо больш за тыдзень ня бачыліся. Дружак і паабяцаў Дамажліцкаму, што ў падзяку за пачастунак, ён напіша яму фэльетон для «Незалежнага слова», для незалежнае значыцца газэты, ад якое той залежаў. І сапраўды, напісаў яму фэльетон пра дзівака-колекцыянэра, які знайшоў у пяску на беразе Эльбы мэталёвы начны гаршчок і выпрашыў, што гэта шалом сьвятога Венцаслава, ды падняў такі гармідар, што сам біскуп з процэсіяй і пратэсамі прыехаў у Кенінгграда паглядзець на знаходку... Ну, а падзібрадзкі аптэкар надумаўся, што гэта—каменчык у ягоны гарод і ад таго часу ў іх з Хаекам Дамажліцкім і сяброўства прэч!

Падпаручык Дуб ахвотней за ўсё скінуў-бы Швэйка ў канаву, але стрымаўся і толькі зароў на ўсіх!

— Я вам кажу, што вы не павінны тут дарэмна швэндацца! Вы мяне яшчэ ня ведаеце, але калі даведаецеся...

— А вы застанецеся тут, Швэйк,—дадаў ён грозна, калі Швэйк хацеў разам з іншымі вярнуцца ў вагон.

Яны засталіся адны і падпаручык пачаў думаць, каб сказаць што-небудзь страшнае.

Аднак Швэйк яго папярэдзіў.

— Дык вось дазвольце далажыць, пане падпаручык, каб толькі надвор'е ў нас пратрымалася. Зараз вось удзень ня душна і ночы таксама даволі прыемныя, так што цяпер самы час ваяваць.

Падпаручык выцягнуў рэвольвэр і запытаў:

— Ведаеш, што гэта такое?

— Так точна, пане падпаручык. Ведаю. У пана паручыка Лукаша таксама такая штучка ёсьць.

— Ну, дык вось, зарубі сабе на носе, нягоднік,—сур'ёзна і з адчуваньнем уласнай годнасьці прамовіў падпаручык Дуб, хаваючы рэвольвэр,—каб ты ведаў, што з табою можа здарыцца вялікая няпрыемнасьць, калі ты будзеш працягваць сваю пропаганду.

Падпаручык адыйшоў, паўтараючы пра сябе:

— Цяпер я яму дужа добра сказаў: «працягваць сваю пропаганду». Менавіта пропаганду...

Перш чым лезьці ў вагон, Швэйк яшчэ крыху пахадзіў перад ім узад і ўперад, мармычучы сабе пад нос:

— Куды-ж бы мне яго прылучыць?

І чым больш ён думаў, тым выразьней вызначалася ў яго розуме назва такога парадку людзей: «паўшаптун».

У вайсковым лексыконе заўсёды з вялікаю ахвотаю ўжывалі слова «шаптун» *). Асабліва гэты ганаровы эпітэт даваўся палкоўнікам, паджылым капітанам ды маёрам; ён станавіў нейкую больш высокую ступень шырока ўжытковага выразу «старая пясочніца». Ніжэйшаю ступеньню была мянушка «дзядулька», якая зьяўлялася ласкальным эпітэтам для старога палкоўніка ці маёра, які ня супраць пакрычаць ды папятушыцца, але шкадуе і любіць сваіх салдатаў і абараняе іх ад салдатаў іншых палкоў, асабліва, калі справа датычала чужых патрулёў, якія затрымлівалі ягоных салдатаў, што пратэрміноўвалі пабыўку ў карчме. «Дзядулька» клапаціўся пра сваіх салдатаў, ежа ў іх была заўсёды добрая, але ў яго абавязкова быў які-небудзь «бзік», да чаго-небудзь у яго была асаблівая прыхільнасьць і з гэтай прычыны ён быў «дзядулька».

Калі-ж «дзядулька» пры гэтым дарэмна мурыжыў людзей і унтэр-афіцэраў, прыдумляў розныя там трывогі ды заняткі ў начную пару, і да таго падобныя рэчы, дык яго ўжо называлі «старая пясочніца».

Са «старое пясочніцы» разьвінаўся як вышэйшая ступень злоснае прыдзірлівасьці, дробязнасьці і тупасьці гэтак званы «шаптун». Гэтае слова азначала ўсё, што хочаце, але розьніца наміж штацкім «шаптуном» і вайсковым—вялікая.

Першы, гэта значыць шаптун на грамадзянскай службе, таксама зьяўляецца начальнікам і служкі ды малодшыя чыноўнікі ва ўстановах даюць яму такую мянушку. Гэта—бюрократ да мозгу касьцей, філістэр, які, напрыклад, чапляецца, чаму напісаны даклад ня быў абсушаны кляксапапірам і да гэтага падобнае. Гэта—наогул абмяжованы, мала разьвіты, нудны чала-

*) У арыгінале ўжыта больш грубое слова, якое вызначае чалавека, што з прычыны слабога жывата ня можа стрымлівацца ад выпусканьня вятроў. *(Заўвага перакладчыка).*

век, які, аднак, хоча граць ролю ў грамадзтве і падкрэсьлівае сваю асаблівую сумленнасьць, уяўляе, што ўсё разумее і ўмее растлумачыць і на ўсіх і ўсё крыўдзіцца.

Але хто пабыў на вайсковай службе, той лёгка зразумее розьніцу між такім тыпам і «шаптуном» у вайсковым мундзіры. Тут гэтая мянушка вызначае «дзядульку», які ёсьць сапраўды прыдзіра ды чалавеканенавісьнік, сапраўды жмот, які нікому не папусьціцца, але ўсё-ж ткі спыняецца перад кожнаю цяжкасьцю. Салдатаў ён ня любіць і заўсёды, хоць і дарэмна, ваюе з імі, ня ўмеючы, аднак, набыць у іх вачох такі аўторытэт, якім карыстаюцца «дзядулькі» і «старыя пясочніцы».

У некаторых гарнізонах, напрыклад у Трыенце, гэтакіх людзей называлі «стары сарцір». У кожным выпадку справа ішла заўсёды пра паджылых людзей, і калі Швэйк у думках назваў падпаручыка Дуба «паўшаптун», ён зусім правільна ўлічыў, што падпаручыку Дубу не хапала процантаў з пяцьдзесят да поўнага шаптуна, як па ўзросту, так і па годнасьці, дый наогул па ўсіх пунктах.

Паглыбіўшыся ў такія развагі, ён вярнуўся да свайго вагону і стрэў каля яго дзяншчыка падпаручыка Дуба. У дзяншчыка быў апухшы твар і ён нявыразна прамармытаў, што ў яго толькі што адбылася сутычка з ягоным панам, які, даведаўшыся, што ён, Кунэрт, хаўрусуе са Швэйкам, набіў яго па мордах.

— У такім выпадку,—спакойна прамовіў Швэйк,—мы павінны рапартавацца. Аўстрыйскі салдат абавязан цярпець мардабой толькі ў вядомых выпадках. Але твой пан перайшоў усе межы, як казаў стары Аўген Савойскі: «адгэтуль—дагэтуль». Цяпер ты сам павінен далажыцца па начальству, а калі ты гэтага ня зробіш, дык і я табе яшчэ надаю па мордзе, каб ты ведаў, што ёсьць дысцыпліна ў арміі. У каролінэнтальскіх казармах быў нейкі падпаручык Хаўзнэр і ў яго быў таксама дзяншчык, якога ён біў па мордзе і штурхаў нагамі. Аднойчы ён так набіў свайго дзяншчыка, што той зусім ашалеў і рапартаваўся, а пры рапорце растлумачыў, што яго набілі за тое, што ён усё пераблытаў. А на грунце гэтых слоў яго пан узяў дый давёў, што дзяншчык хлусіць, таму што таго дня ён яго

па твары ня біў, а біў ногцам, так што ўрэшце хлопца пасадзілі яшчэ на 20 сутак у карцар за няпраўдзівы данос.

— Зрэшты,—гаварыў далей Швэйк,—гэта справы не мяняе. Гэта-ж якраз тое самае, пра што заўсёды гаварыў наш мэдык Гаўбічка, што, бач, у паталёгічным інстытуце ўсёроўна пачынаюць рэзаць чалавека, ці павесіўся ён, ці атруціўся. Так што я пайду разам з табой. Пара-другая лішніх аплявух на вайсковай службе—рэч сур'ёзная!

Кунэрт зусім ачмурэў і даў Швэйку павесьці сябе ў штабны вагон.

— Што вам тут трэба, сволачы?—зароў на іх падпаручык Дуб, высоўваючыся з вакна.

— Трымай сябе з гонарам,—шапянуў Швэйк Кунэрту і ўпхнуў яго ў вагон.

У праходзе зьявіўся паручык Лукаш, а за ім і капітан Загнэр.

Паручык Лукаш, якому ўжо так часта даводзілася мець справу са Швэйкам, быў дужа зьдзіўлен, таму што на гэты раз Швэйк ня трымаўся так просьценька, як звычайна, а твар яго страціў свой такі знаёмы, ласкавы выраз і прарочыў якіясьці новыя няпрыемнасьці.

— Дазвольце далажыць, пане паручык,—сказаў Швэйк,—мы хочам рапартавацца.

— Ня стройце дурня, Швэйк. Мне гэта нарэшце напрыкрала.

— Нікак нет,—запярэчыў Швэйк,—дазвольце далажыць, пане паручык. Я-ж ордынарац вашае роты, а вы ротны камандзір 11-й роты. Я ведаю, што гэта выглядае дужа сьмешна, але ведаю, што пан падпаручык Дуб—ваш падначалены.

— Вы зусім з глузду зьехалі, Швэйк,—перапыніў яго паручык Лукаш.—Ці вы п'яны, і тады вам лепш за ўсё вымятацца вон адгэтуль, разумееш, боўдзіла, жывёліна.

— Нікак нет, пане падпаручык,—адказаў Швэйк, штурхаючы Кунэрта наперад.—Гэта зусім падобна да таго, як аднойчы выпрабоўвалі ў Празе абаронныя краты, якія павінны былі перасьцерагаць, каб ня трапіць пад трамвай. Пан вына-

ходца сам ахвяраваў сабою для гэтага выправабаваньня, а пасьля гораду давялося плаціць ягонай удаве ўсё жыцьцё пэнсію.

Капітан Загнэр, ня ведаючы, што сказаць, ківаў галавой. у той час як паручыка Лукаша, здавалася апанаваў адчай.

— Так што дазвольце далажыць, пане паручык,—няўмольна працягваў Швэйк,—што ўсё павінна пайсьці па рапорту. Яшчэ ў Бруку, пане паручык, вы казалі мне, што калі я буду за ротнага ордынарца, у мяне будуць і іншыя абавязкі, а ня толькі перадаваць загады, і што я павінен быць у курсе ўсяго, што адбываецца ў нас у роце. На падставе гэтага загаду я дазволю сабе далажыць вам, пане паручык, што пан падпаручык Дуб нізавошта адхвастаў свайго дзяншчыка па мардасах. Я сам ад сябе, дазвольце далажыць, пане паручык, гэтага-б не далажыў. Але калі я бачу, што пан падпаручык Дуб знаходзіцца пад вашым начальствам, дык я і надумаўся рапартавацца.

— Гэта нейкая дзіўная справа,—сказаў капітан Загнэр.— А чаму вы прыцягнулі сюды гэтага Кунэрта?

— Дык вось дазвольце далажыць, пане батальённы, што ўсё павінна ісьці па рапорту. Ён-жа дурны. Пан падпаручык адхвастаў яго па мордзе, а ён ня ўмее адзін пайсьці далажыцца да начальства. Дазвольце далажыць, пане капітан, каб вы былі ласкавы зірнуць на яго, як у яго калені дрыжаць і чалавек ледзь не памірае ад страху, што яму трэба далажыцца па начальству. А каб ня было тут мяне, ён, мусіць, і зусім не пайшоў-бы дакладвацца, як той Кудзеля з Бытоухава, які на прызыўнай службе да таго часу дакладваўся па начальству, пакуль яго не перавялі ва флёт, дзе ён выбіўся на мічмана і зрабіўся славуты як дэзэртыр на аднэй з выспаў Ціхага акіяну. Пасьля ён там і ажаніўся, і калі гутарыў з падарожнікам наўкол сьвету Гаўлагам, дык той ня мог адрозьніць, што гэта ня тубылец. Наогул, вядома, дужа сумна, што даводзіцца праз нейкія няшчасныя аплявухі дакладвацца па начальству. Але ў тым-жа і справа, што ён не хацеў ісьці, бо сказаў, што ня пойдзе Ён наогул такі затуканы чалавек, што нават ня ведае, пра якія пабоі ідзе мова. Так што ён ня прышоў-бы сюды, зусім-бы не пайшоў рапартавацца, а дазволіў-бы сябе біць яшчэ

болей, так што дазвольце далажыць, пане капітан, гляньце на яго—ён-жа зусім ужо адураненўшы. А, з другога боку, яму трэба зараз-жа паскардзіцца, што яго набілі, але ён не наважыўся, таму што ведаў, што лепей, як гаварыў паэт, «цывісьці сьціплаю фіялкаю». Справа ў тым, што ён служыць за дзяншчыка ў пана падпаручыка Дуба.

Падштурхваючы перад сабой Кунэрта, Швэйк сказаў:

— Ды ня дрыжы ты, як асінавы ліст.

Капітан Загнэр запытаў Кунэрта, як была справа.

Але Кунэрт, дрыжучы ўсім целам, адказаў, што няхай пан капітан запытае хоць у пана падпаручыка, што той яго зусім і ня біў.

Дрыжучы, Юда-Кунэрт нават заявіў, што Швэйк проста прыдумаў усю гэтую гісторыю.

Скончыў гэты цяжкі інцыдэнт сам падпаручык Дуб, які раптам адкульсьці зьявіўся і кінуўся да Кунэрта:

— Хочаш атрымаць яшчэ пару аплявух?

Такім чынам справа была зразумелая і капітан Загнэр проста заявіў падпаручыку Дубу:

— Ад сягонешняга дня Кунэрт пераводзіцца ў кашавары, а па прызначэньні вам новага дзяншчыка будзьце ласкавы зьвярнуцца да каптэнармуса Ванэка.

Падпаручык Дуб узяў пад казырок і адыходзячы засыкаў:

— Іду аб заклад, што вы Швэйк яшчэ будзеце калі-небудзь матляцца на шыбеніцы.

Калі падпаручык вышаў, Швэйк ласкава, сяброўскім тонам—зьвярнуўся да паручыка Лукаша:

— У Мюнхэнгрэцы быў таксама адзін такі пан і таксама ґаварыў так з другім панам, а той яму адказаў: «На эшафоце мы з вамі яшчэ пагутарым».

— Ну, Швэйк,—сказаў паручык Лукаш,—і ідыёт-жа вы! Але толькі не наважцеся адказваць, як вы гэта звычайна робіце: «Так точна, пане паручык, я—ідыёт».

— Дзіўна!—заўважыў капітан Загнэр, глянуўшы ў акно.

Ён ахвотна адышоў-бы адсюль, але не пасьпеў, таму што пад вакном вынырнуў аднекуль падпаручык Дуб.

Падпаручык Дуб сказаў, што вельмі шкадуе, што капітан Загнэр пайшоў, ня выслухаўшы яго доказаў на карысьць наступленьня на Ўсходнім фронце.

— Калі мы хочам зразумець вялізарны плян гэтага наступленьня,—голасна сказаў у вакно падпаручык Дуб,—мы павінны ўявіць сабе, як разьвівалася наступленьне ў канцы красавіка. Нам неабходна было прарваць расійскі фронт і мы вырашылі, што найбольш спрыяльным месцам для гэткага прарыву зьяўляецца фронт паміж Карпатамі і Віслай.

— Ды я і ня думаю спрачацца з табой,—суха сказаў капітан Загнэр і адышоў ад вакна.

Калі праз паўгадзіны пасьля гэтага эшалён працягваў свой шлях у Санок, капітан Загнэр выцягнуўся на лаўцы ды прыкінуўся, што сьпіць, каб падпаручык Дуб забыўся тымчасам на свае нудныя тлумачэньні «вялізманнага наступленьня».

У вагоне, дзе ехаў Швэйк, не далічваліся Балуна. Справа ў тым, што Балун атрымаў дазвол выскрабці кацёл, у якім гатавалі гуляш. І вось ён трапіў у вагон, дзе былі папружаны палявыя кухні, у дужа няпрыемнае становішча, таму што ў той момант калі цягнік крануўся, Балун галавой наперад паляцеў у вялізны кацёл, і толькі ногі яго тырчалі ўгары. Аднак, ён хутка прывык да гэтага нязвычайнага становішча; з катла пачулася чмаканьне, як быццам вожык лавіў тараканаў, а пасьля пачуўся з глыбіні голас Балуна:

— Браткі, на ласку, кіньце сюды мне акрайчык хлеба, тут яшчэ так многа поліўкі.

Гэтая ідылія працягвалася аж да наступнага прыпынку, куды 11-ая рота прыбыла з так добра вычышчаным катлом, што палуда блішчэла, як жар.

— Дай вам божа здароўя, браткі,—ад душы дзякаваў Балун.—Ад таго часу, як я на вайсковай службе, першы раз мне ўсьміхнулася такое шчасьце.

І гэта было сапраўды так. На Любкінскім перавале Балун атрымаў цэлых дзьве дзялянкі гуляшу; паручык Лукаш быў так здаволены, што Балун прынёс яму з афіцэрскага катла незачэпленую дзялянку, што аддаў яму за гэта добрую палавіну свайго абеду. Балун быў зусім шчасьлівы, матляў нагамі, зьве-

сіўшы іх з вагону; і раптам гэтая вайна здалася яму чымсьці родным, чымсьці блізкім.

Ротны кашавар пачаў быў яго цывіліць, упэўняючы, што яшчэ да прыезду ў Санок людзям будзе раздадзена вячэра і другі абед, бо гэтая вячэра і абед ім належаць за тыя дні калі яны іх не атрымалі. Але Балун толькі згаджаючыся ківаў галавою і шаптаў:

— Вось пабачыце, браткі, бог нас не пакіне.

З гэтага ўсе ад душы пасьмяяліся, а кашавар, седзячы на сваёй палявой кухні, пачаў:

Гоп, гэй ды! Гоп, гэй ды!
З намі сам пан-бог заўжды!
Ён нас часта ў бруд кідае,
Але й з бруду падымае;
Чэрствы хлеб шле на палудзень,
Спачувае усім людзям.
Гоп, гэй ды! Гоп, гэй ды!
З намі сам пан-бог заўжды!

Пасьля станцыі Шчаўна зьявіліся ў далінах новыя салдацкія могілкі і брацкія магілы. З цягніка відзён быў каменны крыж з хрыстом без галавы. Ён страціў галаву пры абстрэле чыгункі.

Цягнік наддаў ходу, сьпяшаючы ў даліну Санок. Далягляд зрабіўся шырэйшы і паабапал палатна разьлёгся малюнак на цэлы шэраг разбураных артылерыйскім агнём вёсак.

Каля Кулашны ляжаў у рэчцы зусім разьбіты цягнік Чырвонага крыжу, які скінуўся з насыпу.

Балун дзіка вырачыў вочы, дзівячыся галоўным чынам раскіданым па даліне часткам паравіка. Труба паравіка ўелася ў насып і выглядала з яе быццам 28-сантымэтровая гармата.

Гэты малюнак зацікавіў і іншых швэйкавых спадарожнікаў. Больш за ўсіх хваляваўся Юрайда.

— Ды хіба-ж дазваляецца расстрэльваць цягнікі Чырвонага крыжу?—не разумеючы пытаўся ён.

— Дазваляецца яно не дазваляецца, а рабіць гэта можна,— па-філёзофску заўважыў Швэйк.—Ва ўсякім выпадку гэта ёсьць добрае пападаньне і кожны бок пасьля апраўдваецца тым, што

справа была ўначы і што знакаў Чырвонага крыжу ня было відаць. Наогул на сьвеце дужа шмат такога, што не дазваляецца, але што можна рабіць. Галоўны сэнс у тым, каб паспрабаваць—а ну пройдзе нумар, а калі не дазваляецца, дык ці ня можна так... Пад час вялікіх манэўраў каля Пісэку вышаў такі загад, што на паходзе не дазваляецца забіваць салдатаў у калодкі. Але наш капітан скмеціў, што такі загад проста сьмешны, бо кожнаму зразумела, што забіты ў калодкі салдат ня можа ісьці паходным парадкам. Дык вось ён загаду, уласна кажучы, не парушыў, а проста загадаў саджаць забітых у калодкі салдатаў на абозныя фурманкі ды так з імі прасоўваўся наперад...

Альбо вось такі выпадак, які быў на нашай вуліцы гадоў з пяць перад гэтым. Жыў там на першым паверсе нейкі пан Карлік, а над ім дужа прыстойны чалавек, вучань консэрваторыі, прозьвішчам Мікеш. Гэты Мікеш быў вялікі бабнік і тымчасам пачаў шуры-муры з дачкою гэтага пана Карліка, у якога было і экспэдыцыйнае бюро і цукерня, а ў Маравіі—пераплётная майстэрня, але толькі на зусім чужое імя. Дык вось, калі пан Карлік даведаўся, што нейкі вучань цягаецца за ягонаю дачкою, ён пайшоў да яго і сказаў: «Я вам не дазваляю жаніцца з маёю дачкою, галадранец вы няшчасны... Я вам яе не аддам!»—«Добра,—адказаў яму пан Мікеш.—Што-ж я магу зрабіць, калі вы не дазваляеце мне з ёю жаніцца? Што мне—разарвацца, ці што?» А праз два месяцы пан Карлік зноў прышоў да яго, дык разам са сваёю жонкаю і абое ў адзін голас гавораць: «Нягоднік, вы абсарамацілі нашую дачку».—«Гэта праўда,—адказвае ён,—я зрабіў яе дамаю, шаноўная пані». Ну, пан Карлік пачаў выслаўляцца рознымі няпрыстойнымі словамі ды крычаць, што ён-жа, Карлік, казаў яму, што не дазваляе яму жаніцца з ягонай дачкою, што не аддасьць яе, але той зусім дарэчы адказаў, што ён аніяк і ня зьбіраецца жаніцца з ёю, а пра тое, што ён можа з ёю зрабіць, на той раз і гаворкі ня было. І яшчэ сказаў, што справа ішла зусім не пра гэта, і няхай шаноўныя бацька ня турбуюцца, і што ён яе аніяк ня хоча, і што ў яго такі характар, каторы ня хістаецца, як травінка на ветры, і што ён стрымае свае словы, і што калі ўжо ён што-

небудзь оказаў, дык гэта як сьвятое. І што, калі-б яго нават пачалі за гэта ўціскаць, яму будзе ўсёроўна, бо сумленьне ягонае чыстае, а яго нябожчыца маці перад сьмерцю заклікала яго ніколі ў жыцьці ня хлусіць, і што ён пакляўся ёй у гэтым, і што гэткая клятьба на век непарушна. І што ў ягонай сям'і наогул ніхто ніколі ня хлусіў, і што ў школе ў яго заўсёды была вышэйшая адзнака за ўзорныя паводзіны... Дык вось бачыце, што шмат чаго ёсьць недазволенага, але ўсё-такі гэта рабіць можна, і што шляхі могуць быць розныя, а волю трэба мець адну.

— Дарагія дружакі!—сказаў вольнапісаны, які старанна запісваў штосьці ў свой блёкнот,—у кожным благім ёсьць і свой добры бок. Гэты зьнішчаны выбухам, напалавіну спалены санітарны цягнік узбагачае гісторыю нашага батальёну на новы наступны гэройскі ўчынак. Я ўяўляю сабе гэтакі малюнак: 16 верасьня, як я ўжо запісаў у сябе, па некалькі чалавек ад кожнае нашай роты, з эфрэйтарам на чале, добраахвотна падручаюцца ўзарваць варожы броняцягнік, які нас абстрэльвае і перашкаджае нам перайсьці раку. Пераапранутыя ў сялянскае адзеньне, яны з гонарам выканалі сваю задачу...

— Але што я бачу?—зусім інакшым тонам выгукнуў раптам вольнапісаны, капаючыся ў сваіх нататках.—Як трапіў сюды наш пан Ванэк? Слухайце, пане каптэнармус, які цудоўны артыкул будзе зьмешчаны пра вас у летапісе нашага батальёну! Я ўпэўнен, што вы і так трапіце калі-небудзь на старонкі гісторыі, але тут гэта будзе болей і лепей...

І вольнапісаны ўголас прачытаў:

Гэройская сьмерць каптэнармуса Ванэка.

На адважную справу зьнішчыць выбухам варожы броняцягнік падручыўся ахвотнікам і каптэнармус Ванэк, пераапрануты, як і астатнія, селянінам. Ён быў аглушаны выбухам і, апрытомнеўшы, убачыў сябе абкружанага варожымі салдатамі, якія зараз-жа павялі яго ў штаб свае дывізіі, дзе ён, пазіраючы ў твар сьмерці, катэгорычна адмовіўся даць якія-колечы весткі пра разьмеркаваньне і колькасьць нашага войска. З прычыны таго, што ён быў

пераапрануты, яго асудзілі на шыбеніцу, як шпэга, а гэтая кара, з прычыны высокай яго годнасьці, была заменена яму расстрэлам. Прысуд зараз-жа выканалі, каля сьцяны магільніку, прычым слаўны каптэнармус Ванэк намогся, каб яму не завязвалі вачэй. На пытаньне, ці мае ён яшчэ якое-небудзь жаданьне, ён адказаў: «Перадайце праз парлямантэра майму батальёну маё апошняе прывітаньне і перадайце яму, што я паміраю з цьвёрдаю вераю, што наш батальён будзе працягваць свой неперамажны шлях. Пасьля скажыце капітану Загнэру, што мясная пайка згодна апошняга загаду па батальёне павялічваецца да дзьвюх з палавінаю бляшанак на чалавека». Так памёр наш каптэнармус Ванэк. Сваім апошнім сказам ён зьбянтэжыў ворага, бо той меркаваў, што, не дапускаючы нашае пераправы цераз рэчку, ён адрэзаў-бы нас ад нашае харчовае базы і выклікаў-бы такім парадкам голад і дэмаралізацыю ў нашых шэрагах. Пра спакойнае дачыненьне Ванэка да сьмерці сьведчыць тая акалічнасьць, што ён аж да самага моманту кары гуляў з варожымі штабафіцэрамі ў прэфэранс. «Грошы, што выгуляў, я прашу перадаць расійскаму Чырвонаму крыжу»,—сказаў ён, стоячы ўжо пад накіраванымі на яго рулямі вінтовак. Гэтая шляхотнасьць вялікае душы кранула прысутных да сьлёз.

— Даруйце, пане Ванэк,—гаварыў далей вольнапісаны,— што я дазволіў сабе на свой погляд даць прызначэньне вашаму выйгрышу. Сьпяша я меркаваў перадаць яго аўстрыйскаму Чырвонаму крыжу, але ўрэшце мне здаецца, што з пункту погляду заміласаваньня да людзей гэта аднолькава, абы перадаць грошы якой-небудзь дабрачыннай установе.

— Наш нябожчык пан каптэнармус,—заўважыў Швэйк,— мог-бы ахвяраваць іх на карысьць дармовае страўні ў горадзе Празе, але так яно, мусібыць, лепей, таму што інакш пан бургамістр купіў-бы сабе за ўсе гэтыя грошы кавалак вантрабянкі на закуску.

— Ну, а што-ж—усюдых крадуць,—абазваўся тэлефаніст Хадынскі.

— А асабліва ў Чырвоным крыжы,—з запалам выгукнуў Юрайда.

— У Бруку ў мяне быў знаёмы кухар, які гатаваў для міласэрдных сясьцёр з бараку, дык той мне расказаў, як загадчыца ды экономка адсылалі дадому шокаляд ды віно цэлымі скрынкамі. На гэта заўжды трапляецца зручны выпадак... Лёс, так сказаць... Накаванага ня мінеш. Кожны чалавек праходзіць у сваім бясканцовым жыцьці цэлы шэраг ператварэньняў і вось, у вядомы пэрыод свае чыннасьці ў гэтым сьвеце, ён павінен пабыць і злодзеем. Сам я гэты пэрыод прарабіў ужо.

Окультыст Юрайда дастаў са свайго меха бутэльку каньяку.

— Вось глядзеце!—сказаў ён, адкаркоўваючы бутэльку.— Вось вам найлепшае сьцьвярджэньне маіх слоў. Я сьцягнуў гэтую бутэльку перад ад'ездам з афіцэрскага сабраньня. Гэты коньяк найлепшага гатунку. Яго трэ' было-б ужываць толькі для цукровага глясэ на лінцкіх тортах, але было наканована, каб тэтую бутэльку украў я, таксама як мне наканована было зрабіцца злодзеем.

— А было-б няблага,—укруціў сваё слоўца Швэйк,—каб нам наканована было зрабіцца вашымі хаўрусьнікамі. У кожным выпадку мне здаецца, што гэта так.

І сапраўды наканаваньне лёсу зьдзейсьнілася. Бутэлька пашла наўкола, не зважаючы на протэсты каптэнармуса Ванэка, які заявіў, што коньяк трэба піць з бачка і разьмеркаваць пароўну, бо іх на бутэльку пяць чалавек, а таму, з прычыны няцотнага ліку, лёгка можа здарыцца, што хто-небудзь каўтане на раз болей за іншых. На гэта Швэйк заўважыў:

— Гэта правільна, і калі пан Ванэк хоча мець цотны лік, дык няхай ён выдзе з компаніі, каб ня было няпрыемнасьцей ды спрэчак.

Ванэк засьпяшаўся ўзяць сваю прапанову назад і высунуў новую больш самаахвярную прапанову, каб Юрайда як гаспадар, заняў у іх шэрагу такое месца, якое-б дазволіла яму двойчы прыкласьціся да бутэлькі, але і гэтая прапанова выклікала

шумлівы протэст, таму што Юрайда пасьпеў ужо забясьпечыцца, калі каштаваў коньяк адкаркоўваючы. Нарэшце была ўхвалена прапанова вольнапісанага піць у альфабэтным парадку, таму што згодна яго слоў пэўнае наканаваньне ёсьць і ў тым, як каго зваць.

Ванэк, першы ад пачатку альфабэту, першы і прыладжыўся да бутэлькі, грозна паглядаючы на іншых і вылічваючы, што яму, мусіць, усё-ж такі давядзецца глынуць звыш нормы. Але гэта была буйная матэматычная памылка, таму што ў бутэльцы было роўна на дваццаць разоў глынуць.

— Пане! Пакінь яе і на лета, пакуль я акапаю яе і абкладу пісаны кожны раз, калі картавалі, прыгадваў які-небудзь трапны радок са сьвятога пісаньня. Так, дакупіўшы даму, ён выгукнуў:

Пасьля гэтага яны селі гуляць у «жалезку», прычым вольнагноем, ці ня дасьць яна плоду.

Калі яму зрабілі заўвагу, што ён меў нахабнасьць пабіць нават васьмёрку, ён падвысіў голас і выславіўся:

— Ці-ж якая жанчына і маючы дзесяць драхм, калі рубіць адну драхму, не запаліць сьвечкі і не пачне падмятаць пакою ды шукаць пільна, пакуль ня знойдзе? А знайшоўшы, скліча сябровак і суседак і скажа: «Парадуйцеся са мною, бо я дакупіла да васьмёркі караля і туза». Дык вось давайце сюды карты, усе вы ставіце рэміз.

Вольнапісанаму Марэку сапраўды фэноменальна шанцавала ў картах. У той час як яго партнёры перакрывалі адзін аднаго, ён кожны раз крыў іх больш высокаю картаю, так што адзін за адным прагульваўся, а ён браў бітку за біткаю, прымаўляючы:

— І будзе плач і скрогат зубоў і вялікі смутак, і ўбачыце агіднасьць спусташэньня і голад і хваробы і здрыганецеся.

Нарэшце ім гэта напрыкрала і яны кінулі гуляць, пасьля таго, як тэлефоніст Хадынскі прагуляў сваю пэнсію на паўгода наперад. Ён быў дужа засмучаны гэтым, тым больш, што вольнапісаны запатрабаваў ад яго пазычковую расьпіску такога зьместу, што каптэнармус Ванэк павінен плаціць пэнсію Хадынскага яму, Марэку.

— Ну, ну ня бойся, Хадынскі,—пачаў суцяшаць яго Швэйк:—калі табе пашанцуе, цябе заб'юць пад час першага-ж бою і тады Марэк ня ўбачыць твае пэнсіі, як сваіх вушэй. Ганяй, пішы яму расыпіску.

Згадка пра тое, што яго могуць забіць, падзейнічала на Хадынскага дужа няпрыемна, а таму ён рашуча заявіў:

— Не, мяне ня могуць забіць, таму што я тэлефоніст, а тэлефоністы заўжды знаходзяцца ў бліндажы. Пракладка правадоў і папсаваных месцаў заўсёды робіцца пасьля бою.

На гэта вольнапісаны запярэчыў, што, наадварот, тэлефоністы падлягаюць найбольшай небясьпецы, таму што варагава артылерыя б'е галоўным чынам па тэлефоністах. Ніякі бліндаж ня можа ахаваць ад небясьпекі. Калі ён нават быў зроблены на дзесяць мэтраў пад зямлёю, дык і тады варагава артылерыя трапіла-б туды. Тэлефоністы растаюць, як градзіны ў летні дзень. Найлепшы сьведка за гэта—тое, што ў Бруку, як-раз тады, калі ён выяджаў, адчынілі дваццаць восьмыя курсы на падрыхтоўку тэлефаністаў.

Хадынскі зусім асмутнеў, што выклікала з швэйкавага боку ласкавую, сяброўскую заўвагу:

— Адным словам, усё гэта страшэннае сьвінства!

На што Хадынскі таксама ласкава адказаў:

— Заткніся, цётка!

— А вось я пагляджу ў маіх матэрыялах па гісторыі нашага батальёну, што ў мяне ёсьць на літару «Х»... Хадынскі... Хадынскі... Ага, вось, вось, ёсьць: «Тэлефоніст Хадынскі засыпаны зямлёю пры выбуху міны. Тэлефонуе са сваей магілы ў штаб: «Паміраючы, вітаю батальён з перамогаю».

— Гэтага-ж з цябе досыць?—запытаў Швэйк.—Ці ты хочаш яшчэ што дадаць? Помніш тэлефоніста з Тытаніка, які, калі параход пайшоў ужо на дно, не пакідаў тэлефанаваць у затоплены камбуз, калі-ж нарэшце, прынясуць абед?

— Ну мне ўсёадно,—ласкава абазваўся вольнапісаны.— Апошнія словы Хадынскага могуць, зрэшты, быць дапоўнены такім чынам, што ён пад канец крычыць у тэлефон: «Перадайце... Маё прывітаньне... нашай... Жалезнай брыгадзе!»...

НАПЕРАД, МАРШ!

Пасьля прыезду ў Санок, высьветлілася, што, уласна кажучы, у вагоне з палявымі кухнямі 11-е роты, дзе Балун, што наеўся ўдосьць, пакрэктаваў ад здавальненьня, наогул не памыліліся. Сапраўды, замест усяго недаатрыманага за гэтыя дні батальён павінен быў атрымаць яшчэ адну вячэру звыш і, апрача вячэры, яшчэ адну пайку хлеба. Калі людзей выгрузілі з вагонаў, зрабілася вядома, што ў Санку знаходзіцца штаб «Жалезнае брыгады», да якое належаў згодна паперах і маршавы батальён 91-га палка. Хоць чыгуначныя зносіны ня былі парушаны, усё-ж заставалася загадкаю, чаму штаб усходняга фронту прыняў дыспозыцыю, каб «Жалезная брыгада» са сваім штабам згрупавала свае маршавыя батальёны на сто пяцьдзесят кілёмэтраў ззаду фронту, калі фронт адначасна з гэтым цягнуўся ад Бродаў на Бугу і ўздоўж ракі ў паўночным кірунку да Сокалю.

Гэтае ў вышэйшай ступені цікавае стратэгічнае пытаньне разьвязалася надзвычай проста, калі капітан Загнэр накіраваўся ў Санку па загады датычна разьмеркаваньня маршавага батальёну.

За ордынарца быў ад'ютант брыгады капітан Тайрле.

— Я дужа зьдзіўлены, што вы не атрымалі пэўных інструкцый, — сказаў капітан Тайрле.—Ваш маршрут вы, вядома, павінны былі-б паведаміць нам заўчасна. Згодна дыспозыцыі найвышэйшага камандаваньня вы прыбылі сюды на двое сутак раней як належала.

Капітан Загнэр крыху пачырванеў, але яму і ў думкі не прышло паўтарыць усе шыфраваныя тэлеграмы, якія ён атрымліваў пад час руху батальёну.

— Дык вось я дужа дзіўлюся, як гэта вы...—зноў пачаў ад'ютант.

— Мне здаецца, што мы, афіцэры, усе адзін з адным на ты,—перапыніў яго капітан Загнэр.

— На ты, дык на ты,—згадзіўся капітан Тайрле.—Але, скажы ты кадравы ці са штацкіх? Кадравы? Ну, тады гэта зусім іншая справа. Ліха яго ведае, адразу і не разьбярэш!.. Тут у мяне праходзілі ўжо такія боўдзілы з запасу, што мае шанаваньне! Калі мы адступалі ад Ліманава і Красьніка, гэтыя «таксама—афіцэры» зусім гублялі галаву, убачыўшы які-небудзь нішчасны казачы разьезд. Адным словам, мы штабныя гэных штафірак ня любім. І што горш за ўсё, вось такі зносак з інтэлігенцкім значком урэшце пераходзіць у кадр ці здае экзамэн на афіцэрскую годнасьць, застаючыся і надалей падвойным шпаком, а ў выпадку вайны робіцца як-бы і сапраўдным падпаручыкам хоць і засранцам.

Капітан Тайрле сплюнуў ды фамільярна палопаў Загнэра па плячы.

— Ну, што-ж, пасядзеце двое сутак тут. Я вас усіх выведу ў сьвет, патанцуем. Дзяўчаткі ў нас—проста пекната, душкі. Пасьля ёсьць у нас яшчэ адна генэральская дачка, якая раней займалася лесбійскім каханьнем. На пацеху мы пераапранаемся ў жаноцкія сукенкі, і тады ты ўбачыш, што гэта за нумар! Такая кошка дзёртая—проста сілы няма! Ал-ле справу сваю ведае дасканала, братка ты мой! Ух, як-кая сьцерва... Ну, ды зрэшты ты сам яе ўбачыш...—Прабачай,—усхапіўся ён раптам,—мне ізноў мутарна, трэці раз сёньня...

Вярнуўшыся, ён, каб давесьці, як тут весела жывецца, растлумачыў капітану Загнэру, што яго мутарыць пасьля ўчарайшае выпіўкі, у якой бралі ўдзел і афіцэры піонэрнае роты.

З камандзірам гэтае роты, які таксама меў годнасьць капітана, капітану Загнэру вельмі хутка давялося пазнаёміцца. У канцылярыю ўляцеў цыбаты чалавек у вайсковай форме і

не заўважаючы прысутнасьці староньняга чалавека, запытаў Тайрле:

— Ну, як маешся, сьвінчо ты няшчаснае! Няма чаго сказаць, спрытна ты ўчора апрацаваў нашую графіню!

Ён сеў на крэсла, сьмяючыся і лопаючы сябе тонкім стэкам па галёнках, і гаварыў далей:

— Калі толькі ўспомніць, як ты яе...

— Так,—згадзіўся Тайрле,—учора было дужа весела.

Пасьля ён пазнаёміў капітана Загнэра з сваім таварышам і ўсе ўтрох накіраваліся з канцылярыі ў кафэ, адчыненае ў памяшканьні былое піўніцы.

Праходзячы цераз канцылярыю, капітан Тайрле ўзяў у камандзіра піонэрнае роты стэк і ўдарыў ім па стале. Пасьля гэтага знаку ўсе, што знаходзіліся ў пакоі, пісары, выстраіліся наўкол стала. Усё гэта былі прыхільнікі спакойнае, нятрывожнае работы ў тылу арміі, у навюткай форме, здаволеныя сабою, з круглымі чараўцамі.

І вось гэтым дванаццаці сытым апосталам шкурніцтва капітан Тайрле, жадаючы падрызыкаваць перад капітанам Загнэрам і другім капітанам, сказаў:

— Ня думайце, што я трымаю вас тут для плэзіру, сучыя вы дзеці! Менш жэрці ды піць, а больш рабіць справы! Я пакажу вам яшчэ і ня гэткую дрэсыроўку,—паабяцаў капітан Тайрле сваім таварышом.

Ён зноў ударыў стэкам па стале і запытаў свой тузін:

— Калі-ж вы нарэшце налопаецеся, парасяты?

— Так, точка, калі загадаеце, пане капітан!—як адзін чалавек, гаркнулі тыя.

Дужа здаволены са свае дасьціпнасьці, капітан Тайрле вышаў з канцылярыі.

Калі ўсе ўтрох селі за столік у кафэ, капітан Тайрле заказаў бутэльку ядлаўцовае гарэлкі ды загадаў паклікаць незанятых паненак. Высьветлілася, што гэтае кафэ было нічым іншае, як публічны дом; а з тэй прычыны, што ўсе паненкі былі занятыя, капітан Тайрле страшэнна расхваляваўся, груба аблаяў «мадам», ды пачаў дапытвацца, хто зараз знаходзіцца

ў фрэйлен Эльлі і дайшоў да яшчэ большага ўзбуджаньня, калі даведаўся, што ў яе нейкі падпаручык.

У фрэйлен Эльлі быў падпаручык Дуб, які пасьля таго, як маршавы батальён быў размешчаны ў будынку гімназіі, склікаў сваю роту і зьвярнуўся да яе з дужа вялікаю прамоваю, у якой упэўняў, што расійцы пры сваім адступленьні ўсюды пакінулі публічныя дамы з жанчынамі-вэнэрычкамі, каб такім шляхам зрабіць аўстрыйскай арміі як мага большую страту. З гэтай прычыны ён, падпаручык Дуб, лічыць, за свой абавязак папярэдзіць салдатаў устрымлівацца ад наведваньня гэткіх дамоў. Ён асабіста будзе правяраць, ці выконваюцца яго загады, таму што батальён знаходзіцца ўжо ў пошасьлівай паласе, і ўсе, каго ён засьпее ў такім доме, будуць аддавацца пад ваенна-палявы суд.

Дык вось, падпаручык Дуб хацеў асабіста ўпэўніцца, ці выконваюцца ягоныя загады; з гэтай прычыны ён абраў за адыходны, як відаць, пункт сваіх назіраньняў атаманку ў пакоі Эльлі на першым паверсе гэтак званага «Гарадзкога кафэ», атаманку, на якой ён цудоўна праводзіў час.

Тымчасам капітан Загнэр накіраваўся назад да свайго батальёну. Такім чынам, кампанія Тайрле парушылася. Самога яго выпатрабавалі ў штаб брыгады, дзе камандзір брыгады ўжо больш за гадзіну марна чакаў свайго ад'ютанта.

Са штабу дывізіі былі атрыманы новыя загады. Неабходна было выпрацаваць канчатковы маршрут батальёну 91-га палка, што катадзе зьявіўся, бо ў першапачатковым кірунку павінен быў згодна найноўшае дыспозыцыі рушыцца маршавы батальён 102-га палка.

Усё гэта было страшэнна заблытана. Расійцы адступалі ў паўночна-ўсходнім рагу Галіцыі так хутка, што аўстрыйскія вайсковыя часьці там зусім перамяшаліся паміж сабою. Дзе-ні-дзе ў іх клінам урэзаліся нямецкія войскі. Атрымаўся страшэнны хаос, які ўсё павялічваўся маршавымі батальёнамі ды іншымі баявымі адзінкамі. Тое-ж самае адбывалася і ў іншых сэктарох фронту, што знаходзіліся больш у тылу, як, напрыклад, тут у Санку, куды прыбылі рэзэрвовыя часьці нямецкае ганоўэрскае дывізыі пад начальствам нейкага палкоўніка.

У гэтага палкоўніка быў такі няпрыемны погляд, што камандзір аўстрыйскае брыгады зусім страціў галаву. Справа ў тым, што начальнік рэзэрваў гановэрскае дывізыі паказаў дыспозыцыю свайго штабу, згодна якое яго людзі павінны былі быць расквартэраваны ў тэй самай гімназіі, дзе толькі, што атаўбаваўся маршавы батальён 91-га палка.

А для свайго штабу ён патрабаваў ачысьціць памяшканьне Кракаўскага банку, дзе якраз знаходзіўся штаб брыгады.

Камандзір брыгады загадаў злучыць сябе па простым провадзе са штабам дывізыі, якому дакладна і паведаміў пра сваё становішча. Пасьля адбылася гутарка з гановэрцам са злоснымі вачыма, і ў выніку ў брыгадзе быў атрыманы загад: «Брыгада пакідае горад а 6 гадзіне ўвечары і разьмяркоўваецца па лініі Турава—Вольск—Ліскавіцы—Старасол — Самбор. Адначасна выступае і маршавы батальён 91-га пяхотнага палка, які ўтварае ахову. Авангард выходзіць а палове шостае на Турава; паміж фляговымі заслонамі на поўнач і на поўдзень $3^1/_2$ кілёмэтры. Ар'ергард выходзіць у чвэртку на сёмую.

Такім чынам у гімназіі ўзьняўся страшэнны гармідар, і на экстраны сход паноў афіцэраў батальёну не зьявіўся адзін толькі падпаручнік Дуб... Швэйку загадалі яго адшукаць.

— Спадзяюся,—сказаў яму паручнік Лукаш,—што вы без асаблівага напружаньня знойдзеце яго. Бо ў вас з ім заўсёды якія-небудзь гісторыі.

— Дык вось дазвольце далажыць, пане паручнік, што я прашу даць мне пісьмовы загад ад роты. Менавіта таму, што ў мяне з ім заўжды якая-небудзь гісторыя.

Пакуль паручнік Лукаш пісаў у сваім палявым блёкноце загад падпаручніку Дубу зараз зьявіцца на нараду, Швэйк разьвінаў свае заўвагі:

— Дык вось, пане паручнік, можаце быць спакойны, як заўсёды. Я ўжо яго адшукаю, таму што салдатам забаронена наведваць публічныя дамы і ён, напэўна, сядзіць у такім месцы. каб упэўніцца, што ніводзін з яго разьдзелу ня хоча адказваць перад ваенна-палявым судом, якім ён так любіць страшыць. Бо ён-жа і сам перад сваім разьдзелам заявіў, што пойдзе ва ўсе такія дамы і што тады гора неслухам, і што яны будуць

ведаць яго з самага благога боку. Зрэшты, я нават дакладна ведаю, дзе ён зараз знаходзіцца. Ён вось там, насупраць, у кафэ, таму што ўвесь разьдзел глядзеў яму ўсьлед, куды ён пойдзе перш за ўсё.

Гарадзкія дамы весялосьці і «Гарадзкое кафэ», пра якое гаварыў Швэйк, складаліся з двух аддзяленьняў. Хто не хацеў праходзіць у кафэ, мог увайсьці з задняга ходу, дзе сядзела, грэючыся на сонейку, старэнькая бабуля і на мешаніне з нямецкае, польскае 'ды мадзьярскае моў упэўняла наведвальнікаў, што тут ёсьць прыгожанькія паненкі.

Калі заходзіў салдат, яна вяла яго па калідоры ў нешта сярэдняе паміж прыходным і прыймовым пакоем і выклікала паненку, якая зараз-жа выбягала ў адной кашулі. Але перш за ўсё паненка патрабавала «грошы наперад», якія атрымлівала за яе мадам, пакуль салдат адшпільваў штых.

Афіцэры праходзілі проста праз кафэ ў пакоі, дзе зьмяшчаўся «вышэйшы гатунак», прызначаны для паноў афіцэраў, дзе кашулінкі былі абшыты тонкімі карункамі і дзе пілі толькі віно і лікёры. Тут мадам не дазваляла ніякіх парушэньняў этыкету: увесь фінал адыгрываўся наверсе, у спальнях.. І вось у гэтакім райскім куточку, што кішэў клапамі, падпаручык Дуб у адных споднікахмлява разьлёгся на атаманцы, у той час як фрэйлен Эльлі, як бывае ў гэтакіх выпадках, расказвала яму прыдуманую гісторыю свайго жыцьця, быццам бацька яе быў багаты фабрыкант, а сама яна—профэсар у Пэштцкім ліцэі і загубіла сябе тут праз нейкае няшчаснае каханьне.

Збоку, пад рукою падпаручыка Дуба, стаялі на маленькім століку бутэлька коньяку і дзьве чаркі. Тое, што падпаручык Дуб і фрэйлен Эльлі вярзьлі ўжо розную лухту, хоць бутэлька была пустая толькі напалавіну, сьведчыла, што падпаручык Дуб нічога ня можа стрываць. З яго слоў відно было, што ён ужо ўсё паблытаў і прымаў фрэйлен Эльлі за свайго дзяншчыка Кунэрта; ён так яе і называў і за штосьці грозіў уяўнаму Кунэрту, паўтараючы згодна свае звычкі:

— Кунэрт, Кунэрт, сьцерва ты такая, чакай адно, будзеш ведаць ты мяне з благога боку...

Швэйка хацелі былі прымусіць прайсьці тую-ж процэдуру, як і ўсіх астатніх салдатаў, што прыходзілі з задняга ходу, але ён мякка вызваліўся з абдымкаў аднэй красуні ў аднэй кашулі, на крык якое зьявілася мадам і пачала нахабна маніць Швэйку ў вочы, што тут няма ніякага падпаручыка.

— Ды вы са мною не асабліва разыходзьцеся, васпані,— ласкава прамовіў Швэйк, прыемна ўсьміхаючыся,—а то-ж я магу і поўху даць. У нас на Платаеравай вуліцы адну мадам аднойчы неяк гэтак зьбілі, што яна нават забылася, як яе імя. Разумееце, сын там шукаў свайго бацьку, нейкага Вандрачэка, у якога быў магазын аўтомобільных і вэлёсыпэдных шын... А прозьвішча тэй мадам было Хравашава, але калі яе адхаялі ды пачалі ў хуткай дапамозе пытацца, як яе зваць, яна ўздужала толькі сказаць, што яе прозьвішча пачыналася, як быццам, на літару «Х»... А дазвольце даведацца, як вашае прозьвішча?

Паважаная матрона падняла жахлівы лямант, калі пасьля гэтых слоў Швэйк ветліва адапхнуў яе і пачаў заклапочана ўздымацца па драўляных усходцах на другі паверх.

Унізе зьявіўся ўласьнік дому, зьбяднелы польскі шляхціц, які ўзьбег за Швэйкам па ўсходнах і, прабуючы ўтрымаць яго за дзяжурку, пачаў тлумачыць яму па-нямецку, што ніжэйшым чыном уваход наверх забаронены, бо там наверсе—толькі для паноў афіцэраў, а для ніжэйшых чыноў—унізе.

Швэйк зьвярнуў ягоную ўвагу на тое, што ён зьявіўся сюды ў інтарэсах цэлае арміі і шукае аднаго афіцэра, без якога армія ня можа выйсьці ў паход. А калі той пачаў выказваць занадта вялікую настойлівасьць і развязнасьць, Швэйк проста спусьціў яго са сходнаў ды пачаў дасьледаваць мясцовасьць. Ён пераканаўся, што ўсе пакоі пустыя, і толькі ў самым канцы калідору, пасьля таго, як ён пастукаўся, націснуў ручку і крыху прачыніў дзьверы, пачуўся пісклівы голас фрэйлен Эльлі:

— Занята.

І зараз-жа ўсьлед за ім пачуўся нізкі бас падпаручыка Дуба, які, мусібыць, меркаваў, што ён знаходзіцца яшчэ ў сваім пакоі ў лягэры:

— Заходзьце.

Швэйк увайшоў, падышоў да атаманкі і, перадаючы падпаручыку Дубу выраваны з палявота блёкноту лісток, далажыў, цішком паглядаючы на раскіданыя на ложку рэчы абмундзіравання:

— Дык вось, пане падпаручык, дазвольце далажыць, вы павінны апранацца і зараз-жа пасьля атрыманьня гэтага загаду, які я вам перадаў, зьявіцца ў нашую казарму ў гімназіі, таму што ў нас там вялікая вайсковая нарада.

Падпаручык Дуб вылупіў на яго свае вочкі з вузенькімі зрэнкамі, але пасьля скеміў, што ён ўсё-ж не на тэтулькі п'яны, каб не пазнаць Швэйка. Яму чамусьці здалося, што Швэйка паслалі да яго рапартавацца, а таму ён яму сказаў:

— Чакай, зараз я з табою разьлічуся, Швэйк. Вось... пабачыш... як... табе... будзе... Кунэрт!—крыкнуў ён раптам фрэйлен Эльлі,—налі ты мне... яшчэ... чарачку...

Ён выпіў чарку коньяку і, разрываючы ў шматкі пісьмовы загад, са сьмехам выгукнуў:

— Гэта, па-твойму, апраўданьне? У нас, брат, ня прымаюць ніякіх апраўданьняў. Мы, брат, на вайне, а ня як яго? ня ў школе. Значыцца, цябе затрымалі ў публічным доме? А ну подыдзі бліжэй, Швэйк, я табе дам пару добрых разоў поўху. А ў каторым годзе Філіп Македонскі перамог рымлян, гэтага ты, боўдзіла, напэўне, ня ведаеш...

— Дык вось, пане падпаручык,—няўмольна працягваў Швэйк,—атрыман найвышэйшы загад па брыгадзе, каб усе паны афіцэры апраналіся і зьявіліся на нараду ў батальён. Справа ў тым, што мы здымаемся, і вось неабходна цяпер вырашыць, каторая рота будзе ў авангардзе, а каторая ў ар'ергардзе і каторая ў флянгавай ахове. Зараз гэта і будуць вырашаць, і мне здаецца, пане падпаручык, што варта ўвярнуць пры гэтым сваё слоўца.

Гэтая дыплёматычная прамова крыху апрытомніла падпаручыка Дуба: ён як быццам пачынаў усьвядомліваць, што ён, як відаць, не ў казарме, але для перасьцярогі ўсё-ж запытаўся:

— А дзе мы знаходзімся?

— Дык вось, пане падпаручык, вы знаходзіцеся ў публічным доме. Шляхі божыя нявызнаны.

Падпаручнік глыбока ўздыхнуў, зьлез з атаманкі і пачаў зьбіраць сваё адзеньне, прычым Швэйк як мог дапамагаў яму; калі ён нарэшце апрануўся, абодва вышлі з пакою, але Швэйк зараз-жа вярнуўся і, не зварачаючы ўвагі на Эльлі, якая надаўшы яго звароту зусім адваротны сэнс, ад няшчаснага каханьня ізноў палезла на ложак, за два прыёмы выпіў з бутэлькі рэшту коньяку, а пасьля накіраваўся за сваім падпаручнікам.

На вуліцы хмель ізноў ударыў у галаву падпаручніку, бо было горача і душна. Ён пачаў расказваць Швэйку ўсякае глупства, успамянуўшы, што ў яго дома ёсьць паштовая скрынка з Гельголянду і што пасьля экзамэну на атэстат сталасьці ён пашоў з таварышамі ў рэсторан гуляць на більярдзе і не пакланіўся свайму былому кляснаму настаўніку. І пасьля кожнага сказу ён паўтараў:

— Спадзяюся, вы мяне добра разумееце?

— Так точна, я вас цудоўна разумею,—адказаў Швэйк.— Вы гаворыце накшталт таго, як бляхар Пакорны ў Будвэйсе. Той, калі яго пыталіся: «Ну, што вы ўжо купаліся сёлета ў рэчцы?», адказваў: «Не, але затое сёлета будзе добры ўраджай на сьлівы». Ці, напрыклад, яго пыталіся: «А вы цяпер елі ўжо грыбы?», а ён на гэта адказваў: «Не, але гэты новы марокскі султан, кажуць, дужа добры чалавек».

Падпаручнік Дуб спыніўся і з напружаньнем вымавіў:

Маркоскі султан? Гэта скончаны чалавек!—а пасьля абцёр з ілба пот і прамармытаў,назіраючы затуманенымі вачыма на Швэйка:—Так моцна я нават узімку не пацеў. Згодны? Вы мяне разумееце?

— Так точна, пане падпаручнік, разумею. Да нас у рэсторан «Поўная чаша» часта-густа прыходзіў адзін стары пан, адстаўны чыноўнік акруговага кіраўніцтва, дык той гаварыў тое самае. Ён заўжды ўпэўняў, што дзівіцца, якая розьніца паміж тэмпэратураю ўлетку і ўзімку, і што яму здаецца дужа сьмешным, што людзі гэтага яшчэ не заўважылі.

У варотах гімназіі Швэйк разьвітаўся з падпаручыкам Дубам, які, хістаючыся, узьняўся на сходцах у конфэрэнцзалю, дзе адбывалася вайсковая нарада, і зараз-жа далажыў

капітану Загнэру, што ён, Дуб, зусім п'яны. На працягу ўсяе нарады ён сядзеў апусьціўшы галаву, толькі зрэдку і недарэчы ўздымаючыся крыку з свайго месца са словамі:

— Ваш погляд абсолютна правільны, панове, але я зусім п'яны.

Пасьля таго, як усе дыспозыцыі былі распрацаваны і рота паручыка Лукаша прызначана ў авангард, падпаручык Дуб раптам здрыгануўся, узьняўся і заявіў:

— Як цяпер помню свайго кляснага настаўніка ў першай клясе, панове. Многая лета майму кляснаму настаўніку! Ура! Ура! Ура!

Паручык Лукаш падумаў, што лепш бы за ўсё загадаць дзяншчыку падпаручыка Дуба палажыць свайго пана ў фізычным габінэце, перад дзьвярыма якога быў пастаўлены вартавы, каб нікому чаго добрага, ня ўзбрыло ў галаву ўкрасьці рэшткі напалавіну ўжо расьцяганай мінэралёгічнае колекцыі. На гэта тымчасам, у штабе брыгады звярочвалі заўсёды ўвагу эшалёнаў, якія праходзілі.

Такі захад перасьцярогі быў зроблены ад таго часу, як адзін гонвэдаўскі батальён, раскватэраваны ў гімназіі, палажыў пачатак расьцягваньню габінэту. Асабліва спадабаліся ўдалым гонвэдам пярэстыя крышталі ды камяні мінэралёгічнае колекцыі, якімі яны напакавалі свае мяхі з рэчамі.

На маленькіх вайсковых могілках ёсьць магіла, на белым крыжы якое напісана: «Ласло Гаргані». Пад гэтым крыжам сьпіць вечным сном адзін гонвэд, які пад час першага абрабаваньня гімназіі выпіў увесь дэнатураваны сьпіртус са слоіка, дзе захоўваліся розныя гадзіны.

Сусьветная вайна зьнішчала людзкі род нават сьпіртусам з натуралістычных колекцый.

Калі ўсе разышліся, паручык Лукаш загадаў паклікаць Кунэрта, які павёў свайго пана ды палажыў яго на канапу. Падпаручык зрабіўся раптам як малое дзіцянё: ён схапіў кунэртаву руку, пачаў разглядаць рысы на ягонай далоні і заявіў, што можа вызначыць па іх прозьвішча яго будучай жонкі.

— Як ваша прозьвішча? Дастаньце ў мяне з бакавое кішэні запісную кніжку і аловак. Дык вось, ваша прозьвішча Кунэрт?

Добра. Прыходзьце праз чвэртку гадзіны і я вам пакіну тут пісульку з прозьвішчам вашае будучай жонкі.

Не пасьпеў ён скончыць свае прамовы, як ужо захроп; але ён зноў прачнуўся і пачаў штосьці чыркаць у сваёй запіснай кніжцы. Пасьля ён вырваў сьпісаны лісток, кінуў яго на падлогу і, таемна прылажыўшы палец да вуснаў, прамовіў:

Не, не цяпер... Праз чвэртку гадзіны... Лепш за ўсё будзе, калі вы будзеце шукаць пісульку з завязанымі вачыма...

Кунэрт быў такі просты і ласкавы чалавек, што сапраўды прышоў праз чвэртку гадзіны. Разгарнуўшы пісульку, ён прачытаў крамзаніну падпаручыка Дуба: «Прозьвішча вашае будучае жонкі будзе—пані Кунэрт».

Калі ён паказаў пасьля гэтую пісульку Швэйку, той сказаў, што яе трэба старанна захаваць, таму што такія дакуманты, якія даюць вялікія вайсковыя начальнікі, кожны павінен асабліва шанаваць. Таму што ў мінулы час, на прызыўнай службе гэткіх выпадкаў ня было, каб афіцэр ліставаўся са сваім дзяншчыком ці, тым больш, называў яго «панам».

*

Калі падрыхтоўка да выступленьня, згодна дадзенай дыспозыцыі, была скончана, камандзір брыгады, якога гановэрскі палкоўнік так ёмка выставіў вон з гораду, загадаў батальёну настроіцца паротна чатырохкутнікам і зьвярнуўся да яго з прамоваю. Справа ў тым, што гэты чалавек любіў пагаварыць. Ён гаварыў пра ўсё-ўсенькае, не разьбіраючыся, а калі ўжо нічога ня мог больш прыдумаць, успомніў яшчэ пра палявую пошту.

— Салдаты!—грымела з яго вуснаў пасярод карэ.—Мы набліжаемся цяпер да варожага фронту, ад якога нас адлучае толькі некалькі дзён хады. Салдаты! Да гэтага часу вы на сваім паходзе ня мелі магчымасьці паведаміць вашым блізкім, якіх вы павінны былі пакінуць, свае адрасы, каб вашыя блізкія ведалі, куды вам пісаць, каб вы маглі радавацца лістом вашых дарагіх сірат.

Тут ён неяк заблытаўся і ніяк ня мог выблытацца, таму няэьлічонае мноства разоў паўтараў:

— Вашых блізкіх... вашых сваякоў... вашых дарагіх удоў і сірат.

І так бясконца, пакуль ня вылез з гэтага зачараванага кола, на ўвесь голас заявіўшы:

— Вось для гэтага і існуе ў нас на фронце палявая пошта!

Уся яго далейшая прамова стварыла ўражаньне, быццам усе гэтыя людзі ў шэрых мундзірах павінны былі з радасьцю дазволіць сябе забіваць выключна таму, што на фронце наладжана была палявая пошта, як быццам чалавеку, якому знарад адарваў абедзьве нагі, проста-такі прыемна памерці, усьвядомліваючы, што яго палявая пошта лічыцца пад нумарам 72-м, дзе, можа быць, ёсьць яму ліст ад дарагіх яму людзей, што засталіся на бацькаўшчыне, ці пасылка, якая складаецца з кавалка вэнджанай сьвініны, шпіку ды хатніх сухароў.

А потым, пасьля гэтае прамовы, калі оркестр брыгады зайграў народны гімн і было агалошана ўра за імпэратара, асобныя групы гэтага чалавецкага статку, які вялі кудысьці на збойства на лінію Бугу, пакорна адна за аднэю выступілі згодна дадзенай ім дыспозыцыі ў паход.

11-я рота выступіла а палове шостай на Турава—Вольск. Швэйк цягнуўся ў самым канцы колёны, з ротнаю канцылярыяй і санітарамі, а паручык Лукаш бесьперастанку аб'яжджаў усю колёну, штохвілінны варочаючыся назад, крыху каб наглядаць становішча падпаручыка Дуба, які ехаў на фурманцы пад брэзэнтавым верхам насустрач новым слаўным учынкам, а крыху каб правесьці час у гутарках са Швэйкам, які пакорна цягнуў на сабе стрэльбу і цяжкі мех з рэчамі ды ўспамінаў з каптэнармусам Ванэкам, як добра было ісьці некалькі год перад гэтым пад час манэўраў каля Грос—Мэзэрычу.

— Гэта была якраз такая-ж мясцовасьць, як тут, толькі мы ішлі ня ў поўным баявым узбраеньні, таму што ў той час мы нават і ня ведалі, што гэта за яно непарушны запас консэрваў, а калі атрымлівалі консэрвы, дык у нашым разьдзеле іх зьядалі на першым прыпынку на начлег і клалі замест іх у ранцы цэглу. У нейкай вёсачцы нам зрабілі агляд і павыкі-

далі ўсю цэглу з мяхоў. Там яе сабралася столькі, што пасьля хтосьці пабудаваў з іх цэлы жыльлёвы дом.

Праз пяць хвілін Швэйк бадзёра выступаў поруч з канём паручыка Лукаша і разважаў пра палявую пошту.

— А прамова была цудоўная, і кожнаму, вядома, прыемна атрымаць на фронце лісты з дому. Калі я служыў у Будвэйсе, я за ўвесь час службы атрымаў толькі адзін ліст, і я захаваў яго да гэтага часу.

Швэйк выцягнуў са свайго бруднага меха ліст, увесь заляпаны салам, і, не астаючыся ад каня паручыка Лукаша, які перайшоў на дробную рысь, прачытаў уголас: «Падлюка, нягоднік, прайдзісьвет, шэльма! У Прагу прыехаў на пабыўку капрал Кржыч, і я танцавала з ім у «Коконе», і ён расказаў мне, што ты танцаваў у Будвэйсе ў «Зялёнай жабе» з нейкаю паршываю трапачкаю і зусім ужо пакінуў мяне. Дык і ведай— я пішу гэты ліст у сарціры на лаўцы поруч з дзіркаю, і паміж нас усё скончана. Твая былая Божэна. Так вось, каб не забыцца: капрал, можа, будзе цябе мурыжыць, я яго пра гэта прасіла. Ды яшчэ вось, каб не забыцца: ты ўжо больш не засьпееш мяне жывою, калі прыедзеш на пабыўку».

— Зразумела,—гаварыў далей Швэйк,—што яна, калі я прыехаў на пабуўку была жывёсенькая, ды яшчэ як. Я знайшоў яе ў «Коконе», дзе якраз два салдаты цягнулі яе кожны на свой бок і пры гэтым адзін з іх рабіў гэта так палка, што пры ўсім добрым народзе пачаў лапаць яе пад сукенку, быццам ён з дазволу сказаць, пане паручык, хацеў выцягнуць адтуль «краску яе цноты», як гаворыць пісьменьніца Венцэслава Лужычка, і як сказала, расплакаўшыся, ў танклясе адна шаснаццацігадовая паненка аднаму гімназісту, які ўшчыкнуў яе за руку: «Ласкавы пане, вы загубілі краску мае цноты!» Вядома, усе паднялі яе на сьмех, а яе маці, якая там наглядала за ёю, выклікала яе пад час наступнага танцу ў калідор і прабрала сваю дурненькую дачушку на чым сьвет стаіць... А я, пане паручык, трымаюся таго погляду, што вясковыя—куды шчырэйшыя за гэтых залапаных мамзэляў, якія ходзяць на танцклясы. Калі некалькі год перад гэтым мы былі на манэўрах у Мнішку, пайшоў я аднойчы на танцы ў Стара-Кмін і па-

знаёміўся там з адною дзяўчынаю, Каруляю Бэклавай, ды толькі яна мне ня дужа ўпадобілася. Вось пайшлі мы з ёю ў нядзелю ўвечары на возера, селі на гаці, і, калі зайшло сонца, я яе запытаў, ці кахае яна мяне. Дык вось, пане паручык, дазвольце далажыць, паветра было цёплае-цёплае, усе птушкі наўкол сьпявалі, а яна зарагатала ды і кажа: «Люблю, як саломіну ў задзе! Занадта ты ўжо дурны, хлопец!» А я сапраўды быў дурань, такі дурань, што я, дазвольце далажыць, пане паручык, хадзіў з ёю перад гэтым па полі, паміж высокага жыта, дзе ня відаць было ніводнага чалавека, і нават ня прысеў з ёю, а ўсё толькі паказваў ёй усю гэнную божую благадаць і—от дурань-жа!—тлумачыў ёй, сялянскай дзяўчыне, што гэта, бач, жыта, а гэта—ячмень, а гэта—авёс.

І як-бы на сьцьвярджэньне гэтых слоў спераду даляцелі звонкія салдацкія галасы, якія сьпявалі працяг песьні, з якою чэскія палкі хадзілі праліваць сваю кроў за Аўстрыю яшчэ пры Сольфэрыно:

Поўнач б'е стары званар
У мяхох скача збажына.
Гоп, гэй-да! Гоп, гэй-ды!
І жанчыны ўсе тады...

І ўсе гуртам падхапілі:

Усе тады, усе тады
Як здараецца заўжды,
Ня раз, а два цалуюць нас—
Зьлева раз і справа раз.
Гоп, гэй-да! Гоп, гэй-да!
Гоп-гоп—да, да!

А пасьля гэтую-ж песьню пачалі сьпяваць немцы панямецку.

Гэта старая салдацкая песьня, якую сьпявалі салдаты на ўсіх мовах яшчэ ў часы Напалеона. Зараз яна грымела—разьлягалася па пыльным шосэ на Туравы ў Галіцыйскай раўніне, дзе ва ўсе бакі, да зялёных узгоркаў на паўдні, палі былі сьціпттаны капытамі коняй і шматлікімі тысячамі цяжкіх салдацкіх ботаў.

— Накшталт гэтага мы спаскудзілі ўсю мясцовасьць пад Пісэкам,—заўважыў, азірнуўшыся наўкол, Швэйк.—З намі быў адзін з эрцгэрцогаў, дык тэта быў такі справядлівы пан, што калі яму здаралася праяжджаць са сваім штабам па засеяным полі, яго ад'ютант павінен быў зараз-жа рабіць ацэнку патравы. Адзін селянін, Піха прозывішча яго нае, застаўся нездаволены, адмовіўся атрымаць ад казны восемнаццаць крон узнагароды за патраву пяці акраў пасеву і надумаўся быў судзіцца. Дык яго, пане паручык, за гэта пасадзілі на паўтары гады— вось як! Ну, а мне, пане паручык, здаецца, уласна кажучы, ён мог-бы толькі радавацца, што яго вучастак наведала асоба імпэратарскай фаміліі. Іншы-б хто разумнейшы апрануў-бы сваіх дачок ва ўсё белае, як да прычасьця, даў-бы ім у рукі па букету, паставіў-бы іх на сваім полі ды загадаў вітаць вялікага госьця, як я чытаў пра Індыю, дзе падданыя некага раджы павінны кідацца пад ногі слану, на якім той едзе.

— Што гэта вы за глупства гародзіце, Швэйк?—перапыніў яго паручык Лукаш.

— Дык вось, пане паручык, дазвольце далажыць, што я кажу пра сланя, які нёс на сваёй сьпіне таго раджы, пра якога я чытаў.

— З гэтым нельга не згадзіцца, Швэйк, што вы ўсё ўмееце зусім правільна растлумачыць,—сказаў паручык Лукаш ды паехаў наперад.

Там маршавы колёны пачыналі парушаць ужо парадак руху і нязвычная хада пасьля доўгае высідкі ў вагонах і поўнае баявое узбраеньне выклікала боль у руках і ў нагах, так што кожны хацеў уладзіцца, як можна выгодней. Стрэльбы перакладвалі з аднаго пляча на другое і большасьць несла іх ужо не на плячы, а пазакідала на сьпіну, як граблі, ці вілкі. Шмат хто знаходзіў, што выгодней ісьці ў канаве ці па краі яе, дзе зямля здавалася мякчэйшаю, чымся на пыльным шосэ.

Амаль усе крачылі, стомлена апусьціўшы галовы і страшэнна смаглі без вады, таму што сонца хоць і садзілася, але ўсё-ж стаяла такая сьпёка і духата, быццам у паўдня, а тымчасам ні ў кога ў пляшцы ня было ні кроплі вады. Гэта быў першы такі пераход, і нязвычнае становішча, што зьяўлялася першай сту-

пеньню да яшчэ больших пакут, усё мацней таміла ды зьнясільвала салдатаў. Яны пакінулі сьпяваць і толькі гадалі міжсобку, колькі засталося яшчэ да Турава-Вольску, дзе згодна іхных разьлікаў, яны павінны былі спыніцца на начлег. Некаторыя садзіліся на хвілінку ў канаву, а каб няпрыкметна была іхная стомленасьць, расшнуроўвалі боты, выклікаючы на першы погляд уражаньне людзей, у якіх зьбіліся парцянкі і якія тужацца наматаць іх так, каб яны ня ціснулі ногі на працягу доўгага шляху. Іншыя пускалі даўжэй ці карацэй рэмень ад стрэльбы, ці разьвязвалі мех з рэчамі і шчыльней складвалі іх, хочучы ўпэўніць самых сябе, што робяць гэта з мэтаю больш роўнага разьмеркаваньня цяжару, каб рамянямі не адцягвала адно ці другое плячо. Калі да іх пад'ехаў паручык Лукаш, яны адзін за адным усталі і далажылі, што ў іх гэта і гэта ціснe, ці замінае,—пакольki іх яшчэ не пасьпелі пагнаць далей кадэты і камандзіры разьдзелаў, што страпянуліся пры набліжэньні начальства.

Праяжджаючы конна паўз стомленых салдатаў, паручык Лукаш ветліва прапанаваў ім устаць дыісьці, таму што да Турава-Вольску, з ягоных слоў, заставалася ня больш за тры кілёмэтры.

Тымчасам, дзякуючы няспыннаму падтрэсваньню на санітарнай двуколцы, падпаручык Дуб пачаў пакрыху ачуньваць, менавіта ён ня зусім яшчэ ачухаўся, але ўжо мог выпрастацца ў сваёй двуколцы ды гукнуць людзей з ротнае канцыляры, якія ішлі ўлегцы вакол яго, бо яны ўсе, пачынаючы ад Балуна і канчаючы Хадынскім, зложылі свае торбы з рэчамі на двуколку. Толькі Швэйк бадзёра ішоў ды ішоў з ранцам за сьпіною і са стрэльбаю, якая вісела ў яго па-драгунску на рамяні цераз грудзі, пакурваючы люльку ды напяваючы нейкую вясёлую песеньку.

Больш як на пяцьсот крокаў у абодва бакі падымаліся перад падпаручыкам Дубам на шосэ слупы пылу, у якіх мільгалі постаці салдатаў. Падпаручык Дуб, якога ізноў ахапіў экстаз, высунуўся з двуколкі ды пачаў крычаць на ўсе лёгкія:—Салдаты! Цяжкая ваша высокая задача! Поўныя стомы пераходы, нястача ўсяго патрэбнага, усякага парадку цяжкасьці ды пры-

годы—усё гэта чакае вас. Але я зусім пакладаюся на вашую трываласьць і на вашую цьвярдую волю.

— Бач, раве, як бык,—прамармытаў сабе пад нос Швэйк.

— Для вас, салдаты,—гаварыў далей падпаручык Дуб,—няма такіх вялікіх перашкод, якіх-бы вы не перамаглі. Яшчэ раз паўтараю вам, салдаты, я вяду вас не на лёгкую перамогу. Вам прыпадзе моцны гарэшак, але вы дасьцё яму рады. А гісторыя ўздыме вас...

— Проста мутарна, слухаць, як ён гаворыць,—зноў мармынуў Швэйк.

І як быццам пачуўшы яго, падпаручык перагнуўся цераз край двуколкі і пачаў бляваць. Спаражніўшыся, ён яшчэ раз крыкнуў:—Наперад, салдаты!,—паваліўся на торбу тэлефоніста Хадынскага і праспаў аж да самага Турава-Вольску, дзе яго, нарэшце, згодна загаду паручыка Лукаша, паднялі з двуколкі ды паставілі на ногі. Але прайшло дужавата часу, пакуль пасьля доўгае і цяжкае гутаркі з паручыкам Лукашам падпаручык Дуб нагэтулькі ачуняў, што здолеў урэшце заявіць:

— Лёгічна разважаючы, я зрабіў глупства, якое выпраўлю ў сутычках з ворагам.

Праўда, ён яшчэ быў ні пры сталых думках ды цьвярдой памяці, таму што, перш чым вярнуцца да свайго разьдзелу, сказаў паручыку Лукашу:

— Вы мяне яшчэ ня ведаеце, але калі даведаецеся...

— Пра тое, чаго вы начварылі, вы можаце даведацца ў Швэйка,—адказаў яму паручык Лукаш.

Дык вось, падпаручык Дуб, па шляху да свайго разьдзелу, перш за ўсё адшукаў Швэйка, якога ён засьпеў у кампаніі з Балуном і каптэнармусам Ванэкам.

Балун якраз расказваў, што ў сябе ў млыне ён заўсёды трымаў у калодзежы бутэльку піва, і піва рабілася такое халоднае, што ня чуваць было зубоў... У іншых млынох, гэткае піва пілі з тварагом ды з маслам, а ён, ад свае пражэрлівасьці, за якую бог яго цяпер і карае, заўсёды зьядаў яшчэ пасьля гэтага і кавалак мяса. Вось бог яго цяпер і пакараў, прымусіўшы яго піць цёплую, сьмярдзючую ваду з калодзежа ў Тураве Вольскім, ваду, куды ўсім было загадана падсыпаць лімон-

нае кіслаты, якую ім кагадзе перад тым раздалі, калі людзей пасылалі па аддзяленьнях на ваду. Балун выказаў такое меркаваньне, што гэтую лімонную кіслату выдалі, як відаць, толькі на тое, каб людзі мацней аддчувалі голад. Праўда, у Санку ён пасьпеў крыху падмацавацца, а паручык Лукаш зноў аддаў яму сваю дзялянку целяціны, якую прыслалі са штабу брыгады, але ўсё-ж такі ёсьці хацелася страшэнна; бо ён-жа разьлічваў, што дабіўшыся сюды лыга будзе аддыхнуць, выспацца і павячэраць. Ён быў у гэтым цьвёрда ўпэўнены, тым болей, што кашавары налівалі ўжо ваду ў катлы, і зараз-жа пашоў разьведаць, як і што, а кашавары сказалі яму, што пакуль што атрыманы загад назапасіць вады і што праз некалькі хвілін можа быць атрыманы загад ваду выліць.

У тэты момант да іх падышоў падпаручык Дуб і, ня ведаючы, што сказаць, запытаў:

— Ну, што, размаўляеце?

— Так точна, гутарым,—за ўсіх адказаў Швэйк.—У нас гутарка сама што разышлася. Наогул лепш за ўсё—прыемна пагутарыць. А бяз гутарак салдат ня можа быць, таму што ён, прынамсі, лягчэй забывае ліхія гадзіны.

Падпаручык Дуб загадаў Швэйку пайсьці з ім крыху далей, таму што ён хоча ў яго штосьці запытацца. Калі яны адышлі на некалькі крокаў, падпаручык Дуб няўпэўненым голасам сказаў:

— Вы не пра мяне гаварылі там?

— Нікак нет, пане падпаручык, і ня думалі нават, а гаварылі пра лімонную кіслату і вэнджаную кілбасу.

— Але паручык Лукаш сказаў мне, быццам я чагосьці такога нарабіў і што вы дасканала гэта ведаеце, Швэйк.

— Нічога вы не начварылі, пане падпаручык,—надзвычай сур'ёзна і разважна прамовіў Швэйк.—Зусім нічога! Вы толькі наведалі публічны дом. Але гэта, мусібыць, здарылася па памылцы. Бляхара Пімпру з Казінае плошчы таксама заўсёды шукалі, калі ён хадзіў у горад па бляху і таксама заўсёды знаходзілі ў якім-небудзь такім месцы, у Шухі ці ў Дворжака, вось як я і вас знайшоў. Унізе было кафэ, а наверсе, як і ў гэтым выпадку, паненкі. Вы, пане падпаручык, таксама, мабыць,

перабльгталі, дзе вы, уласна кажучы, знаходзіцеся, было дужа душна, а калі чалавек ня прывык піць, дык ён можа гэткаю духатою сп'янець нават ад звычайнага рому, а тым болей вы, пане падпаручык, ад коньяку. Дык вось мне было загадана, перш як выходзіць адсюль, каб я занёс вам запрашэньне на караду, і я адшукаў вас там наверсе ў паненкі. Ад духаты і коньяку вы ня ўздужалі мяне пазнаць і ляжалі там гальцом-голы на атаманцы. Вы нічога такога не начворылі і нават не гаварылі: «Вы мяне яшчэ ня ведаеце!», а гэткая вось штука можа з кожным здарыцца, калі душна. Іншы чалавек нават задужа пакутуе ад сьпёкі, а іншаму, як вада з гусака. Вось каб вы ведалі дзядка дзесятніка Вяйводу з Вршовіцэ, дык той, пане падпаручык, даў сабе слова, што ня будзе піць нічога такога, ад чаго ён мог-бы захмялець. Вышіў ён, ведаеце, у хаце чарачку для сьмеласьці і пайшоў сабе шукаць безалькогольных трункаў. Адразу-ж ён зайшоўся ў тракцір «Станцыя», заказаў карафінку горкае ды пачаў асьцярожна дапытвацца ў гаспадара, што, уласна кажучы, п'юць гэтыя цьверазуны, бо ён зусім правільна разважаў, што аднае вады і цьверазуны ня п'юць. Ну, гаспадар яму і расказаў, што цьверазуны п'юць содавую, лімонады там розныя, малако, а таксама і безалькогольнае віно, суропы ды іншыя безалкогольныя трункі. З усяго гэтага дзядулю Вяйводзе больш ад усяго ўпадабалася безалькогольнае віно. Ён яшчэ запытаў, ці бывае безалькогольная гарэлка, выпіў яшчэ карафінку і пачаў з гаспадаром гаворку пра тое, што, бач, сапраўды вялікі грэх часта напівацца, а гаспадар яму на гэта адказаў, што ён ўсё на сьвеце гатоў стрываць і прабачыць, але толькі не п'янога чалавека, што напіўся ў якім-небудзь іншым месцы, а да яго прыходзіць пахмяляцца бутэлькаю содавае ды ў дадатак яшчэ і распачынае гармідар. «Напіся ў мяне,— кажа гаспадар,—тады і я цябе буду абстойваць, а як не, дык я цябе і ведаць ня хочу». Ну, стары Вяйвода дапіў карафінку ды пашоў сабе далей, пакуль ня прышоў, пане падпаручык, на Карлаву плошчу ў віньніцу, куды ён і раней часамі заходзіў, і запытаў, ці няма ў іх безалкогольнага віна: «Безалькогольнага віна ў нас няма, пане Вяйвода,—адказалі яму,—але затое херасу ці горкае, калі ласка, колькі ўлезе!» Старому зрабілася

неяк няёмка адмовіцца, ён і выпіў там карафінку горкае і карафінку херасу. Дык вось, калі ён там сядзеў, ён пазнаёміўся, ведаеце, выпадкова з адным цьверазуном. Ну, зразумела, слова за слова, разгаварыліся, выпілі яшчэ па карафінцы херасу і пад канец высьветлілася, што гэты пан ведае такое месца, дзе ёсьць безалькогольнае віно. «Гэта, кажа ён, на вуліцы Больцана, тры сходкі ўніз і грамофон там гэтаксама ёсьць». За гэткае прыемнае паведамленьне стары Вяйвода паставіў яшчэ цэлую бутэльку вэрмуту, а пасьля абодва пайшлі на вуліцу Больцана, дзе тры сходкі ўніз і ёсьць грамофон. І сапраўды, там падавалі толькі ягаднае віно, і куды там безалькогольнае, а нават і зусім бяз нічога. Спачатку кожны заказаў па паўлітры парэчкі, а пасьля па паўлітры агрэсту, а калі выпілі яшчэ па паўлітры безалькогольнае парэчкі, дык у іх пасьля ўсіх папярэдніх херасаў і горкіх і вэрмутаў ногі і адабрала, і яны ўзьнялі гармідар, каб ім выдалі афіцыйнае пасьведчаньне, што тое, што яны тутака пілі, сапраўды безалькогольнае віно. І яшчэ, што яны сапраўдныя цьверазуны, і што калі ім зараз-жа не прынясуць такога пасьведчаньня, дык яны разаб'юць ушчэнт на кавалкі ўсё абсталяваньне, разам з грамофонам. Так што паліцыі давялося цягнуць абодвых сілком тры сходкі ўгару на вуліцу Больцана, пасадзіць на дзяжурны аўтомобіль і зьвезьці, пакуль ацьверазяцца, у халодную. А ўрэшце на іх абодвых, як цьверазуноў, наладжылі спагнаньне за тое, што яны парушылі свой статут і напіліся.

— Да чаго вы мне гэта ўсё расказваеце?—выгукнуў паручык Дуб, які пасьля гэткае даўгое прамовы зусім ацьвярозеў.

— Дык вось, пане падпаручык, яно, вядома, вас на датычыць, але ўжо калі мы пачалі гаворку...

Тут падпаручык здагадаўся, што Швэйк яго зноў абразіў і, з прычыны таго, што ён быў ужо зусім пры поўнай сьвядомасьці, пачаў раўці на Швэйка:

— Ты мяне яшчэ будзеш ведаць!... Як стаіш?

— Так точна, пане падпаручык, стаю блага, бо, дазвольце далажыць, забыўся стуліць абцасы. Зараз папраўлю.

І вось ужо Швэйк стаяў перад афіцэрам, выцягнуўшыся ва фронт, згодна ўсіх правіл мастацтва.

Падпаручык Дуб пачаў меркаваць, да чаго-б яшчэ прычапіцца, але ўрэшце толькі сказаў:

— Ну, сьцеражыся, каб мне зноў не давялося табе паўтараць. Ты мяне яшчэ ня ведаеш, а я цябе наскрозь бачу,—дадаў ён, крыху зьмяначаўшы свой улюбёны сказ. Калі ён адышоў ад Швэйка, у яго галаве, што аж гула з пахмельля, кружылася думка:» А ці ня лепш было-б, каб я яму сказаў: «Я ўжо даўно ведаю цябе з твайго благога боку, нягоднік!»

Пасьля ён загадаў паклікаць свайго дзяншчыка Кунэрта і загадаў яму прынесьці збан вады. На гонар Кунэрта трэба адзначыць, што ён даволі доўга-ткі шукаў у Тураве-Вольску збанок вады.

Нарэшце яму пашанцавала ўкрасьці ў папа збанок і ў гэты збанок ён набраў вады з забітага калодзежу. Праўда, на гэта яму трэ' было адарваць некалькі дошчак, бо калодзеж быў забіты наглуха, таму што вада ў ім была падазроная наконт тыфусу.

Але падпаручык выпіў бяз жадных шкодных для сябе вынікаў увесь збанок, спраўдзіўшы гэтым прыказку:

«Чалавек ня сьвіньня, усё зьесьць!»

*

Усе жорстка памыліліся ў сваіх разьліках, быццам у Тураве-Вольску можна будзе пераначаваць.

Паручык Лукаш сабраў наўкол сябе тэлефоніста Хадынскага, каптэнармуса Ванэка, ротнага ордынарца Швэйка і дзяншчыка Балуна. Атрыманыя загады былі дужа простыя: людзі пакідаюць сваё прыладзьдзе санітарнаму атраду і зараз-жа накіроўваюцца ў паходным парадку прасёлкаваю дарогаю ў Поланец, а адтуль уздоўж плыні ручаіны ў паўднёва-ўсходнім кірунку на Ліскавіцы.

Швэйк, Ванэк і Хадынскі—кватэр'еры. Яны павінны падрыхтаваць месцы на начлег сваёй роце, якая прыйдзе праз гадзіну, адсілы праз паўтары гадзіны пасьля іх. Балун тымчасам павінен здабыць і сьпячы гусака там, дзе спыніцца начаваць

паручнік Лукаш, а тых трох павінны наглядаць, каб ён сам адзін ня зжор палавіну. Апрача таго Ванэку і Швэйку загадана купіць для роты сьвіньню, улічваючы тое, колькі мяса давядзецца на чалавека пры раскладцы. Увечары будуць гатаваць гуляш. Месцы на начлег павінна быць прыстойныя; халуп, дзе ёсьць паразыты, не займаць, бо людзі павінны як належыць адпачыць, бо ўжо а палове сёмай раніцы роце давядзецца здымацца ды ісьці далей з Ліскавіц праз Крозіенку на Старасол.

Цяпер батальён ня быў ужо бедны. Брыгаднае казначэйства ў Сонку выдала батальёну аванс перад чарговаю бойняй. У ротнай касе знаходзілася звыш ста тысяч крон, і каптэнармус атрымаў ужо загад, зробіць дзе-небудзь на месцы, г. ё. у акопах, канчатковы разьлік з ротаю перад яе сьмерцю і выплаціць людзям бясспрэчна належныя ім грошы на аплату нявыданых пайкаў да харчаваньня.

Пакуль усе чацьвёра зьбіраліся ў дарогу, у роту зьявіўся мясцовы поп і раздаў салдатам згодна іхнае нацыянальнасьці паперкі з «Лурдзкім гімнам» на ўсіх мовах. У яго быў цэлы пак гэтых гімнаў, якія пакінула яму на раздачу нейкая высокая духоўная асоба, якая аб'яжджала на аўтомобілі, у кампаніі дзьвёх-трох жанчын лёгкіх паводзін, разбураную вайною Галіцыю.

У Турове-Вольску было шмат прыбіраньняў і ўсюдых панакіданы былі паперкі з гэтым «Лурдзкім гімнам».

Капрал Нахцігаль, родам з Бэрграйхэнштэйну, дастаўшы ў нейката запужанага абывателя бутэльку коньяку, сабраў вакол сябе некалькі чалавек сваіх таварышоў, і ўсе пачалі хорам расьпяваць нямецкі тэкст «Люрдзката гімну», але бяз прыпеву і на мотыў салдацкае песьні пра прынца Аўгена.

Пасьля цяжкага пераходу чацьвёра людзей, пасланых падрыхтаваць начлег адзінаццатай роте, выйшлі з надыходам цемнаты на лясную дарогу па той бок ручаіны. Гэтая дарога павінна была прывесьці іх у Ліскавіцы.

Балун, які ўпяршыню трапіў у такое становішча і якому ўсё—і цемната, і абавязкі кватэр'ера—здавалася надзвычай

таемным, прымеў раптам страшное падазрэньне, што ўсё гэта нездарма.

— Браткі,—ціхенька сказаў ён, спатыкаючыся па дарозе ўздоўж ручаіны,—нас ахвяравалі...

— Што ты брэшаш?—прыкрыкнуў на яго Швэйк.

— Браткі, ня трэба гэтак крычаць,—пачаў прасіцца Балун. Я ўжо ўсім нутром адчуваю, што нас пачуюць ды пачнуць абстрэльваць. Я гэта ведаю. Нас сумысьля паслалі наперад, каб мы выведалі, ці няма там ворага, і як пачуюць страляніну, дык адразу зразумеюць, што далей ісьці нельга. Мы—выведчныя дазор, браткі, як вучыў мяне капрал Церна.

— Ну, дык і ідзі наперад,—абазваўся Швэйк,—а мы пойдзем за табою, каб мы маглі пасьпець легчы на выпадак чаго... Ну і салдат-жа ты! Баішся, што ў цябе будуць страляць! А якраз салдату павінна быць прыемна, калі ў яго страляюць, бо чым часьцей вораг страляе, тым хутчэй зьмяншаюцца ягоныя баявыя прыпасы. Гэта-ж кожнаму зразумела. З кожным стрэлам, які дае па табе ворагаў салдат, зьмяншаецца ягоная баяздольнасьць і ён яшчэ тым болей здаволены, што можа паліць у цябе, бо і яму не давядзецца цягнуць на сабе ўсе патроны, дый бегчы яму лягчэй.

— А калі ў мяне, скажам, дома гаспадарка ёсьць?—цяжка ўздыхнуў Балун.

— Наплюй ты на сваю гаспадарку!—выгукнуў Швэйк.— Дай сябе лепей забіць на славу яго імпэратарскае вялікасьці. Няўжо цябе гэтаму не навучылі на вайсковай службе?

— Не, толькі згадвалі,—адказаў просты Балун.—Нас толькі мурыжылі па пляцы, а пасьля мне дык і зусім не даводзілася чуць пра гэта, бо мяне прызначылі за дзяншчыка... Вось каб імпэратар лепей нас карміў...

— Ой, якая ты сьвіньня ненаедная, Балун! Перад боем наогул зусім нельга карміць салдатаў, гэта тлумачыў нам яшчэ ў навучальнай камандзе капітан Унтэргрыц. Ён нам колькі разоў казаў: «Слухайце, дурылы! Як здарыцца калі-небудзь вайна і вам давядзецца ісьці ў бой, дык глядзеце на наядайцеся перад боем. У каго чэрава поўнае, дыналучыць кулю ў жывот, таму кадохэс, бо ўся поліўка і казённы хлеб пасьля та-

кое раны выйдуць напаверх і ў такога салдата адразу-ж зробіцца запаленьне і яму каюк. А калі ў яго ў кішках пуста, дык рана ў жывот чыстае глупства, бынцам яго асва ўкусіла».

— Нічога,—сказаў Балун,—у мяне жывот хутка травіць, і ў ім шмат не застаецца. Я, браткі, магу зьесьці цэлы паўмісак клёцак са сьвінінаю ды з капустаю, а праз паўгадзіны з мяне выдзе ня больш за тры сталовыя лыжкі, а ўвесь астатні матэрыял разыходзіцца ва мне. Ізноў-жа грыбы: у іншых яны выходзяць цалкам, а ў мяне—ані-ні, так толькі, крышачку, а ўсе астатняе цалкам разыходзіцца ў сярэдзіне... Ува мне, дружа,—зьвярнуўся ён да Швэйка,—расчыняюцца нават рыбіныя косткі і сьліўяныя каменчыкі. Аднойчы я насумысьля палічыў. Я зьвёў семдзесят сьліў разам з каменчыкамі, а пасьля, калі надышоў час, я палічыў, колькі вышла, і атрымалася, што больш за палавіну, так ва мне і засталося.

Балун прычыніў вусны і крыху ўздыхнуў.

— Бабуля мая гатавала бульбяныя смажанкі са сьлівамі і крыхтачкаю тварогу, каб яны былі тлусьцейшыя. Сама дык яна любіла іх болей з макам, а я—тварогам, дык я нават неяк набіў яе за гэта, што яна не хацела перапусьціць... Так ня ўмеў я шанаваць свайго сямейнага шчасьця!..

Балун перадыхнуў, цмокнуў, аблізаўся і сказаў сумна і мякка:

— А ведаеш, таварыш, мой дарагі, што цяпер, калі ўсё гэта так далёка, мне часамі здаецца, што жонка мая казала праўду—што яны лепей з макам! Тады-дык мне ўсё не падабалася, што мак трапляў у мяне паміж зубоў, а цяпер мне думаецца: эх, каб ён туды трапіў. У мяне з жонкаю часта здараліся буйныя сваркі. Колькі разоў ёй даводзілася плакаць, калі я патрабаваў, каб яна палажыла ў кілбасы-вантрабянкі як мага больш маёрану, і пры тым я заўсёды пачынаў біцца. Аднойчы я няшчасьніцу так урэзаў, што яна дзён два пракачалася, за тое, што яна не хацела зарэзаць мне на вячэру індычку, а знаходзіла, што з мяне і курыцы даволі... Ах, таварыш дарагі,— захныкаў Балун,—каб мне цяпер вантрабянкі з маёранам ды

курачку!.. А ты любіш подліўку з кропу? Колькі ў нас праз гэтую самую подліўку гвалту было—жах! Ну, а цяпер-бы я не пачаў піць, як каву.

У гэтых гутарках Балун вусім забыўся пра ўяўную небясьпеку, што як быццам-бы абкружыла яго, і ўжо спускаючыся ў начной цішыні ў Ліскавіцы пачаў бесьперастанку пералічваць Швэйку, што ўсё ён раней ня ўмеў шанаваць і чаго-б яму хацелася-б цяпер зьесьці, да таго хацелася, што аж на сьлёзы хіліць...

Ззаду іх ішлі каптэнармус Ванэк і тэлефоніст Хадынскі. Хадынскі тлумачыў Ванэку, што на яго погляд сусьветная вайна зьяўляецца найвялікшаю бязглуздзіцаю. Самае благое ў ёй тое, што калі дзе-небудзь парвуцца правады, даводзіцца правіць іх уначы. Але яшчэ горай тое, што вораг з дапамогаю сваіх прожэктароў адразу-ж выяўляе тэлефоністаў пры гэтай праклятай паправе, і ўся артылерыя пачынае шпарыць па іх. У ранейшых войнах ня было хоць гэтых няшчасных прожэктараў.

У вёсцы, дзе трэ' было падрыхтаваць месца на начлег усяе роты, было цёмна—хоць вока выпары! З усіх бакоў забрахалі сабакі і гэта прымусіла нашых малайцоў спыніцца і падумаць, як ім управіцца з гэтымі подлымі стварэньнямі.

— А ці не пайсьці нам лепей назад?—прашаптаў Балун.

— Эх, Балун, Балун, каб мы гэта зрабілі, цябе-б расстралялі за баязьлівасьць,—абазваўся Швэйк.

Сабакі брахалі ўсё настойлівей і да іх далучыліся пад канец нават сабакі з другіх вёсак, бо Швэйк пачаў раўсьці сярод ночнае цішыні:

— Сьціхні!.. Куш!..

Зусім як у тыя часы, калі ён гандляваў яшчэ сабакамі!

Але сабакі заліваліся яшчэ горш, так што каптэнармус Ванэк сказаў Швэйку:

— Кіньце крычаць на сабак, Швэйк, а то, чаго добрага, ўся Галіцыя брахаць пачне.

— Падобная да гэтай гісторыя,—сказаў на гэта Швэйк,—здарылася з намі на манэўрах у раёне Габара. Прышлі мы тады

ўначы ў адну вёску, а сабакі брэшуць, аж канчаюцца. Мясцовасьць там густа населеная, так што гэты брэх перадаваўся з вёскі ў вёску, усё далей і далей, а сабакі з нашае вёскі, дзе мы атаўбаваліся, толькі пачнуць крыху аціхаць, як пачуюць здалёк брэх, скажам, з Пільгрыму, дык і заліюцца ізноў. І праз якую-небудзь хвіліну брахаў увесь Габар, Пільгрым, Будвэйс, Гумполен, Тржэбон і Іглава. Наш капітан, такі нэрвовы пан, страшэнна ня любіў сабачага брэху. Усю ноч ён ня мог заснуць, а ўсё прыходзіў і пытаўся вартавых: «Хто брэша, чаму брэша?» Салдаты адказваюць, што так точна—сабакі брэшуць, а гэта яго так раззлавала, што тыя, якія былі тады на варце, усе засталіся без адпачынку, калі вярнуліся з манэўраў. Пасьля гэтага выпадку ён заўсёды пачаў прызначаць «сабачую каманду» і пасылаць яе ўперад. Гэта рабілася на тое, каб папярэдзіць насельніцтва тых пунктаў, дзе мы спыняліся на начлег, што калі ўначы каторы сабака забрэша, дык яго зараз-жа расстраляюць. Мне таксама давялося пабыць у гэтакай камандзе, і калі мы прышлі неяк у адну вёску пад Мюльгаўзэнам каля Табару, я крышачку пераблытаў і сказаў старасту, што кожны ўласьнік сабакі, якая забрэша ўначы, будзе згодна стратэгічных меркаваньняў расстраляны. Староста, вядома, перапалохаўся, загадаў запрагаць ды паскакаў на зламаньне шыі ў штаб прасіць зьлітавацца над вёскаю. Туды, у штаб, яго наогул ня пусьцілі, траха вартавы яго з вінтоўкі ня ўпэйкаў, так што ён засыпяшаўся вярнуцца назад, і раней, як мы пасьпелі ўвайсьці ў вёску, усе гаспадары заматалі згодна ягонай парадзе сваім сабакам морды вяроўкамі, так што тры штукі нават ускруціліся.

Яны ўвайшлі ў вёску пасьля таго, як Швэйк упэўняў іх, што ў цемнаце сабакі баяцца агенчыку з цапяросіны. На ліха, ніводзін з іх ня курыў папярос, так што ягоная парада ня дала дадатных вынікаў. Але затое высьветлілася, што сабакі брахалі ад радасьці, бо яны з заміламаньнем згадвалі салдатаў, што праходзілі тут, пакідаючы ім якую-небудзь ежу.

Яны ўжо здалёк чулі, што набліжаюцца істоты, якія пакідаюць пасьля сябе косткі ды конскія трупы...

Раптам выскачыўшы, як быццам з-пад зямлі, Швэйка абкружылі чатыры сабакі і з паднятымі хвастамі пачалі ласкава напіраць на яго. Швэйк пагладзіў і патрапаў іх, размаўляючы з імі ў цемнаце, як з дзецымі.

— Ну так, ну так, мы ўжо тут, мы прышлі да вас паспаць ды пад'есьці, а вам дамо смачных костачак ды скарынак, а раненька ізноў рушым далей на ворага.

У халупах пазапальваліся агеньчыкі, а калі нашы ўдалыя ваякі пастукаліся ў бліжэйшую халупу, каб запытаць, дзе жыве стараста, адтуль пачуўся прарэзьлівы піскьлявы голас нейкае жанчыны, якая ці то па-польску, ці то па-русінску растлумачыла, што яе мужыка забралі на вайну, дзецi хворыя на воспу, маскалі ўсё ўжо забралі, а яе муж, адыходзячы на вайну, забараніў ёй адчыняць уначы каму-б ні прыпала. І толькі калі ўсе чацьвёра ізноў усе забарабанілі ў дзьверы, упэўняючы, што гэта—свае, кватэр'еры, яны былі адчынены нейчаю нявідушчаю рукою. Калі яны ўвайшлі, высьветлілася, што тут якраз і жыве стараста, які марна тужыўся пераканаць Швэйка, што гэта ня ён сам гаварыў піскьлявым бабскім голасам. Ён бажыўся і прысягаўся, што спаў у таку на сене, а жонка яго спрасонку, сама ня ведае, што гаворыць, калі яе зьнячэўку пабудзяць. Што-ж датычыць начлегу для цэлае роты, дык вёсачка такая малая, што ў ёй нельга зьмясьціць нават і аднаго салдата. Наогул месц спаць няма. Купіць тут таксама нічога нельга, бо маскалі ўсё рэквізавалі.

Калі паны дабрадзеі згодны, ён, бач, завядзе іх у Кросіенку, там двары вялікія і хады будзе—тры чвэрткі гадзіны, ня болей. А месца там—колькі хочаш, кожны салдат можа накрыцца аўчынаю і кароў там столькі, што ўсім салдатам будзе па збанку малака, дый вада там добрая, а паны афіцэры могуць падначаваць у маёнтку. А тут у Ліскавіцах што? Адна толькі гразь ды вошы! Вось у яго, у старосты ў самога, было пяць кароў, ды ўсіх маскалі пазабіралі, дык цяпер яму самому даводзіцца хадзіць па малако для сваіх хворых у Кросіенку.

Як быццам на сьцьвярджэньне ягоных слоў поруч у хляве замукала карова, і чуваць было, як жаночы голас прабаваў супакоіць жывёліну, прыгаворваючы: «Халеру табе ў бок!».

Але старасту гэта не зьбянтэжыла. Нацягваючы боты, ён гаварыў:

— Адна-адненькая кароўка засталася ў Бойчыка, у суседа, і яна гэта зараз і раўла, паны дабрадзеі. Зусім хворая псаваная жывёліна. Маскалі адабралі ў яе цялятка. Ад таго часу ў яе малако і згінула, але гаспадару шкада яе зарэзаць, бо ён мяркуе, што прасьвятая багародзіца ўсё паставіць на лепшае.

Гаворачы гэта ён апранаў ужо кажух.

— Дый трох чвэртак гадзіны да Крозіенкі ня будзе, паны дабрадзеі. Зблытаў я, прызнацца, час. Паўгадзіны—толькі ўсяго і дарогі будзе. Я адну дарогу ведаю праз ручаіну, а пасьля бярозавым гаем, паўз стары дуб... А вёска, яна вялікая, і гарэлкі там—колькі душа прымае...

Хадзем, паны дабрадзеі. Чаго дарма марудзіць? Паны афіцэры вашага адважнага палка заслужылі на тое, каб добра адпачыць, бо адважнаму аўстрыйскаму салдату, які б'ецца з маскалямі, трэба даць чыстае і выгоднае месца... А ў нас што? Вошы, кароста, воспа, халера... Вось якраз яшчэ ўчора ў нас у гэтай праклятай вёсцы трох хлопцаў ад халеры сконччыла... Пракляў бог літасьцівы нашыя Ліскавіцы!...

У гэтую хвіліну Швэйк велічна матнуў рукою.

— Паны дабрадзеі,—сказаў ён, перакрыўляючы старастave інтонацыі,—давялося мне неяк у аднэй кніжцы прачытаць, як адбрахаўся адзін староста ў Швэдзкую вайну, калі прышоў загад спыніцца на кватэрах у такой вось вёсцы. Адным словаме, ён не захацеў дапамагчы і яго падвесілі на бліжэйшым дрэве. А сягоньня ў Санку адзін капрал, паляк, растлумачыў мне, што староста, калі зьяўляюцца кватэр'еры, абавязан склікаць дзесяцкіх, а пасьля ідзеш з імі ад халупы да халупы і проста гаворыш:

«Сюды вось траіх, а сюды чацьвёра, а ў папоўскім доме будуць спаць паны афіцэры і каб праз паўгадзіны ўсё было эроблена!».

— Пане дабрадзею,—сур'ёзна зьвярнуўся Швэйк да старасты,—дзе ў цябе тутака бліжэйшае дрэва?

Староста не зразумеў, што значыць слова «дрэва», з гэтай прычыны Швэйк растлумачыў яму, што гэта можа быць бя-

роза, дуб, ігруша, ябльшя, адным словам—усё, дзе ёсьць хоць адзін моцны сук. Стараста ізноў не зразумеў, а калі прачуў пра садовыя дрэвы, дык спалохаўся, бо вішні пасьпелі ўжо, і сказаў, што пра гэта яму нічога невядома, а што сапраўды ёсьць перад хатаю толькі адзін дубок.

— Добра,—сказаў Швэйк, зрабіўшы рукою інтэрнацыянальны знак павешаньня,—так і быць, мы павесім цябе тут, перад тваёю халупаю, каб ты ведаў, што цяпер час ваенны і што нам загадана пераначаваць тут, а ня ў нейкай Крозіенцы. Не, брат, жартуеш! Нашыя стратэгічныя пляны зьнячыць табе ня ўдасца, а павесіць цябе давядзецца, як было апісана ў кніжцы пра швэдзкія войны... Вось, ведаеце, браткі, быў гэткі-ж выпадак на манэўрах пад Стара...

Але тут Швэйка перапыніў каптэнармус Ванэк:

— Гэта вы нам калі-небудзь другім разам раскажаце, Швэйк,—сказаў ён і, зварочваючыся да старасты, рашуча прамовіў:—Ну, а цяпер—трывогу і кватэра!

Стараста пачаў дрыжаць, як асінавы ліст, і, заікаючыся, упэўняць, што ён, бач, хацеў толькі зрабіць лепей паном дабрадзеям, але калі ўжо нельга іначай, у вёсцы, можа, і знойдзецца што-небудзь ніштаватае, каб паны засталіся здаволены, і што ён зараз прынясе ліхтар.

Калі ён вышаў з пакойчыку, што быў слаба асьветлены аднэю лампадкаю перад іконаю нейкага сьвятога, падобнага да страшнога калекі, Хадынскі раптам крыкнуў:

— А дзе-ж падзеўся Балун?

Але не пасьпелі яны як належыць агледзецца, як дзьверы за печчу, што вялі ў нейкі цёмны куток, асьцярожна адчыніліся, і Балун праціснуўся ў пакойчык. Упэўніўшыся, што стараста вышаў, ён сказаў, як быццам у яго быў страшэнны катар:

— Я пабыў у каморы, у нешта ўехаў рукою і набіў ім сабе повен рот, а цяпер у мяне ўвесь рот заляпіла. Нешта несалонае і несалодкае, накшталт цеста.

Каптэнармус пасьвяціў на яго электрычным ліхтарыкам, і ўсе маглі пераканацца, што яшчэ ніколі ў жыцьці ня бачылі такога выквацанага аўстрыйскага салдата. А пасьля спалоха-

ліся, калі заўважылі, што Балунава дзяжурка так раздалася, быццам ён быў на апошнім месяцы цяжарнасьці.

— Што з табою здарылася, Балун?—спагадна запытаў Швэйк, тыцкаючы пальцам у яго апушанае чэрава.

— Гэта гуркі,—прахрыпеў Балун, давячыся цестам, якое не праходзіла ні туды, ні сюды,—квашаныя гуркі. Тры штукі я зьеў, а рэшту прынёс вам.

І Балун пачаў даставаць штуку за штукаю гуркі ў сябе з-за пазухі.

На парозе зьявіўся стараста з ліхтаром; убачыўшы гэтую сцэну, ён перахрысьціўся і зарумзаў:

— Маскалі рэквізавалі, а цяпер і свае яшчэ таксама рэквізуюць.

Усе рушыліся па вёсцы ў суправаджэньні цэлай зграі сабак, якія ўсё ўпарцей круціліся каля Балуна і прагна абнюхівалі яго-ныя кішэні, дзе ён схаваў кавалак сала, якое ён таксама ўкраў з каморы, але ад свае пражорлівасьці па-здрадніцку затаіў ад сяброў.

— Чаго гэта каля цябе гэтак сабакі ўвіхаюцца?—запытаў яго Швэйк.

— Яны чуюць ва мне добрага чалавека,—пасьля доўгага разважаньня адказаў Балун.

Але ён не казаў, што прытрымліваў аднэю рукою ў кішэні кавалак сала і што адзін сабака ўвесь час мерыўся схапіць зубамі гэтую самую руку...

Пасьля абходу халуп, каб заняць іх пад кватэры, было высьветлена, што Ліскавіцы даволі вялікая вёска, хоць якая і належным чынам пацярпела ад вайны. Праўда, яна не пацярпела ні ад пажараў, ні ад бомбардаваньня, бо абодва варожыя бакі праз нейкі цуд не ўцягнулі яе ў сфэру сваіх непасрэдных вайсковых опэрацый, але затое тут сабралася насельніцтва суседніх зьнішчаных вёсак: Хырава, Грабава і Галублі.

У дзе-якіх халупах скучылася ў страшэннай цясноце і беднасьці па восем сямей. Гэта быў іх апошні прыпынак пасьля ўсіх жахаў, якія яны перажылі ў віры вайны, цэлая эпоха якое адбушавала над іхнымі галовамі, быццам нястрымныя струмені падчас паводкі.

Частка роты павінна была зьмясьціцца ў маленькім разбураным бровары, каля самае ваколіцы, дзе палавіну разьдзелу льга было зьмясьціць у брадзільным аддзяленьні. Астатніх разьвялі па дзесяць чалавек па некаторых багацейшых хатках, дзе гаспадары адмаўляліся пусьціць да сябе абрабаваных і зьбяднелых бежанцаў з суседніх вёсак.

Штаб з усімі афіцэрамі, а таксама каптэнармусам Ванэкам, афіцэрскімі дзяншчыкамі, тэлефоністамі, санітарамі, кашаварамі і Швэйкам быў зьмешчаны ў папоўскім доме, бо поп дагэтуль таксама ня прыняў ніводнага бежанца, так што там месца хапала.

Поп быў высокі, хударлявы ў лінялай выцьвілай расе. Ён быў такі скупы, што амаль нічога ня еў. Бацька выхаваў у ім фанатычную нянавісьць да расійцаў, але яна ў ім раптам зьнікла, калі расійцы адступілі і зьявіліся аўстрыйскія войскі, якія паелі ў яго ўсіх курэй і гусей, што засталіся незачэпленыя, пакуль у яго доме стаялі некалькі калматых забайкальскіх казакаў. Пасьля, калі ў вёску прышлі вэнгерцы і адабралі ў яго ўвесь мёд з вульляў, яго злосьць супроць аўстрыйскае арміі ўзрасла яшчэ болей. А цяпер ён з нянавісьцю глядзеў на сваіх няпрошаных кватарантаў, і яму давала выразнае здавальненьне праходзіць і, паціскаючы плячыма, паўтараць:

— У мяне нічога няма. Я—жабрак. У мяне вы ня знойдзеце кавалачка хлеба, панове.

Больш за ўсіх засмуціла гэта Балуна, які ледзь ня плакаў ад жаласьці. У марах яго неадступна кружылася няхвыразнае ўяўленьне пра нейкае парася, ружовая шкурачка якога была апэтытна падрумянена і прыемна хрумчала па зубах. І вось ён сядзеў у марах у папоўскай кухні, куды час-ад-часу заглядваў даўгальгі маладзы хлапец, які служыў у папа і за парабка і за кухарку і атрымаў ад яго суровы загад усюды паглядаць, каб ня кралі.

І сапраўды, нават Балун нічога не знайшоў у кухні, апрача крыхі загорнутага ў паперку кмену, які ён зараз-жа ўсыпаў сабе ў рот і пах якога выклікаў у ім галюцынацыю пра парася.

На двары маленькага бровару, што за папоўскім домам, палаў агонь пад катламі, вада кіпела, а ў вадзе нічога ня кіпела.

Каптэнармус і кашавары ababегалі ўсю вёску, шукаючы якую-небудзь сьвіньню, але дарэмна! Усюды быў адзін адказ: «Маскалі паелі усё ці забралі з сабою».

Яны пабудзілі і яўрэя-карчмара, які пачаў рваць на сабе пэйсы і горка скардзіцца, што ня можа паслужыць паном салдатам. Нарэшце ён угаварыў іх купіць у яго старую, траха не стагадовую карову, худую, як сьмерць—косьці ды скура. Ён патрабаваў за яе шалёныя грошы, церабіў сваю бараду і ўпэўняў, што гэткае каровы не знайсьці ва ўсёй Галіцыі, ва ўсёй Аўстрыі і Нямеччыне, ва ўсёй Эўропе і нават ва ўсім сьвеце. Пры гэтым ён румзаў, плакаў і бажыўся, што гэта самая тлустая карова, якая калі-небудзь з ласкі Яговы існавала на белым сьвеце. Ён прысягаўся ўсімі патрыярхамі, што паглядзець на гэтую карову прыходзілі людзі з-пад самага Залачыска, што пра гэтую карову гавораць ва ўсёй акрузе, як пра нейкі цуд і што гэта нават і не карова, а сапраўдны буйвал. Калі і гэта яшчэ не дапамагло, ён кінуўся перад каптэнармусам і ягонымі таварышамі на калені і, абнімаючы іх па чарзе за ногі, з пафосам выгукнуў:

— Ужо лепей забіце старога, беднага яўрэя, але ня ідзеце без каровы.

Ён да такой ступені спанталычыў усіх сваім гармідарам, што яны сапраўды купілі гэтае пудзіла, ад якога-б з агідаю адвярнуўся—кожны мясьнік, і пацягнулі яе да катлоў. А пасьля, калі грошы былі даўно ўжо ў карчмаровай кішэні, ён пачаў плакаць, скогліць, што яго зусім абабралі, што ён сам сябе зрабіў жабраком, бо прадаў ім такую цудоўную карову так танна. Ён нават прасіў іх павесіць яго за тое, што ён на старасьці год зрабіў такое глупства, ад якога перавернуцца ў трунах ягоныя продкі.

Пакланіўшыся ім яшчэ да зямлі, ён раптам скінуў з сябе ўвесь смутак і жаль і пабег дамоў, дзе сказаў жонцы:

«Сарачка, салдаты—дурні, а твой Натанчык—дужа разумны.

З кароваю было шмат клопату. Часамі здавалася, што з яе наогул нематчыма садраць скуру. Некалькі разоў скура рвалася,

і тады пад ёю выступалі жылы, цьвёрдыя, як вузлы карабельнае ліны.

Тымчасам аднекуль прыцягнулі мех бульбы і пачалі бяз жаднае надзеі на посьпех варыць гэтыя жылы і косьці, а поруч, за маленькаю кухняю кашавар з сапраўдным адчаем тужыўся прыгатаваць кавалак гэтага «шкілета» на афіцэрскі стол.

Няшчасная карова, калі наогул гэтую гульню прыроды льга было назваць кароваю, надоўга далася ў памяць усім удзельнікам гэтага банкету, і можна з усёй верагоднасьцю меркаваць, што калі-б перад боем пры Сокалі командзіры напамянулі людзям пра карову, якою кармілі іх у Ліскавіцах, яны-б з зацятым галасам кінуліся на ворага ў штыхі.

Карова гэтая была такая подлая жывёліна, што з яе ніяк нельга было зварыць крупнік. Чым больш кіпела мяса, тым мацней яно трымалася на костках: яно як быццам зраслося з імі ў адно цэлае і адзеравянела, быццам бюрократ, які ўсё жыцьцё сваё прасядзеў у сваёй канцылярыі і харчаваўся толькі паперкамі.

Швэйк, які падтрымліваў, як ордынарац, сталую сувязь між штабам і кухняю, каб быць у курсе, калі-ж нарэшце дадуць есьці,—далажыў нарэшце паручыку Лукашу:

— Дык вось, пане паручык, цяпер з яе атрымалася парцаляна. У каровы ў гэтае такое жорсткае мяса, што ім хоць шкло рэж. Кашавар Паўлічак, калі каштаваў з Балуном, ці зварылася, зламаў сабе пярэдні зуб, а Балун—кутні.

Балун забянтэжана падышоў да паручыка Лукаша, падаў яму загорнуты ў «Лурдзкі гімн» кутні зуб і, заікаючыся, сказаў:

— Дазвольце далажыць, пане паручык, што я зрабіў усё, што толькі падолеў. Дык вось зуб я зламаў на афіцэрскай страве, калі мы каштавалі, ці ня можна з гэтага мяса ўсё-такі прыгатаваць біфштэксы.

Пры гэтых словах з крэсла, што стаяла каля вакна, паднялася нейчая сумная постаць. Гэта быў падпаручык Дуб, якога прывезьлі сюды, як зусім зьнядужалага, на санітарнай двуколцы.

— Прашу цішэй,—прамовіў ён ледзь чутка,—мне блага!

Ён зноў сеў у старое крэсла, у кожнай зборцы і шчылінцы якога былі адкладзены тысячы блышыных яечак.

— Я змарыўся,—сказаў ён трагічным голасам,—я хворы і нядужы і прашу, каб пры мне не гаварылі пра зламаныя зубы. Мой адрас: Сімхаў, Кралева вуліца, 18. Калі мне ня суджана дажыць да раніцы, я прашу асьцярожна паведаміць пра маю сьмерць і не забыцца напісаць на маёй магіле, што да вайны я быў старэйшы выкладчык гімназіі.

Ён пачаў ціхенька храпці і ўжо ня чуў, як Швэйк прачытаў некалькі радкоў з адправы па нябожчыках.

Распусьніцы ты нейкай, божа, дараваў,
Рабаўніка ты на крыжы благаслаўляў,—
Дай зьлітаваньне і нам, рабам тваім пакорным...

Усьлед за гэтым каптэнармус Ванэк высьветліў, што няшчасная карова павінна гатавацца яшчэ гадзіны з дзьве ў афіцэрскім катле, што пра біфштэксы і думаць няма чаго і што замест біфштэксаў будзе падрыхтаваны гуляш.

Апрача гэтага было вырашана, што людзі пакладуцца спаць да раздачы стравы, бо вячэра ўсё адно зварыцца на раніцу.

Каптэнармус Ванэк прыцягнуў аднекуль вязку сена, падаслаў яе ў сталовым пакоі папоўскага дому пад сябе, нэрвова падкруціў вусы і ціхенька сказаў паручыку Лукашу, што ляжаў якраз над ім на старой скураной канапе:

— Дайце веры, пане паручык, што я такое ялаўчыны за ўсё жыцьцё ніколі ня еў...

У кухні сядзеў перад запаленым недагаркам царкоўнае сьвечкі тэлефоніст Хадынскі і нарыхтоўваў лісты, каб не задаваць сабе працы пасьля, калі ў батальёна будзе нарэшце нумар свае палявое пошты.

Ён пісаў:

«Дарагая, улюбёная жонка, любая Божэна. Зараз ноч і я ўсё думаю пра цябе, як і ты думаеш пра мяне, калі глядзіш на пусты ложак поруч з табою. І ты павінна мне даравацъ, калі пры гэтым мне лезуць у галаву розныя думкі. Табе добра вядома, што ўжо ад самага пачатку

вайны я прызваны ў войска і што я рознай рознасьці наслухаўся ад таварышоў, якія былі паранены, накіраваны дамоў на папраўку і, трапіўшы дамоў, лепей хацелі-б бачыць сябе ў магіле, як пераканацца, што які-небудзь паршук цягаецца за іхнаю жонкаю. Мне дужа цяжка пісаць табе пра гэта, дарагая Божэна. Я-б і ня пісаў-бы, але ты сама дужа добра помніш, як ты мне прызналася, што я ня першы, хто быў «сур'ёзна» знаёмы з табою, і што яшчэ да мяне цябе меў пан Крацэ з Мікалаеўскай вуліцы. І вось цяпер, калі я ў гэтую ноч уяўляю сабе, як гэтае страшыдла, карыстаючыся з мае адсутнасьці, можа заявіць табе якія-колечы прэтэнзіі, дык мне здаецца, дарагая Божэна, што я мог-бы задушыць яго на месцы. Я доўга цярпеў, але калі я ўяўляю сабе, што ён можа ізноў пачаць залёты да цябе, сэрца ў мяне сьціскаецца і толькі на адно хачу зьвярнуць тваю ўвагу, што я ня ўтрываю каля сябе гэткае сьвіньні, якая рада швэндацца з кожным і ганьбіць маё добрае імя. Даруй мне, дарагая Божэна, мае жорсткія словы, але сьцеражыся, каб я не даведаўся пра цябе чаго-небудзь благога! Бо іначай я быў-бы прымушаны забіць вас абоіх, бо чалавек я заўзяты і на ўсё гатовы, нават каб гэта каштавала мне жыцьця. Тысячу разоў цалую цябе. Прывітаньне бацьку і маці.

Твой Тонуш.

P. S. Глядзі не забывайся, што ты носіш маё прозьвішча.

А вось і другі ліст у запас:

Незраўнаная мая Божэна! Калі ты атрымаеш гэтыя радкі, дык ведай, што ў нас кагадзе скончыўся вялікі бой у якім вайсковае шчасьце схілілася на наш бок. Тымчасам, мы зьбілі дзесяць варагавых самалётаў, разам з адным таўстым генэралам з вялікаю барадаўкаю на носе. У самай жарыні бою, калі пад намі ўсё выбухалі шрапнэлі, я ўсё толькі думаў пра цябе, дарагая мая Бо-

жэна, што ты парабляеш, як жывеш і што новенькага ў хаце. І ведаеш я ўсё згадваю, як мы з табою былі ў рэсторане «Тамаш» і як ты вяла мяне дамоў, а назаўтра ў цябе балела рука ад напружаньня. Зараз мы рушым далей, наступаем, дык у мяне нехапае часу скончыць гэты ліст. Спадзяюся, што ты засталася вернаю мне, бо добра ведаеш, што ў гэтых адносінах я з сабою жартаваць не дазволю. Але пара выступаць, ужо трубяць збор! Цалую цябе тысячу разоў, дарагая мая жонка, і спадзяюся, што ўсё будзе добра.

Шчыра кахаю цябе. Твой Тонуш.

Тэлефоніст Хадынскі палажыў галаву на ліст і так заснуў на стале. Поп, які ня спаў, а бязупынна хадзіў па ўсім доме, адчыніў кухонныя дзьверы і для экономіі патушыў недагарак поруч з галавою Хадынскага. У сталовай ня спаў ніхто, апрача падпаручыка Дуба. Каптэнармус Ванэк уважліва вывучаў новы загад пра харчаваньне войска, які ён атрымаў у Санку ў канцылярыі брыгады і пераканаўся, што, уласна кажучы, салдатам тым больш зьмяншалі пайку, чым бліжэй падыходзілі да фронту. Пад канец ён ня мог утрымацца ад сьмеху пры чытаньні аднаго пункту загаду, у якім забаранялася ўжываць пры варцы крупніку ніжэйшым чыном шафран і імбір. У загадзе была таксама адна заўвага, згодна якое палявыя кухні абавязаны былі зьбіраць косткі і здаваць іх у тыл у дывізыйныя склады. Гэты пункт быў крыху нявыразны, таму што было незразумела, пра якія косткі ідзе гутарка: пра чалавечыя ці пра косткі іншае жывёлы, прызначанай на ўбой.

*

— Слухайце, Швэйк,—сказаў паручык Лукаш, пазяхаючы ад нуды,—пакуль яшчэ нам дадуць есьці, вы-б пасьпелі расказаць мне што-небудзь.

— Ой-ой,—адказаў Швэйк,—да таго, як нам дадуць есьці, пане паручык, я пасьпеў-бы расказаць вам усю гісторыю чэскага народу. Але я ведаю толькі адно дужа кароценькае апаведанейка пра нейкую поштмэйстэршу ў Сельчанах, якая была

прызначана за поштмэйстэршу там пасьля сьмерці яе мужа. Мне гэтая гісторыя адразу ўспомнілася, як я пачуў пра палявую пошту, хоць з палявою поштаю яна ня мае нічога агульнага.

— Швэйк,—перапыніў яго з канапы паручык Лукаш,—вы ўжо ізноў пачынаеце гаварыць глупства.

— Так точна, пане паручык, гэта сапраўды, дазвольце далажыць, страшэнна дурная гісторыя. Я і сам ня ведаю, як гэта я надумаўся загаварыць пра яе. Мусібыць ад прыроджанае дурнаты, ці так успомнілася, з маленства... Бо розныя-ж бываюць на сьвеце характары, пане паручык, і кухар Юрайда казаў праўду, калі, помніце, у Бруку ён, п'яны, праваліўся ў сарцір і не хацеў адтуль вылазіць, ды ячшчэ крычаў: «Чалавек мае прызначэньне ўсьвядоміць ісьціну, каб уладарыць, дзякуючы свайму розуму і заняць першае месца ў гармоніі вечнага сусьвету, заўсёды разьвівацца і дасканаліцца і пакрысе прасякнуць у вышэйшыя сфэры больш мудрага і поўнага любові сьвету». А калі мы хацелі яго адтуль выцягнуць, ён кусаўся і драпаўся. Бо ён думаў, што ён у сябе дома і толькі калі мы яго сапхнулі ізноў у равок, пачаў прасіцца, каб яго адтуль выцягнулі.

— Ну, а што-ж там было з поштмэйстэршаю?—губляючы цярплівасьць, выгукнуў паручык Лукаш.

— Гэта была дужа слаўная жанчына, пане паручык, і ўсё-ж такі сволач... Яна сумленна выконвала ўсе свае абавязкі на пошце, але ў яе быў адзін недахоп,—яна меркавала, што ўсе за ёю бегаюць, усе хочуць мець з ёю сувязь, а таму яна пасьля службы пісала на ўсіх даносы начальству, як трапіцца. Аднойчы пашла яна раніцою ў лес па грыбы. Праходзячы паўз школу, яна заўважыла, што настаўнік ўжо ўстаў. Ён запытаў яе, куды яна так рана выбралася; яна адказала, што па грыбы, і ён сказаў, што таксама пойдзе па грыбы. З гэтага яна ўжо зрабіла вывад, што ён з ёю, з гэткаю вось пачвараю, надумаўся зрабіць штосьці нядобрае, і вось, калі ўбачыла, што той выходзіць з кустоў, перапалохалася, уцякла і зараз-жа напісала заяву мясцоваму школьнаму савету, што настаўнік мерыўся яе згвалціць. Над настаўнікам было прызначана сьледзтва ў дысцыплі-

нарным парадку і каб не рабіць грамадзкага тармідару, разьбіраць гэтую справу прыехаў сам інспэктар народных школ, які запытаў жандарскага вахмістра, ці лічыць той настаўніка здольным на тэткі ўчынак. Жандарскі вахмістр зрабіў даведкі ў старых справах і заявіў, што гэта зусім немагчыма, бо гэтага самага настаўніка ўжо двойчы абвінавачваў поп, быццам той чапіўся да яго, папоўскае, нябогі, з якою заўсёды спаў сам поп, а настаўнік здабыў у акруговага доктара мэдычнае пасьведчаньне, што ён ужо шэсьць гадоў як хварэе на родавую нядужасьць, ад таго самага часу, як упаў з расстаўленымі нагамі з хлява на дышаль. Тады гэтая сволач, поштмэйстэрша, падала скаргу на жандарскага вахмістра і на інспэктара народных школ, быццам яны абодва атрымалі ад настаўніка хабар. Ну, тады ўжо яны абвінавацілі яе за абмову і за неправдзівы данос і яе прысудзілі да нейкага пакараньня. Але яна падала апэляцыю, спасылаючыся на тое, што была не ў сваім розуме. Яе агледзелі судовыя дактары і далі пасьведчаньне, што яна, сапраўды, не ў сваім розуме, але можа выконваць кожную дзяржаўную службу.

— Езус-Мар'я!—выгукнуў паручык Лукаш і дадаў:—Сказаў-бы я вам слоўца Швэйк, ды ня хочацца мне псаваць сабе апэтыт перад вячэраю.

— Я-ж дакладваў вам, пане паручык, — адпраўдваўся Швэйк,—што тое, што я хацеў вам расказаць, страшэнная дурната.

Паручык стомлена матнуў рукою і прамовіў:

— Ну, вядома! Дзе-ж ад вас пачуць што-небудзь разумнае!

— Ня ўсе могуць быць разумнымі, пане паручык,—перакохана сказаў Швэйк,—трэба, каб былі і дурныя, бо, каб усе былі разумныя, дык на сьвеце было-б столькі розуму, што людзі ад яго зусім-бы падурнелі. Дык вось дазвольце, пане паручык, далажыць, калі-б, напрыклад, кожны ведаў законы прыроды і ўмеў вылічаць нябесныя адлегласьці, дык ён толькі-б турбаваў сваіх суседзяў, як мой адзін знаёмы, ягонае прозьвішча Чапэк, які таксама часта прыходзіў у рэсторан «Поўная чаша», а падвыпіўшы, выходзіў з рэсторану на вуліцу, глядзеў

на зорнае неба, варочаўся назад і пачынаў хадзіць ад аднаго да другога ды зудзіць: «Ах, як цудоўна зьяе сёньня Юпітэр, а ты, невук, нават і ня ведаеш, што ў цябе над галавою! Вось гэта адлегласьці дык адлегласьці! Калі-б табою, гультаём, заладаваць гармату ды стрэліць, табе трэ' былі-б мільёны гадоў, каб даляцець да зоркі, хоць-бы ты ўвесь час ляцеў з хуткасьцю гарматнага ядра», і пад час гэтага ён рабіўся такі нахабны, што звычайна сам вылятаў з рэсторану з сярэдняю хуткасьцю трамвая, кілёмэтраў дзесяць за гадзіну, пане паручык... Ці ўзяць напрыклад, мурашак...

Паручык Лукаш сеў на канапу і малітоўна злажыў рукі.

— Я сам з сябе дзіўлюся,—сказаў ён,—што я ўсё яшчэ размаўляю з вамі, Швэйк,—бо я так даўно вас ведаю...

— Гэта справа прывычкі, пане паручык,—адказаў Швэйк, лагодна ківаючы галавою.—Гэта таму, што мы з вамі, пане паручык, ужо даўно знаёмы і даволі многа разам перажылі. Мы ўжо дзе-што разам каштавалі, і заўсёды гэтыя напасьці валіліся на нас, як сьнег на галаву. Дык вось гэта, дазвольце далажыць, пане паручык,—лёс! Тым, чым загадвае гасудар імпэратар, ён загадвае мудра. Яго воля была, каб мы былі разам, і я нічога іншага не жадаю, як толькі быць вам калі-небудзь асабліва карысным. Вам не хацелася-б чаго-небудзь зьесьці, пане паручык?

Паручык Лукаш, які пасьпеў ужо зноў разваліцца на старэнькай канапе, сказаў, што апошні швэйкаў сказ зьяўляецца найлепшым разьвязаньнем гэтае цяжкае гаворкі, і загадаў яму пайсьці даведацца, як ідзе справа наконт вячэры, бо, бяззумоўна, было-б дужа добра, каб Швэйк на час пашоў, і даў яму супакою, бо тая нісянетніца, якую даводзіцца выслухваць ад Швэйка, больш стамляе за форсаваны пераход з Санку. Яму, паручыку, дужа хацелася-б заснуць, але ён ніяк ня можа.

— Гэта ўсё праз блох, пане паручык,—абазваўся Швэйк.— Ёсьць такое старадаўняе паданьне, што блохі родзяцца ад папоў і вы нідзе ня знойдзеце столькі блох, як у папоўскім доме. У парафіі Кралёвіча поп Замосьціл напісаў цэлую кнігу пра блохі, якія поўзалі па ім нават пад час імшы...

— Ну, што я вам сказаў, Швэйк? Пойдзеце вы на кухню, ці не?—прыкрыкнуў на яго паручык Лукаш.

Швэйк пайшоў, і, як цень, выскачыў за ім на дыбачках Балун з свайго кутка.

*

Калі раніцою рота вышла з Ліскавіц на Старасол і Самбор, у кухонных катлох павезьлі і няшчасную карову, якая яшчэ не зварылася. Было вырашана дварыць і зьесьці яе дарогаю, калі ў палавіне адлегласьці між Ліскавіцамі і Старасолам будзе зроблены прывал. Перад выступленьнем людзей напаілі гарачаю чорнаю каваю.

Падпаручыка Дуба зноў узьнесьлі на санітарную двуколку, бо пасьля ўчарайшага яму зрабілася яшчэ горай.

Больш за ўсіх пакутваў праз гэта ягоны дзяншчык, якому ўзесь час даводзілася бегчы поруч з двуколкаю і якога падпаручык Дуб бесьперастанку дакараў за тое, што ён учора наогул не паклапаціўся пра свайго пана. Пагражаючы Кунэрту разьлічыцца з ім, калі прыдуць на месца, ён усё патрабаваў, каб яму падалі вады, а як толькі выпіваў яе, яна зараз-жа выходзіла ў яго назад.

— З каго... з чаго вы сьмеяцёся?—крычаў ён з двохколкі.— Я вам пакажу сьмяяцца! Ня думайце, што са мною льга жартаваць! Вы мяне яшчэ будзеце ведаць!

Паручык Лукаш ехаў конна, а Швэйк, робячы яму кампанію, крычаў так бадзёра, быццам ня мог дачакацца тае хвіліны, калі стрэнецца з ворагам. Пры гэтым ён расказваў:

— А вы, пане паручык, узялі на ўвагу, што некаторыя праміж нашых людзей, сапраўды, быццам мухі? Бо ў іх-жа на сьпіне і трыццаці кілё не нагружана, а яны ўжо гатовы і ногі выкруціць. Варта было-б прачытаць ім такія нотацыі, якія чытаў нам нябожчык паручык Буханэк, што застрэліўся праз задатак, які ён атрымаў на шлёб ад свайго будучага цесьця ды пракруціў з рознымі проститутками. Пасьля гэтага ён атрымаў ізноў гэтакі-ж самы задатак ад другога «будучага цесьця»; з гэтымі грашыма ён ўжо лепей гаспадарыў—ён іх паціхеньку прагуляў у карты, а з дзяўчатамі не займаўся. Але і гэтай сумы

хапіла не надоўга, так што яму давялося ўзяць за бакі трэцята «будучага цесьця» ды прымусіць і яго развязаць калітку. На гэтыя трэція грошы ён купіў сабе коняй: арабскага жарабца, мяшанае крыві...

Паручык Лукаш саскочыў з каня.

— Швэйк,—грозна прамовіў ён,—калі вы наважыцеся заікнуцца яшчэ пра чацьвёртыя задатак, я сапхну вас у канаву.

Ён зноў ускочыў на каня, а Швэйк сур'ёзна гаварыў далей:

— Ніяк нет, пане падпаручык, пра чацьверты задатак ня можа быць і гаворкі, бо ён застрэліўся пасьля трэцяга.

— Адразу-ж бы!—лягчэй уздыхнуў паручык Лукаш.

— Дык вось, каб не забыцца, пра што мы гаварылі,— вёў далей гаворку Швэйк.—На мой сьціплы погляд, варта было-б чытаць усёй камандзе такія-ж нотацыі, якія заўсёды чытаў нам паручык Буханэк, калі людзі падалі ўжо ад утомы. Ён камандаваў у гэтакіх выпадках: «Стой!», рабіў невялічкі прывал, зьбіраў нас вакол сябе, як квактуха сваіх куранят, і давай нас абіраць: «Ах вы, такія-гэтакія, вось вы нават і ацаніць ня ўмееце, што ідзеце па земнай кулі, бо вы—невукі, шэрыя боўдзілы, так што нават мутарна на вас глядзець. Вось каб вас прымусіў пахадзіць па сонечнай кулі, дзе чалавек, які на нашай плянэце важыць шэсьцьдзесят кілё, важыць больш за тысячу семсот кілё. От дзе-б вы адразу падохлі! Паглядзеў-бы я як вы пачалі-б маршыраваць, калі ў вас у ранцы было-б па дзьвесьці восемдзесят кілё, а стрэльба важыла-б нешта калі дваста пяцідзесяці кілё! Вы адразу-б закрахталі і павысалопліваЛі-б языкі, як загнаныя сабакі»! А паміж нас быў адзін няшчасны настаўнічак, дык той папрабаваў яму пярэчыць: «Дазвольце, пане паручык, сказаць, што на месяцы чалавек вагою на 60 кілё важыць толькі 13 кілё. На месяцы нам было-б лепей маршыраваць, бо там наш ранец важыў-бы ўсяго чатыры кілё. На месяцы мы-б лёталі, а не маршыравалі». «Гэта жахліва!—адказаў на гэта нябожчык пан паручык Буханэк.—Табе, як відаць, хочацца зарабіць па мордзе. Дык будзь здаволены, нягоднік, што я даю табе звычайную земную поўху, бо каб я табе даў месячную, дык ты пры сваёй лёгкай вазе паляцеў-бы дагары нагамі да самых Альпаў

ды там-бы і прыліп. А каб я табе даў сонечную, дык уся амуніцыя на табе зрабілася-б, як каша, а галава адляцела-б кудынебудзь у Афрыку».—

Дык вось пан паручык Буханэк даў яму звычайную земную поўху, і наш харахоня заплакаў, а мы пашлі сабе далей. І ўсю дарогу ён румзаў і плявузгаў пра некую чалавецкую годнасьць і што з ім абыходзяцца, як з сабакам. Пасьля гэтага пан паручык загадаў яму зьявіцца з рапартам і яго пасадзілі на пятнаццаць дзён. Яму заставалася служыць яшчэ паўтара месяцы, але ён да канца так і не даслужыў, бо ў яго была кіла, а яго прымусілі рабіць практыкаваньні на турніку. Ну, а ён гэтага ня вытрымаў і памёр, як сымулянт, у шпіталі.

— Гэта-ж сапраўды дзіўна, Швэйк,—сказаў паручык Лукаш,—што ў вас, як я вам не аднойчы ўжо тварыў, ёсьць звычка неяк асабліва зьневажаць годнасьць афіцэрскага складу.

— Ды чаму-ж?—шчыра зьдзівіўся Швэйк.—Я-ж толькі хацеў расказаць вам, пане паручык, як калісьці, бывалішнім часам, людзі самі сабе псавалі ўсю справу па вайсковай службе. Вось гэты чалавек, напрыклад, меркаваў, што ён адукаванейшы за пана паручыка і хацеў сваім месяцам пахіснуць ягоны аўторэтэт у вачох ягоных людзей, і калі зарабіў земную поўху, дык мы ўсе лягчэй уздыхнулі, і нікога гэта не засмуціла, а, наадварот, усе былі дужа здаволены, што пан паручык так дарэчы падкінуў са сваёю земнаю поўхаю. Гэта называецца выратаваць становішча! Трэба, каб чалавеку адразу прышла добрая думка, і тады ўсё ў парадку. Дык вось, дарэчы, пане паручык, у Празе, насупроць Кармэліцкага кляштару, нейкі пан Іенам меў за некалькі год перад гэтым гандаль трусамі ды іншымі птушкамі, і пачаў ён знаёмства з дачкою пераплётчыка Білека. Пану Білеку гэтае знаёмства штосьці не ўпадабался, і ён нават адкрыта, пры ўсіх, заяўляў у тракціры, што калі пан Іенам папросіць у яго рукі ягонае дачкі, ён у належным выглядзе скіне яго са сходаў. Пасьля гэтага пан Іенам выпіў для сьмеласьці і ўсё-такі пашоў да пана Білека, які спаткаў яго ў калідоры з вялікім нажом у руках, гэткімі нажамі пераплётчыкі робяць абрэзы, і выглядаюць гэтыя нажы дужа страшна. Пан Білек зароў на гасьця, пытаючыся, што яму тутака трэба, і вось у гэты момант пан Іенам не-

чакана пусьціў такога «шаптуна», што нават гадзіньнік на сьцяне спыніўся. Ну, пан Білек засьмяяўся і пачаў рассыпацца салодкімі слоўцамі: «Ах, калі ласка, проша, заходзьце, пане Іенам... калі ласка, сядайце... спадзяюся з вамі ня здарылася бяды... Бо я ўжо зусім ня гэткі злосны чалавек. Праўда, я хацеў быў скінуць вас са сходаў, але цяпер я бачу, што вы дужа прыемны пан і вялікі дзівак. Я, ведаеце, пераплётчык і перачытаў за свой век шмат аповесьцяй ды романаў, але ні ў адной кнізе мне не давялося чытаць, каб малады гэтак рэкомэнкаваўся свайму будучаму цесьцю і пры гэтым ён сьмяяўся да сьлёз і ўсё паўтараў, што ён вельмі, вельмі рад, і што яму здаецца, быццам яны ўжо сто год, як знаёмы, проста як родныя браты. Ён прынёс яму цыгару, паслаў па піва і сасіскі, паклікаў жонку і пазнаёміў яе з панам Іенам, расказаўшы пры гэтым з усімі дэталямі, з якім трэскам той зьявіўся перад ім. Жонка ягоная толькі плюнула ды пайшла. Тады ён паклікаў дачку і сказаў ёй: «Гэты пан вось пры гэтакіх абставінах прышоў прасіць, каб я аддаў цябе за яго замуж». Дачка пачала плакаць і сказала, што яна яго і знаць не жадае і бачыць ня хоча. Дык вось не засталося нічога іншага, як ім удваіх дапіць піва і даесьці сасіскі, а пасьля разысьціся па-добраму. Ды толькі пасьля гэтага выпадку ў пана Іенама была яшчэ няпрыемнасьць у тым тракціры, куды заўсёды хадзіў пан Білек, і нарэшце, пана Іенама ва ўсім квартале звалі няйначай, як «Іенам-шаптун», і ўсюдых расказвалі, як ён «выратаваў становішча»... Дык вось, пане паручык, дазвольце сказаць, чалавецкае жыцьцё гэта такая складаная рэч, што лёс аднаго чалавека ў параўнаньні з жыцьцём—проста нявартная рэч! Вось, напрыклад, да нас у рэсторан «Поўная чаша» на Божышце да вайны яшчэ прыходзіў адзін старэйшы паліцэйскі, пан Губічка ягонае прозьвішча, а таксама адзін рэпорцёр, які зьбіраў паламаныя ногі, задушаных людзей ды самагубцаў розных ды здаваў іх у газэту. Гэта быў такі вясёлы чалавек, што ён болей сядзеў у дзяжурным пакоі ва ўчастку, як у сябе ў рэдакцыі. Аднойчы ён падпаіў гэтага старэйшага паліцэйскага Губічку, і яны памяняліся вопраткаю, так што Губічка апынуўся ў штацкім, а пан рэпорцёр ператварыўся ў старэйшага паліцэйскага, толькі свой нумар прыкрыў і накі-

раваўся ў горад рабіць абход. Недалёка ад былое Вепухслававае ашчаднае касы ён стрэў начною парою старога пана ў цыліндры, які ішоў пад руку са старою паняю ў футры. Яны сьпяшаліся дамоў і не гаварылі ніводнага слова. Ён на іх рынуўся і зароў таму пану па вуха: «Чаго вы так крычыце? Ня крычаць, бо я вас арыштую!» Вы толькі ўявіце, як яны перапалохаліся, пане паручык! Дарэмна яны тлумачылі яму, што гэта, мусібыць, нейкае непаразуменьне, бо яны якраз варочаюцца з рауту ад намесьніка, што яны даехалі ў карэце да Нацыянальнага тэатру, а пасьля пашлі пехатою, каб крыху падыхаць паветрам, што яны жывуць тут поблізу і што ён старэйшы дарадца пры намесьніку, а пані—ягоная жонка. «Мяне вы не ашукаеце!—зноў зароў на яго пераапрануты рэпорцёр.—А толькі вам-жа павінна быць сорамна, калі вы сапраўды старэйшы дарадца пры намесьніку, а трымаеце сябе, як падшывалец. Я ўжо даўно за вамі сачу, як вы лупілі кійком у жалезныя жалюзі на ўсіх вокнах магазынаў каля якіх вы праходзілі, і пры гэтым вам дапамагала ваша, як вы кажаце, жонка».—«Але ў мяне, вы самі бачыце, нават і кійка няма. Гэта быў, можа быць, хто-небудзь іншы, але ня я».—«Дзіва што— запярэчыў пераапрануты рэпорцёр,— будзе ў вас кіёк, калі вы самі зламалі яго там за кутом аб няшчасную бабульку, якая ходзіць па тракцірах і піўніцах гандляваць смажанымі каштанамі і бульбаю. Гэта-ж я сам бачыў, на свае вочы бачыў!» Паня дык тая ўжо болей і плакаць ня ўздужала, а пан старэйшы дарадца пры намесьніку так расхваляваўся, што пачаў штосьці гаварыць пра чалавецкую подласьць, пасьля чаго наш рэпорцёр іх і забраў. Ён перадаў пару бліжэйшаму патрулю, а той завёў іх у раённы комісарыят за Зальмскай вуліцы. А сам пераапрануты рэпорцёр толькі загадаў, каб накіравалі туды, і заявіў, што ён з раённага комісарыяту на Гэнрыхавай вуліцы і што па службовых справах камандыраваны ў Вінаграды, што арыштаваў гэтую парачку за парушэньне грамадзкае цішыні і спакою і што, апрача гэтага, вось гэты пан дазволіў сабе абразіць яго словамі пры выкананьні службовых абавязкаў. Пасьля ён яшчэ дадаў, што яму неабходна па тэрміновай справе зайсьці спачатку ў комісарыят на Гэнрыхавай вуліцы, але што ён праз гадзіну зьявіцца ў комісарыят на Зальмскай вуліцы. Такім чынам патруль павёў

абоіх старых на Зальмскую вуліцу, і яны прасядзелі ў комісарыяце да раніцы, з хвіліны на хвіліну чакаючы «пана комісара», які тымчасам кружным шляхам вярнуўся ў «Поўную чашу», раскатурхаў старэйшага поліцэйскага Губічку і з усёю далікатнасьцю сказаў яму, што ў яго здарылася і якая з гэтага можа вырасьці буйная справа, калі ён ня будзе маўчаць...

Паручыка, здавалася, змарыла гэтае апавяданьне, але перш чым прышпорыць каня і выехаць к галаве колёны, ён сказаў Швэйку:

— Калі вы будзеце гаварыць вось так да вечраа, дык вашыя гісторыі будуць усё дурнейшыя і дурнейшыя.

— Пане паручык,—крыкнуў Швэйк, усьлед паручыку, які пусьціў свайго каня наўзавад,—няўжо вам ня цікава даведацца, чым гэта ўсё скончылася?

Але паручык Лукаш толькі яшчэ раз падагнаў каня. Стан паручыка Дуба пастолькі палепшыўся, што ён вылез з санітарнае двуколкі, сабраў вакол сябе ўсю канцылярыю роты ды пачаў, як праз сон, навучаць салдатаў. Ён зьвярнуўся да іх з надзвычай даўгою прамоваю, якая душыла іх сваім цяжарам болей за ранец і вінтоўку.

Гэта быў нейкі разгардзіяш рознастайных прытчаў.

— Любоў салдатаў да офіцэраў,—пачаў ён,—робіць магчымымі неверагодныя ахвяры, і ў гэтым увесь сэнс. Наадварот, калі такая любоў не зьяўляецца ў салдатаў прыроджанай, дык трэба выклікаць яе прымусова. У грамадзянскім жыцьці любоў з прымушэньня, скажам, напрыклад, любоў школьнага служкі да настаўніцкае колегіі, існуе да таго часу, пакуль існуе знадворная сіла, якая вымагае гэткае любові. Але на вайне мы бачым якраз адваротнае, бо афіцэр ня можа дазволіць салдату жаднага найменшага пасла бленьня таго пачуцьця любові, якое зьвязвае ніжэйшага чына са сваімі начальнікамі і гэтая любоў ня ёсьць якая-небудзь звычайная любоў, а ёсьць, уласна кажучы, павага, страх і дысцыпліна.

Швэйк увесь час крочыў па левую руку ад падпаручыка Дуба і, пакуль той прастарэкаваў, не пакідаў рабіць вочы направа, павярнуўшыся тварам да афіцэра.

Падпаручык Дуб спачатку гэтага не заўважыў і гаварыў далей:

— Гэтая дысцыпліна і абавязак слухацца—зразумелыя і непарушныя, бо дачыненьні паміж радавым салдатэм і афіцэрам зусім простыя: адзін слухаецца, другі загадвае. Мы даўно ўжо чыталі ў кнігах пра вайсковае мастацтва, што вайсковы лаконізм і вайсковая прастата зьяўляюцца менавіта тымі якасьцямі, да якіх павінен імкнуцца кожны ваяка, які любіць ці то ад свайго пабуджэньня ці з прымушэньня сваё начальства. Гэтае начальства павінна быць у ягоных вачох найбольш закончанаю, найболь выкрышталізаванаю рэччу зусім усталяванага і вызначанага валявога імпульсу.

Толькі цяпер падпаручык Дуб заўважыў, што Швэйк рабіў «вочы направа». Гэта расьцьвяліла яго. Яму зрабілася неяк не па сабе, бо ён да некаторай ступені і сам усьведамляў, што заблытаўся ў сваёй прамове і ніяк ня мог выбіцца на простую дарогу з гэтага лябірынту салдатавай любові да свайго начальства. Таму ён раскрычаўся на Швэйка.

— Ну, чаго ты ўтаропіўся на мяне, як баран на новыя вароты?

— Дык вось, дазвольце далажыць, пане падпаручык, згодна вашага-ж загаду. Вы самі неяк мелі ласку мне заўважыць, што я, як вы гаворыце, павінен «есьці вас вачыма». Ну, а з прычыны таго, што кожны салдат павінен выконваць усе загады свайго начальства і навек іх не забываць, дык я і ня мог іначай.

— Глядзі ў другі бок,—крыкнуў падпаручык Дуб,—толькі на мяне не адважвайся глядзець, ёлап! Ты-ж ведаеш, што я гэтага ня люблю, што я гэтага не магу стрываць... Вось я вазьмуся за цябе, тады пабачыш!

Швэйк зрабіў галавою паварот налева ды так і застыў у такім становішчы, крочачы поруч з падпаручыкам Дубам. Тот ізноў ня вытрымаў і зароў:

— Куды-ж ты гэта вочы ўтаропіў, калі я з табою гавару?

— Нікак нет, пане падпаручык, а толькі я згодна вашага загаду зрабіў «вочы налева».

— Ах ты, божухна, вось пакута з табою,—уздыхнуў падпаручык Дуб.—Глядзі проста перад сабою і думай сам пра сябе:

«я, бач, такі дурніца, што мяне і шкадаваць ня варта ў выпадку чаго»... Запомніў?

Швэйк пачаў глядзець проста і адказаў:

— Так точна, пане падпаручык, запомніў. А адказаць на гэта трэба?

— Што? Як ты адважыўся?—зароў на яго падпаручык Дуб.—Як ты са мною гаворыш? Што ты хочаш гэтым сказаць?

— Дык вось, пане падпаручык, дазвольце далажыць, што я ўспомніў ваш загад на аднэй станцыі, калі вы мне зрабілі заўвагу, што я наогул не павінен адказваць, калі вы канчаеце гаварыць.

— Значыцца, ты мяне баішся?—радасна запытаў падпаручык Дуб.—Але ты мяне яшчэ ня ведаеш. Перада мною дрыжалі і ня гэткія малойчыкі, як ты, так і ведай! Я ўпраўляўся з людзямі ямчэйшымі за цябе, а таму раджу табе не разважаць і трымацца ад мяне далей у хвасьце, каб я цябе ня бачыў!

Такім чынам Швэйк трапіў у самы хвост колёны, да санітараў, і дужа выгодна праехаў у двуколцы да бліжэйшага месца прывалу, дзе, нарэшце, людзям раздалі крупнік і мяса няшчаснае каровы.

— Гэтую карову трэ' было-б тыдні са два вымачыць у воцаце,—бурчэлі салдаты,—а калі ўжо нельга было вымачыць карову, дык хоць таго чалавека, які яе купіў.

Са штабу брыгады прыляцеў конны ордынарац з загадамі 11-й роце. Маршрут быў зьменены. Трэ' было ісьці на Вэльдштэйн, а Воральшч і Самбор павінны былі застацца па левую руку, бо раскватараваць там роту ня было жаднае магчымасьці, таму, што там сталі ўжо два пазнанскіх палкі.

Паручык Лукаш зараз-жа аддаў адпаведныя загады і загадаў каптэнармусу Ванэку і Швэйку падрыхтаваць кватэры для роты ў Фэльдштэйне.

— Ды, глядзеце, Швэйк, не надумайцеся ізноў нарабіць глупства!—папярэдзіў яго паручык Лукаш.—Галоўнае, трэба ветліва абыходзіцца з мясцовым насельніцтвам!

— Рады старацца, пане паручык! Праўда, мне прысьніўся сёньня нядобры сон, калі я пад раніцу крышку прыкархнуў.

Мне прысьнілася вялікае карыта з вадою, якое ўсю ноч цякло ў мяне ў калідоры ў доме, дзе я жыў, пакуль ня выцекла ўся вада, якая падмачыла столь у домаўласьніка, а той мне тае-ж раніцы і адмовіў ад кватэры. І, бач, якраз гэтакі-ж выпадак быў сапраўды ў нас у Карліне, зараз за рынкам...

— Дайце нам спакою з вашымі дурнымі гаворкамі, Швэйк. ды разгледзьце лепей з Ванэкам карту, каб ведаць, якою дарогаю ісьці. Дык вось тут вы бачыце ўсе гэтыя вёскі. Ад гэтае вёскі вы паварочваеце направа да рэчкі ды ідзеце ўздоўж рэчкі да наступнае вёскі, а адтуль, дзе першая ручаіна ўпадае ў рэчку, якая будзе ў вас на правую руку, вы пойдзеце прасёлкаваю дарогаю проста на поўнач, і такім парадкам вы нікуды ня здолееце трапіць, апрача як у Фэльдштэйн! Запомнілі, што я вам казаў?

Дык вось Швэйк накіраваўся з каптэнармусам Ванэкам у дарогу, згодна прызначанага ім маршруту.

Было на паўдні. Зямля цяжка дыхала ў распаленым паветры, і дрэнна засыпаныя брацкія магілы, дзе ляжалі салдацкія трупы, распаўсюджвалі страшэнны смурод. Швэйк і Ванэк дабраліся да мясцовасьці, дзе адбываліся баі пад час наступленьня на Перамышль і кулямётным агнём былі падкошаны цэлыя батальёны. У невялічкім ляску, каля рэчкі, навальнічны абстрэл артылерыі пакінуў страшэнныя сьляды. На вялікіх участках і на ўсіх спадах тырчалі замест дрэў адны пашчапаныя пні і гэтая пустэльня ва ўсіх кірунках была перакапана акопамі.

— Так, тут справа выглядае іначай, як у Празе!—сказаў Швэйк, каб парушыць цяжкае маўчаньне.

— А ў нас пачалі ўжо здымаць збожжа з поля,—абазваўся каптэнармус Ванэк.—У нас у Кралупе заўжды раней за ўсіх пачынаюць.

— Што-ж тут пасьля вайны будзе атрымлівацца добры ўраджай,—адказаў, крыху пачакаўшы Швэйк.—Тут ужо ня тр' будзе купляць касьцянное мукі, і селяніну гэта дужа выгодна, калі на яго полі згніе цэлы полк, бо гэта будзе добрае ўгнаеньне. Адно толькі мяне непакоіць: каб гэтыя сяляне ня далі сябе абдурыць і не прадалі гэтых салдацкіх касьцей за бесцань на касьцяны вугаль для цукраварань! У нас, у карлінскай казарме быў,

ведаеце, адзін паручык, Голуб ягонае прозьвішча, дык той быў такі вучоны, што ўсе нашыя хлопцы лічылі яго за ідыёта, бо ён праз сваю вучонасьць не навучыўся абкладаць салдатаў рознымі нядобрымі слоўцамі, а на ўсё глядзеў толькі з навуковага пункту гледжаньня. Вось аднойчы яму нашыя салдацікі далажылі, што выданы ім хлеб нікуды ня варты, проста немагчыма есьці. Іншы афіцэр раззлаваўся-б за гэткую нахабнасьць, а ён—не, застаўся зусім спакойны, нікога не абазваў сьвіньнёю ні іншым якім словам, і нікому нават па мордзе не заехаў. Ён толькі склікаў усіх сваіх салдатаў і сказаў ім сваім прыемным голасам: «Перш за ўсё, салдаты, вы павінны зразумець, што казарма, гэта—не гастраномічны магазын, дзе-б вы здолелі выбраць сабе вэнджанага утра, сардзінкі ці што накшталт гэтага. Кожны салдат павінен быць настолькі сьвядомы, каб без разважаньняў есьці ўсё, што яму даюць, і настолькі быць прысякнутым дысцыплінаю, каб не меркаваць пра якасьць таго, што ён ёсьць. Вы сабе ўявіце, што ў нас выбухнула вайна. Дык вось таму полю, дзе вас закапаюць пасьля бою, будзе зусім усёроўна, якім казённым хлебам вы напакавалі сабе чэрава перад сьмерцю. Маці—сырая зямля раскладзе вас на састаўныя элемэнты і праглыне вас без астатку разам з ботамі. У сусьвеце нішто ня траціцца, і з вашых трупаў, салдаты, вырасьце новае жыта для салдацкага хлеба. Гэты хлеб будуць есьці новыя пакаленьні салдатаў, якія можа быць, таксама будуць чымсьці нездаволены і, пойдуць скардзіцца і нарвуцца на гэткага, які пасадзіць іх куды трэба і надоўга, бо ён мае на гэта поўнае права. Ну вось, браткі, я цяпер вам усё ладком растлумачыў і спадзяюся, што мне больш ніколі не давядзецца вам нагадваць, што калі хто-небудзь на потым надумаецца скардзіцца, дык ён ужо ня гэтак хутка убачыць божы сьвет».

— Хоць-бы, ён прынамсі, аблаяў нас!—меркавалі пасьля між сабою нашыя салдаты, якія дужа крыўдзіліся на гэтыя далікатнасьці ў трыманьні пана паручыка. А пасьля яны неяк ня вытрымалі да выбралі мяне ад усяе роты, каб я сказаў нашаму паручыку, што яго ўсе дужа любяць, але які-ж гэта вайсковы чалавек, што ня лаецца! Ну, я пашоў да яго на кватэру і пачаў прасіць яго, каб ён адкінуў усякую боязьнь, што начальства па-

віна біць словамі, як рэменем, і што салдаты звыклі, каб ім нагадвалі кожны дзень, што яны сабакі сьмярдзючыя, сьвіньні і да т. п., бо іначай яны страцяць павагу да сваіх начальнікаў. Спачатку дык ён адмаўляўся і казаў нешта такое пра інтэлігентнасьць, і быццам у цяперашні век нельга ўжо болей служыць з-пад палкі, але ўрэшце даў сябе ўпэўніць, надаваў мне па мордзе і выкінуў за дзьверы, каб яго паважалі, і калі я далажыў нашым пра вынікі нашых перамаўленьняў, усе былі дужа рады, але ён ужо назаўтра сапсаваў ім гэтую радасьць. Ведаеце, ён пры ўсіх падыходзіць да мяне і кажа: «Швэйк, я ўчора крыху пагарачыўся, дык вось вам гульдэн, і выпіце за маё здароўе!» Так, з салдатамі трэба ўмець трымацца!..

Швэйк змоўк і азірнуўся навакол.

— Мне здаецца,—прамовіў ён, што мы ідзем ня тэю дарогаю. Бо пан паручык так нам добра растлумачыў: спачатку направа на гару і з гары, пасьля налева і ізноў направа, пасьля зноў налева... А мы ўвесь час ідзем проста. Ці мы ўсе гэтыя павароты зрабілі так, між іншым, у гаворках. Вось я якраз бачу перад сабою дзьве дарогі ў Фэльдштэйн. Я хацеў-бы прапанаваць зьвярнуць налева.

Але каптэнармус Ванэк—як гэта заўжды бывае, калі двое стаяць на раздарожжы—сьцьвярджаў, што трэба ісьці направа.

— Мая дарога,—сказаў яму на гэта Швэйк,—у кожным выпадку выгаднейшая за вашую. Я пайду ўздоўж ручаіны, дзе растуць незабудкі, а вы ў гэты час будзеце пячыся на сонцы. Я стаю на тым, што сказаў нам пан паручык, што мы наогул ня можам заблудзіць. Дык нашто-ж лезьці на гору? Я сабе пайду ціхенька сенажацямі, заткну сабе ў шапку кветачку і набяру цэлы букет пану паручыку. Зрэшты мы можам пераканацца, хто з нас кажа праўду, і я спадзяюся, што мы разыйдземся з вамі, як добрыя сябры. Па-мойму, тут такое месца, што ўсе дарогі павінны весьці ў Фэльдштэйн.

— Годзе вам дурыць, Швэйк,—сказаў Ванэк.—Глядзеце на карце, якраз тут мы і павінны ўзяць направа.

— Што-ж, карта можа і памыліцца,—адказаў Швэйк, рыхтуючыся сысьці ў даліну, па якой бегла ручаіна.

— Вось таксама калбасьнік Кшэнэк з Вінаград надумаўся аднойчы прайсьці ўначы, згодна пляну горада Прагі, з тракціру «Панядзелак» да сябе дамоў у Вінаграды, а раніцою апынуўся ў Родзелаве, пад Кладна, дзе яго знайшлі на сьвітаньні зусім скарчанелага на жытнім полі, дзе ён упаў ад зморы. Дык вось, калі вы ня хочаце прыняць мае парады, пане каптэнармус, і хочаце ўсё рабіць па-свойму, дык нам нічога не застаецца, як разысьціся ў розныя бакі і стрэцца толькі на месцы, у Фэльдштэйне. Паглядзеце на гадзіньнік, каб ведаць, хто першы туды прыдзе. А калі вам будзе пагражаць якая небясьпека, стрэльце ў паветра, каб я ведаў, дзе вы знаходзіцеся.

Праз гадзіну Швэйк дайшоў да невялічкага возера, дзе стрэў уцекача, расійскага палоннага, які тут надумаўся купацца і, убачыўшы Швэйка, так гальцом і ўцёк на ўсю сілу.

Швэйку дужа цікава было паглядзець, ці да твару яму расійская форма. Таму ён пераапрануўся з ног да галавы ў форму няшчаснага голага палоннага, які, як пасьля высьветлілася, уцёк з партыі палонных, што спыніліся ў вёсцы за ляском. Швэйку хацелася добра разглядзець сябе ў сьветлай вадзе возера, а таму ён да тае пары хадзіў узад і ўперад па беразе, пакуль яго не знайшоў патруль палявых жандараў, якія шукалі расійскага ўцекача. Гэта былі мадзьяры, якія не зважаючы на швэйкавы пратэсты, даставілі яго ў Хыраў і ўключылі ў партыю расійскіх палонных, прызначаную на работу—правіць чыгунку на Перамышль.

Усё гэта адбылося так хутка, што Швэйк толькі назаўтра зразумеў сваё становішча. Тады ён узяў і напісаў абвугленым канцом лучыны на белай сьцяне ў аднэй з кляс школы, дзе была зьмешчана на тую ноч частка палонных:

Тут спаў ротны ордынарац 11-й маршавой роты 91-га пяхотнага палка Явэп Швэйк з Прагілкі, будучы пасланы ў якасьці квартэр'ера, памылкова трапіў у аўстрыйскі палон.

ЗЬМЕСТ

	Стар.
Праз усю Вэнгрыю	3
У Будапэшце	62
З Гатвану на галіцыйскую мяжу	118
Наперад, марш!.	171